ARCHE Зьмест № 1’2000 ПАНСЛАВІЗМ: думка і злачынствы

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. Ад рэдакцыі: "...Чатыры ракі бягуць з Дзяржынскай гары, але ніводная з іх не нясе сваіх вод у Расію. Бо ўвогуле ніводная з беларускіх рэк не цячэ ў Расію. Такая ўжо наша геаграфічная сітуацыя. Дык прэч ад Расіі, кажам мы..."
3. Ад бяды зь бядою. Сакрат Яновіч у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Панславісцкая ідэя сьцісла вяжацца з палітычнай сытуацыяй у XIX стагодзьдзі: росквіт Расейскай Імпэрыі і паняволеньне ўсіх славянскіх народаў (акрамя расейскага). Хоць і ўзьнікла яна ў інтарэсах імпэрыі, з аднаго боку, і тых жа няшчасных народаў — з другога, аднак уяўляла сабою тыповую ўтопію..."
4. Апытаньне ў ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Панславісцкая ідэя сьцісла вяжацца з палітычнай сытуацыяй у XIX стагодзьдзі: росквіт Расейскай Імпэрыі і паняволеньне ўсіх славянскіх народаў (акрамя расейскага). Хоць і ўзьнікла яна ў інтарэсах імпэрыі, з аднаго боку, і тых жа няшчасных народаў — з другога, аднак уяўляла сабою тыповую ўтопію..."
5. Славянская Еўропа. ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Большасць нашых людзей аб славянах ведае хіба з курсу гісторыі савецкай школы, дый тое ў многіх выветрылася з галавы. Справа ўскладняецца і тым, што ў наш час на карце Еўропы з'явіўся шэраг новых славянскіх краінаў, што нават прыводзіць да блытаніны..."
6. Нож. Вук Драшкавіч у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Калі выбухнула Нэвэсінскае паўстаньне, пратапопу мінуў чатырнаццаты

год, а калі пала Турцыя й парадным крокам, з барабанамі, увайшлі ў Герцэговіну аўстрыйскія жаўнеры, быў ён ужо хлопцам, здатным для жаніцьбы..."

7. Чым ёсьць чэхі? Ян Патачка у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Чэхі - малы сярэднеэўрапейскі народ, які насяляе адасоблены ад іншых, калісьці вельмі цяжкадаступны край (Чэхія) і суседнюю, разьлеглую на шляхах зямлю (Марава)..."
8. Маскальшчына і Эўропа. Ян Станкевіч у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Нямецкая інтэлігентная моладзь мае новую моду: знайшла Дастаеўскага, глытае яго творы і захоплюецца ім. Гэта шырыцца там як пошасьць, так што нямецкія мысьліцелі пачынаюць зварочаць увагу, пісаць шмат аб гэтым..."
9. Ёсіп Броз Ціта, альбо Праўдзівая гісторыя росквіту і падзеньня панславізму ў Югаславіі.Ягор Новікаў у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...пасьляваенная Югаславія, створаная геніем Ёсіпа Броз Ціта, якая забясьпечыла дабрабыт і мірнае існаваньне некалькіх малапрыхільных адзін да аднаго народаў, але пасьля ягонае сьмерці распалася зь вялікім кравапраліцьцем і войнамі. Тым ня менш, яна пасьпела зьявіць узор дзяржаўнага панславізму і ўзмацніць агонь панславізму ў іншых краінах..."
10. Сутоньне ідалаў. Успаміны пра былую Югаславію. Алеш Дэбэляк у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Насамрэч, здаецца, што ўжо шмат зімаў мінула ад таго часу, як узброеная банда сэрбскіх ваякаў з падтрымкай Бялграду зраўняла зь зямлёй гэты харвацкі горад, хаця ўсё здарылася толькі ў лістападзе 1991 году. Каменя на камені не пакінулі ад таго, што яшчэ нядаўна было чароўным правінцыйным местам з насельніцтвам у 100 тысяч чалавек..."
11. Косаўскія варыяцыі. Кшыштаф Чыжэўскі ў ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Вось і мяжа Македоніі. Далей ісьці нельга. З узвышша, на якім спыняюся, адкрываюцца мне неаглядныя замглёныя разлогі Косава - краіны, імя якой далі волялюбныя чорныя птахі..."

12. Славенскія маргіналіі. Драга Янчар у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Нарэшце ў нас зьявілася тое, пра што мы калісьці маглі толькі шаптаць: мы маем дэмакратычнае грамадзтва з усімі адпаведнымі інстытутамі, маем свабоду слова і друку, ёсьць у нас свая дзяржава, вольнае прадпрымальніцтва, мы разумныя, адукаваныя, таленавітыя, мы здольныя з усім гэтым удала спраўляцца..."
13. Мінуўшчына Расеі і яе будучыня. Рычард Пайпс у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...е нас ёсьць падставы для асьцярожнага аптымізму. Цяжар гісторыі сапраўды вельмі прыгнятае Расею, чым толькі замаруджвае ейнае разьвіцьцё, аднак не асуджае краіну на нерухомасьць. Надзея, якую нашу ў сабе асабіста я, абапіраецца на меркаваньне, што Расея, краіна, што прэтэндуе на становішча прызнанай сусьветнай супэрдзяржавы, не захоча..."
14. Шавініст расейскі. Адам Глёбус у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...У раённым судзе абвясьцілі прысуд Шавіністу. Як на тое, што ён утварыў, далі зусім мала: тры з паловаю гады ўмоўна. Шавініста вызвалілі з-пад варты..."
15. Выкраданьне вепрука. Ігар Сідарук у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Грысь Чаравячка ўвесь Божы дзень ды добры жмут ночы жлукціў каламутную первачыну. Трэба сказаць, што жлукціў ён яе і дзень таму, і тыдзень, і месяц, і яшчэ шмат-шмат гадоў да тых знамянальных падзеяў, якія неўзабаве разгорнуцца перад ягоным займглістым позіркам і пра якія ён нават яшчэ й не здагадваецца..."
16. Фрагмэнт пра Гётэ і Талстоя. Томас Ман у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. ".... Гётэ і Талстой розьняцца ад абодвух сваіх хворых антыподаў, ад Шылера і Дастаеўскага, сухотніка і эпілептыка, моцнаю жывёльнаю асновай свайго іства, вітальнасьцю, якая дазволіла абодвум, нягледзячы на ўсе напяцьці жарсьцяў, што апаноўвалі іхнае жыцьцё, нягледзячы на неверагодныя ўчынкі і цяжкія перакрышы са здароўем, дасягнуць патрыярхальнага ўзросту..."

17. Расейскія дэбаты па-нямецку. Вальтэр Бэн'ямін у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Буржуазія, сказаў вялікі гішпанскі філёзаф дзяржавы Даноса Картэс, — гэта вечна дыскутуючая кляса. У аснове гэтага зьняважлівага і вельмі глыбокага азначэньня ляжыць пагардлівае стаўленьне да дыскусіяў, пашыранае і сёньня..."
18. Канец Вялікай Паўзы. Мікола Рабчук у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...калі Дружба народов (у двукосьсі і без двукосься) калі-небудзь такі ўваскрэсьне на нашых атручаных шматгадовымі крыўдамі і ўзаемнай перадузятасьцю абшарах, то адбудзецца гэта, відавочна, менавіта так: пры спрыяньні і пасярэдніцтве Нью-Ёрку (Вашынгтону, Брусэлю, Страсбургу), у рэальным, г. зн. „атлянтацэнтрычным“, а не „масквацэнтрычным“ сьвеце, дзе голас Эстоніі ў пытаньнях інтэграцыі і супрацоўніцтва будзе важыць ня менш, чым голас Расеі..."
19. Камуністычная кастрацыя ды таемныя радасьці нацыянал-фалізму. Івайла Дычэў у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Адмовіць каму-небудзь у прызначэньні на пасаду, паколькі ён жыд (у Расеі, у Польшчы), можна было толькі за адным акрэсьленым пісьмовым сталом, пачынаючы з пэўнага ўзроўню ўнутры намэнклятуры; „для грамадзкасьці“ прычына заўсёды фармулявалася так: той і той знаходзіцца пад ідэалягічным уплывам з боку Захаду..."
20. Менск 1920-га: Меражкоўскі аб Міцкевічу і славянах. Ілья Куркоў у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...qq..."
21. Тры сымфоніі. Оскар Любіч-Мілаш у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Вітаю цябе, што прыйшла да мяне на спатканьне, / У водгульлі крокаў маіх, з халоднае цемры тунэляў часу. / Вітаю цябе, о маці мая, самота. / Калі шчасьце крочыла ў ценю маім, калі біліся ..."
22. Чэскі пацыент. Іван Блатны ў ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...У чэскім клюбе ў глыбі мэтраполіі / цяпер, бо ўжо рана сутонее, / афіцыянт запальвае лямпы й прыносіць чэскія стравы...."

23. Альшанскія Могліцы. Максім Шчур у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Выбітныя іншаверцы / сваіх краёў, паломнікі ад месцаў пакланеньня, / ад млынаў збочыўшыя рыцары / ўсіх папярэдніх пакаленьняў / тут зьберажоны..."
24. З хатняга альбому. Уладзімер Ракіцкі ў ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Я нарадзіўся ў Парасьлянах, сяле, што на поўнач ад Пружаны, на пачатку сакавіка пяцьдзясят другога. Але яшчэ ляжаў сьнег, бо бацька, калі вёз санямі бабу Кацю з Шанёў у адведкі, то згубіў яе па дарозе і мусіў варочацца і шукаці яе ў полі..."
25. Турэмны дзёньнік: ад Усьпеньня да Калядаў. Славамір Адамовіч у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Сьніўся сон, што Лукашэнка іграе ролю ў нейкім спэктаклі: з указкай у руцэ і надта худы..."
26. З чаго пачынаецца Жодзіна? Андрэй Хадановіч у ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Пільнуе ды сочыць паводзіны, То хваліць, то ставіць у кут... З чаго пачынаецца Жодзіна? Яно пачынаецца тут..."
27. Разьвіцьцё і злачынствы панславізму. Вацлаў Чэрны ў ARCHE 1(6)-2000. Тэма нумару: Панславізм: думка і злачынствы. "...Калі я скажу, што панславізм — гэта чэскі выраб зь нямецкага матэрыялу, мой французскі або ангельскі чытач усьміхнецца..."

[image]
[image]

З ь м е с т 1 (6) - 2000

.

[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

---

[image] - [image]
Т[image] [image] 2000
Панславізм:
думка і злачынствы
[image]
[image]

ЗЬМЕСТ

Ад рэдакцыі
Сакрат Яновіч. Ад бяды зь бядою
славянская ідэя
Апытаньне ARCHE
Славянская Еўропа
Вук Драшкавіч. Нож (ZIP: 44 K)
Ян Патачка. Чым ёсьць чэхі? (ZIP: 24 K)
Ян Станкевіч. Маскальшчына і Эўропа
Балканы
Ягор Новікаў. Ёсіп Броз Ціта, альбо Праўдзівая гісторыя росквіту і падзеньня панславізму ў Югаславіі
Алеш Дэбэляк. Сутоньне ідалаў (успаміны пра былую Югаславію) (ZIP: 28 K)
Кшыштаф Чыжэўскі. Косаўскія варыяцыі
Драга Янчар. Славенскія маргіналіі
геапалітыка
Рычард Пайпс. Мінуўшчына Расеі і яе будучыня (ZIP: 24 K)
гісторыі
Адам Глёбус. Шавініст расейскі
Ігар Сідарук. Выкраданьне вепрука (ZIP: 28 K)
крытыка
Чэслаў Мілаш. Дастаеўскі й Сартр
(ZIP: 18 K)
Томас Ман. Фрагмэнт пра Гётэ і Талстоя
Вальтэр Бэн'ямін. Расейскія дэбаты па-нямецку
гуманістыка
Мікола Рабчук. Канец Вялікай Паўзы
Івайла Дычэў. Камуністычная кастрацыя ды таемныя радасьці

нацыянал-фалізму
архіў
Ілья Куркоў. Менск 1920-га: Мережкоўскі аб Міцкевічу і славянах
лірыка
Оскар Любіч-Мілаш. Тры сымфоніі
Іван Блатны. Чэскі пацыент
Максім Шчур. Альшанскія Могліцы
сьветліня
Уладзімер Ракіцкі. З хатняга альбому
хроніка
Славамір Адамовіч. Турэмны дзёньнік: ад Усьпеньня да Калядаў (урыўкі з кнігі) (ZIP: 23 K)
вожык
Андрэй Хадановіч. З чаго пачынаецца Жодзіна?
кніга
Вацлаў Чэрны. Разьвіцьцё і злачынствы панславізму (ZIP: 103 K)

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

[image]

да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

Ад рэдакцыі

У нядаўнім сваім „Лісце брату“ ў „Нашай Ніве“ лідэр Маладога Фронту Павал Севярынец заклікаў „хрысьціянізаваць Расею“, „выратаваць яе духоўнай экспансіяй прасьвятленьня і пропаведзі“, бо „менавіта ў Беларусі вырашаліся ключавыя пытаньні паўстаньня й распаду Расейскае імпэрыі“. Задача настолькі ж маштабная, наколькі рытарычная.

Месіянізм Севярынца мае эквівалент у іншым пешчаным дзіцяці беларускага паспольства, Аляксандру Лукашэнку, які быў спаўняў — і натхняў увесь свой народ на спаўненне — місіі збаўлення агульнарускай супольнасці, што прынесла б таксама збаўленне ўсяму свету, „шматполюснасць“ якога тым самым была б засцярэжана. Абодва месіянізмы, абодва намеры вылучаюцца утапічнасцю (іх выразнікі паходзяць з культуры слова, а не справы) і апеляцыяй да ірацыянальных аргументаў. Абодва супрацьстаўляюць нямілай сучаснасці інверсійна ідэалізаванае мінулае й будучыню. Абодва яны ўяўна беларусацэнтрычныя, але грунтуюцца на адмаўленні свайго народу і гэтага свету, сённяшняга дня сённяшняй Беларусі, якому процістаўляецца славянская ці хрысціянская духоўнасць і наканаванне.

Лукашэнка хацеў завалодаць Вялікай Расіяй, даўшы ёй прыклад сапраўднай расійскасці, Севярынец хоча завалодаць Святой Расіяю, паказаўшы ёй сапраўдную хрысціянскасць. Дзве гэтыя стратэгіі абумоўленыя фрустрацыяй: у першым выпадку фрустрацыя, выкліканая дыскрэдытацыяй імперскага дыскурсу *общерусской* нацыі, у другім — крызіс моцна ідэалізаванага варыянту беларускага нацыядзяржаватворчага праекту, *нацыянальнага адраджэння* 80—90-х. З аднаго боку, страта імперскага цэнтру, які, калі ўжо яго сапраўды няма, дык трэба выдумаць, з другога — цяжкасці і адкаты дэкаланізацыі, якія

хочацца чым хутчэй, хоць з дапамогай шаманства, пераадолець. Расія застаецца Расіяй, Беларусь — Беларуссю, і пакуль Беларусь не можа не прапаноўваць сябе Расіі ўсю без астатку. Але прамаскоўскі шал беларускіх панславістаў хіба што ўвасобіцца ў безлічы псеўдаінтэграцыйных структур, а пратэстанцкі месіянізм хіба дадасць да „недовольства части русских католиков — священников и мирян — польским и польско-белорусским национализмом“ каталіцкіх ксяндзоў[1] такія ж інвектывы на адрас пратэстанцкіх казаннікаў.
Апаненты Паўла Севярынца ў Маладым Фронце тлумачаць ягоную адмову ад палітычнай дзейнасці, замаскаваную ў хрысціянскія шаты, подступам КГБ. Інтэрпрэтацыя ў лепшых традыцыях *conspiracy theory*. Мы ж звяртаем увагу на спадчыну даўгавечнага насаджэння славянскай ідэі, якая ў Беларусі цалкам зводзілася да ідэі расійскай (у іншых нацый Цэнтральнай і Усходняй Еўропы славянафільства нярэдка іграла эманцыпацыйную ролю; гэтак, украінскія „будзіцелі“, як бліскуча паказаў Мікола Рабчук, выкарыстоўвалі яго як альтэрнатыву „общерусскому“ міфу[2]).
Самая цяжкая спадчына каланіялізму ў Беларусі — светапоглядныя мадэлі, а не сацыяльныя і эканамічныя структуры, што ў прынцыпе, як засведчыў досвед Балтыі і Цэнтральнай Еўропы, адносна лёгка паддаюцца трансфармацыі.
Панславізму, утылітарысцкай замежнапалітычнай дактрыне позніх славянафілаў, а пасля — расійскіх вялікадзяржаўных нацыяналістаў, не было наканавана рэалізавацца ў поўнай меры. Расійская царская імперыя і Савецкі Саюз былі зруйнаваныя ўнутранымі супярэчнасцямі і паражэннямі ў міжнародным спаборніцтве. Югаславізм крывава сканаў. Прадукт панславізму — катастрафічная і месіянская свядомасць — скіроўвае нацыянальную энергію беларусаў за іх нацыянальную супольнасць. Яна таксама выклікае канцэнтрацыю ўвагі грамадства на замежнапалітычных, а не ўнутрыпалітычных праблемах. Не знікаюць міфы пра „асаблівую місію славянскіх народаў“, „ратаванне свету славянамі“, „сусветную антыславянскую змову“, часта спараджаючы адкрыта расісцкія настроі. Славянафільства ў выпадку беларуса — гэта самаадрачэньне.
Славянафільства і панславізм сапраўды, як заўважае Ігар

Бабкоў, „занялі сваё месца ў мінулым“. Але ад іх у свядомасці застаюцца непрыняцце мадэрнізацыі ў яе заходнім варыянце — культываванне страху перад яе сацыяльнымі, эканамічнымі і маральнымі праблемамі й супярэчнасцямі, прымітывізацыя і ірацыяналізацыя мыслення, нявера ў патэнцыял капіталізму, цяга да самаізаляцыі і адгароджання ад Захаду і „сапсаванага“ ім свету, таго, як выказаўся Аляксандр Лукашэнка, „цывілізаванага свету, за якім я свой народ не павяду“. Захаваць эфектыўнае традыцыяналісцкае немадэрнае грамадства ў Беларусі, што знаходзіцца ля калыскі мадэрнага свету, немагчыма. Той самападман ці свядомы падман, у які ўдаецца цяперашні беларускі рэжым, вяртаючы ці, дакладней, імітуючы вяртанне „залатога савецкага мінулага“, уяўляецца сапраўдным злачынствам, і не можа не выклікаць болю і пратэсту ў тых, хто здае сабе справу з таго, якую гаспадарчую і маральную дэградацыю нясе з сабой гэты псеўдатрадыцыяналісцкі „славянскі іншы шлях“, якое цемрашальства ён культывуе, колькі пакаленняў беларусаў ён пазбаўляе перспектыў, якую частку нацыянальнай эліты ён выпіхвае ў эміграцыю. Боль і пратэст несуцешныя пагатоў у тых, хто ўсведамляе неўнікнёнасць мадэрнасці для ўсіх сучасных грамадстваў. Мадэрнасць і адкрытасць можна абдумваць, крытыкаваць і карэктаваць, але іх нельга пазбегнуць — можна адно адцягнуць іхні надыход.
Мікола Рабчук у згаданым вышэй артыкуле з гэтай нагоды цытуе Джона Томлінсана:

> Socio-economic modernity is the „fate“ of all cultures in that they are integrated at a structural level in the orders of the nation-state system and the global capitalist market; but this integration—which is a structural *fait accompli*, not a cultural „option“—alters the terms of culture irrevocably, since it entails a one-way journey from „tradition“ to „modernity“. As this journey is made by human agents and involves the emergence of new senses of possibility—new options, new desires, new freedoms—it too can be understood in „existential“ terms. „Cultural fate“ becomes linked with the realisation of individual human freedom. Cultures are „condemned to modernity“ [Octavio Paz] not

> simply by the „structural“ process of economic development, but by the human process of *self-development.*[3]

Антымадэрнасць, антызаходніцтва — аснова славянафільства. Наша крытычнае стаўленне да „славянскай ідэі“ як такой і беларускіх славянафілаў-сучаснікаў у прыватнасці (а гэткія прыхільнасці ўласцівыя для інтэлектуалаў з розных, часам супрацьлеглых палітычных лагераў) тлумачыцца тым, што Ніл Гілевіч, Іван Чарота, Віктар Чыкін, Таіса Бондар, Георгій Марчук, Аляксандр Вайтовіч, Святлана Алексіевіч, Уладзімір Замяталін або хто-кольвек іншы, каго розум ці сэрца, прага ўлады ці сімпатыя да сербаў прывялі на гэтую платформу, наўмысна ці міжволі жывяць і ўмацоўваюць гэтае рэакцыйнае непрыманне мадэрнасці (тое самае робіць „традыцыяналісцкі“ дыскурс у літаратуры, рэакцыйны і аджылы).

Масква ж тым-то й падтрымлівае або наўпрост спансаруе тыя ці тыя беларускія славянафільскія колы, што сутнасць расійскай стратэгіі ў Беларусі палягае сёння ў максімальным тармажэнні рынкавых і палітычных рэформ, кансервацыі дзяржаўнага кантролю над сродкамі вытворчасці і працоўнай сілай і недапушчэнні пераходу да самарэгуляванай эканомікі, заснаванай на прыватнай уласнасці, недапушчэнні стварэння перадумоваў для завяршэння мадэрнізацыі — адваротнае і толькі адваротнае паскорыла б фармаванне грамадзянскай супольнасці і саслабіла б татальны на сёння кантроль над грамадствам, следам за чым непазбежна надышоў бы канец расійскаму панаванню над Беларуссю.
Дагэтуль Беларусь была зазнала толькі абмежаваную, запозненую і каланіяльную (трансляваную праз Расію і ў меншай ступені Польшчу) мадэрнізацыю. Супраціў каланізацыі — як і ў азіяцкіх і афрыканскіх калоніях — адбываўся таксама як супраціў мадэрнізацыі, якая несла з сабой большую залежнасць ад імперскага цэнтру і разбурэнне традыцыйнага ладу жыцця і сістэмы вартасцяў[4].
У гэтай традыцыі выхаваныя сучасныя беларускія нацыяналісты-антымадэрністы (Зянон Пазьняк у гутарцы з рэдактарамі ARCHE прыпусціўся, што „заходні лібералізм, магчыма, сёння страшнейшы для беларушчыны, чым расейскі камунізм“), нацыяналісты-славянафілы або таксама

маргінальная плынь балтафілаў-паганцаў. Іх непакой зразумелы, але ці слушны?
З вышыні найвышэйшай кропкі Беларусі, Дзяржынскай гары, якая шчэ да 1958 года называлася Святой, нам, што з надзеяй глядзяць на Захад, мадэрная еўрапейская, ці то еўраатлантычная, цывілізацыя і здаецца ўцелаўленнем хрысціянскага духу. Мы абсурдна бачым яго якраз у перавазе рацыянальнага над ірацыянальным, розуму над сэрцам, грамадзянскай супольнасці над дзяржавай, грамады над пастырам, знаходзім у *changer le monde* замест *changer du monde*, у этыцы працы, эстэтыцы меры, у свабодзе, індывідуальнай адказнасці і нават такой палохаючай павазе да спажывання. Што можа быць у такім разе большым у справе *хрысціянізацыі* Расіі, чым яе вестэрнізацыя? І што большае могуць зрабіць беларусы для далучэння Расіі да заходняй цывілізацыі, чым прылучэнне сябе да гэтай цывілізацыі, чым палітычнае і культурнае вызваленне сваёй краіны — моцны сродак лячэння найбольшай славянскай дзяржавы ад *імперскае хваробы*? Павал Севярынец захапляецца цывілізацыяй Захаду, „пабудаванай на хрысьціянскіх прынцыпах“, а пра Расію, Украіну й Беларусь піша, што „яны засталіся духова змрочнымі зонамі“, бо „мараль, і палітыка, і эканоміка ў краіне бяз Бога ня маюць аснаватворнае сыстэмы каардынатаў, і таму носіць сатана, кідае на хвалях без стырна, безь вятрылаў і асобнага чалавека, і ўсю дзяржаву“. Але не выключана, што сучасны ісіхазм, праваслаўны ці пратэстанцкі, можа нават больш разбуральна ўздзейнічаць на станаўленне грамадзянскай супольнасці, чым характэрнае для Расеі зрастанне дзяржаўных і рэлігійных структур. Галоўнае, прыкра чуць ад намесніка старшыні БНФ, што „палітыка ў Беларусі даўно скончылася“.

Чатыры ракі бягуць з Дзяржынскай гары, але ніводная з іх не нясе сваіх вод у Расію. Бо ўвогуле ніводная з беларускіх рэк не цячэ ў Расію. Такая ўжо наша геаграфічная сітуацыя. Дык прэч ад Расіі, кажам мы.

Гэты славянскі нумар ARCHE атрымаўся звернуты ў мінулае нават там, дзе гаворка ідзе пра перспектывы славянскай ідэі. Мы напэўна зробім і іншы славянскі нумар — пра ўсе колеры сучаснага славянства, але гэта ўжо справа іншага тысячагоддзя.

Радыя паведаміць, што часопіс ARCHE павялічвае свой наклад і будзе выходзіць сёлета штомесяц, чаргуючы „тоўстыя“ тэматычныя нумары з тонкім дадаткам „Скарына“, які мае складацца з аналітыкі, эсэістыкі, крытыкі й рэцэнзій. Мы рыхтуем таксама далекасяжныя праекты іншых выданняў, сярод якіх часопісы для жанчын „Баба“ і для нашых расейскамоўных сяброў „Нерусский журнал“. Усе гэтыя планы здзейсняцца, калі вы будзеце купляць наш часопіс. Цана ARCHE — гэта высокая цана культуры.

Андрэй Дынько

[1] С. Филатов, Л. Воронцова. „Судьба католицизма в России“ в *Иностранная литература* (Москва: 1998/11), 250.

[2] Mykola Riabchouk, „The Nativist-Westernizer Controversy in Ukraine: The End or the Beginning?“ in *Journal of Ukrainian Studies* (Toronto: 1996/1-2), 27—54.

[3] John Tomlinson, *Cultural Imperialism: A Critical Introduction* (London: Pinter Publishers, 1991), 140—141.

[4] Пра гэта гл. Валерка Булгакаў, „Мой Багушэвіч. Дыялектыка клясычнага тэксту“ ў *Фрагмэнты* (Менск: 1998/1), 151—160.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**

Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **4-03-2000**

да Зьместу 1(6)-2000

прадмова

Сакрат Яновіч
Ад бяды зь бядою

Панславісцкая ідэя сьцісла вяжацца з палітычнай сытуацыяй у XIX стагодзьдзі: росквіт Расейскай Імпэрыі і паняволеньне ўсіх славянскіх народаў (акрамя расейскага). Хоць і ўзьнікла яна ў інтарэсах імпэрыі, з аднаго боку, і тых жа няшчасных народаў — з другога, аднак уяўляла сабою тыповую ўтопію. Перш за ўсё таму, што ў тую эпоху імпэрыяў у Эўропе панславянскія памкненьні цалкам залежалі ад расейскага патэнцыялу. Дакладней кажучы: ад дзяржаўных інтарэсаў Пецярбургу з Масквою. Ну, і ад эўрапейскіх абумоўленасьцяў.

Яскрава тое паказала глумленьне вугорскай рэвалюцыі ў Вясну Народаў, калі дапамагаць Аўстрыі прыйшла царская армія, зусім не клапоцячыся пра свабоду тадышнім чэхам, славакам, палякам, харватам, славенцам, украінцам галіцкім, што знаходзіліся пад ботам Вены. Саюз двух імпэратараў — расейскага і аўстрыйскага — аказаўся важнейшым, а славяне лічыліся неістотнай маргіналіяй. На павярхоўны выгляд, іначай бачылася балканская вайна праз трыццаць гадоў пасьля, закончаная ўтварэньнем — аднаўленьнем — Баўгарыі. Рамантыка т. зв. освободителей — гэта байкі для простага люду. Гістарычная праўда іншая: Расея спрабавала рэалізаваць сваю адвечную мару выбіць з рук Турцыі пралівы Баспор і Дарданэлы, каб выйсьці ў Міжземнае мора, на поўдзень Эўропы, поўнач Афрыкі і на захад Блізкага Ўсходу. Што супярэчыла інтарэсам імпэрыяў брытанскай і французскай. Таксама й нямецкай, тады вельмі маладой, якой патрэбны быў балканскі калідор у арабскі сьвет, каб будаваць стратэгічную

лінію Бэрлін—Багдад з акном на Індыйскі акіян і Палінэзію (каб захапіць пакуль не захопленыя „ў дзікіх“ землі). Палітычна Расея апынулася ў становішчы 1:3 і мусіла прайграць, а першым манархам новай Баўгарыі стаў не расейскі князь, а нямецкі.

Калі Расея такая славяналюбная, дык чаму імкнулася русіфікаваць палякаў, беларусаў, украінцаў?! Кожнага славяніна, які знайшоўся быў пад яе ўладаю? Гэта што — ад вялікага каханьня ціснуў такі мус пазбавіць усіх тоеснасьці? Брутальная праўда наступная: каб утрымаць імпэрыю, трэба всех и вся перарабіць у аднолькавасьць. Вядома, чарговая расейская ўтопія. Справа ў тым, што асымілюе не адміністрацыя, а эканоміка, лепшы быт ад этнічна горшага. Гісторыя вучыць, што дабрабыт магчымы, аднак, толькі ў нацыянальнай дзяржаве. Імпэрыя непазьбежна падзяляецца на „багаты Рым“ і ўбогія правінцыі; яна прытым ракатворная структура, такім чынам, значыць, і самазьнішчальная. Дадатковая асаблівасьць Расеі ў тым, што яна бесьперапынна разгортвалася прасторава, замест разьвівацца (як Захад). Жыла выключна анэксіямі, рабаваньнем тэрыторыяў. Іначай не магла, бо не Расея мела армію, але армія — Расею. Армія — бы амяла, нічога не будуе, не займаецца гаспадаркаю. Усё ваюе. Славянафільства канчаткова анахранізавалася адначасова з самаарганізацыяй славян ва ўласныя дзяржавы. Сёньнячы гэта палітычны фальклёр, які любяць слухаць адны настальгікі па Савецкім Саюзе. Асабліва ў Беларусі, бо цывілізацыйна патанае яна. І ў Расеі, бо там падобнае становішча плюс смуткаваньне па былой імпэрыі, агонія якой адбываецца на нашых вачох. Гісторыя Расейскае Імпэрыі вельмі чытабэльная: без Украіны яе проста не было б. Знакаміта гэта разумеў Ленін, лёгка аддаючы ў 1919 годзе палякам усю Беларусь, але аберуч трымаўся ён за Ўкраіну менавіта (Беларусь Маскве — ня больш як калідор у Эўропу, эканамічнага значаньня яна ёй ня мела і ня мае). Цікава зазначыць у заканчэньне, што ўсякія пан-рухі нараджаюцца ў заняпалых зонах сьвету, прыкладам: панцюркізм, панарабізм, панамэрыканізм у Лацінскай Амэрыцы ці панафрыканізм. Цалкам у згодзе з прыродаю ўтопіі, г.зн. успрыманьня жаданага за рэальнае.
Невыпадкова сьлед панславянізму даўно прастыў у

эўрапейскай Славяншчыне, нават у Сэрбіі, што сябе адчула моцна здраджанай цяпер Масквою, якая — сэрбы таго ня кемілі — ад спакон вякоў кіруецца перш за ўсё глябальнымі інтарэсамі. І разам з тым усё яшчэ цёплы той сьлед у драме жыцьця постсавецкага. Гэтак ад бяды зь бядою!

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
[image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **4-03-2000**

да Зьместу 1(6)-2000
славянская ідэя

Апытаньне ARCHE

Распачынаючы апытаньне на тэму „**Якія, на вашу думку, пэрспэктывы славянства і славянскай ідэі ў будучай аб'яднанай Эўропе?**“, рэдакцыя ARCHE нат не спадзявалася на тое, што атрымае сапраўдны шквал адказаў. Адказы прыйшлі з Амэрыкі, Украіны і Польшчы, зь беларускіх гарадоў і вёсак. Усім дзякуй.

Сьвятлана Алексіевіч
(беларуская пісьменьніца)
Славянский мир объединится

Мне кажется, что в XXI столетии славянский мир предложит миру какие-то интересные идеи. Об этом говорят и интеллектуалы на Западе. Думаю, славянский мир будет объединяться. Информационные технологии заставят человека искать ментальные опоры. Мы иные, не такие, как европейцы. Эту свою особость мы будем осознавать. Прошлое панславизма противоречивое, и оно мешает нам увидеть его будущее. Думаю, славянский мир оформится в единый организм, может быть, только не такой агрессивный организм, как раньше. Лично я чувствую славянина. Я всегда узнаю славян, когда езжу, когда встречаюсь. Славяне по-иному мыслят и, я бы сказала, больше смотрят на небо. А вообще мир бесконечен, а битвы местного масштаба грустны.

Ігар Бабкоў
(філёзаф, рэдактар часопіса «Фрагмэнты»)
Неактуальны праект

Пэрспэктывы эўрапейскай інтэграцыі значна больш праблематычныя, чым лёс славянскай ідэі. Эўрапейская інтэграцыя — праект, скіраваны ў невядомую будучыню, а славянская ідэя ўжо заняла сваё месца ў мінулым, і сёньня ў большай ступені зьяўляецца рэспэктабэльнай тэмай акадэмічных дасьледаваньняў, чым актуальным геапалітычным ці нават геакультурным праектам. Славянская ідэя сталася бясьпечная (у адрозьненьне ад XIX стагодзьдзя зь „вясной народаў“) і маргінальна-архаічная.
Адраджэньне славянскай ідэі ў аб'яднанай Эўропе магчыма толькі пры ўмове, што Расея стане пераважна монаэтнічнай багатай лібэральнай дэмакратыяй і ўзначаліць антыкаляніяльны (ці посткаляніяльны) супраціў традыцыйнаму цэнтру ўлады (Захаду як Вялікаму Калянізатару). Але дзьве гэтыя ўмовы практычна выключаюць адна адну (багатыя лібэральныя дэмакратыі ніколі не вядуць антыкаляніяльнай барацьбы, прыклад — Японія), а тыя, хто вядзе, ніколі не стануць ані багатымі, ані лібэральнымі, ані дэмакратыямі.

Зьбігнеў Бжэзінскі
(амэрыканскі палітоляг, дарадца прэзыдэнта Злучаных Штатаў Амэрыкі па нацыянальнай бясьпецы ў 1977—1981 гадах)
Славянская ідэя — мітычны лёзунг
Разважаць пра „славянскую ідэю“ — гэта тое самае, што разважаць пра „ідэю германскую“, „скандынаўскую“ альбо „лацінаамэрыканскую“. Інакш кажучы, гэтая ідэя пазбаўлена як сэнсу, так і зьместу. Яна ня мае ані будучыні, ані мінулага. Гэты мітычны лёзунг выкарыстоўваецца дэмагогамі дзеля ўплыву на маласьвядомых людзей. На сёньня ён знаходзіць пэўную падтрымку на абшарах былога Савецкага Саюзу, дзе абвал злачыннай камуністычнай сыстэмы выклікаў хаос у інтэлектуальным асяродзьдзі наровень зь вядзеньнем адчайных пошукаў нейкай альтэрнатыўнай „агітпропаўскай“ фармулёўкі.

Таіса Бондар
(пісьменьніца, рэдактар часопіса *Всемирная литература*)
Славянскія народы маюць місію

Ні час, ні радзіму, як вядома, не выбіраюць. Кожны нараджаецца тады і там, куды ўсім цяжарам пражытага і дагэтуль не зжытага схіляе яго лёс. І ад таго, прымаем мы свой лёс як працу любові да зямлі і людзей ці спрабуем адвярнуцца ад яго з марным спадзяваннем пазбегнуць адказнасці, залежыць многае ў свеце.

Час не за гарамі, а за плячамі... Дзень учорашні са сваім мысленнем ужо мінуўся. І час не здзіўляцца, чаму ўсё відочней расхіствающца маральныя прынцыпы, а росквіт магутных некалі дзяржаў аказваецца міражом, а ўразумець, што калі чалавек не можа жыць без хлеба зямнога, надзённага, то не зможа, не зможа — без таго, каб не страціць чалавечнасць, — і без хлеба духоўнага, бо толькі дух прасвятляе, толькі з ім прыходзіць усведамленне Прыгажосці, усведамленне велічы законаў і таямніцаў Прыроды. Век, у які мы ўступілі, стане — павінен стаць! — векам вяртання, узвышэння духоўных каштоўнасцей, найвялікшыя з якіх — Любоў, Дабро, Ісціна, і аграмадная, не ўразуметая ў поўнай меры і па сёння роля ў гэтым славянства, славянскага свету. І Беларусі, хачу я дадаць...

На небе *ведаць* азначае бачыць, на зямлі — памятаць. Не ўзгадваць зрэдчас, ад выпадку да выпадку, а памятаць, што карані нашага роду ідуць у глыбіню вякоў, што без нацыянальнай ідэі, закладзенай у зярнятка духу народнага, не ўзнікла б, не працяла стагоддзі ніць нацыянальнага лёсу, бачная і адсюль, з нашых дзён, праз лёсы людзей, якія пакінулі след у гісторыі. Пакінулі якраз таму, што ў іх дзеяннях, у іх жыццях, аддадзеных служэнню Госпаду і сваёй Бацькаўшчыне, увасабляліся памкненні народу да еднасці з усім людствам, і ў першую чаргу — да аб'яднання земляў славянскіх.

Хоць бы і Ефрасінню Полацкую ўзяць... Часцей за ўсё мы гаворым пра яе як пра асветніцу, пра святую зямлі нашае, а нават тыя адзінкавыя сведчанні пра яе жыццё, якія засталіся, паказваюць яе як вялікую дзяржаўную дзеячку, што вяла перапіску не адно з самымі слыннымі мысліцелямі сваёй эпохі, а з імператарамі, як вялікую заступніцу за мір і згоду на землях славянскіх, за ўз'яднанне разрозненых княстваў Русі ў адзіную моцную дзяржаву.

Кірыла Тураўскі, Сімяон Полацкі, Францыск Скарына, Сымон Будны... Хто з іх, жыцці аддаўшых служэнню справе асветы,

захаванне духоўных каштоўнасцей свайго народу і іншых народаў, клікаў да нацыянальнага адасаблення? Ідэя еднасці, ідэя славянскага братэрства заўсёды жыла ў народзе і, нягледзячы на ўсе навалы, на ўсе войны (колькі разоў было, што брат на брата — то з захаду, то з усходу — ішлі), жыве і сягоння. Нікім навукова не абгрунтаваная, ніводнай палітычнай сілай дагэтуль як вядучая ідэя не запатрабаваная і нават не прызнаная, яна, тым не менш, і сягоння вызначае менталітэт народу.

Дык што, запытацца, мы шукаем? Чаму не асмельваемся выразна, ясна, на поўны голас агучыць яе, сцвярджаючы, што геаграфічны цэнтр Еўропы, які знаходзіцца на нашай зямлі, не толькі сімвалізуе, але і вызначае цэнтр усіх славянскіх земляў. Упэўнена: шматвяковая барацьба за куточак зямнога шара пасярод Еўропы, які неаднойчы мяняў контуры і межы і сёння носіць імя Беларусь, вялася не адно таму, што ён заўжды немінуча аказваўся на шляху варвараў і місіянераў самага рознага кшталту, дзякуючы сваёй геаграфічнай, геапалітычнай, кажучы сучаснаю моваю, перавазе, але і таму, што менавіта тут, у гэтай зямлі, ключ ад далёкае, ці не вельмі далёкае, будучыні планеты. Духоўны ключ... Своеасаблівы магніт устойлівасці, памкнення да міру з усімі, нават з ворагамі гэтага міру... І зусім не з-за „рабскай псіхалогіі“, як сяму-таму здаецца!

У глыбіні народнай душы, на ўзроўні геннай памяці захоўваецца код яго шляху, яго місіі — і ні жорсткім заваёўнікам, ні багатым купцам не завалодаць ім, пакуль доўжыцца гэты шлях (а ён доўжыцца!), пакуль не завершана гэта місія (а яна не завершана!). І нездарма сярод геніяў і вялікіх майстроў, якімі ганарацца не толькі блізкія да нас краіны, шмат тых, хто народжаны нашай зямлёй. Мы і сваяцтва гэтага часцей за ўсё не помнім, у прастаце сваёй — ісціннай, той, што ад Бога, прастаце! — мяркуючы, што не збяднее, не бяднее ад гэтага зямля, мы і сёння гатовы дзяліцца апошнім. Апошнім, але не тым, што складае сутнасць, аснову светаразумення, — памкненнем да ўстойлівасці, стабільнасці, якія з’яўляюцца своеасаблівым цэнтрам цяжару, што ўтрымлівае свет у раўнавазе. Свет у самым шырокім сэнсе слова...

Між іншым, ці ведаеце вы, што наш „край лясоў і балотаў“

знаходзіцца на аграмадным, як сцвярджаюць геолагі, амаль невымерным гранітным стрыжні, скіраваным углыб Зямлі? Знакавы факт!
Неаднойчы, не адным прарокам адзначалася, што менавіта славянскаму свету ў садружнасці з іншымі народамі прадвызначана ўтварыць духоўны цэнтр будучай цывілізацыі. Вось чаму, як мне здаецца, цяпер, у рашаючыя гады ўзыходжання Духу Чалавечага, пэўнымі сіламі робіцца ўсё, каб мы адмовіліся ад сваёй місіі, каб прыйшлі да думкі, што не варты яе. Славянскім народам (і беларускаму народу ў тым ліку) прывіваецца глабальны комплекс непаўнавартаснасці, нас адкрыта і нахабна правакуюць, з тым, каб падштурхнуць да крывавых дзеянняў, да бунту, які ўцягне — і ўжо ў немалой ступені ўцягнуў — краіны ў хаос.
Сёння ж мы ўзаемазалежныя адно ад аднаго і так шчыльна звязаны, што без пачуцця агульнай адказнасці, без пачуцця агульнага братэрства і перакананасці ў тым, што мы з'яўляемся найперш часткай адной вялікай славянскай сям'і, мы не можам спадзявацца пераадолець ці хоць бы аддаліць небяспеку, якая зноў ставіць пад пагрозу само наша існаванне.
Час, як вядома, мяняецца, мяняючы ўсё і ўсіх, — тая ж вось, вакол якой ён рухаецца, вызначана вечнасцю і спрадвек непарушная. І нялёгкую, але важную місію выконваюць тыя народы (сярод іх і народ беларускі), якія адчуваюць гэтую непарушнасць стрыжнем свайго духоўнага лёсу.
Крокі гісторыі рэдка супадаюць з хадою часу, заўсёды абцяжаранага мноствам самых розных патрэбаў і прэтэнзій як кожнага асобнага чалавека, так і ўсяго грамадства. І ўсё ж, нават не супадаючы, вызначаюць яе, каб некалі потым — праз дзесяцігоддзі, а то і праз стагоддзі — адгукнуцца новаму часу, пазначыць знакавую вяху ў далёкім ці недалёкім мінулым народа. Які гэта будзе час, гадаць не выпадае: мы жывём сёння, мы сёння вершым тую, будучую, гісторыю, і адно трэба — памятаць, не забываць, што гэта ў *нашы* дні Беларусь, стаўшы незалежнаю, вярнула страчаную некалі дзяржаўнасць, што гэта *наша* праца з дня ў дзень, з году ў год умацоўвае яе самастойнасць і аўтарытэт, што гэта ад *нашае* волі залежыць, ці ўсвядомім мы, а потым і нашы дзеці, і нашы ўнукі, яе як свой нацыянальны дом. Няхай бяднейшы, чым нечы дом па суседстве, няхай не такі высокі і светлы, як марылася, але свой

— ні ў каго не заваяваны, ні ў каго не адабраны, што яскрава засведчыла наша гісторыя.
Было — з'яўляліся ў гэтым доме няпрошаныя госці, што імкнуліся не проста пацясніць, а з цягам часу і выжыць гаспадароў, ператварыўшы іх у бязмоўных паслугачоў сваёй волі. Было — панавалі ў ім чужыя, рабаўніцкія законы, якія забаранялі гаспадарам гаварыць, думаць, жыць па-свойму — так, як дзяды і прадзеды жылі. Але, захаванае дзе-небудзь у кутку, за бажніцаю, а то і проста ў песні, у простай калыханцы, пачутай ад бабкі ці прабабкі, выжывала слова. Але зноў і зноў то адзін, то другі хто задумваўся пра лёс зямлі і свой уласны лёс, спрабуючы адшукаць тую спадчынную сцежку, што выводзіла з мінулага стагоддзе за стагоддзем і, нягледзячы ні на што, не гублялася, не згубілася і гукае далей. І зноў, кожны раз, з кожным нараджэннем дзіцяці, нібыта наноў адраджаўся дух старога дому, каб удыхнуць у немаўля мужнасць жыць, і выжыць, і з годнасцю несці сваё імя.
Крывіч, ліцвін, беларус... Імя давала гісторыя, і заўсёды на славянскіх прасцягах прамаўлялася гэтае імя, нярэдка пагарджанае дужымі свету гэтага, з прыхаванаю, а то і непрыхаванаю павагаю: можна было спаліць, вытаптаць гэтыя нівы, спаліць, струшчыць капытамі або коламі, змешваючы з палітым крывёю пяском сам дом, а жыццё ў ім упарта адраджалася, стаптаныя нівы адраджаліся новым жытам, дом на руінах і папялішчах узводзіўся наноў, і хутка ў яго сценах, перш нягучна, а потым усё грамчэй, усё смялей пачынала гучаць родная песня. Прыгадайма, колькі разоў у пакутнай нашай гісторыі гэта паўтаралася!
Не, хто б і што б сёння не казаў, з простай недасведчанасці ці з-за палітычнай кан'юнктуры спасылаючыся на тое, што Беларусь на працягу большай часткі сваёй гісторыі была чымсьці накшталт глухой правінцыі Польшчы, Літвы або Расіі, адно тое, што яна стаіць, дзе стаяла, і каторы ўжо раз імкнецца вярнуць сваё гістарычнае аблічча, гаворыць само за сябе.
Незалежнасць — дар не палітыкаў, добрых ці кепскіх, як часта даводзіцца гэтымі палітыкамі свядомаму і несвядомаму люду, гэта — дар нябёсаў, дар Усявышніх Сілаў, які не бывае нясвоечасовым ці незаслужаным. Яго, гэты дар, можна прыняць — і тады даражыць ім, як самым каштоўным у сваім жыцці, а можна і не прыняць — але тады не скардзіцца на долю і не

жалкаваць аб страчаным.
„Беларусь? А што гэта такое? Гэта нагадвае чорную дзірку Еўропы“, — прыводзіла неяк газета „Вашынгтон пост“ словы аднаго з заходніх палітолагаў, і супрацьпаставіць сказанаму можна толькі саміх сябе — свае перакананні, свае веды былога і цяперашняга, сваю волю да пераадолення новых цяжкасцяў і новага скепсісу ў адносінах да нашае будучыні. Скепсіс, які выказваецца не толькі заходнімі ці ўсходнімі палітыкамі і палітолагамі, але і намі самімі, маўляў, ня трэба напружвацца — ад дабра дабра не шукаюць... І не, каб успомніць старую, пакінутую нам вякамі мудрасць, што той, хто не шукае, звычайна нічога і не знаходзіць — ні для сябе, ні для будучыні. Не вазьмуся прадказваць будучыню, хоць і веру ў яе светлае ўвацарэнне недзе там, за намі, за нашымі страхамі і сумненнямі: лёс любога чалавека — і любога народу — *прадвызначаны*, і як бы, якімі пакутамі гэты лёс не зжываўся, ён павінен быць зжыты. Рана ці позна. На стагоддзе раней, на стагоддзе пазней... Мерка тут іншая, зусім іншая! Шлях жа... Шлях на кожным новым павароце лёсу мы выбіраем самі — і плацім, як скрозь, спрадвеку плацілі, за свой выбар спаўна.

Канстанты Гэбэрт
(польскі грамадзкі дзеяч, рэдактар часопіса *Midrasz*):
Ня ведаю такой ідэі
Баюся, што я не змагу адказаць на гэтае пытаньне, таму што я ня ведаю, што такое славянская ідэя і чым яна адрозьніваецца ад раманскай ці германскай.

Сяргей Грабоўскі
(украінскі філёзаф, рэдактар часопіса *Генеза*):
Міт XX стагодзьдзя
Найперш — да ўдакладненьня паняцьцяў. Панславізм, паводле энцыкляпэдычных даведнікаў, — гэта тэорыя ўсеславянскага адзінства ў той або іншай форме. Калі размова ідзе пра такое адзінства, то ў яўнай ці няяўнай форме маецца на ўвазе пэўная місія ўсеславянскае супольнасьці, пэўнае зямное акрэсьленьне славянскае долі. То бок, рэалізацыя пэўнай, прадвызначанай канкрэтнымі дзеяньнямі ідэі. Уласна самое вызначэньне кола

„славянства“ зьдзяйсьняецца на аснове пэўнай ідэі аб „славяніне“ як такім. А з прычыны таго, што працэдура адбывалася ў XIX стагодзьдзі, калі фіхтаўская, шэлінгаўская, гегелеўская філязофская традыцыя зь ейнымі варыяцыямі была папулярнаю ў славянскіх колах (колах, якія ўсьвядомілі сваё славянства), ідэя немінуча мусіла апярэджваць рэчаіснасьць. І да таго ж цягнуць на сабе пэўную місію па рэалізацыі тае ідэі ў агульнай лягічнай сукупнасьці ідэяў ды рэчаў.
Гэтак, ад самага пачатку, з XIX стагодзьдзя (больш раньні Ю. Крыжаніч із сваімі славянскімі інтуіцыямі пачаў лічыцца першым панславістам толькі тады, калі панславізм стаўся агульным фактарам) панславізм = актуальны стан славянскае ідэі, і наадварот, ідэя панславізму — гэта разьвіцьцё тае ідэі. У адначасова рамантычным і пазытывісцкім XIX стагодзьдзі славянская ідэя не змагла праявіцца да канца. З аднаго боку, Аляксандар Пушкін зь яго прагненьнямі, каб „славянскія ручаі ў расейскім зьліліся моры“, зь іншага — украінскія кірыла-мяфодзеўцы з прагненьнем фэдэрацыі раўнапраўных славянскіх рэспублік, цэнтральнаэўрапейскія рэвалюцыйныя рамантыкі 1848 году, якія адмовіліся ад спробы „далучыцца да прагрэсу“ і зьліцца зь „перадавым нямецкім народам“. Таму вельмі хутка вымалёўваюцца групы „добрых“ ды „кепскіх“ славянаў (уласна для саміх прыхільнікаў славянскае ідэі). „Добрыя“ — гэта тыя, хто прагнуў „праваслаўя, самадзяржаўя, народнасьці“, „кепскія“ — гэта тыя, хто жадаў жыць уласным жыцьцём, каб толькі не турбавалі іх сусьветна-гістарычнымі місіямі большага ці меншага кшталту.
Адметна, што ў асяродзьдзі інтэлектуалаў зь ліку „кепскіх“ славянаў сам панславізм практычна зьнік. Ён працягваў жыць толькі там, дзе „добрыя“ славяне з усяе моцы намагаліся ашчасьціць усіх тых, хто адкінуў заганны шлях Захаду ці Ўсходу і ўстаў на ісьцінна славянскія пазыцыі. Пры гэтым меру ісьціннасьці славянскага звычайна вызначалі самі адэпты славянскае ідэі. Гэтак, да канца XIX стагодзьдзя славянская ідэя (той самы панславізм) дажыла, фактычна, у выглядзе сыноніму вялікарасейскае ідэі, ідэі Расейскае імпэрыі як а) вызвольніцы славянскіх народаў ад „няверных“ ды „каталікоў“; б) навучальніцы вызваленых правільнаму ды праведнаму жыцьцю з мэтай іх ачышчэньня ад „скверны“ і пераходу на расейскую мову; в) мэсіі для неславянскіх, але

праваслаўных, а часам і ня дужа праваслаўных народаў (грузіны, грэкі, румыны, армяне ды іншыя), якія супольнымі высілкамі мусілі ўзвысіць Сьвятую Русь як спадкаемніцу Бізантыі, каб залатыя крыжы зазьзялі на купалах Сьв. Сафіі ў Канстантынопалі (з тым, каб, па магчымасьці, працягнуць пераможны марш да Ерусаліму, Індыйскага акіяну і г.д.). Адметна, што практычна кожны вызвалены „ад басурманаў“ славянскі народ раптам выяўляў сваю няўдзячнасьць (баўгары паклікалі на трон нямецкую дынастыю, сэрбы любілі Расею, але яшчэ больш любілі рэзаць суседнія славянскія народы, армяне наракалі, што дзеля карысьці расейская таемная дыпляматыя падзяліла надвая армянскую этнічную ды гістарычную тэрыторыю).

Ці не адзіны вядомы мне прыклад пазытыўнага ўзьдзеяньня панславізму ў ХХ стагодзьдзі быў апісаны Гашкам ва „Ўдалым ваяку Швэйку“. Калі Швэйк, западозраны ў шпегаваньні на карысьць Расеі, трапляе пад арышт да ня менш удалага за яго жандара-вахмістра, абодва, урэшце, назюзюкаліся рабінаўкі ды кунтушоўкі, як швэды, і габсбурскі ротмістар пяшчотна шапоча Швэйку: „Ах ты ж, рыбанька мая славянская“, — і выказвае спадзяваньне, што брат расейскага імпэратара станецца чэскім царом, а сяляне пойдуць з цапамі на Вену, як за часамі гусіцкіх войнаў. Такое своеасаблівае славянафільства цэзарскага вахмістра дае Швэйку магчымасьць, урэшце, працягнуць свой шлях па бязглузьдзі першай сусьветнай вайны замест таго, каб паўстаць перад ваенна-палявым судом (што цікава, асаблівага славянафільства самі чэхі ў тую вайну ня выявілі: Антанта абяцала ім незалежную дзяржаву ажно да Карпатаў, чэскія легіёны і біліся за гэта, у тым ліку і супраць славакаў у 1919 годзе).

Вядома, абазнаная публіка можа прыгадаць, што ў часы другое сусьветнае вайны Сталін арганізаваў Усеславянскі камітэт. Але, па-першае, тое быў ня менш расісцкі орган, чым нацысцкія структуры, бо ён заклікаў да барацьбы ня супраць таталітарнага сацыялізму, а супраць немцаў як такіх („Убей немца!“). Па-другое, згаданы камітэт існаваў у якасьці простай дэкарацыі і не замінаў НКУС зьнішчаць на „вызваленых“ польскіх землях байцоў Арміі Краёвай, ня кажучы ўжо пра ўдзельнікаў некамуністычнага руху супраціву абодвум таталітарызмам ва Ўкраіне ды Беларусі. Па-трэцяе,

„славянафільства“ ў сталінскім варыянце вельмі хутка дайшло да ўзроўню „России — родины слонов“, на тым яго ўяўны прагрэсізм і скапуціўся. Пасьля званьне „славянафіла“ аўтаматычна ператварылася ў званьне антысэміта, а таксама найлюцейшага ворага „полячишек, хохлов и бандер“.
У позьнеСССРаўскія часы славянская ідэя змагалася з савецкаю. Як заўсёды, ад змаганьня двух ідыятызмаў выйгравалі нармальныя людзі. Зьявілася такая-сякая культуралягічная ды гістарычная (а часам і мастацкая) літаратура пра больш-менш рэальную („нармальную“) гісторыю расейцаў, а бывала, і ўкраінцаў зь беларусамі. Адэпты ж савецкае ідэі кінулі ў бой набыткі эўрапейскае, так званае „дэмакратычнае“ думкі (там таксама было нямала сапраўды цікавага). Памятаю, як навуковую дыскусію пра „азіяцкі спосаб вытворчасьці“ праціўнікі рэжыму ў абодвух яго вымярэньнях — савецкім і вялікарасейскім — ператварылі ў выкрываньне бязглуздасьці імпэрскае дзяржавы з дужа знаёмымі рысамі.
Аднак значная частка інтэлектуалаў шчыра прасякнулася славянскай ідэяй, бачачы ў загубленай бальшавікамі (жыдакамуністамі, якія на практыцы ажыцьцявілі завезеную з Эўропы дактрыну) „сьвятой Русі“ ўвасабленьне ўсіх магчымых ідэалаў. Гэтаму спрыяла паступовая і частковая легалізацыя расейскай хрысьціянскай філязофіі ды расейскай некамуністычнай культуры ХХ стагодзьдзя (у той час, як, скажам, творчасьць украінскіх сацыялістаў В. Віньнічэнкі ці М. Грушэўскага лічылася „буржуазна-нацыяналістычнай“).
Прытым аднаўленьне тых ідэалаў уважалася магчымым праз паступовую „лібэралізацыю“ рэжыму, яго „дэкамунізацыю“ ды „ўкараненьне ў расейскі грунт“. На гэтым шляху былі бясспрэчныя посьпехі. У школьным курсе гісторыі ўсё, што зьвязвалася зь Вялікарасеяй, прагалошвалася прагрэсіўным, што ішло насуперак ейным інтарэсам — рэакцыйным.
Штодалей пан-руса-славізм усё больш ператвараўся ў афіцыйную ідэалёгію. У 1979 годзе сакратар ЦК КПСС Суслаў нават прапанаваў праект ліквідацыі „нацыянальных рэспублік“ і пераходу да чыста абласнога падзелу СССР. Праект быў адхілены палітбюром як „заўчасны“. Але канцэпцыя „збліжэньня і зьліцьця нацыяў“, татальнага панаваньня расейскае мовы (рэальна — яе савецкага сацыялекту), „поўнага і канчатковага вырашэньня нацыянальнага пытаньня“

дамінавала і ў „навуковым камунізьме“, і ў камуністычнай практыцы. Адметна, што нікога ня кідалі ў мардоўскія лягеры за „расейскі буржуазны нацыяналізм“, што ніводзін зь дзеячоў расейскае культуры, стасуючыся зь іншаземцамі, не пярэчыў, калі СССР клікалі „Расеяй“.
За часамі Андропава-Чарненкі ды аўганскае вайны славянская ідэя ды панславізм знаходзілі ўсё большае ўвасабленьне ў савецка-расейскім нацыянал-сацыялізьме. Але тут наляцела перастройка і на нейкі час скаламуціла лёгіку падзеяў.
У постсавецкім сьвеце ўсё стала на сваё месца. Расейская Фэдэрацыя і на афіцыйным узроўні, і ў мэнтальнасьці сваіх грамадзянаў зьяўляецца спадкаемніцай СССР. „Лица кавказской национальности“ праваахоўнымі органамі Масквы лічацца грамадзянамі другога гатунку. Як і „хахлы“.
Незьлічоная колькасьць інтэлектуальных вымаганьняў маскоўскай эліты абгрунтоўвае існаваньне сусьветна-гістарычнай змовы, ахвяраю якой сталася Расея, ды варыянты пераадоленьня гэтай змовы. Менавіта варыянты. „Лібэралы“ Яўлінскага і „лібэральныя дэмакраты“ Жырыноўскага разыходзяцца хіба ў дэталях. Толькі тры дэпутаты расейскай Дзяржаўнай Думы прагаласавалі супраць ратыфікацыі дамовы аб стварэньні расейска-беларускага саюзу. Хоць любы сапраўдны дэмакрат (няхай і прыхільнік такога саюзу) мусіў галасаваць катэгарычна супраць ужо таму, што нельга падпісваць дамову зь нелегітымным прэзыдэнтам-дыктатарам. І з маральнага боку гэта недапушчальна, і з прагматычнага (ува што выліўся для Францыі ды Вялікабрытаніі Мюнхен?), і зь юрыдычнага (усе структуры ўлады ў Беларусі на сёньня нелегітымныя, „канстытуцыя“ ня ёсьць прававым дакумэнтам, таму, як кажуць, могуць быць непрыемнасьці).
Цікавая рэч: ва Ўкраіне практычна ўсе прыхільнікі „славянскага адзінства“ ёсьць або непрыхаванымі камуністамі, або нэакамуністамі з розных „парцеек“ тыпу РУС, „прагрэсіўных сацыялістаў“ і гэтак далей. Ёсьць і непрыхаваныя нацысты — Славянская партыя. Хаця якая розьніца? Для ўсіх галоўнае — таталітарна-сацыялістычная звышдзяржава із сталіцаю ў Маскве. Як зазначыў аўтару гэтых радкоў асабіста кандыдат у прэзыдэнты Ўкраіны, лідэр КПУ Пятро Сіманенка, „нас аб’ядноўвае тое, што ўсе мы славяне, праваслаўныя, маем свой духоўны цэнтар — Маскву, у нас свая цывілізацыя, свая

культура, адрозная ад іншых“.
Трапляюцца і незьлічоныя быццам бы лібэральныя прыхільнікі зьліцьця ва ўсеславянскім (дакладней, расейска-ўкраінска-беларуска-сэрбскім) экстазе. Было такое аб’яднаньне СЛОН. Атрымала на парлямэнцкіх выбарах менш за паўадсотка галасоў. А як прыглядзецца ўважлівей да кіраўніцтва аб’яданьня — і там альбо былыя спэцыялісты савецкіх „органаў“, альбо сёньняшнія кадравыя супрацоўнікі маскоўскіх спэцслужбаў (але з рэпутацыяй „інтэлектуалаў“). Але несьвядомае грамадзтва не разумее „лібэральнага“ ўсеславянскага нацыянал-сацыялізму. Яму патрэбная шчыра расейска-савецкая постаць (незалежна ад этнічнага паходжаньня, дарэчы). Сталін, Лукашэнка, Жырыноўскі, хто там яшчэ?
Вынікае, што да канца XX стагодзьдзя славянская ідэя завершыла свой інтэлектуальны паход. У наступным веку яна магчымая хіба што ў выглядзе „міту XX стагодзьдзя“, на ўзор таго, што Розэнбэрг з Гёбэльсам змалявалі для арыйцаў.
А такая трансфармацыя небясьпечная і падобнымі практычнымі наступствамі. Як для носьбітаў міту, так і для іхных блізкіх ды найаддаленейшых суседзяў.

Аксана Забужко
(украінскі філёзаф і літаратуразнаўца):
Ня веру ў групавыя ідэнтычнасьці

Я ня веру ў славянскую ідэю, славянскую ідэнтычнасьць. Я веру ў нацыянальныя ідэнтычнасьці, а не групавыя. Групавыя ідэнтычнасьці ўзьнікаюць пры слабасьці нацыянальных ідэнтычнасьцяў — славянскіх, раманскіх ці нават скандынаўскіх. Ад недааформленасьці славянскіх народаў славянская ідэя ўзьнікла ў XIX ст. — і дзеля гэтага яна адразу мела нячысты прысмак, якога дагэтуль не пазбылася. Якая будзе стаяць ідэнтычнасьць за культурна аб’яднанаю Эўропай — гэта пытаньне не XXI, а XXII стагодзьдзя. Галоўнае сёньняшняе пытаньне — пытаньне аслабленасьці нацыянальнай ідэнтычнасьці і страху заблудзіць у аб’яднанай Эўропе. Ён ёсьць у французаў, нарвэжцаў, датчанаў. Пытаньне аслабленасьці нацыянальнай тоеснасьці актуальнае і для нас.

Віталь Панамароў
(украінскі крытык і публіцыст)
Панславізм паходзіць з протаславянскае еднасьці
Сучасны панславізм паходзіць зь еднасьці протаславянскае супольнасьці, якая ўжо ў IV стагодзьдзі з-за навалы готаў пачала распадацца на асобныя этнасы. *Saqlabia* (*Саклабія*) — так у VIII—IX стагодзьдзях называлі славянскія землі на ўсход ад Эльбы, адкуль нявольнікаў-славянаў вывозілі на эўрапейскія ды азіяцкія рынкі Волгаю-Донам, тым *Nahr-as-Saqaliba* (*Галоўны шлях рабоў*) арабскіх крыніцаў. Нездарма ў 1895 годзе Лэся Ўкраінка назвала свой верш даўняй лацінскай прыказкай „Slavus — sclavus“ („Славянін — раб“).
Будучае атаясамленьне славянаў з расейцамі ўпярэдзіў яшчэ „Гусьцінскі летапіс“, заўважыўшы, што „славяне не такія злыя былі, як масхіны“. Прапанаваны яшчэ Геркелем, тэрмін *панславізм* і сёньня досыць эфэктыўна „працуе“, не зважаючы на свой паважны век (ажно ад 1826 году!), што сьведчыць пра яго інструмэнтальны характар ды добрую прыдатнасьць да патрэбаў расейскае дзяржавы. Славянскі фундамэнталізм ёсьць аднаяйкавым блізьнюком нямецкага нацызму: аншлюс Аўстрыі знайшоў сваё адлюстраваньне ў аншлюсе Беларусі, абарона судэцкіх немцаў — у абароне „расейскамоўнага насельніцтва“, „сусьветная жыдоўская змова“ ператварылася ў подступы ісламскага тэрарызму, ліквідацыя негістарычных народаў сёньня называецца „зачысткай ад іншародцаў“, Бабін Яр — горадам Джахар-Кала, а ўльтыматум нацы „жидам города Киева“ цяпер гучыць цалкам інтэрнацыянальна: „Жители города Грозного!“.
І штораз размовы пра славянскае адзінства ды пра перавагі славянаў над „варожым Захадам“ сыгналізуюць сьвету пра намер Расеі ўстанавіць супольную мяжу яшчэ з адной краінай.

Алег Трусаў
(кіраўнік Таварыства Беларускай Мовы):
Панславізму няма месца
Я шчыра веру, што на сёньня ніякага панславізму ўжо не існуе, ідэя аб ім ледзь ліпее. Увогуле ж, панславізм ніколі ня быў нічым іншым, як палітычным абгрунтаваньнем экспансійных

памкненьняў Расеі ў заходнім ды паўднёвым кірунку. Ён напраўду існаваў толькі ў мінулым стагодзьдзі, калі Расея вызваляла ад турэцкага прыгнёту паўднёвых славянаў, югаславаў ды баўгараў. Дый тое было ня болей, чым прыкрыцьцём: вызваляючы Баўгарыю ад захопнікаў, Расея прабівала сабе шлях да Баспору ды Дарданэлаў, гэта не сакрэт. Апагеем жа панславісцкай палітыкі для мяне зьяўляецца ўдзел Менскага палку ва ўзяцьці Шыпкі, дзе амаль усе яго ваяры і палеглі. Як напамін аб тых падзеях стаіць цяпер на Вайсковых могілках царква Аляксандра Неўскага. На тым, дарэчы, панславізм і скончыўся, бо ўжо пад час першай сусьветнай вайны Баўгарыя выступіла супраць Расеі, прыняўшы бок Аўстра-Вугоршчыны ды Нямеччыны. І цяпер ён выяўлены хіба што ў постімпэрскіх амбіцыях расейскіх палітыкаў. Што ж тычыцца Сэрбіі, то яны імпэрыялісты іншыя, малыя, калі так можна сказаць. Поўная ж адсутнасьць будзь-якой рэальнай падтрымкі панславісцкіх ідэяў у іншых народаў выявілася ў разводзе Чэхіі ды Славакіі, хоць розьніца паміж двума народамі зусім невялікая, дый канфліктаў сярод іх ніколі не было, хоць славакі таксама лічаць чэхаў гэткімі малымі імпэрыялістамі. Я калі быў у Славаччыне, размаўляў з тамтэйшымі парлямэнтарамі, то яны мне з гонарам даводзілі, што лепей патрапім, маўляў, на колькі год у горшыя эканамічныя ўмовы, але мова нашая не загіне. Таму ў XXI ст. панславізму месца няма, празь 10—15 гадоў ён цалкам адыдзе ў нябыт, і ад яго застануцца, магчыма, якія кволыя рэмінісцэнцыі. Што да Ўкраіны, яна, нягледзячы на буйныя памеры і колькасьць насельніцтва, ня зможа — у блізкі час, прынамсі — ператварыцца ў дзяржаву імпэрыялістычнага кшталту, бо ёй замінае цэлы шэраг абцяжарвальных фактараў: вялізная маса расейцаў, крымская праблема. Сёньняшнія ж закіды расейскіх палітыкаў выглядаюць як камэдыя ці фарс. І ніякіх радыкальных зьменаў з прыходам Пуціна не адбудзецца, бо ён сам сказаў, што галоўнае для яго — захаваць цэласнасьць краіны. Ён мне нагадвае аднаго з апошніх рымскіх імпэратараў, Траяна, напрыклад. Такім быў і Ціта: пакуль быў жывы, трымалася і фэдэрацыя, а як памёр, дык усё ляснулася. Пуцін проста абавязаны выйграць вайну ў Чачні, калі хоча пазьбегнуць развалу імпэрыі. Пра які панславізм можна казаць, калі ў Расеі такое слабое, дэзарганізаванае войска? Каб там

ваявалі беларусы ды ўкраінцы, то менавіта іх бы кінулі на штурм Грознага, і яны б яго ўзялі, як калісьці Віцебская дэсантная дывізія захапіла Кабул. Але той барбарскай сілай, якая зруйнуе маскоўскі Трэці Рым, будзе, на маю думку, зусім не Каўказ, а Сібір, якая можа памкнуцца да незалежнасьці, адкалоцца. Ужо сёньня назіраюцца сэпаратныя працэсы: узгадайце такіх палітыкаў, як Росель, Наздраценка, Лебедзь. Па лёгіцы, можна гаварыць пра два варыянты разьвіцьця падзеяў. Альбо Масква дасьць Сібіры ды Ўралу шырокую аўтаномію, маштабам падобную да правоў амэрыканскіх штатаў, альбо праз 20—50 гадоў насельніцтва тамтэйшых абшараў пойдзе шляхам жыхароў ангельскіх калёніяў і выйдзе са складу Расеі. І тады дакладна панславізму канец, а Расея станецца нечым накшталт цяперашняй Вялікай Брытаніі ў этнічных межах: дэмакратыя калісьці мусіць запанаваць і там.

Юрась Хадыка
(прафэсар, гістарычны лідэр Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне“):
Нежыцьцяздольная абстрактная палітыка

Увогуле, я не магу сабе ўявіць славянства аб’яднаным, на ўзор таго, як гэта зрабілі краіны Эўропы, бо там яны злучыліся не па пляменных прыкметах і не на ідэалягічнай аснове. Для іх галоўнай была справа стварэньня адзінае гаспадарчае прасторы і забесьпячэньня стабільнасьці на кантынэнце. Славяне ж падзеленыя ня толькі нацыянальна, але і паводле веравызнаньня: паспрабуйце сабе сёньня ўявіць аб’яднаных палякаў-каталікаў ды праваслаўных расейцаў. Я, прынамсі, не ўяўляю. Аднак панславісцкіх захадаў варта чакаць, і ня толькі ад расейскіх палітыкаў, а і ад Лукашэнкі, у першую чаргу. Падобная місія Мілошавіча была ня больш чым гульнёй, для югаславаў прымальнейшаю была палітыка, што праводзілася маршалам Ціта.
Урэшце, аб’яднанае славянства — абсалютна нежыцьцяздольная і цалкам абстрактная ідэя.

Кшыштаф Чыжэўскі
(польскі культурны дзеяч, рэдактар часопіса *Krasnogruda*)

Мае пэрспэктыву, калі адмовіцца ад выключнасьці

Я думаю, што найперш, каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба троху азірнуцца назад, да пытаньня славянскай ідэі, бо маё стаўленьне да гэтай ідэі амбівалентнае, з шмат якіх прычынаў. Гістарычны кантэкст, у якім яна зьяўлялася, часта прыводзіў да таго, што сама ідэя ўсё больш і больш аддалялася ад маіх перакананьняў, бачаньня рэчаў. На мой погляд, кожная ідэя, асабліва такая, якая абымае вялікую культурную прастору, і кожная ідэя, якая гаворыць пра аб'яднаньне, якая аб'ядноўвае больш, чымся адну нацыю, адну дзяржаву, стаецца небясьпечнай у той момант, калі яна становіцца інструмэнтам мацнейшага і можа ператварыцца ў карту, дзякуючы якой разыгрываецца пэўная палітычная, культурная стратэгія. Тое ж самае мы бачым і ў выпадку славянскай ідэі, братэрства славянаў. Ёсьць, безумоўна, нешта ў ёй прывабнае — той момант, калі яна была моцна артыкуляваная ў эпоху рамантызму і якраз на той хвалі братэрства, якая ўзьнялася пасьля Французскай рэвалюцыі, братэрства народаў. Гэта была ў добрым сэнсе наша прапанова ў гэтай частцы Эўропы, накіраваная на братняе змаганьне і салідарнасьць у розных сытуацыях. Тым ня менш, розьніца паміж ідэямі Французскай рэвалюцыі і славянскай ідэяй палягае ў тым, што ў першым выпадку гэтая ідэя не набыла пляменнай або нацыянальнай прыналежнасьці, пакідаючы чалавека больш вольным у выбары сваёй прыналежнасьці або прыняцьці гэткіх ідэяў ці вартасьцяў. Славянская ідэя мае, аднак, такую „прывязку" да крыві, да нацыянальнасьці, да паходжаньня, што можа перашкаджаць і перашкаджала, робячыся часам крыніцай небясьпечных ідэалёгіяў або небясьпечных палітычных гульняў. На маю думку, гэта галоўная слабасьць славянскай ідэі, якая палягае якраз у тым, што яна гэтую ідэю задзіночаньня, братэрства, супольнага будаваньня абмяжоўвае або „завязвае" на паходжаньні, нацыянальнай або пляменнай прыналежнасьці. Тым больш, што пачуцьцё гэтай прыналежнасьці паміж намі, славянамі, вельмі дыфэрэнцыяванае, яно ня ёсьць нечым жывым, моцным і трывалым. Я ня бачу адмысловых прычынаў, каб больш аб'ядноўвацца з баўгарамі, чым з вугорцамі, якія не належаць да славянскай супольнасьці, але зьяўляюцца нашымі блізкімі суседзямі, сплеценымі рознымі іншымі сувязямі — культурнымі і гістарычнымі — з намі і нашай часткай Эўропы.

Гэта, такім чынам, заўсёды будзе ствараць нейкую перашкоду, і я на гэта буду зьвяртаць увагу. У мяне няма такой патрэбы апынацца з боку гэткай прыналежнасьці, *stricto* славянскай, якая б апэлявала якраз да паходжаньня. Чаму я гавару аб гэтым? Таму што зазвычай гэткая прыналежнасьць або гэткае пачуцьцё лучнасьці не зьяўляецца такім моцным, але здараюцца моманты, калі такое неспадзяваным чынам мае месца альбо дае аб сабе ведаць якраз у кепскім сэнсе. Калі, напрыклад, разгараецца вайна ў Косаве, то рэакцыю сярэднеэўрапейскіх краінаў можна прасачыць таксама з гледзішча славянскай ідэі і пачуцьця прыналежнасьці, салідарнасьці ці братаньня з тым бокам у гэтым канфлікце, для якога гэткае братаньне вынікае ня з выбару вартасьцяў, не з ацэнкі пазыцыі або ацэнкі паводзінаў, а з славянскага братэрства. У гэтым кантэксьце мне гэта вельмі перашкаджае. Я мяркую, што такая нэгатыўная рэакцыя супраць інтэрвэнцыі ў Косаве, напрыклад, у Чэхіі, у той пэрыяд, калі пачалася вайна, і такая некрытычная часам падтрымка сэрбаў у гэтым канфлікце, без зразуменьня альбанскага боку, у вялікай меры вынікае з таго, што Чэхія была і застаецца дагэтуль пад вялікім уплывам славянскай ідэі і панславізму, і вельмі шмат людзей там успрымаюць гэта ў гэткіх катэгорыях, г.зн. нашыя браты там уступілі ў канфлікт і трэба заняць іхны бок ды бараніць іх, ня надта паглыбляючыся ў саму сутнасьць справы — у тое, хто там сапраўды вінаваты і хто нясе большую маральную адказнасьць за тое, што там дзеецца. Гэта дакладна такая сытуацыя, у якой такога роду лучнасьць, калі яна стаецца прыматам у ацэнцы сапраўднасьці, можа прыводзіць да розных вельмі небясьпечных вычварэньняў і перакручваньняў. Перад намі пастка: калі б у будучай аб'яднанай Эўропе славянскія народы кансалідавала паміж сабой пачуцьцё некрытычнай абароны адзін аднаго, не зважаючы на іншыя крытэры і ўзаемазалежнасьці, гэта было б вельмі небясьпечным і стварыла б цяжкую для нас сытуацыю. Нам было б цяжэй удзельнічаць у працэсе аб'яднаньня Эўропы, гэта стварала б своеасаблівы анкляў, нейкую адметнасьць, заснаваную на лучнасьці крыві, лучнасьці паходжаньня, якія ў будучыні маглі б прывесьці да нэгатыўных зьяваў у нашых краінах і аддаліць нас ад працэсу такога здаровага аб'яднаньня ў Эўропе.
Гэта адзін небясьпечны бок, укарэнены ў славянскай ідэі, і для

такіх народаў, як, напрыклад, польскі, яшчэ ў гэтым кантэксьце заўсёды будзе мець месца перасьцярога, ці ня будзе гэтая ідэя зноў інструмэнтам расейскага, напрыклад, дамінаваньня ў гэтай частцы Эўропы, як гэта было ў мінулым. Расея вельмі моцна выкарыстоўвала гэтую карту і, у вялікай ступені, надоўга адштурхнула палякаў ад славянскай ідэі. Гэта таксама абумовіла тое, што палякі — якраз з гістарычных прычынаў — увогуле адчуваюць вельмі слабую лучнасьць з гэтай ідэяй. Але ёсьць яшчэ іншыя аспэкты і справы, г.зн. гэтая ідэя спараджае пэўнае паразуменьне паміж намі па-за межамі нашых нацыянальных дзяржаваў, а таксама пэўны ідэал братэрства, пэўны абавязак да сваіх суседзяў-пабраціmаў. Калі падысьці да славянскай ідэі не такім заідэалягізаваным чынам і абсалютна, г.зн. робячы гэтую ідэю, так сказаць, абсалютным прыматам, калі падысьці да яе як да аднаго з элемэнтаў аб'яднаўчага працэсу, да якога можна апэляваць пры аб'яднаньні ў добрым значэньні гэтага слова, то, думаецца, яна можа зусім зьмяніць сваё аблічча і стаць нечым жаданым і патрэбным. Выкарыстоўваючы, але — падкрэсьліваю — разумным чынам, без абсалютызацыі, без выключнасьці, забясьпечанай толькі для такога роду лучнасьці ці прыналежнасьці, выкарыстоўваючы, такім чынам, існуючыя сувязі, выкарыстоўваючы пабраціmства, блізіню, абумоўленую пэўнага роду мэнтальнасьцю і нейкім духоўным падабенствам, нешта мэтафізычнае, што можа існаваць у гэтым усім, то з гэтага могуць паўстаць вельмі добрыя вынікі для будучай аб'яднанай Эўропы. Парадаксальна, але тады гэтая славянская ідэя, саступаючы поле іншым вартасьцям, якія, можа, яшчэ больш павінны цаніцца, атрымае дадатковую вартасьць і можа ізноў стаць здаровым інтэграцыйным фактарам. Бо — і гэта цікава — калі б удалося абараніць нейкую славянскую адметнасьць у гэтай інтэграцыі ці нейкую славянскую спэцыфіку, то гэта было б вельмі карысна пры аб'яднаўчым працэсе, г.зн. дадало афарбаваны ў іншы колер тэмпэрамэнт, элемэнт ці частку мазаікі. Таму шкада было б страціць зразуметую ў такім сэнсе славянскую ідэю і ўвогуле славянскасьць ува ўсёй гэтай сытуацыі. Аднак, калі гаварыць пра працэс аб'яднаньня і пра будучую аб'яднаную Эўропу, то якраз такі славянскі кампанэнт, а не нацыянальны, быў бы вельмі патрэбны. У Эўропе сёньня шмат гавораць пра

разнароднасьць, пра абарону адметнасьці на рэгіянальным альбо нацыянальным узроўні, г.зн. на ўзроўні абароны прыгнечаных нацыянальных моваў ці такіх рэгіёнаў, як Каталёнія альбо Далматыя і Валёнія. Ніхто, тым ня менш, не гаворыць пра большыя супольнасьці, што існуюць на духоўнай мапе Эўропы. Яны маюць сваю адметную духоўнасьць, сваю своеасаблівасьць. Цікава, што гэтая духоўнасьць і своеасаблівасьць ужо заснаваная на інтэграцыі, г.зн. на нейкім спалучэньні, на нейкім аб'яднаньні ў абсягу гэтай своеасаблівасьці.

Каб абараніць у будучыні славянскую ідэю, то, з аднаго боку, трэба стварыць шанцы для збліжэньня ці інтэграцыі тых людзей, якія прызнаюць сябе славянамі і будуць выяўляць сваю прыналежнасьць да славянаў. Але гэтая інтэграцыя мае сэнс толькі для таго, каб падкрэсьліць, увыпукліць адметнасьць, каб падкрэсьліць іншую культурную ці духовую прастору на мапе Эўропы. Такая пэрспэктыва нашага ўзаемапаразуменьня зь беларусамі, расейцамі, украінцамі, з баўгарамі, з славакамі, з сэрбамі, харватамі, як мне здаецца, вельмі цікавая. Падмуркам гэткага ўзаемапаразуменьня будзе наша суадчуваньне і суперажываньне, супольны акт пабудовы, для таго, каб у працэсе эўрапейскай інтэграцыі выявіць сваю адметнасьць, не сваю польскую адметнасьць, не сваю чэскую адметнасьць, а сваю славянскую адметнасьць.

Каб гэта ўдалося, каб такая пэрспэктыва спраўдзілася, славянская ідэя павінна адмовіцца ад пазыцыі выключнасьці і дамінаваньня. Яна павінна стаць адным з розных фактараў гэтага працэсу інтэграцыі, не найважнейшым. Яна ня можа засланяць іншых маральных і духоўных вартасьцяў, вольных і незалежных ад сваяцтва, заснаванага на крыві ці паходжаньні.

Сакрат Яновіч
(беларускі культурны і грамадзкі дзеяч, кіраўнік культурнага асяродку *Villa Sokrates*)
Дзьве славяншчыны

Адказу на гэтае пытаньне трэба шукаць у гісторыі: хто, дзе і з кім жыў? Маленечкая Славенія, што ў Юлійскіх Альпах, ужо дасягнула заходніх стандартаў, але яна вякамі жыла ў сымбіёзе з Аўстрыяй ды прывэнэцкай Італіяй. Няшмат адстае ад Славеніі

менавіта Чэхія, тысячагадовае эўрапейскае каралеўства і былая індустрыяльная апора Аўстра-Вугорскай імпэрыі. Значна аддаленая цывілізацыйна Славакія, якая ня столькі сама дабілася незалежнасьці, колькі якраз выпхнулі яе ў незалежнасьць самі чэхі, пазбываючыся такім чынам лішняга ім цяжару адсталай правінцыі, ад якое слабы даход (вытворчасьць цяпер вырашаюць не працоўныя рукі, а тэхналёгіі). За славенцамі і чэхамі на трэцім месцы Польшча, якую некалі пацягнула ў яму звышстогадовая расейская няволя. Вось валодала Польшчай Расея, сама ж будучы на шэрым канцы Эўропы, але затое з найвялізьнейшай арміяй... На ўзроўні Польшчы прыблізна знаходзіцца Харватыя, што побач Славеніі. Харваты ўсё ж апынуліся былі ў Аўстрыйскай імпэрыі, якая расьселася важна ў цэнтры Эўропы. Рэшту балканскіх славянаў гнулі да зямлі барбарскія туркі; македонцаў аж да пачатку нашага веку. Гэта ўсё і тлумачыць.
Постсавецкія славяне не маглі пачувацца лепей ад тых жа македонцаў, свой лёс каратаючы ў імпэрыі, найадсталай, у якой 80 % марнага агульнанацыянальнага даходу прызначалася на патрэбы арміі ды ваеннага комплексу (у ЗША гэты паказьнік вагаўся каля 10—15 %, а цяпер менш).
Рэзюмэ такое: тыя славяне, якія ўвесь час жылі ў Эўропе, хутка ў яе і вернуцца, успрымаючы славянскі камунізм як кароткі паганы эпізод. Рэшце славянаў я прарочу біблейскія сорак гадоў выхаду жыдоў з эгіпэцкай няволі. Вырашае гісторыя, як сёньняшні дзень вынікае з учорашняга.

У наступным нумары:
апытаньне ARCHE „**Ці ёсьць Рэспубліка Беларусь незалежнай дзяржавай?**“

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**

Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000
славянская ідэя

Славянская Еўропа

Большасць нашых людзей аб славянах ведае хіба з курсу гісторыі савецкай школы, дый тое ў многіх выветрылася з галавы. Справа ўскладняецца і тым, што ў наш час на карце Еўропы з'явіўся шэраг новых славянскіх краінаў, што нават прыводзіць да блытаніны.
Паводле найбольш распаўсюджанай тэорыі, да VI ст. н.э. славяне жылі на абмежаванай тэрыторыі на поўнач і паўночны ўсход ад Карпатаў. Гэта тая частка агульнай радзімы балтаў і славян, якая была захоплена скіфамі паміж 1000 і 500 г. да н.э. Са сваёй тэрыторыі славянскія плямёны сталі рассяляцца ў розных кірунках. Там, куды яны прыходзілі, звычайна ўжо жылі іншыя народы. У выніку змешвання і ўзаемадзеяння іх моваў і культураў з'явіліся асобныя славянскія народы, адрозненні паміж якімі былі ў многім абумоўленыя папярэднікамі славянаў у гэтых месцах.
Часта здаралася, што славянскія прышэльцы былі даволі нешматлікія, але з розных прычынаў славянская мова шырока распаўсюджвалася спачатку ў гарадах і іх ваколіцах, а пасля і на больш значнай тэрыторыі.

Македонцы
Найчасцей пры назве „Македонія" прыгадваюць Аляксандра Македонскага, хаця ён жыў гадоў за тысячу да таго, як продкі славянаў-македонцаў у VI—VII стст. н. э. прыйшлі на Балканы, дзе ўжо жылі грэкі і ілірыйцы. Моваю тутэйшых славян кіраваліся жыхары горада Салонікі Кірыла (памёр у 860 г.) і

Мятод (памёр у 855 г.), распрацоўваючы славянскі алфавіт. Лічыцца, што Кірыла стварыў глаголіцу, а каля 900 г. на базе грэцкага пісьма ўзнікла кірыліца. Ад старамакедонскай мовы паходзіць царкоўнаславянская мова, якая выкарыстоўваецца ў якасці літургічнай у праваслаўнай царкве ў славянскіх краінах. На гэта часта спасылаюцца балгары, каб даказаць, што іх культура сягае ў даўніну, бо на той час тэрыторыя Македоніі ўваходзіла ў Балгарскае царства.
У канцы XII стагоддзя пачалася экспансія Сербіі на македонскія землі, а неўзабаве Македонія была захопленая Атаманскай імперыяй, у складзе якой заставалася больш за пяць стагоддзяў.
У выніку Балканскіх войнаў у 1912—1913 гг. Македонія была вызваленая ад турэцкага панавання і раздзеленая паміж Грэцыяй, Сербіяй і Балгарыяй. Часткі называліся адпаведна Эгейская, Вардарская і Пірынская. У міжваеннай Югаславіі Македонію называлі Паўднёвай Сербіяй. Рэакцыяй на гэта было адчуванне македонцамі сваёй адметнасці і блізкасці да балгараў. У 1941 г. Македонію занялі балгарскія войскі, што ваявалі ў саюзе з Германіяй і Італіяй. Акупацыйны рэжым пераследаваў праявы нацыянальнай адметнасці, што, у сваю чаргу, дапамагло македонцам адчуць сваю адрознасць ад балгараў.
У пасляваеннай Югаславіі была створаная Македонская рэспубліка, развілася ўнармаваная македонская мова. У Балгарыі шмат гадоў назва Македонія была забароненая, і ўсе размовы пра самабытнасць македонцаў трактаваліся як антыбалгарская інтрыга.
Пасля распаду Югаславіі Македонія (Вардарская) атрымала незалежнасць. Тым часам Грэцыя заявіла, што прызнае Македонію толькі тады, калі яна возьме іншую назву, бо лічыць, што назва антычнай дзяржавы Македоніі належыць выключна да грэцкай спадчыны.

Балгары
У другой палове VI ст. племя булгараў цюркскага паходжання пад кіраўніцтвам хана Аспаруха перасялілася на тэрыторыю Балканскага паўвострава. Булгары заключылі саюз са славянамі, і Аспарух стаў галоўным князем у тым саюзе. Адбываецца змешванне славян і булгараў, у выніку чаго

славяне прымаюць назву булгараў, а булгары — славянскую мову. Так з'явіліся продкі сучасных балгараў.
У пачатку IX ст. Балгарыя была ўжо буйной дзяржавай. Цар Сімяон I далучыў Македонію і Сербію, аднак Сербія аддзялілася ў 930 г. У 1256 г. Балгарыя сама трапляе ў залежнасць ад Сербіі. У 1396 г. гэтыя вобласці захапіла Асманская імперыя. 500-гадовае турэцкае панаванне скончылася ў выніку расійска-турэцкай вайны 1877—1878 гг. Былі нават планы далучэння Балгарыі да Расеі ў якасці Задунайскай губерні. Відаць, помнячы аб гэтым, у абедзвюх сусветных войнах Балгарыя ваявала на баку праціўнікаў Расеі.

Сербы і харваты

Першая харвацкая дзяржава сфармавалася на мяжы VIII—IX стст. на тэрыторыі, якая атрымала назву Далмацінская Харватыя — уздоўж пабярэжжа Адрыятычнага мора. Культура сярэднявечнай Далматыі зазнала вялікі ўплыў заходнееўрапейскіх краін, з якімі падтрымлівалі гандлёвыя сувязі далмацінскія гарады. У пачатку XIII ст. Харватыя страціла незалежнасць, падпаўшы пад уладу Венгрыі.
Сербскія плямёны стварылі свае дзяржаўныя аб'яднанні ў VIII—IX стст. Сербскія княствы ўтварыліся таксама і на тэрыторыі сучасных Чарнагорыі і Герцэговіны. У пачатку XI ст. сербскія абшары падпалі пад уладу Візантыі. У 80-х гадах XII ст. Стэфан Неманя адмовіўся падпарадкавацца Візантыі і стаў на чале аб'яднаных сербскіх плямёнаў.
Яшчэ з X ст. сербы належалі да грэцкай праваслаўнай царквы. У XIII ст. у Босніі і Герцэговіне склалася самастойная хрысціянская царква: яна спавядала вучэнне багамілаў, якое Візантыя лічыла ерэтычным. Царква гэтая праіснавала да сярэдзіны XV ст., да турэцкага заваявання, а пасля многія баснякі-багамілы прынялі мусульманства.
У 1389 г. адбылася бітва на Косавым полі, у якой сербы і баснійцы біліся з туркамі. Большая частка сербаў і баснійцаў загінула, і Сербія трапіла ў залежнасць ад Турцыі. У 1690 г. вялікая колькасць сербаў вымушаная была пакінуць родныя мясціны, перш за ўсё Косаўскі край, і шукаць ратунку ў Ваяводзіне, якая тады належала Габсбургскай імперыі.
Горная вобласць Чарнагорыя яшчэ ў канцы XVIII — пач. XIX ст. вызвалілася ад турэцкага панавання і стала княствам, а затым

незалежным каралеўствам.
У 1850 г. у Вене прадстаўнікі сербаў і харватаў падпісалі пагадненне аб стварэнні адзінай сербска-харвацкай літаратурнай мовы. Сёння гэта адна мова, якой карыстаюцца сербы і харваты. Сербы выкарыстоўваюць кірылічны алфавіт, а харваты — лацінічны.
У 1918 г. у выніку распаду Аўстра-Венгерскай імперыі ўтварылася самастойнае каралеўства Сербіі, Харватыі і Славеніі (з 1929 г. — Каралеўства Югаславія). Кіраўнічыя колы Сербіі мелі тэорыю „інтэгральнага паўднёваславянства“, якая прадугледжвала зліццё нацыяў і культураў у новую этнічную злучнасць.
Пасля другой сусветнай вайны была створаная Югаслаўская федэрацыя, у якой мовы ўсіх народаў Югаславіі прызнаваліся раўнапраўнымі і сталі афіцыйна ўжывацца ў адпаведных рэспубліках. Пасля распаду саюзнай дзяржавы Югаславія ўключае ў сябе Сербію і Чарнагорыю. Чарнагорыя вядзе падрыхтоўку да стварэння незалежнай дзяржавы.

Славенцы
Славенская мова стаіць бліжэй да паўднёва-заходняй групы славянскіх моваў, у якую ўваходзяць чэшская і славацкая мовы. Славенцы аселі на сваёй тэрыторыі ў канцы VI ст. У 626 г. славенскія плямёны ўвайшлі ў заходнеславянскае палітычнае аб’яднанне на чале з князем Само. Пасля распаду гэтай дзяржавы славенцы стварылі ў Карынціі, на тэрыторыі свайго рассялення, самастойнае княства. У час нашэсця авараў яны папрасілі апякунства ў баварскага караля. У 788 г. славенцы апынуліся пад уладай франкаў і ўвайшлі ў склад імперыі Карла Вялікага. У 1282 г. тэрыторыя Славеніі стала належаць да Аўстра-Венгерскай імперыі і была ў яе складзе аж да 1918 г.

Чэхі і славакі
Ратуючыся ад нашэсця авараў у канцы VI ст., славяне прасунуліся на Захад, дасягнуўшы Багеміі. Багемія — даўняя назва Чэхіі — верагодна, паходзіць ад назвы кельцкага племені бояў, якія насялялі Багемію да славянаў. Сучасная Чэхія ўключае ў сябе Багемію (уласна Чэхію) і Маравію.
Калі Візантыя разграміла авараў, военачальнік славянаў Само заснаваў дзяржаву з цэнтрам у Багеміі. У 869 г. на аснове

Маравіі князь Святаполк стварае Вялікую Маравію, куды былі ўключаныя таксама Багемія і заходняя Славакія. Гэты князь спыняе дзейнасць балгарскай хрысціянскай місіі, а ў 885 г. наагул выганяе паўднёваславянскіх царкоўнікаў і аднаўляе даўнейшую паганскую рэлігію. Канец Вялікай Маравіі прыйшоў каля 907 г. у выніку нападу мадзяраў (вуграў).
Пасля падзення Вялікай Маравіі Багемія дасталася нямецкаму каралю Генрыху I. Маравію захапілі палякі, а цераз сто гадоў яе заваявала Багемія. Славакі з 1037 да 1918 г. знаходзіліся ў сферы венгерскага ўплыву. У сувязі з турэцкай пагрозай Славакія разам з Венгрыяй у XVII ст. далучылася да Габсбургскай імперыі.
Карл Маркс у 1848 г. казаў, што чэхі як нацыя вымруць, і Чэхія бачыцца яму ў будучыні толькі як частка германскіх земляў. Тым не менш у 1918 г. была створаная незалежная Чэхаславакія, а ў 30-х гадах Чэхаславакія была адным з вядучых прамысловых вытворцаў свету. У 1992 г. яна раздзялілася на дзве незалежныя дзяржавы — Чэхію і Славакію.

Палякі
Польская дзяржава спачатку ўяўляла сабой саюз некалькіх плямёнаў у басейне Віслы. Першым польскім князем быў Мешка з роду Пястаў. Ён кіраваў у 960—992 гг. як князь Велікапольшчы, Сілезіі, Мазовіі, Куявіі. Ягоны сын Балеслаў I (992—1025) падпарадкаваў сабе Малапольшчу з Кракавам і Памор'е. У 1025 г. ён прыняў тытул караля.
У 1386 г. польскім каралём быў выбраны літоўскі князь Ягайла, які пад імем Уладзіслава II амаль 50 год быў польскім каралём. З таго ж году ўступіла ў дзеянне Крэўская унія паміж Польскім каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім, якая дазволіла аб'яднаць сілы супраць Тэўтонскага ордэну.
У канцы XVIII ст. Польская дзяржава перастала існаваць у выніку трох падзелаў паміж Расеяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Аднавіла сваю дзяржаўнасць пасля першай сусветнай вайны.

Малыя славянскія народы
На поўдні Польшчы, у раёне Катавіцаў, а таксама ў раёне Цешына ў Чэхіі, жывуць *слёнзакі* (сілезцы), яны ўяўляюць сабой этнас, памежны паміж чэхамі і палякамі. *Гуралі* — жыхары гор у польскай частцы Бяшчадаў, іх мова стаіць паміж польскай і

славацкай.
Да паўночна-заходніх моваў, акрамя польскай, належыць *кашубская* мова ў паўночна-заходняй Польшчы, што некалі ўваходзіла ў Заходнюю Прусію.
Мовы слёнзакаў, кашубаў і гураляў часцей разглядаюцца не як асобныя мовы, а як дыялекты польскай.
Лужыцкія сербы
(лужычане) жывуць у Германіі ў ваколіцах гарадоў Котбус і Баўцэн (Будышын), у землях Саксонія і Брандэнбург. Іх мову можна разглядаць як пераходную паміж польскай і чэшскай.

Яшчэ ў X—XII стст. былі вядомыя славянскія дзяржаўныя ўтварэнні, што існавалі на берагах Эльбы. Пазней яны трапілі ў залежнасць ад нямецкіх дзяржаваў і зніклі, а таксама знікла і *палабская* мова, якая была распаўсюджаная на поўначы цяперашняй Германіі.
Цікавае нацыянальнае ўтварэнне *русіны* — невялікі народ, частка якога міграваля з Карпатаў на Балканы ў XVIII ст. (тады і Балканы, і Карпаты былі ў межах адной дзяржавы — Аўстра-Венгрыі). Фактычна гэта змяшанае або пераходнае ўкраінска-славацкае насельніцтва асобных карпацкіх вёсак. Русіны лічаць сябе і сваю мову абсалютна самастойнымі. Частка з русінаў лічыць сябе этнічнай групай украінцаў, а іншыя сцвярджаюць, што яны — „рускія“.

Славяне на ўсходзе
Калі, напрыклад, *гуцулы* — самы вялікі па колькасці карпацкі субэтнас украінцаў — прызнаюць сваю прыналежнасць да ўкраінскага народу, то *бойкі* і лэмкі не толькі ніколі не прызнаюць сваёй „украінскасці“, але і не скажуць свайго саманазову незнаёмаму чалавеку. Пасля другой сусветнай вайны большасць бойкаў і лэмкаў, што жылі ў межах Польшчы, былі гвалтоўна выселеныя польскімі ўладамі са сваіх родных месцаў.
Заходняя частка сучаснай *Украіны* ўваходзіла ў рэгіён першапачатковага рассялення славянаў. Рассяляючыся на ўсход, славяне асімілявалі плямёны рознага паходжання, што насялялі стэпы і лесастэпы, як, напрыклад, полаўцаў і інш. Ад тых плямёнаў засталіся вядомыя шаравары і казацкая прычоска „асяледзец“. Відаць, такое ж паходжанне мелі і даўнейшыя

казакі на поўдні Расеі. У летапісах, якія пісаліся звычайна праваслаўнымі манахамі, полаўцы звaліся „паганымі“. Але навукоўцы схіляюцца да думкі, што полаўцы спавядалі хрысціянства, але не ў візантыйскім, а ў нестарыянскім варыянце, чым і было выклікана варожае стаўленне да іх летапісцаў. У X ст. была створана Кіеўская дзяржава. Кіеўскія князі часта бралі сабе за жонак палаўчанак. Яны ваявалі са сваімі стэпавымі суседзямі, але, урэшце, не больш, чым з суседнімі славянскімі князямі-сваякамі. А вось у 1067 г. адбылася бітва войскаў полацкага князя Ўсяслава Чарадзея і паўднёвых князёў Яраславічаў. Быў разбураны Менск, і паведамленне аб гэтым лічыцца першым упамінаннем аб Менску ў летапісах. Так што ў 1997 годзе мы фактычна святкавалі не 930-годдзе заснавання Менску, а юбілей яго разбурэння.

Хрысціянства ў Кіеў было завезенае з Візантыі ў 988 г. У 1239 г. Кіеўскае княства было заваяванае татара-манголамі, потым з'яўлялася ўладаннем Вялікага Княства Літоўскага. У 1569 г. ВКЛ саступіла Украіну Польскай кароне. У 1654 г. Левабярэжная Украіна далучана да Маскоўскай дзяржавы. Другая частка Украіны адыходзіць да Масквы пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Заходняя Украіна, украінскі П'емонт — толькі ў 1944 годзе. Стабільную сучасную дзяржаўнасць Украіна займела ў 1991 годзе.

У VII—VIII стст. н.э. славяне прыйшлі на тэрыторыю сучаснай *Беларусі*, якая была заселеная балцкімі плямёнамі, роднаснымі продкам сучасных латышоў і літоўцаў. Па звестках антраполагаў, асноўная частка насельніцтва Беларусі захоўвае пераемнасць на працягу 1500—2000 гадоў, з чаго можна зрабіць выснову, што змянілася толькі мова. Ад балтаў засталіся заўважныя сляды ў беларускай мове, назвы рэк і мясцінаў, прозвішчы людзей, многія элементы традыцыйнай культуры. Астраўкі балцкага насельніцтва заставаліся яшчэ да пачатку XX ст. З X ст. вядомае Полацкае княства. У 1230 годзе ўтварылася Вялікае Княства Літоўскае, у 1918 годзе была дэкларавaная незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. На паўночным усходзе свайго рассялення, у Окска-Волжскім міжрэччы, славяне асімілявалі шматлікія вугра-фінскія плямёны: меру, мураму, мяшчэру, эрзянь і інш. Так, некаторыя навукоўцы лічаць, што назва горада Уладзімір паходзіць ад

назвы аднаго з падпарадкаваных плямёнаў (*Влади-Мерь*). У выніку з'явіліся продкі сучаснага *расейскага* народу. Звычайна іх славянізацыя пачыналася з прыняццём хрысціянства, таму ў сучаснай расейскай мове вялікі ўплыў мовы царкоўнаславянскай. У сярэдзіне XIII ст. гэтыя землі былі падпарадкаваныя манголамі. Маскоўскія князі пачалі падпарадкоўваць сабе іншыя паўночна-ўсходнія землі, маючы на гэта дазвол ад манголо-татараў. Гэты працэс працягваўся і пасля таго, як у XV ст. Масква перастала плаціць даніну татарам. Як пісаў Н. Трубяцкой, прадстаўнік эмігранцкай гістарычнай школы еўразійцаў, папулярнай цяпер у Расеі: „*Расейскі цар стаў спадкаемцам мангольскага хана... Адбылося абрусенне і абправаслаўленне татаршчыны, і маскоўскі цар аказаўся носьбітам гэтай новай формы татарскай дзяржаўнасці*". Доўгі час пасля падзення Візантыі Маскоўская дзяржава была адзіным у свеце праваслаўным гаспадарствам, што прывяло да асаблівай месіяністычнасці і ізаляцыянізму свядомасці расейцаў. Іншымі фактарамі фармавання расейскай нацыі сталі геаграфічнае становішча дзяржавы — адкрытасць у Азію і амаль неабмежаваныя магчымасці для тэрытарыяльнай экспансіі.

Падрыхтаваў В. Л.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
[image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000
да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

да Зьместу 1(6)-2000
славянская ідэя

Вук Драшкавіч
Нож

Вук Драшкавіч (нар. 1946) — з адукацыі юрыст, пасьля журналіст, пісьменьнік-дысыдэнт. Цяпер лідэр памяркоўна-нацыяналістычнай апазыцыі, Сэрбскага Руху Аднаўленьня. Перад вамі першы разьдзел яго раману „Нож" (1982), эпічны зачын твору. Далей дзея разьвіваецца ўжо праз шмат гадоў, у сацыялістычнай Югаславіі. Галоўны герой, басьняк-мусульманін Алія Асманавіч праходзіць доўгі шлях да самапазнаньня, то бо ўсьведамленьня сваёй сэрбскасьці. Раман трохі падобны да памфлету з эмацыйным пералічэньнем „гістарычных крыўдаў" і „крыўдзіцеляў" сэрбскага народу. Для многіх сэрбаў гэты мастацкі твор стаў „гістарычным" падмацаваньнем права на зьвядзеньне рахункаў з суседзямі, моцна паспрыяўшы ўздыму шавінізму. Дабро ў рамане, безумоўна, толькі на адным баку, а ўсё зло сканцэнтравана на другім. Наратар існуе ў міталягічнай прасторы герояў сэрбскага гістарычнага эпасу. Час спыніўся — там заўсёды прысутнічае Косава, дзейнічаюць Абілічы й Бранкавічы, а сьвет падзелены на „сваіх" і „ворагаў". Ёсьць абсалютныя ворагі - туркі, альбанцы, швабы, зь

імі ня можа быць кампрамісу. У стаўленьні да народаў-суседзяў аўтар кіруецца прынцыпам „Каін-Абэль" — усе яны або заблукалі, або здрадзілі братам-сэрбам. Славяне-каталікі ці славяне-мусульмане — істоты, сапсаваныя чужымі ўплывамі, якіх трэба „выправіць", то бо вярнуць у сэрбскае ўлоньне, а сэрбаў, сапраўдных славянаў, абраны Богам чысты і пакутны народ, акружае нянавісьць і здрада.

Прысьвячаецца старому Вукашыну зь вёскі Клепац у Герцэговіне. Калі ўсташоўскі кат у Ясэнаўцы[1] адсёк яму вуха, Вукашын са спакоем сьвятога адказаў: „А ты, сыне, рабі сваю працу!“ Калі ўсташ адарваў яму і другое вуха, а потым нос, і калі яму і вочы выбраў, атрымаў ад старога той самы адказ: „А ты, сыне, рабі сваю працу!“

Згарэлая зямля, як шнар на дне душы,
Забыліся аб ёй багі ў сваім паходзе,
Яна жыве і змагаецца,
каб яе крыніцы не перасохлі,
Крумкач цікуе над хлявом, ізноў чуючы нягоды,
Згарэлая зямля, як шнар на дне душы!
(Мілімір Мілошавіч.
„У краіне Герцэговінскай“)
Паганятыя валоў, самотнікі!
Летуценьнікі, гаротнікі!
Цяжка нам паміж вамі,
Ад зла чакаючы дабра!
(Надпіс на адным з прыдарожных
памятных знакаў паблізу Гацка)

Адна за адною запальваюцца ў вёсцы газоўкі. Зь цішыні і змроку выныраюць слаба асьветленыя і заледзянелыя вакенцы, больш падобныя да мігатлівых і мутных ліхтарыкаў. Узялося на мароз, вецер сьвішча, ані сьледу ад сьцежкі, пратаптанай учора ў сьнезе. Нічога не чуваць. Ані кот ня мяўкне, ані сабака не забрэша, ані чалавек не загаворыць. Толькі міргаюць газоўкі, і здаецца, што на ўзгорыстай белі параскіданыя сьветлякі альбо пэрліны. Колькі сьветлякоў —

столькі й хатаў у вёсцы, ды толькі хто схоча пералічваць іх у такую страшную замець?
З аднаго боку вёскі ўздымаюцца стромкія скалы: у ціхую ноч яны гудуць, у іх адбіваюцца рэхам выцьцё ваўкоў і галасы людзей. Але гэтым ранкам чуваць адно завіруху, яна перакрывае ўсё, і першых пеўнікаў чуе толькі вецер.
Дый Нэрэтва, якая звычайна шуміць у цясьніне, нібы спынілася й прыціхла: не чуваць ані як падаюць гурбкі сьнегу ў ваду, ані шолаху дрэваў на беразе.
Днее, і з боку Вучава і Зэленгоры разьліваецца на небе чырвань.

Серада, 7 студзеня 1942 году.
У хаце двох братоў, старога пратапопа Нічыфара й дзеда Станоі Югавічаў, за вялікаю софраю[2] сабраліся ўсе шаснаццаць дамачадцаў. У галаве стала, як належыць па ягоных гадох і старшынстве, хударлявы й кашчавы пратапоп Нічыфар. У мінулым месяцы яму споўнілася семдзесят дзевяць гадоў.
„Пагнаў восьмы дзясятак“, — казаў ён жартам сваякам і суседзям.
Пратапоп, адзін зь нямногіх пісьменных людзей у блізкім навакольлі, быў чалавекам моцнага здароўя, меў востры розум, шмат чаго перажыў у жыцьці, і памяць ягоная сягала далёка. У такія ночы запрашалі яго па вёсках, садзілі на пачэснае месца й першым частавалі.
Нават жанчыны й дзеці годзе ўжо былі балбатаць, цапы вязаць і пляткарыць па кутох, калі пратапоп пачынаў аб нечым распавядаць альбо браў у рукі гуслы[3] і, падмазаўшы смык ладанам, прыплюшчваў вочы, падымаў правае брыво, закідваў галаву і, даючы волю голасу, пачынаў сьпяваць.
І сьпяваў, і распавядаў ён роўна спрытна й цікава. Зважаў на тое, каб не паўтарацца, заўсёды казаў нешта новае, а калі да яго чапляліся, каб ізноў апавёў ён тое, што ўжо чулі, рабіў гэта іншымі словамі, у іншай пасьлядоўнасьці, з новымі падрабязнасьцямі, і выглядала гэта як новы аповед і зусім новая прыгода.
Калі выбухнула Нэвэсінскае паўстаньне[4], пратапопу мінуў чатырнаццаты год, а калі пала Турцыя й парадным крокам, з барабанамі, увайшлі ў Герцэговіну аўстрыйскія жаўнеры[5], быў ён ужо хлопцам, здатным для жаніцьбы. Расказваў, што ў тыя

даўнія й смутныя часы хату ягонага бацькі Божыдара наведвалі Васа Пэлагіч, Міца Любібраціч, а таксама князь і сьвятар Богдан Зімоніч[6] з Гацка. Зазірнуў аднойчы, мімаходзь, і Пэтар Мрконіч, унук Караджорджы й будучы кароль Сэрбіі[7].
Ведаў пратапоп і Нэдэльку Чабрынавіча[8]: пазнаёміў іх у Трэбіні пратапоп Парэжанін, за паўгода якраз перад тым, як у Сараеве, на бульвары побач зь Міляцкай вуліцай, Чабрынавіч кінуў бомбу ў аўстрыйскага эрцгерцага Франца-Фэрдынанда.
Часта гаварыў ён пра гэтую ды іншыя падзеі, маляўніча апісваў, хто й як быў апрануты, як выглядаў і што каму казаў. Слухачы ягоныя сядзелі разявіўшы рот і стрымаўшы подых. І каб у гэты момант якое дзіця раптам пачало сьмяяцца ці плакаць, добра б яму папала ад бацькоў.
Памятаў ён і адсочваў у глыбі стагодзьдзяў шмат розных рэчаў і падзеяў, пачынаючы ад звычаяў, якія панавалі ў гады ягонай маладосьці, і аж да сямейных радаводаў ды гісторыі паўстаньня вёсак. Калі нехта ў Югавічах альбо ў навакольлі хацеў ажаніцца, пратапопу досыць было толькі даведацца, хто бацькі маладой, каб адразу прыгадаць увесь род і па бацькоўскай, і па матчынай лініі на сто гадоў таму, а часта й да самога Косава[9]. Пра заснаваньне вёсак, пра паходжаньне сем'яў у іхным павеце, ды шырэй, па ўсёй Герцэговіне, вёў пратапоп і нейкія свае нататкі, але невядома, наколькі дакладна і рэгулярна.
Запрашалі яго й цанілі далёка за Югавічамі. Перад вайною клікалі пратапопа нават у Стоц, Фочу, Каліновік і Нэвэсіне, каб ахрысьціў дзяцей і завязаў новыя кумоўствы. У першыя гады пасьля распаду Аўстрыі і паўстаньня Югаславіі[10] дзеля кумоўства й пабрацімства часта запрашалі яго землякі і мусульманскае, і каталіцкае веры, і рабілі гэта бяз страху, што за імі будуць потым шпегаваць з Мостару, Сараева, Рыму ці Стамбулу, як гэта было ў турэцкія ці швабскія[11] часіны. Але паступова гэтых запрашэньняў рабілася ўсё меней, а пачынаючы з гэтае вясны, калі ня стала Югаславіі й стварылі Незалежную Дзяржаву Харватыю[12], яны і ўвогуле зьвяліся.
Прыйшлі новыя кепскія часы, і стары Нічыфар у свой нататнік, які хаваў пад падушкаю, замест новых сваяцкіх повязяў, заносіў цяпер зацемкі пра братнія магілы, панажоўшчыну й разьню.
На ўвесь сьвет было абвешчана, што італьянцы й немцы зруйнавалі Югаславію. Але пратапоп, тымчасам, у саміх

Югавічах і вакол іх за ўсе дзевяць месяцаў, як ішла вайна, ня бачыў яшчэ ніводнага чалавека ў швабскай альбо італьянскай форме. Чуў ён, што ёсьць яны ў гарадох, але ж і там не было іх так шмат, каб сьцьвярджаць, што менавіта яны трымалі Герцэговіну на каленях у страху. Рабіла гэта, сьпісваючы ўсе грахі свае на немцаў ды італьянцаў, іншае войска, тое, якое — куды б ня рушыла — пакідала за сабою руіны і крывавыя сьляды.

„Нашае галоўнае няшчасьце ў тым, здаецца, што нашыя найбольшыя ворагі гавораць з намі адною моваю“, — запісаў сабе ў нататнік колькі дзён таму пратапоп Нічыфар.

Пратапоп ня меў дзяцей, ягоная жонка маладою памерла ад сухотаў, а ў яго зь цягам часу прайшло жаданьне новага шлюбу й пачатку. Неадданую бацькоўскую любоў замяніў ён частымі вандроўкамі, новымі знаёмствамі й цікавымі размовамі, а ўвагу й клопаты, якімі калісьці хацеў адарыць сваіх нашчадкаў, перанёс на дзяцей брата Станоі, зь сям'ёю якога жыў разам і ў згодзе, без аніводнага горкага слова альбо дакорлівага погляду. Станоя быў маладзейшы ад пратапопа на тры гады, але — мо таму, што быў задышлівы й згорблены, — выглядаў на старэйшага. Гэтай раніцай, за софраю, сядзіць ён праваруч ад пратапопа Нічыфара. Побач са Станоем — ягоны старэйшы сын Страхіня, каля Нічыфара — малодшы Драгіша. Сярэдні, Радаван, памёр ад кохліку ў два годзікі.

Страхіня і Драгіша — яшчэ дужыя мужыкі, хаця абодвум ужо за пяцьдзясят, таму і не было іх у сьпісах тых, каго палічылі досыць спрытным і моцным, каб бараніць бацькаўшчыну гэтай вясною, пад час красавіцкае вайны[13]. Гэты абавязак і гонар выпаў іхным дзецям: адзінаму сыну Страхіні Братаміру й байцом Драгішы — Войку і Боіцы. Трэці, Трыфка, таксама дасьпеў да зброі, але, дзякуючы сувязям пратапопа, яго пакінулі дома як адзіную падпору і адзіны мужчынскі парастак у сям'і. Пратапоп гэта зрабіў умела й патаемна, каб не даведаўся ні Трыфка, ні хто іншы зь сямейнікаў.

На вайну йшлі сьцяўшы зубы, але зь песьняю. Сорамам лічылася выказаць боязь, унікнуць прызыву й не апрануць вайсковае формы. Так рабілі ў Югавічах, можа, нясьведама, але без ваганьняў і ў адпаведнасьці з тым, што тыя хлопцы, прастадушныя й збольшага неадукаваныя, адчувалі да сваёй радні й бацькаўшчыны. Тымчасам іхныя гадкі зь некаторых

суседніх вёсак рабілі ўсё, каб пазьбегнуць мабілізацыі й ня браць стрэльбы ў рукі. Многія з тых, хто ўсё ж такі рушыў насустрач непрыяцелю, пільнавалі зручнага моманту, каб драпануць з калёны альбо пры першай страляніне падняць рукі й перакінуцца да праціўніка. З Асманавічаў, суседняй вялікай вёскі, якая ляжыць вышэй на Нэрэтве, на вайну пайшло ўсяго трыццаць хлопцаў, а прызывалі разоў у пяць болей. Астатнія схаваліся па навакольных лясох і равох, забіліся ў ямы й варыўні ды аб'явіліся, з трыюмфам і песьнямі, толькі тады, калі да іх дайшла вестка, што вайна скончаная, а Югаславіі няма. Тры ўнукі пратапопа залічаныя былі ў Зэцкую дывізію й накіраваныя пад Шкодар, у Альбанію. Нічыфар, асядлаўшы каня, правёў іх да Гацка і там разьвітаўся. Панесьлі яны з дому ў сваіх вайсковых заплечніках пару шкарпэтак, трохі зьменнага нацеліва, шматок сала й кавалак пшанічнае погачы[14], якую ім на добры шлях выпекла жонка Страхіні Мара, якая, хоць і не была старэйшаю паміж жанчынамі, лічылася за гаспадыню дому. Да таго як падзяліць погачу, Мара, агледзеўшы нейкія ўзоры й знакі на скарынцы і прасачыўшы, як куды разыходзяцца трэшчынкі, сказала: „Угледзела тры шляхі, і кожны вяртаецца дадому, уратуюць і абароняць вас Госпад Бог і Сьвяты Васіль".

Дадому яны вярнуліся на чацьверты дзень пасьля капітуляцыі, сьпярша Войка й Боіца, а ўвечары, калі таго найменш чакалі, і Братамір. Прыйшлі галодныя, няголеныя й прыгнечаныя няслаўем. Яны атрымалі загад аб капітуляцыі пад Шкодарам, калі італьянцы як зайцы ўцякалі ад іх у глыбіню Альбаніі. Трох афіцэраў з палка Братаміра ня зьнесьлі ганьбы, павымалі пісталеты й на вачох у жаўнераў вынесьлі сабе прысуд. Прыйшлі браты пешшу, ад Шкодара, праз Зэцкую Банавіну: ішлі рэчышчам Бояны, потым выйшлі на лысыя ўзгоркі пад Лоўчанам, абмінулі Цэціне і Падгорыцу, потым цераз Востраг дабраліся да Банянаў. Хаваліся ад рэдкіх італьянскіх аддзелаў, якія траплялі на пыльных дарогах, пазьбягалі сустрэчаў са старымі чарнагорцамі, якія, зьняважаныя паразаю, адварочваліся ад іх, рабілі выгляд, што не заўважаюць, нешта бурчэлі пад нос і пляваліся. Калі браты адчулі пад сабою герцэговінскую глебу і прыкмецілі знаёмыя шляхі наперадзе, адразу прайшлі ў іх і стома, і крыўда, і дрэнны настрой. Уздыхнулі на поўныя грудзі: паўсюль пахла вясною, на

навакольных верхавінах і на Гацкім полі пасьвіліся авечкі й каровы. Ня верылася ім, што тутака, на родным парозе, ля Сарычавай грады, напаткае іх засада.
Акрамя Войкі і Боіцы, было іх яшчэ васьмёра: двое з Фойніцы, адзін хлапец з Рыбара, двое з Калешаніна і трое са Сьліўля. Усім загадалі падняць рукі й кінуць зброю. „У імя нашага правадыра Антэ Павэліча[15] й Незалежнай Дзяржавы Харватыі!“ — закрычаў нейкі мужчына й высунуўся з-за каменя, наставіўшы на іх стрэльбу. Першым, зблытаўшы і сваіх, і чужых, адрэагаваў адзін са сьліўлянаў. Скінуў стрэльбу з пляча ды бухнуў наўздагад, і гэтага было дастаткова, каб і астатнія скочылі ў роў, падаставалі гранаты й разагналі хеўру па навакольных мусульманскіх халупах.
Зброю прынесьлі з сабою дадому, але ўладам не здалі, хоць і быў такі загад. Са зброяю адчувалі сябе больш пэўна: разумелі, што вайна толькі пачынаецца і што шкодарскія вінтоўкі ды патроны хутка яшчэ прыдадуцца.
На няшчасьце, не прадбачылі яны, што паміж паўстанцамі — „кукардамі“ і „чырваназорнымі“[16] — пачнуцца звады, а неўзабаве і разьня. Сьпярша са сваёй зброяю йшлі яны пад сьцягі й тых, і другіх — хто першы клікаў, бо лічылі барацьбу з усташамі больш важнаю, чым бязглуздыя сутычкі й спрэчкі наконт таго, у чыё імя — караля ці партыі — зь імі змагацца. Потым, калі палілася кроў і брат пачаў лупіць з брата скуру, калі людзей сталі жыўцом кідаць у равы, яны зноў вярнуліся дахаты, выйшаўшы з гэтага забойчага кола, а зброю сваю, каб не ржавела й чакала на больш разумныя часы, пачапілі на цьвік.
І была б яна там, напэўна, і да гэтае раніцы, калі б месяц зь нечым таму не ўваліліся ў хату пратапопаву партызаны. Пратапоп хаваўся ад іх у лесе, атрымаўшы нейкім чынам знак, што па яго прыйдуць, бо ведаюць пра ягоныя сувязі з чэтніцкім ваяводам Мітрам Жэравіцам, і што, пэўна, прыйдуць забіваць. „Сяброўства з ваяводам, — казаў пратапоп брату Станою, — для іх толькі падстава. Вырашылі б мяне зьліквідаваць і бяз гэтага: кажуць пра іх, што пачалі ўжо гамузам забіваць усіх самавітых людзей і заможных гаспадароў. Распавёў мне адзін чалавек, што прыйшлі яны нават да хворага князя Сэкулы Тошкавіча, узьнялі яго са сьмяротнае пасьцелі, пасадзілі на каня і застрэлілі ў першай лагчыне. Забілі, а быў ён ад мяне

старэйшы на адзінаццаць гадоў“.
Пратапоп ня меў ахвоты чакаць на іх, седзячы ўдома, але не таму, паводле ягоных словаў, што баяўся за сваё жыцьцё й не хацеў дражніць лёс:
„Калі б мяне забілі, я б і мёртвы саромеўся іхнага злачынства. Іхнага, але разам з тым і свайго, і нашага, бо мы зь імі адной косткі й мяса, і ў гэтым, а не ў маёй сьмерці, гора нашае і бяда“.
Пратапоп казаў тады брату, што калі б даведаўся, што прыйдуць яго рэзаць усташы, ня стаў бы ад іх уцякаць.
„Няхай на іх, а не на нас, назаўсёды застанецца ганебнае кляймо забойцаў невінаватых людзей“.
Партызаны яго тады не знайшлі, хоць пратрэсьлі ўсю хату, зазірнулі ў лёх ды ясьлі, нават на вышкі залезьлі і тыкалі штыхамі ў сена. Знайшлі яны нешта іншае, тое, на што не спадзяваліся: тры стрэльбы, дзевяць гранатаў і торбу з патронамі. Усё забралі сабе.
„Навошта гэта ім, баязьліўцам, — казаў адзін з партызанаў, — народным мсьціўцам зброя больш трэба“.
З таго часу не надаралася выпадку, каб набыць зброю.
Пратапоп, праўду кажучы, думаў, што ў гэтым і патрэбы няма. Вёска іхная была ў глушы, далёка ад места і ад шляхоў, якімі рухаюцца войскі, а ў моцныя завірухі дык у яе толькі ваўкі й наведваліся. Ваўкі ды Асманавічы — адзіныя суседзі Югавічаў. Першыя бяз дай прычыны на людзей ня кідаліся, а другія цяпер далёка ад сваёй вёскі не адыходзілі: рукі ў іх былі па локаць у крыві, і таму кожны раз, калі яны выходзілі з сваіх умацаваных сядзібаў, рызыкавалі трапіць на сваяка каго з забітых, які толькі й чакаў моманту, каб зь імі палічыцца.
Былі яны вінныя і партызанам, і чэтнікам, дык дзесяць дзён запар сядзелі ў аблозе, у абцугох, без усялякае надзеі на дапамогу. Завіруха й моцны сьнег прымусілі мсьціўцаў адступіць, і зараз Асманавічы цешацца спакоем, хаваюць мёртвых, перавязваюць параненых і латаюць дзіркі ў абароне. Але каб і не сядзелі яны ў аблозе, ня верыў пратапоп, што суседзі маглі б рушыць на Югавічы. Патрэбна было б ім, перадусім, дзьве гадзіны брысьці праз гурбы сьнегу ды ў гэткую непагадзь. Было й яшчэ нешта ў іх на шляху, адна неадольная перашкода, адна кроўная повязь, пра якую напрыканцы месяца казаў пратапоп чэтніцкаму ваяводу, калі той прасіў яго

сьцерагчыся й берагчыся асманавіцкіх стрэльбаў.

— Ці ўсе сабраліся тут? — запытаўся дзед Станоя.
— Усе, дзякуй Богу, тутака, — кажа Нічыфар. — Мара, хай цябе ліха возьме, ці ж мы дачакаем калі цыцвары[17]?
— Яшчэ крышачку, толькі даб'ю масла, пачакайце хвілінку, яшчэ цукар у вадзе не разышоўся.
— Гэй, дзеўкі, падвядзіцеся, дапамажыце крыху, будзе вам сідма сядзець ды пазяхаць, — накінуўся Станоя на сваіх чатырох унучак, якія, седзячы з жаночага краю, паапускалі галовы, змораныя сном.
Ніводная зь іх яшчэ не была замужам. Старэйшай, Косі, было дзевятнаццаць, найменшай, Сімане, пятнаццаць гадоў. Дзьве сярэднія, блізьнючкі, Анджа і Вэра, хоць і нарадзіліся ў адзін дзень, былі ня надта падобныя адна да адной. Анджа — смуглявая, дзябёлая і для сваіх гадоў вялікая й разьвітая. Вэра — маленькая, хударлявая, з рэдкімі каштанавымі валасамі, блядая на твар.
— Не крычы сёньня на дзетак, — баронячы іх, падала голас жонка Станоі, баба Стана, і прытулілася да малой Сіманы.
— Вэра, дачушка, падай цётцы шклянку вады, нешта ў мяне ў роце перасохла, — адазвалася Драгішава жонка Ёка.
— Не памрэш, падыміся й вазьмі сама, — з гатоўнасьцю ўблытаўся Драгіша.
— Любіца, здаецца мне, што малы прачнуўся, крычыць, схадзі, паглядзі, што зь ім, — зьвярнуўся да сваёй жонкі Братамір.
Любіца ўскочыла з-за стала, змучаная, жоўтая, як воск, ледзь трымаючыся на нагах. Учора ўвечары нарадзіла, перад самаю вячэраю, калі была нанесеная салома ў пакой і пратапоп Нічыфар паклаў быў на вогнішча дубовае палена. Баба Мара адрэзала й завязала дзіцёнку пупавіну, выкупала яго ў драўляных начоўках зь цёплаю вадою, пацягнула тры разы за нос, пражагнала й спавіла. Потым паклала ўнука каля маці, пацалавала яе ў шчаку й сказала: „Адпачні, насьпіся, дачушка, каб заўтра, калі Бог дасьць, паднялася да царквы".
Салому ў хату гаспадыня ўчора прынесла з клуні на сьпіне. Пераскочыўшы зь ёю праз парог, пачала квахтаць, нібы тая курыца. За ёю прынадзіліся, папіскваючы, бы кураняты, чатыры дачкі Страхіні ды сыны Драгішы, Трыфка і Боіца. На раскіданую па хаце салому пратапоп кінуў дзьве жмені арэхаў.

Вяроўку, у якой прынесьлі вязку саломы, Мара вынесла з хаты й кінула на дварэ неразьвязанаю. З раніцы, як толькі разьвіднелася, яна на вяроўцы, як патрабуе звычай, насыпала жменьку пшанічных зярнятак курам, і пакуль яны дзяўблі, голасна паўтарала: „Колькі ў маёй вяроўцы дзяўбецца, гэтулькі ж у курніку нясецца“.

Як скончылі з саломаю, Мара з сынам Братамірам па сьнезе й голым лёдзе пайшлі па ваду да прыледзянелай крынічкі Зьмійкавіцы. Братамір пасыпаў крынічку пшаніцай, якую трымаў у прыгаршчы, потым нахіліўся, разьбіў лёд, захапіў вады ў далоні й тры разы лінуў сабе на твар. Толькі пасьля гэтага набрала Мара вады ў вядро. На вадзе гэтай потым гатавалі ўсю ежу на калядную вячэру, на ёй замяшаны быў і вялікі калядны пірог, які, гарачы, дыхаў параю цяпер на стале перад дзедам Станоем і пратапопам Нічыфарам.
— Цяжкі сон прысьніў, братку, вось усё раздумваю, ці распавесьці табе яго? — раптам зьвярнуўся Станоя да брата Нічыфара.
— Мабыць, ты проста ляжаў няёмка альбо ногі твае тырчалі з-пад коўдры, — паспрабаваў пажартаваць пратапоп.
— Не, вось паслухай, Нічыфар: зьявілася перад маімі вачыма, — пачынае Станоя, — нейкая бясконцая вада альбо паляна, а на ёй усё толькі дзіцячыя галовы й нажы. Апынуўся аднекуль на сярэдзіне тае паляны драўляны трыножак, а на трыножку — нябожчык наш дзед Вук, вялікі, з доўгім сівым вусам, у аблямаваным золатам чарнагорскім строі і з кляновымі гусламі ў руках. Пагладжвае й закручвае свой вус, нацягвае струны на гуслах, і разносіцца па той паляне альбо па возеры нейкая добра знаёмая мне песьня, нават здаецца мне, што я яе ў дзяцінстве безьліч разоў чуў.
— Ці прыгадаў ты, што гэта была за песьня? — перапыняе яго Нічыфар.
— Песьня гэтая была пра Паўла, пра ягоную жонку й сястру, варанога каня й шэрага сокала… Памятаеш, пэўна, колькі разоў мы яе чулі ад нябожчыка-бацькі.
— І я гэтую песьню ведаю, — зь цікаўнасьцю ўмешваецца малая Сімана. — Прачытала яе ў адной старой кнізе, на гарышчы.
— А ну, памаўчы, што ты тамака можаш ведаць? — асадзіў яе Братамір.

— А вось ведаю, хочаце, распавяду? — абурылася дзіця й пакрыўджана нахіліла галаву.
— Распавядзі, распавядзі, дачка, слухайма, — падышоў і пагладзіў яе па валасох Страхіня.
— Ну, дык вось… Паўле быў такі юнак, які меў найлепшыя срэбраныя нажы і найлепшых каня й сокала. Тыя нажы падараваў ён сястры сваёй Еліцы, якая была вельмі добрая і надта яго любіла…
— Што ты тамака, малая, можаш ведаць, хто, каго й як любіць, — зьдзекліва сказала Мара, яе маці, якая ўсё яшчэ вазілася з цыцвараю.
— Гэй, няхай дзіцё дагаворыць, — махнуў рукою пратапоп Нічыфар.
— Ну вось, жонка Паўла зайздросьціла праз той падарунак і таму аднойчы ноччу, пакуль Еліца спала, выкрала ў яе срэбраныя нажы, выцягнуўшы іх з-пад падушкі, ды забіла імі Паўлавых каня й сокала. Хацела пасварыць сястру з братам, каб сястру ў гэтым абвінавацілі. Калі ж і гэта не дапамагло, Паўліха зноў выкрала нажы ў Еліцы і зарэзала свайго сына ў калысцы, паклала нажы пад падушку Еліцы й пабегла да Паўла, галосячы, што ягоная сястра забіла дзіцё ў калысцы..
— Дакладна так, дачушка, — не дае ёй працягнуць дзед Станоя. — Дапамагла ты мне прыпомніць, як далей ідуць вершы… Там далей Паўліха зарвалася да мужа й загаласіла:

На зло, Паўле, ты сястру любіў,
На бяду ёй міласьць даваў.
Зарэзала тваё дзіцятка ў калысцы!
— Сапраўды, так, — ізноў умяшалася малая Сімана. — А потым Паўле загадаў разьдзерці Еліцу, прывязаўшы яе да конскіх хвастоў…
— Якая ж ты спрытная, — засьмяяўся Станоя, — ну, зараз бачым, што ўсё ведаеш і што вельмі разумная. А цяперака памаўчы трошкі, дазволь дзеду скончыць… Якраз тую частку, дзе разьдзіралі Еліцу, гэтай ноччу і сьпяваў дзед Вук, бачыў я ягоныя сьлёзы, калі граў ён на гуслах:

Дзе кроплі яе крыві ўпалі,
Там цьмен і базылік усталі.
А дзе яна сама ўпала,

Там царква ўстала!
— Божухна, чаго толькі ты ня памятаеш, няшчасны ты Станоя, — перабіла яго жонка Стана, захітала галавою й скрыгатнула зубамі.
— Паслухай, старая! — узьняў ён бровы. — Рабі сваё й ня тыкай носу туды, куды ня трэба… Ну вось, больш ня памятаю вершаў, выцерла мне іх жонка з памяці, апруцянела б, каб ня ўлезла, марна я зь ёй размаўляю вось ужо шэсьцьдзесят гадоў: усё адно, што зь ёю, што з каменем. Ну, карацей, Паўліха раскаялася ў сваім граху і просіць яна… Ат, успомніў я песьню:

Праляцеў час,
Расхварэлася маладая Паўліха,
І хварэла дзевяць год.
Скрозь косьці ёй трава прарасла,
У траве гэтай лютыя зьмеі хаваюцца,
Вочы яе п'юць, па траве поўзаюць,
Моцна сумуе маладая Паўліха!
— Ну дык вось, ня буду больш марудзіць, — працягвае дзед Станоя, — Паўліха бачыць, што спасьцігнула яе Боская кара і не дапамагаюць ёй ані малітвы, ані зельле. Кліча яна Паўла й моліць яго ды заклінае, каб яе, як колісь Еліцу, прывязаў ён да конскіх хвастоў… Трыножак пад нябожчыкам-дзедам усё глыбей і глыбей правальваецца ў зямлю, паўсюль вакол яго зьмеі з высалапленымі языкамі, а ён сьпявае й сьпявае, колькі яму хапае голасу, і патанае разам з гусламі… Чакайце, як гэтая песьня сканчаецца? А, так, у канцы, як Паўліху разьдзіраюць:

Дзе кроплі яе крыві ўпалі,
Там крапіва й цёран усталі,
А дзе яна сама ўпала,
Там возера стала.
Па возеры вараны конь плыве,
А за ім залатая калыска.
На калысцы сядзіць шэры сокал,
У калысцы той хлопчык,
На горле ягоным рука матчына,
А ў руцэ цётчыны нажы!
— Дай Божа, каб сон гэты быў на дабро, — казаў, як бы сам сабе, пратапоп Нічыфар. — Кожны раз, калі мне сьніцца дзед

Вук, чакай добрых навінаў і прыемных падзеяў.
— Ня ведаю, Нічыфар, ці быў гэта дзед Вук альбо сам сатана. На хвіліну пазнаў я дзедавы голас і вус. Але потым здалося мне, што на Вукаву шыю ды насаджаная галава д'ябла.
— Кінь, не ўспамінай д'ябла, хай бы ён там і быў, не кажы ты пра яго за софраю ды пры ўсёй радні, — працэдзіла Ёка скрозь зубы й тры разы перахрысьцілася.
— Праўду кажаш, — задуменна ўсьміхнуўся пратапоп Нічыфар.
— Ану, падай мне мае рызманы, Братаміру.
Шукае Нічыфар у кішэні белую хустаўку, каб сьцерці пот з ілба і броваў. Ад нядаўна б'е яго гарачынь ды напала зьнямогласьць, абцяжэлі ногі, падрыгваюць калені. Хавае гэта ад родных, каб не прыкмецілі.
Замест хустаўкі намацаў пакамечаны кавалак паперы, крыху падумаў, а потым хутка адхінуў руку, быццам дакрануўся да гадзіны.
На памяць ведае ён, што напісана на гэтай паперцы. Прынёс яе пратапопу тыдзень таму нейкі маладзён з Чэмэрны, ня памятае ягонага імя.
„Ойча пратапопе! — казаў хлапец. — Шчыра вітае цябе спадар ваявода".
Запрасіў пратапоп яго на падвячорак, пачаставаў ракіяй[18]. Той выпіў дзьве чаркі, але сесьці пад'есьці адмовіўся.
„Дзякуй табе, ойча, я не галодны, а да таго ж мушу засьветла дайсьці да Чэмэрны. Ты толькі скажы мне, што перадаць ваяводу?"
„Пачакай, сынок, пагляджу толькі, пра што гэта мне паведамляе ваявода й чаго ад мяне хоча", — адказаў Нічыфар.
Чытаў сам сабе, каля вакна, сур'ёзны, нахмурыўшы маршчыністы лоб зь белымі брывамі:
„Дарагі браце Нічыфару! Апошні раз табе кажу: падымай сям'ю, падымай вёску й бяжы зь Югавічаў! Паведамі, калі прыедзеш, буду чакаць цябе з войскам у Чэмэрне. Калі ня можаш, тады я прыйду ў Югавічы. Але ж хачу табе нагадаць, што войска ў мяне няшмат, галоўная частка адышла ў кірунку Фочы і Гораждy, а з партызанамі б'емся мы мала ня кожны дзень. З усташамі калі-нікалі, а паміж сабою штодня. Нож, які мы ўзьнялі адзін на аднаго, больш, на нашае гора, у похвы не вяртаецца. Вабяць нас, як наканаваньне, Косаўская вячэра і лёс Абіліча з Бранкавічам[19]. Казаў я табе пра гэта апошнім разам.

Рады быў бы цябе ўбачыць як мага хутчэй, тады й пагутарым. Перадай мне праз гэтага хлапца, калі рушыце й дзе вас трэба чакаць. Ці трэба пасылаць людзей у Югавічы? Баюся, каб ня высачылі нас усташоўскія шпегі або Асманавічы не падрыхтавалі пастку, помсьцячы за марную аблогу. Небясьпечныя яны, а зараз небясьпечнейшыя, чым калі-кольвек. Не падманвайся, не спадзявайся на сваяцтва, Нічыфар. Калі б ведаў, што партызаны ня ўдараць нам у сьпіну, заўтра б рушыў на Асманавічы, хаця й рызыкоўна па гэткім сьнезе ды ў непагадзь штурхаць людзей у котла. Выходзьце ноччу, калі вас ня змогуць высачыць і калі Асманавічам у галаву ня прыйдзе вас чакаць. Чакаю цябе не пазьней як праз тры дні ў Чэмэрне. Паведамі праз гэтага хлапца, калі вы выйдзеце. Твой Мітар“.
Паклаў пратапоп тады ліст у кішэню, пачухаў галаву, пагладзіў доўгую й сівую бараду, выдраў балонку з аднаго із сваіх сшыткаў і коратка адказаў:
„Вялікі дзякуй за павагу й клопат, спадару ваяводзе! Можа, усё так яно й ёсьць, як ты кажаш, але мы не пабяжым, мы адсюль нікуды ня пойдзем. Анікога не пасылай сюды й не чакай нас у Чэмэрне. Ня буду палохаць сваіх і ня веру ў тое, што ты пішаш, ваяводзе. Дзякуй табе яшчэ раз за брацкі клопат. Твой Нічыфар“.
Пратапоп стаіў ад сваіх і ад вёскі і ліст ваяводы, і свой адказ. Не хацеў палохаць людзей і нішчыць іхныя спадзяваньні ды псаваць калядныя сьвяты. Брату Станою сказаў, што кліча яго ваявода на кумоўства ў Чэмэрну і што падзякаваў ён яму за павагу ды адказаў, што ў чэтніцкім войску альбо ў навакольных вёсках ёсьць багата маладзейшых, больш адукаваных і ня менш шанаваных сьвятароў. Распавёў гэта брату нібы цераз сілу і толькі тады, калі ваяводаў лістаноша пакінуў іхную хату й Югавічы.
Сон Станоі цяпер нагадаў яму пра гэты ліст. А таксама пра нейкае чорнае й дрэннае прадчуваньне, што зьнянацку ўвайшло ў яго й лягло на цела каменем, з-пад якога ніяк ён ня можа вырвацца. Ня можа пратапоп зразумець усе спружыны гэтага непакою, які перацякае ў страх, у нядужасьць, у боязь, што ўсё тое, што напісаў ваявода пра суседзяў і крэўных Асманавічаў і пра што яго два з паловай месяцы таму ў гэтым самым пакоі і за гэтым самым сталом папярэджваў, — праўда.

Узгадваецца яму: сядзіць ваявода на ложку, скінуў боты, на нагах — белыя шкарпэткі й сінія суконныя сялянскія чакшыры[20]. Барада ў ваяводы невялікая, але густая й шорсткая. Рэдка калі сівізна забялее ў гэтым чорным лесе, што аточвае выцягнуты й змучаны твар селяніна-земляроба, якому ўжо за пяцьдзясят. Ваявода скулаты, нос у яго вялікі, лоб маршчыністы, вочы вадзяністыя й стомленыя. На шырокіх плячох Мітра афіцэрскі кіцель, які да вайны насілі каралеўскія гвардзейцы (гэты кіцель яму падарыў адзін з афіцэраў, якімі зараз Мітар камандуе). На галаве — чорная кучма, а на ёй — вялікая кукарда каралеўскага войска. Калі ваявода здымае шапку і афіцэрскі кіцель, ён ні ў чым не падобны да жаўнера, а тым больш да камандзіра. Нічога тады не адрозьнівае яго ад герцэговінскіх земляробаў, якіх можна сустрэць тут на кожным кроку і якім быў да вайны ён сам. З тых часоў пратапоп яго й ведаў. Ваявода быў сябрам Сялянска-Работніцкай Партыі і адным з самых вядомых і паважаных гаспадароў. Цягнуў, праўду кажучы, заўсёды трохі ў бок, не любіў вадзіцца з уладамі, агітаваў, каб зямлёю надзялялі і безьзямельных, нават шапталі пра яго, што ён „чырвоны“ і водзіць шашні з камуністымі. У школу ваявода ніколі не хадзіў, а почырк меў — казалі — як ніхто з жандараў альбо настаўнікаў у Нэвэсіні. Пад час кароткай і сумнай красавіцкай вайны яго не паклікалі ў войска. Для гэткіх справаў палічылі яго застарым і недасьведчаным. Папраўдзе, ён і цяпер, ваяводзтвуючы, не насіў пры сабе зброі. Можа, толькі пісталет, хаця й яго ў ваяводы ніхто ня бачыў. Камандзіраваў ён у сялянскай вопратцы, без чыноў, бразготак і ордэнаў. Неахвотна згадзіўся, ледзь яго ўгаварылі, каб апрануў гэты афіцэрскі кіцель; ня можа прызвычаіцца да яго ваявода, цісьне ён яму ў плячох. Не было ў яго і асаблівага жаданьня рабіцца ваяводаю. Ня вабяць яго ні чыны, ні ўхвалы. Гэтае глупства ён і да вайны ахвотна саступаў іншым. Але людзі чамусьці заўсёды гуртаваліся вакол яго і давяралі яму. Мо за тое, што ўмеў ён знайсьці патрэбнае моцнае слова і заваражыць пры размове.

І вось сядзіць ваявода на ложку й кажа Нічыфару:

— Прыемна цябе паслухаць, але ў дабро, на якое ты спадзяешся, і ў моц, якую згадваеш, я асабліва ня веру. Калі сьцены ў хаце трухлявыя, не дапаможа пабелка і шалёўка.

— Хата была ў нас новая, а сьцены за дваццаць год не

трухлеюць, спадару ваяводзе.
— Была яна хаця й новая, але ж толькі з аднаго боку мела падваліны. Таму, як толькі наляцеў мацнейшы вецер, так лёгка й завалілася.
— Браце Мітру, ці ня хочаш ты сказаць, што й Францыя была без падмурку? І Чэхія, і Польшча, і… выбач мне, і гэтая нашая спустошаная й гаротная Расея?
— Францыя, пратапопе, толькі занятая, не зруйнаваная, ня зрынутая, не паваленая. Хоць і акупаваная, але і далей застаецца Францыяй. Ніхто яе, як гэтую нашую гаротную хату, не разьбіваў на некалькі малых і дробных дзяржаваў.
— А Расея, што з Расеяю, ваяводзе?
— Ведаю толькі адно: карак сабе ламаў кожны, хто налятаў на Расею.
— Тады, дзякуй Богу, хутка ўсё зьменіцца. Ці верыш ты ў гэта, ваяводзе?
— Пакінуў нас Бог, даўно ўжо мы пад д'яблам ходзім! Швабы ды італьянцы яшчэ не перайшлі нашай мяжы, а ўжо знутры пачалі сыпацца нашыя сьцены. Маленькая Сэрбія ў чатырнаццатым годзе, як адна душа, сустрэла зь мячом два швабскія каралеўствы. Войска рабіла немагчымае. Ведала, што бароніць і чаго хоча, было заадно і мела надзейны тыл. А што адбылося гэтаю вясною, Нічыфару? За тыдзень да капітуляцыі Югаславіі Павэліч абвесьціў Незалежную Дзяржаву Харватыю! Ня мог вытрываць, каб хаця сьпярша завалілася старая хата, а толькі тады пачынаць будаваць новую. Арнавуты[21] загаманілі аб Вялікай Альбаніі, вугорцы — аб Вялікай Вугоршчыне, а гэтыя нашыя гаротнікі, гэтае нашае ліхое семя ўскочыла нам на шыю раней, чым мы разабраліся ў тым, што адбываецца!
— Ці гэта ты пра Асманавічаў?
— Эх, ня можна, браце мой, — саскочыў ваявода з ложку і гэтак басанож пачаў хадзіць па пакоі, — уздымаць агульны дом толькі на сэрбскай крыві і сэрбскім падмурку! Ня можна й годзе, Нічыфару!
— Тады што ж нам рабіць, ваяводзе?
— Падымай сваіх, падымай вёску і ўцякай у лес! Вось што я ведаю і табе раю. Бяжы, схавайся дзе, зьберажы галаву, пакуль усё гэта ня скончыцца!
— Каб я ўцякаў ад Асманавічаў? Дык яны гэтага, браце Мітру, толькі й чакаюць!

— Беражы галаву на плячох, а то яны яе адрэжуць табе, як пеўню, Нічыфару! Кінь ганарыцца ды харабрыцца, ня маем часу на гэта, ці не разумееш ты, хто мы і хто яны, ты ж разумны чалавек, не павінен, можа, табе гэтага тлумачыць.
— Але ж мы мацнейшыя за іх, нас болей, сорам уцякаць, ваяводзе!
— Сорам — гэта нешта іншае, Нічыфару ты мой! Сорам — гэта, браце, тое, што мы б'ем адзін аднаго, што самі адзін адному вочы выбіраем, што дзелімся на Абілічаў і Бранкавічаў, і таму мы Богам праклятыя, таму толькі мы адзіныя такія і ёсьць, што паміж сабою, як людажэрцы, грыземся!
— Ваявода, скажы, а хто ж з нас Абілічы, а хто Бранкавічы? Партызаны кажуць, што гэта вы здрайцы.
— Ня ведаю, далібог, ня ведаю, гэта час пакажа. Але ведаю, што трэба зрабіць усё, каб любым чынам замірыліся мы. Каб не стралялі адзін у аднаго, каб хоць міналі адзін аднаго. Паглядзі на харватаў і на гэтых нашых патурэчаных братоў, якія яны зьяднаныя і як спрытна і хітра сьцерагуцца нашых шляхоў.
— Не, браце Мітру, я ведаю і чуў, што сярод іх таксама няшмат людзей, якія стаяць за ўсташоў. І ў іх ёсьць прыстойныя людзі і розная дрэнь.
— Ёсьць, напэўна ёсьць, мой Нічыфар. Вось, браце ты мой, у гацкім і нэвэсінскім паветах ёсьць колькі камуністых-мусульманаў, якія супраць усташоў і разьні сэрбаў. Астатнія ж альбо маўчаць ды абыякава паглядаюць, як ліецца наша кроў, альбо самі з ахвотаю яе праліваюць. Не хачу браць грэх на душу, ёсьць, акрамя камуністых, і некалькі прыстойных гаспадароў, якія пры ўсіх плюнулі на ўсташоўскі нож і не захацелі ўхваляць злачынствы. Гэта, браце мой, у Нэвэсіні Смая Вргіч і Муса Мэўліч, а ў Гацку Осман Кврджыч, Хайра Бэскіч і Сіктэр Эфэндзія. Можа, каго й прапусьціў, але кажу пра тых, каго ведаю і пра каго між людзямі кажуць. Усе іншыя спакойна церпяць усташоў або зь імі заадно. Зараз ты, мой Нічыфару, параўнаў гэта з нашымі бедамі і нашым Косавам. Палова вёскі прышыла зоркі, а палова кукарды, і забіваюць адзін аднаго… Адзін брат у партызанах, а другі ў чэтніках. Бацька ў чэтніках, а сыны-камуністыя засуджваюць яго на сьмерць і плююць на яго труп на шыбеніцы. Брат брату вочы выдзірае і кідае ў роў: вось, якія мы ёсьць, гэта нашая пагібель і праклён, мой Нічыфару!

— А калі былі б мы зьяднаныя, думаеш, было б інакш? Думаеш, каб не было ўсташоў, нас швабы пакінулі б у спакоі?
— Меней было б бяды й крыві, Нічыфару!

— Мо ведаеш, ці ваявода Мітар з войскам яшчэ ў Чэмэрне? — перашкодзіў пратапопу ў думках дзед Станоя.
— Ваявода Мітар? Так, а дзе ж ён будзе? Зрэшты, у вайну ніколі ня ведаеш, дзе будзе віднець, а дзе зьмяркацца.
— Нешта не чуваць апошнія дні сьліўлянаў. Кажуць, што прыцягнулі яны на Брняц гармату, якую захапілі ў харватаў, і што адтуль будуць страляць па Асманавічах.
— Завіруха, дзядуля, бура, вярнуліся іхныя людзі ў вёску, — умяшаўся Братамір.
— А чаму пытаешся пра ваяводу? — зьвярнуўся да Станоі Нічыфар.
— А нічога, так толькі, прыйшло ў галаву. І не адыходзіць ад мяне гэты сон, увесь я быццам заламаны, так ён мяне змарыў.
— Тата, заўсёды табе мроіцца нейкая бяда, — падала голас нявестка Станоі Мара. — Выйдзі, дзеля Бога, Страхіня, з хаты, прыслухайся трохі і абыдзі вакол.
— Паглядзі, ці сабака спушчаны, нешта яго не чуваць, — дадала баязьліва баба Стана.

Прыгадалася пратапопу, як ваявода выяжджаў зь Югавічаў: асядлаў тады пратапоп Зэкана і паехаў яго правесьці. Ехалі побач, у сярэдзіне доўгай калёны чэтнікаў, якая кіравалася на Брняц, на Нэвэсіне. Дзьмуў асеньні вецер, калмаціліся нізкія хмары над іхнымі галовамі і гаргалі крумкачы, прадчуваючы завеі.
— Добра маешся, пратапопе! — казаў ваявода. — Калі б цябе ня ведаў, не паверыў бы, што пайшоў табе васьмідзясяты.
— Зямля трымае, браце Мітру. Але ж, урэшце, і мне здраджваюць ногі, і кроку не магу ступіць бяз кульбы, і на каня ня сяду, калі не падсадзяць, — сам бачыў.
— Колькі гадоў пражыў твой бацька Божыдар?
— Сто і дзевяць год — так занатавана ў царкоўных кнігах.
— Э, перажывеш яго, і думаць няма чаго.
— Не да жартаў, спадару ваяводзе… Нязручна мне было перад сваякамі, то зараз хачу цябе аб нечым запытацца.
— Не бянтэжся, пытайся, што за бяда, Нічыфару?

— Ці патрэбныя табе жаўнеры? Добрыя жаўнеры, ручаюся за іх.
— Ці патрэбны дождж сухой глебе? Пра гэта, браце ты мой, і не пытайся.
— Ты сам бачыў, быў у мяне дома, ёсьць у мяне чатыры ўнукі, усе прыдатныя да зброі. Вось, таму і прапаную: вазьмі двух, сам вырашы і выберы, ваяводзе!
Мітар кашлянуў, моўчкі стаў глядзець у мутнае неба, якое амаль што лягло на Югавічы. Падагнаўшы свайго каня бліжэй да Нічыфаравага і загадаўшы іншым паехаць трохі наперад, ледзь чутно прашаптаў:
— Калі мяне пытаешся, адкажу: не адсылай іх у чэтнікі!
— Не разумею… Ці ты гэткім чынам мяне выпрабоўваеш? — прамармытаў Нічыфар.
— Мы, браце ты мой, гэтую вайну прайграем. Іхная будзе перамога, і гэта вырашана!
— Кажаш пра партызанаў?
— Пра іх, пра Расею і пра Сталіна. Нашыя карты нявыйгрышныя, і вельмі далёка нашыя прыяцелі. А я й ня веру ў тое, што яны нам сапраўды прыяцелі. Пакінулі нас, даўно яны нас пакінулі, сябра.
— Ня верыш, што ангельцы нам прыяцелі?
— Нікому я больш, браце ты мой, ня веру. Сумняюся і ў самым сабе, не магу паручыцца нават за тое, што сам сабе думаю. Прададуць яны нас мацнейшаму, галоўны пераможца будзе ставіць умовы.
— Расейцы?
— Адсюль і аж да Бэрліну пройдуць сталінскія дывізіі!
— Але ж, браце Мітру, палову Расеі немец пад сябе забраў. А Ангельшчына й Амэрыка некранутыя й на нагах.
— Калі б нават і ўся Расея была накрытая, тое самае табе казаў бы. Няма і ніколі ня будзе без Расеі перамогі. Скончана, скончана, зьмяняюцца царствы, брат Нічыфар!
Мітар ізноў замаўчаў, прайшоўся шурпатай далоньню па барадзе, павярнуў галаву некуды ў кірунку Вучава. Бяз слоў ехалі яны побач, пакуль не прамінулі лесу і ня выйшлі на голую верхавіну над Югавічамі. Тут і спыніліся, каб разьвітацца.
— Тое, што казаў, казаў я толькі табе, гэта не для чужых вушэй, Нічыфару! Нядобра, нават і сорамна, калі камандзір прадчувае і прадказвае сваю пагібель. Але з табою хачу размаўляць

шчыра, без хлусьні. Сам я пайшоў у чэтнікі таму, што мусіў узяць нечы бок, павінен быў вызначыцца. Зорка альбо кукарда — трэцяга ня меў. Выпала мне гэткая карта, можа й міма волі маёй, і гэтая другая адзнака (ваявода дакрануўся рукою да кукарды на сваёй шапцы) — гэта знак і кляймо нашага падзелу.
— Мітру, браце, сьпярша ж і ты быў з камуністымі. І ты трымаў у руках чырвоны сьцяг, калі сёлета ў чэрвені напалі вы на Нэвэсіне!
— Усе мы тады, браце мой, ішлі пад аднымі і тымі ж сьцягамі. Скраілі мы іх сьпешна ў тую самую першую ноч, калі пачулі, што ў вайну ўступіла Расея. Нашыя сьцягі былі расейскага колеру, бо мы спадзяваліся, што сама позна за тыдзень-другі „бацюшкі“ прыйдуць у Нэвэсіне.
— Казалі пра цябе тады, што ты ў камуністах. Таму ня мог даць веры, калі пачуў, што ты стаў ваяводаю.
— Шмат чаго пра мяне казалі й будуць казаць… А тады на нас як пярун жахнуў зь неба, ударыў у войска і разьдзёр сьцяг. Пачалі некаторыя гаварыць пра рэвалюцыю, без суду й віны каб забіваць самых паважаных і добрых гаспадароў. Камісары самавольна вызначалі, хто кулак, а ўначы высылалі тройкі для ліквідацыі. Прасіў я тады а маліў іх спыніць усё гэтае, дарма казаў ім, што па ўсёй Герцэговіне няма нікога, апроч беднякоў… Усе мы, кажу табе, былі напачатку за Расею, а яны з гэтай Расеі зрабілі пудзіла. Замест каб біць агульнага ворага, а толькі потым, калі ўжо так наканавана, вызначыцца, хто за караля, а хто за Сталіна, яны пасярод гэтае разьні пачалі дзяліцца ды яшчэ горшымі зрабілі няшчасьці, што нас напаткалі.
— Ці брат твой, нябожчык Драга, быў у камуністах?
— Быў, я гэтага не хаваю і ня сорам мне. Загінуў прыстойна, у атацы, калі бралі Нэвэсіне. У сапраўдны і шчасьлівы час загінуў. Не дачакаў таго, як мы павярнулі стрэльбы адзін супраць другога, як закрывавіліся і, забіваючы, залеглі ў акопы па розныя бакі.
— Цябе, браце Мітру — прынамсі, так кажуць — у чэтнікі пагнала нейкае ліхое слова Віды Ступіча: ляпнуў ён штосьці, пакрыўдзіў цябе перад паважнымі людзьмі, ці то праўда?
— Гм… Праўда! А хто ведае, дзе тая праўда… Спрачаліся мы наконт таго, якое імя будуць насіць нэвэсінскія паўстанцы. Дамовіліся былі, што будзем мець чырвоныя сьцягі. Я сам гэта

прапанаваў на сустрэчы ў Відавай хаце, і ўсе мяне падтрымалі.
— Чаму чырвоныя сьцягі, далібог, ваявода?
— Бо гэта, пратапопе, расейскі сымбаль, а мы мусілі быць з Расеяю. Так я тады казаў. Наш абавязак, казаў я, змагацца пад чырвонымі сьцягамі да поўнай расейскай перамогі. А пасьля пабачым, можа, нешта іншае будзе нам бліжэйшае і больш даспадобы. Віда тады прапанаваў, каб паўстанцы называліся Народнае Вызвольнае Войска Нэвэсіня. Запытаўся я ў яго, хто такія гэтыя паўстанцы? „Як гэта хто?“ — адказаў той спахмурна. Запытаў я ізноў, ці можа ён паміж трыма тысячамі паўстанцаў налічыць хаця б трох нясэрбаў. „Не магу, дык і што?“ — павысіў ён голас. Нічога, кажу, толькі вось патрабую, каб паўстанцы назваліся — Сэрбскае Народнае Вызвольнае Войска Нэвэсіня. На што сусед Ступіч ускінуўся: „Паслухай, Мітру, і мой рабенькі цуцык пад плотам, можа, таксама сэрб, за цябе ня горшы!“ Анічога я яму не адказаў. Падняўся і выйшаў… Вось як гэта было, і Бог ведае, што ён яшчэ пра мяне кажа і прыбаўляе. Перайшоў я тады на другі бок і досыць людзей пацягнуў за сабою. Можа, я й памыліўся тады, можа, і здрадзіў!
— Крый Божа, каго-каго, а цябе ў гэтым ніхто ня вольны дакараць. Браце Мітру, а ты, відаць, сябе зьненавідзеў!
Ваявода скрывіў твар, як бы зараз званітуе. Дакрануўся рукою да горла, наблізіўся да Нічыфара.
— Італьянцы, італьянцы, вось яны дзе ў мяне, калі б ткнуў пальцам у дыхалку, пачалі бы адтуль выскокваць, гэтулькі гэтага гаўна ўва мне! Зьвязаныя мы зь імі, дасылаюць яны нам есьці, трапілі мы ім у казан.
— Трэба так, ваяводзе, на тое Боская воля.
— Трэба ня трэба, але гэта патыхае здрадаю! У гэтым партызаны чыстыя, і я ім зайздрошчу.
— Але ж, ваяводзе, і дзівак ты: яны здрадзілі каралю й веры, плююць на цэрквы, а народ, як быдла, гоняць да агульнага карыта!
— Так, так, Нічыфару! Здрадзілі каралю і каралеўству, але ж не Югаславіі! А што да карыта, дык прыкра мне ўсё гэта, але ж тыя карыты, якія яны ні ёсьць, усё ж нашыя, а не італьянскія!
— Робяць яны і горшыя справы, сам мне пра гэта крыху раней распавядаў!
— Казаў і не адракуся, але ж гэта не зьмяншае глупства, якое робім мы. Кожны будзе адказваць за свае злачынствы і за свой

унёсак у агульнае гора, за свае заслугі ў распадзе і расколе.
— Адказваць будуць толькі пераможаныя. Пераможцы будуць трымаць у руках ключы ад праўды, спадару ваяводзе!
— І яны стануць аднойчы перад судзьдзёю справядлівым, і адны, і другія. Нішто ня вечнае, Нічыфару!
— Ці палохае цябе, сябра мой, гэты суд?
— Ня рады я яму, больш прычынаў для сораму, чым для гонару. А найгорш тое, што я ўсё гэта ведаю і не магу нічога зьмяніць. Нічога, зусім анічога: увайшоў у чараду ды іду за званочкам, хаця й ведаю, што мы не на тым шляху і што туды, куды мы ймкнемся, ніколі не патрапім. Нясе мяне плынь, назад не магу, а наперад няма куды.
Ваявода ўздыхнуў, нахінуўся і палашчыў шыю свайго Беланогага.
— А дзе ж тады паратунак, і ці ёсьць ён? — разьвёў рукамі пратапоп Нічыфар.
— Ёсьць, яшчэ раз табе кажу: бяжы зь Югавічаў! Пашлі ўнукаў у партызаны, а сам схавайся ад нажа й стрэльбы Асманавічаў.
— У партызаны? Каб што-што, а гэта мне раіў ваявода чэтнікаў!
— Запомні ўсё тое, што зараз табе скажу, Нічыфару! Яны, а ня мы, зломяць Асманавічаў. Яны, а ня мы, скінуць з шыі народу сэрбскага тую вяроўку, што накінулі яму швабы й харвацкая дзяржава…
— Накінуць яму, калі перамогуць, на шыю іншую вяроўку, ваяводзе!
— Але сёньняшнюю скінуць, у гэтым я ўпэўнены!.. Яны, а ня мы, адновяць Югаславію. Яны яе адновяць, калі толькі хто-небудзь увогуле ў стане яе аднавіць. Ведаюць, чаго хочуць, і ня маюць літасьці, а гэта для перамогі самае галоўнае. Мы зьбіліся з дарогі, ня бачым, куды б’ем, нам няма куды ісьці. Ня бачым ясна, чаго хочам, а чаго не, ногі ў нас заплятаюцца, яны спрытныя, а мы не пасьпяваем за падзеямі. За нас толькі сэрбы, а за іх і сэрбы, і нясэрбы. Калі ўсё ўсталюецца, пагодзяцца зь імі і ўсе астатнія. А ад нас тады адвернуцца самыя блізкія сябры. І кароль ім паклоніцца, змушаны будзе, гарантую!
Мітар Жэравіца нечакана спыніў размову і працягнуў руку Нічыфару:
— Ну, бывай, браце, давай расцалуемся!
Разьвітаўшыся, павярнуў Беланогага да дружыны, якая чакала

на яго. Раптам спыніўся і абярнуўся, быццам бы нешта згубіў.
— Забудзь, калі зможаш, усё, пра што мы гутарылі. Усё пройдзе і ўсё забудзецца, але нянавісьць Асманавічаў ніколі. Гэта ты памятай і трымай у галаве, Нічыфару!
— Мы зь імі кумы, ды і кроў у нас адна, на гэта ты забыўся. Больш за дзьвесьце год, як мы ў сваяцтве.
Ваявода даў знак рукою людзям, каб яшчэ крыху пачакалі. Вярнуўся, падагнаў свайго каня да пратапопава, нахіліўся да пратапопа ды так, што іхныя шапкі датыкнуліся.
— Менавіта таму, што вы адной крыві, што яны паўсталі з вашага семені, ікнай нянавісьці няма канца і краю. Менавіта таму ня мае межаў іх шаленства. Гэтае сваё паходжаньне ўспрымаюць яны як брудную пляму на сваім імені… Якую яны, браце ты мой, маюць повязь з Павэлічам? Адкуль гэта яны паўсталі „кветкаю харвацкаю“, самымі шалёнымі змагарамі за ўсташоўскую дзяржаву? А таму і адтуль, што Павэліч вынішчэньне сэрбаў узьняў як першую й сьвятую прысягу на сваім сьцягу! Толькі таму, мой Нічыфар! Гэтаксама яны назаўтра прыядналіся б да самога д’ябла, да каго заўгодна, калі цаною гэтаму была б пагібель сэрбскага народу. Агульныя карані не даюць ім спакою, у сьне мучыць іх рана гэтая непазбыўная. Пакуль у Югавічах ёсьць хаця б адно вуха — і яно будзе ім нагадваць мінулае ды здраду!
— Несправядліва казаць пра здраду, такі быў тады час, не было іншага шляху, каб пратрываць.
— Казаў што казаў і зноў паўтару: бяда цябе пільнуе з таго боку, не давярай сваяцтву, Нічыфару мой!
Яшчэ раз працягнуў ён пратапопу руку й сьцебануў Беланогага. Набліжалася навальніца, грымела і бліскала ў даліне Суцьескі, цямнела на ўзгорках і лагчынах каля Зэленгоры.

— Мара, далібог, давай, нарэшце, гэтую цыцвару, — ізноў падаў голас пратапоп, бо ўжо вызваліўся ад аблічча і голасу ваяводы.
— Зараз, зараз, масла блішчыць, бы шкло, — сьпяшаецца яна з гаршчком у руках.
Пад парывістымі і імклівымі ўдарамі ветру дрыжаць шыбы. На шкле зь сярэдзіны прыхапіліся ледзяныя карункі. Ёка ўзьнялася з-за стала, дыхнула колькі разоў у шкло, растапляючы корку, і паглядзела ў сьнежную бель і холад, адкуль даносіўся

прыглушаны брэх зьмерзлых сабакаў, якія круціліся вакол дамоў па замеценых сьцежках.
Пратапоп Нічыфар узяў вялікую калядную погачу, блаславіў яе тры разы і пераламіў над галавою старэйшага Станоевага сына Страхіні. Адну палову погачы перадаў брату. І пачалі яны ўдвох рукамі дзяліць хлеб на больш-менш роўныя кавалкі: на сямнаццаць частак, каб кожнаму дасталася аднолькавая, нават і таму дзіцёнку, якое ўчора нарадзілася.
Апроч пірага й каляднай цыцвары на стале было яшчэ досыць пітва ды ежы, самага лепшага і смачнага, што толькі было ў хаце і што толькі раз на год, на „Сьвята славы“[22], на Сьвятога Міколу, выносіла на софру сям'я дзеда Станоі і пратапопа Нічыфара. Тры гатункі віна, ракія „прэпэчэніца“[23] зь Піўскага манастыра, ракія з Уміну, зь ніжняе Герцэговіны, і, нарэшце, хатняя „забойная“, якую з гацкіх сьліваў прыгатаваў пад сьвята дзед Станоя. Чатыры зь верхам круглыя бляхі са смажанай казьляцінай ды баранінай, два кавалы сушанае вяндліны, каймак[24], сыр, хатняе масла, дзьве талеркі сухіх і марынаваных ігрушаў, кіслая капуста, пяць місаў зь печывам і смажаная бульба.
Належала, згодна са звычаем, перад тым як зьесьці й выпіць, кожнаму з дамачадцаў нахіліцца над гаршчком, дзе ў масьле плавала цыцвара, і паглядзець на сябе, як у люстэрка. Калі ўбачыш сваю галаву — гэта Боскі знак, што жывы й здаровы дачакаешся наступных Калядаў і наступных агледзінаў у цыцвары. Пасьля гэтага, пацалаваўшы адзін аднаго тры разы са словамі „Мір, Божа, Каляды!“, усе маліліся.
Першым, па старшынстве, перахрысьціўся і падышоў да цыцвары пратапоп Нічыфар.
У тое ж самае імгненьне трэснула шыба, і кавалак шкла пляснуўся на калядны стол!
З-за шыбаў ашчэрыліся рулямі стрэльбы!
Адазваліся, страшна і павольна:
— Хрыстос нарадзіўся, кумкі й браткі Югавічы!
І ў той самы момант перад дзьвярыма пачулася страляніна, зь дзьвярэй зьляцела засаўка, і з аўтаматам у руках у пакой уваліўся Хусэйн Асманавіч, увесь белы ад сьнегу, як млынар. А за ім ягоны бацька Кемаль.
— Хрыстос нарадзіўся, куме Нічыфару! — зароў Кемаль, трасучыся ад рогату, паказваючы гнілыя, скурадымленыя зубы,

і заазіраўся вакол сябе, як вар’ят.
Сьнег зацярушыў ягоныя панчохі і драўляныя чаравікі, ён трасе нагамі, але раптам супакойваецца і глядзіць на пратапопа Нічыфара.
Хусэйн міргае, утаропіўся ў Любіцу, на ягоным абутку й на вопратцы растапіўся сьнег, пад ім — там, дзе стаіць, — лужына, быццам ён усікаўся.
З вокнаў зьніклі рулі. У пакой уляцелі яшчэ два Асманавічы — Кемалеў брат Фазьлія і вуяк Зульфікар.
Югавічы ня рухаюцца. З узьнятымі дагары рукамі стаяць каля софры й каляднай цыцвары.
Першым азваўся дрыготкім голасам дзед Станоя:
— Ці з дабром вы, што добрае прынесьлі з сабою, куме Кемалю?
— Ха-ха, прыгожа кажаш, кумок. А з чаго б гэта мы ды ў такую завіруху, дарагі мой, да вас прыходзілі?
Кульгавы на правую нагу Зульфікар накіраваўся да софры, сунуў руку ў кішэню шынэлю, спыніў Кемаля і сказаў зь нянавісьцю й выклікам:
— Мы ж вашыя старыя знаёмыя, калядоўшчыкі, няўжо ж на каго іншага чакалі?!
Зульфікар высунуў з кішэні руку, поўную пшаніцы, і, кінуўшы яе, як сейбіт па ніве, у напрамку Югавічаў, прамовіў, усьміхаючыся:
— Хрыстос родзіцца, сёньня народзіцца і, Бог дасьць, больш ніколі!
А пасьля, зьвяртаючыся да пляменьніка Хусэйна:
— Ану, хутка, віншуй кумоў!
Хусэйн адскочыў у бок, хістаючыся, быццам п’яны, насунуўся пагрозьліва на Любіцу і Братаміра. Потым падышоў да печкі, адчыніў абцугамі дзьверцы, выцягнуў галавешку і, ударaючы ёю па распаленым жалезе, сыплючы іскры, пачаў лічыць:
— Колькі вылеціць іскраў з галавешкі, столькі няхай галоваў югавіцкіх зьляціць, столькі няхай дзяцей іхных ва ўлоньнях матчыных Аллаг зморыць, столькі вужакаў няхай ім вочы высьсе, столькі магілак без крыжоў і надпісаў паўстане, столькі крывавых ручаёў на сьвяточную сьвечку праліецца, столькі ніваў іхных пустазельлем парасьце, столькі перуном дзяцей заб’е, столькі… столькі ўдавіцаў і бясплодных матак, як пракажоных, па сьвеце пацягнецца!

— Нічога, няшчасны ты Хусэйне, ня значаць для цябе, даруй Божа, пабраціцтва, кумоўства, суседзтва і кроў Ільліна! — не сьцярпеў Нічыфар. Падаўся наперад і плюнуў на яго.
„Бач ты, брыкаецца поп! — падумаў Зульфікар. — Клянуся Аллагам, насяру яму сёньня на бараду й вусы. Ня будзеш болей хросту даваць, налію табе на нос матчынага малака. Абрэзаць бы яго! І абрэжу, клянуся Аллагам, абрэжу, абы было калі“.
За вокнамі на ймгненьне сьціхла завіруха. З суседніх дамоў даляцелі плач і крыкі аб дапамозе. Час ад часу чулася страляніна.
— Што кажа кум, нешта я аглух ад шуму й холаду!? — падаў голас Фазьлія.
— Любіца! Любіца, дачка мая! — раптам жаласна загаварыў дзед Станоя. — Ідзі да Станінага куфру, выцягні чатыры кашулі і чатыры пары панчох, адары гэтых каляднікаў, братоў і кумоў нашых!
Пасьля выпрастаўся і зьвярнуўся да Кемаля:
— Мы пад вашаю ўладаю, куме! Але ж прысядзь да софры, мо вып’ем разам трошкі.
„Іншага каго пакліч, сабака, глядзі, каб мяне не расчуліць. Жаласнае маю сэрца, вось ужо сьлёзы пацяклі, па сьпіне і па дупе цякуць. Баюся толькі, што нас вы не пашкадавалі б, ведаю добра, што пра нас думаеце і чаго жадаеце яшчэ ад самага Косава. І што ты цяперака пхаеш мне ў нос тое пабраціцтва і клічаш піць з табою, нібы я да цябе ў сваты прыйшоў, што мне хочаш давесьці тым, сабака ты гарбаты!“
— Вяжыце іх! — схамянуўся Кемаль. — Першымі Драгішавых сыноў і Братаміра.
Кемаль і Зульфікар наставілі на іх свае аўтаматы.
Хусэйн і Фазьлія падскочылі да Братаміра, схапілі яго пад пахі, крычаць яму штосьці, сьліна сьцякае па вуснах. Цягнуць Братаміра на сярэдзіну пакоя, ён вырываецца — хлапец дужы — аж ня могуць яму даць рады. Хусэйн выцягнуў нож, прыставіў Братаміру да горла, даў драўляным чаравіком у нагу, Братамір спатыкнуўся, падаўся наперад, больш не адбіваецца.
„Зарэжуць мяне, Божа ж мой! — праляцела ў яго галаве. — Сьніў наконадні, што хаджу без галавы і галава мая ў торбе Хусэйнавай. Зарэжуць! Канцы мне, няма паратунку, зараз жа пасярод хаты й зарэжуць!“

— Сюды, сюды, братка, сьпярша цябе зьвяжам, а потым ужо пап'ем, павесялімся й пагутарым.
Зьвязалі Братаміра, заламаўшы яму рукі за сьпіну, канцы вяровак абкруцілі дротам і зацягнулі абцугамі.
З такімі ж тычкамі й пагрозамі хутка зьвязалі Трыфку, Войку і Боіцу. Потым Страхіню й Драгішу. Апошнімі — пратапопа Нічыфара й дзеда Станою.
— Зацягвай мацней, я малады, поўны сілы, разарву дрот, куме!
— крычыць пратапоп, узбуджана скалячы зубы на Хусэйна.
— Сьмешна, вох, сьмешна, — адказвае Хусэйн. — Паказычы мяне, поп, каб я расьсьмяяўся.
— Дык вось як ты мне аддзячыў, Хуса, за тое, што я цябе, параненага, цягнуў праз усю Альбанію? — зьдзекліва пытаецца зьвязаны Братамір.
„Так, нёс мяне, ураташ мне жыцьцё, не магу ад таго адрачыся. Раздушылі б мяне тады ў тым пекле грузавікі й танкі… А можа і не, нічога б і не было, узялі б мяне ў палон італьянцы ды выправілі ў шпіталь. Сказаў бы ім, што ненавіджу сэрбаў і Югаславію, напэўна б мяне пусьцілі! Але што ж з таго, калі і ўратаваў. Ратаваў не з прыязнасьці, а каб потым выхваляцца й да самай труны мне гэтым у нос тыкаць і згадваць".
— А ці прасіў я цябе, каб ты мяне нёс? — выдыхнуў ён у твар Братаміру.
— Ты ж непрытомны быў, адной нагой на тым сьвеце, Хусэйне!
— Дык я ўдаваў, дурань, не хацеў загінацца за дзяржаву вашу ўласкую[25]!
— Удаваў, бадай, не ўдаваў! — скаліць жоўтыя зубы Кемаль Асманавіч. — А ён цябе, куме, замест каня ці асла выкарыстаў.
— Ха-ха-ха! — рагатаў Фазьлія.
— І чаму я ня кінуў цябе тамака, навошта мучыўся, Божа ж мой! — скрыгатаў зубамі Братамір.
— А хто ж тады прыйшоў бы да цябе сёньня калядаваць, калі б не ўратаваў ты Хусэйна! — выпрастаўся Зульфікар.
— Думай, што кажаш! — прыгразіў Братаміру Кемаль. — Зараз вось гэтым нажом адсяку твой паганы язык!
А Стана й Мара б'юць сябе рукамі ў грудзі, Ёка самлела й павалілася побач з софраю, лямантуюць і енчаць Любіца ды чатыры дачкі Страхіні. Коса, старэйшая, кінулася пад ногі Кемалю, цалуе яго смуродныя ад поту, мокрыя чаравікі:
— Не, куме, Богам прашу! Не рабі гэтага, прашу цябе!

— Устань, Коса, ня пэцкайся ў гаўне! — закрычаў пратапоп Нічыфар. — Не дамо сукіным дзецям, каб з нашае пагібелі шчэ й цешыліся!
— Праўду кажаш, куме Нічыфару, клянуся Аллагам! — ізноў разрагатаўся Фазьлія. — Заўжды вы былі героямі ў сваіх пакутах, яшчэ ад Косава!
— І тады, калі мы з вашымі жонкамі, дзякуй Аллагу, спалі! І калі вашых дзяцей атурэчвалі! — умешваецца Зульфікар.
— І калі мы вас, дзякуй Аллагу, на кол падсаджвалі! — падхапіў Кемаль і тыцнуў аўтаматам у сьпіну Братаміра.
— Любіца, горачка маё, ці прынясеш ты тое, што я табе казаў? — выкрыкнуў дзед Станоя.
Перапалоханая й зусім ашалелая Любіца кінулася ў кут да старога чорнага куфра, цяжкога дубовага куфра, які шэсьцьдзесят год таму баба Стана прынесла з пасагам, што складаўся з жменькі дукатаў і засушанага пахучага зельля. Любіца ледзьве ўзьняла цяжкую накрыўку і пачала шукаць падарункаў.
— Добры ты чалавек, што тут казаць, куме Станоя! — паляпаў яго па плячы Фазьлія. — Заўсёды я казаў, браты, што іхная хата самая гасьцінная ва ўсіх Югавічах.
— Так, так, дачка! А зараз, як належыць, раздай падарункі кумам. Кожнаму шкарпэткі й кашулі, як я табе й казаў. А Хусэйну, ад Братаміра, яшчэ й хустку.
„Адкуль у іх столькі мужнасьці, — падумаў Хусэйн, — каб так трымацца? Я на іхным месцы даўно б усраўся! Плакаў бы, кленчыў, усё б рабіў. А ты паглядзі на іх, паглядзі на гэтых сьвіньняў!“
— Ня трэба мне хусткі, сраў я на тваю хустку! — вырвалася ў Хусэйна.
— Звычай, сынку, таго патрабуе. А ты рабі зь ёй, што хочаш, куме Хусэйне!
— Хачу Любіцу, ябаў я твае шкарпэткі й хустку!
— А я Косу, каб ёй вярнуць клятвы і пацалункі! — крыкнуў Кемаль.
— Клянуся Аллагам, братка, і я б Любіцу! — падскочыў Фазьлія.
І ў той самы момант Хусэйн як бык накінуўся на Любіцу. Схапіў яе рукамі за грудзі, тузае і дзярэ пацеркі, агаліў ёй плечы й цыцкі, прыціскаецца да яе, пачаў яе лапаць і кусаць.

— Балія26! — зароў Братамір ды рвануўся да Хусэйна, за ім Войка і Страхіня. — Балія, заб'ю цябе!
Фазьлія націснуў на курок.
Войка і Страхіня захісталіся, словы застраглі ім у роце, кроў пырснула на калядную цыцвару, адзін струмень акрапіў і сівую бараду пратапопа Нічыфара. Упаў на стол і Боіца. Куля, прызначаная Братаміру, прайшла яму праз горла, разадрала гартань, не пасьпеў нават і ахнуць.
— Эх, шкада куляў, лепей нажом, мы ж дамовіліся, — вырвалася ў Кемаля. — Куля для людзей, а гэтыя не заслужылі нават і нажа!
— Куля, браток, для мядзьведзяў ды іншых зьвяроў, толькі не для ўлахаў! — дадаў Зульфікар.
— Трэба ўсё рабіць паволі, паціху, па-кумску, мерна, памятаеце, што казаў Фікрэт, — ізноў кажа задаволены Кемаль.
— І ходжа, ведаеце, што казаў: бязь сьпеху, па-людзку, каб ніхто потым не дакараў.
— Ці пад'ямо зь імі, мо было б добра, га? — запытаў Фазьлія.
— Пасьля, пасьля, маем час. Грэбуюць намі, гідзяцца туркаў, ня любяць з намі сядзець пры софры, сьмярдзім мы ім, га, сьмярдзім, кумку? — рыкае на Братаміра Кемаль.
— І не скачы больш, сядзі ціха, а то бач, ледзь не загінуў! — рагоча Фазьлія.
— Не бяжы, добра табе чалавек раіць, нельга ад сьмерці ўцячы, ані табе, ані мне, усіх нас чакае, нікога не выракалася! — ласкавым голасам паўтарае Зульфікар.
„Што ж гэта робіцца, ці ўсё гэта сьніцца мне, Божа ж мой! — пранеслася ў галаве Нічыфара. Капае кроў зь ягонае барады, у крыві ягоныя пальцы, чырвоная кашуля. — Разьня, колюць, як парсюкоў, як быдла, за софраю, маці галасіла й нагаласіла, я вінаваты, гэта я зрабіў, возьмуць маю галаву, але ж хаця б толькі маю, усіх нас зарэжуць, усё, няхай будуць праклятыя, Богу заплацяць, зямлі заплацяць, што гэта я блею, які Бог, чый Бог, няма Бога, няма ні партызанаў, дзе вы, чаму сёньня мяне не шукаеце, няма й ваяводы Мітра, чаму яго не паслухаў, Бог мяне ня выслухаў, зямля мяне ня прыме, які Бог, паглядзі, паглядзі ты на гэтага ката, на кума, на пароду Ільліну, паглядзі ты на гэтых забойцаў, ябаць іх усіх да дзявятага калена, брашы, брашы, як сабака, што ты шчэ можаш, вось табе пабрацімства, якое такое пабрацімства, з кім брацімства, накінуўся на куму,

рэж мяне, зараз жа, зараз жа, каб ня бачыць, ці цяжка мне і ці гаротны я, адыдзі ад Любіцы, адпусьці Анджу, паганец, што ж гэта, Мітру, браце родны, што ж тутака казаць, залаты ты чалавеча, адкуль было ведаць, мілы браце, усё пройдзе, усё пяройдзе, але нянавісьць іхная, злосьць іхная, ліха іхнае ніколі, дзе ж быў мой розум, няма адказу, забіў усю сям'ю, забіў кожны свайго, рэжуць па ўсёй вёсцы, рэжуць, рэжуць, няўжо яшчэ не нарэзаліся, а пазычыў я Кемалю сёлета грошай і даў яму валоў араць, і бедалагу Боіцу, каб вадзіў тых валоў, Боіца, сынку дзедаў, Боіца, рана сьмяротная, глянь на гаротнага Страхіню, разьбілі яму галаву, разьбіла яе маланка нябесная, ці ты чуеш мяне, Божа, дзе ты, Божа, ці ёсьць ты, не было цябе, выбачай, Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, ці чуе мяне хто-небудзь, ці бачыць мяне хто-небудзь, дзе вы, чарнагорцы, партызаны, браты мае, партызаны, ці саграшыў я перад вамі, перад кожным, дзеці мае, няўжо сёньня раніцай, няўжо на Каляды, апошні раз нам разьвіднела, пры софры, сьпі, няшчасны Станоя, дапамажы Сьвяты Васіль Астроскі, дапамажы й пачуй мой праклён, а што дасьць мне той праклён, што мне, што дасьць, партызаны далёка, Мітар далёка, чарнагорцы далёка, расейцы далёка, сонца далёка, Сэрбія далёка, усё далёка, толькі Кемаль паблізу, толькі яны паблізу, Божа мой, ці яны гэта, хто гэта, што гэта такое, што гэта я хрышчуся, баюся, каб ня ўбачылі, няма Бога, няма яго сёньня раніцою, Бог невінаваты, ня бачыць ён усяго, ня можа бачыць усяго, Ойча наш, каторы ёсьць у небе, дзьме вецер, ірвецца, чуеш, як трасецца дах, зруйнуецца, упадзе неба, праваліцца зямля, хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, гаротны хлеб, крывавы хлеб, а быў Братамір у Хусэйна сватам, у Бахоры, Божа ж мой, а тыя песьні, а тое вясельле, чуеш, Братамір, дык і я быў у Хусэйна сватам, вітаў Дэдага, адкуль нам гэтыя беды, не скавычыце, жанчыны, дзеля імені Боскага, адкуль вам толькі такая глотка, спыніся, Мара, толькі іх дражніш, дзе ж тая Любіца, што гэта зь Любіцай, чаго плачаш, куранятка дзедава, Бог твайго дзеда цяжка пакараў, усё гэта дзед заварыў, Сімана, галовушка ты мая разумная й чорная, так, вось як гэта было, далі мне чару, ня ведаю хто, можа, Кемаль, а можа, Дэдаг, а Рабія маладзенькая, прыгожая, што ж рабіць, ведаю столькі тостаў, але ж ведаю толькі нашыя, няёмка мне, каб не ўпікнулі, бач Фазьлію, бач Зульфу, што ўтаропіўся, Зульфага, рэж,

няшчасны, рэж, паскуда, заплаціш, заплаціш, а чаму гэта ён будзе плаціць, каму, каму, няма нідзе нікога, ці кінуцца мне на яго, каб мяне забіў, куды кінуцца, а можа й ня будзе, пакіне каго-небудзь, лепей яго не дражніць, разадралі вы мне вушы, жанчыны, Ёка, Стана, ды дзе ж гэтая Любіца, п'яныя, вар'яты, не зрабілі б таго цьвярозыя, п'яныя, як на вясельлі, а я падняў тады чару, першы выпіў Дэдаг, потым я кажу, што ж іншае мог тады прыпомніць, жадаю, каб было добра ім і нам, ды яшчэ, так, так, было, казаў гэта, каб келіх вялікі быў, як поўны ручай, а паміж намі любоў доўгая, каб Бог працягнуў жыцьцё й здароўе, шчасьце і квітненьне, добра селі, прыстойна ўсталі, добрую памяць прынесьлі, а лепшую з сабою аднесьлі, дай жа літасьцівы Божа, паслухай, літасьцівы, каб ты быў літасьцівы, не адбылося б гэтага сёньня раніцаю, і ня толькі сёньня, ты звар'яцеў, Нічыфар, ты п'яны, а яны не, як гэта сёньня раніцаю, як гэта толькі з раніцы, што ж ты зачапіўся за гэтую раніцу, рэжуць нас зь лета, ад распаду Югаславіі, нічога не засталося, ад нашага распаду, Бог нас пакінуў, ці сьпіць Станоя, ці жывы ён, у беднага Драгішы крывавае вока, калі ж гэта яго пабілі, не варухнецца Драгіша, паслухай, з раніцы, паслухай, ад лета, заўсёды рэзалі, заўсёды, з тых часоў, як Ільля патурэчыўся, заўсёды, заўсёды, дзе ж гэта быў мой розум, Мітру, браце, Мітру, ваяводзе, няма ў мяне брата, вось гэта мае браты, гэтыя ёсьць маімі братамі, ня маю нікога бліжэйшага, што ты вызьверыўся, чаго ж ты хочаш, чаго ж ты хочаш, спыніся, спыніся, што ты намерыўся, Кемалю!"

— Ябі, чаго чакаеш, сыне Хусэйне! — крыкнуў Кемаль і накінуўся на Косу, схапіў за валасы старэйшую Страхіневу дачку. Потым павярнуў галаву да Зульфікара:

— Выберы і ты сабе якую курвіну! Іншых забі, адразу, няма калі!

— Зарэзаць ці застрэліць? — пытаецца Зульфікар.

— Беражы кулі, цюхцяй! — адказаў яму Фазьлія.

Адным махам Зульфікар апынуўся за софраю, паміж жанчынамі. Аддзяліў Анджу ад маці й сясьцёр, кінуў яе Кемалю і Фазьліі… бліснулі клінкі!

Братамір хацеў нешта сказаць і кудысьці рушыць, ды здрадзіў яму голас, бы прыкавалі яго да падлогі, ня бачыць анічога, перакуліўся пакой, здаецца яму, што столь у яго пад нагамі, спыніліся думкі, глядзіць несьвядома, тупа і бяз выразу на

твары. У галаве ягонай каламуціцца толькі адна паўдумка, кідаецца, б'ецца аб сьценкі чэрапа, і сам ён хістаецца ў такт гэтым ударам: „Стрэльбы, гранаты, няма стрэльбы, няма гранаты, у сенцах сякера, усе зьвязаныя, у сенцах сякера, нідзе няма стрэльбы, на софры нож, усе зьвязаныя, чым, няма нідзе гранаты, у сенцах сякера…"
Менш чым за паўхвіліны сьціхлі енкі і крыкі „ратуйце". Чуваць толькі сьвіст крыві і хрыпы.
У Братаміра трошкі расчысьцілася ў вачох, бачыць ён нейкія цені, рухаюцца нейкія цені, а дзе ж Любіца, няма Любіцы, ён трасе галавою, каб вытрасьці зь яе сякеру й гранаты, яму патрэбны розум, а розум яго пакінуў, толькі вось гэтая сякера й гранаты круцяцца ў галаве, ізноў узьняў галаву, заўважыў Нічыфара.
„Крывавая ў дзеда барада, уся кашуля ў крыві, зарэзалі яго, а ён жывы і стаіць, мёртвы, а стаіць, не паддаецца ім, так і трэба, так і трэба, дзед Нічыфар, каб толькі мы былі незьвязаныя, што ж гэта я дазволіў сябе зьвязаць, маці Божая, думаў, што яны не наважацца, нічога мы ім не зрабілі, сьвятая Тройца, ці гэта Сіманіна галава, а дзе Сімана, вось яе галава, а чые гэта ногі, маці, маці, усе маўчаць, што ж гэта так усё зьнянацку, Божа, ці сапраўды мёртвы дзед Нічыфар, а дзе ж Станоя, тата, што з татам, гранаты й стрэльбы, няма ні стрэльбаў, ні гранатаў, сякера ў сенцах, сякера ў сенцах, няма гранатаў, а мы зьвязаныя!"
У пратапопа Нічыфара здубела крывавая барада, падрыгвае й стукае ён зубамі, круціцца софра наўкола яго, цемра, усё гусьцейшы змрок, ня думае ён ні пра што, ня бачыць анікога, чуе адно, як крычыць дзіцё, захліпнулася ад плачу, амаль што задушылася.
Дзед Станоя адкрыў шырока рот, уперыў зрэнкі ў столь, твар скрывіўся, хоча завыць, няма моцы, язык здранцьвеў. Здаецца яму, што гэта не галава малой Сіманы, а галава іхнай авечкі, двугодкі Зырны, якую ўчора ўвечары, перад хатаю, на сьнезе закалолі Драгіша й Братамір. І яна, калі ёй перарэзалі горла, таксама білася. Дый нож, які аблізвае Зульфікар і зь якога зьбірае кроў зь ляза і похваў, такі ж самы, як і Братаміраў: з доўгім і бліскучым канцом, трошкі выгнуты наперад, похвы з бычыных рагоў, з прыгожаю срэбранаю аправаю. Падалося дзеду Станою яшчэ, што гэткі альбо падобны нож бачыў ён

раней, нашмат раней, у дзяцінстве, пад туркамі, на пасе свайго бацькі Божыдара і дзеда Вука Югавічаў. Меў той нож, згадвае ён, восем срэбных зашпілек на похвах і быў доўгі, аж на 26 пальцаў, і не абы-якіх, а Вукавых і Божыдаравых. Першым, раней за ўсё астатняе, раней за велікодныя сьвечкі, раней за бутлі зь віном, на Сьвятога Мікалая клалі на софру гэты нож, і не абы куды, а туды, дзе было месца гаспадара і дзе мусіла быць месца толькі для гаспадара. Заходзілі, — пранеслася ў галаве Станоі, — у дом розныя турэцкія агі і дармаеды. Заходзіў і бэк Мустафа Асманавіч, прадзед Зульфікара, і ён меў на поясе такі самы нож, можа нават і гэты, менавіта гэты, якім Зульфа, ужо яго аблізаўшы, спрабуе адсячы бараду пратапопа Нічыфара.

Кашулю, якую падаравала яму Любіца, Хусэйн забіў ёй у рот, каб не верашчэла й не кусалася. Разяпіў штаны, спусьціў іх да каленяў, паказалася ягонае голае вахлатае гузло, праціскаецца ёй праміж ног, махтае нажом перад яе вачыма, грозіцца, што зарэжа. Яна раптам сьціхла, толькі енкнула праз кашулю ў роце, зьняможана падалася і перастала торгацца. Хусэйн пачаў, уверх-уніз, увесь час нешта мармычучы, выгінаецца, круціць гузлом, захапіў яго юр, забыў усё ад асалоды, выпусьціў нож з рукі, пачаў Любіцу хапаць за косы, грызьці за шыю й шчокі. Пацякла з-пад іх кроў, нашмат шчадрэй і мацней, чым з шыі Сіманінай.

— Машала[27]! Сыне, ты ж яе распароў! — ашалела, бы не ў сабе, ускрыкнуў Кемаль. — Цячэ, пырскае, ліецца, як з бочкі.

Не заўважыў Кемаль, як Любіца, пакуль Хусэйн стагнаў ад жарсьці, намацала нож у сябе ля галавы, ухапіла яго за цаўё, падцягнула пад Хусэйна, пад самы пупок, прыціснула моцна і адразу адчула вадкасьць і цеплыню пад пальцамі. Падалося ёй, што яна працяла вялікі бурдзюк.

Хусэйн зарыпеў, дрыгануў азадкам, падняў галаву, ізноў енкнуў, Кемалю ўсё здавалася, што ад уцехі й задавальненьня.

— Афэрым[28], сынок! Сыходзь, няхай цяпер асядлаюць Зульфа альбо Фазьлія!

Любіца пакруціла нажом у бурдзюку, з напругаю й гідлівасьцю. Потым торгнулася й выкруцілася з-пад Хусэйна.

Пакусаная і зьбітая, скрываўленая і раскудлачаная, яна ўскочыла на ногі і з нажом у руцэ рынулася на Кемаля. Ён спрытна адскочыў у бок, і яна, прамахнуўшыся, страціла моц

ды ўпала ніцма. Нож вылецеў з рук, грукнуў на падлогу і зьнік у саломе.
Выпрастаўся й Хусэйн, вываліў язык, сьліна цячэ, сподні спаўзьлі на лыткі, кішкі выпадаюць, ён падтрымвае іх рукамі. Мычыць, кроў ліецца яму па сьцёгнах, спрабуе рухацца, падае на калені, як калода, бяз гуку. Лопнуў, вываліўшыся, страўнік і пацягнула смуродам каля забітых і зьвязаных Югавічаў.
— Хусэйне, сонейка маё! Шчасьце маё, надзея мая пахаваная! — завыў Кемаль Асманавіч.
Укленчыў ён каля мёртвага сына, перавярнуў на сьпіну, зьбірае ягоныя скручаныя крывавыя трыбухі, пхне назад у распоратую нутробу.
— Забілі цябе сукіны дзеці, ябаў я іх у душу мацер, усіх выебу да дзявятага калена!
Раптам ускоквае, у вачох шал, сьлёзы ня можа стрымаць, хістаецца, як хворы, выцягвае з похваў нож, кідаецца на Любіцу і, схапіўшы за валасы, шпурляе яе побач з Хусэйнам.
Адным махам, як сьвінячы кумпяк, адцяў ёй левую грудзь, яна завішчэла, кроў пырскнула яму на лоб і шчокі. Адцяў нос, выцягнуў з роту язык і таксама адрэзаў. Убіў лязо ў вока, пракруціў колькі разоў і, выдраўшы вока, кінуў яго на стол перад пратапопам Нічыфарам. Тады дабіў Любіцу!
Тымчасам Зульфікар, трымаючы Анджу за валасы і заламіўшы яе галаву назад, спрактыкаваным рухам маханўў нажом, і галава Анджы засталася ў ягонай руцэ — вочы вылупленыя, рот разяўлены, быццам сказаць штосьці хоча.
Фазьлія зрабіў інакш: вылічыўшы Косіна сэрца, дакладна пацэліў між рэбрамі, прыціснуў з усяе моцы і пачаў гуляць нажом, закручвае яго справа налева, задае ўдары.
А Кемаль усё плача, круціцца на месцы, гразіцца ды паўтарае:
— Дорага заплаціш мне за Хусэйна, дорага, куме Нічыфару!
Неўзабаве спыніўся, выцер сьлёзы рукавом шынэлю, плюнуў на Любіцу, схапіў адрэзаную грудзь і кінуў яе на распалены круг пліты. Засквірчэла сырое крывавае мяса, і Кемаль, з усьмешкаю, падышоў да Братаміра. Адразу, без прыкідкі забіў яму нож у горла, а потым, сьцягнуўшы чару са стала, напоўніў яе да краёў Братаміравай крывёю. Зарагатаў так гучна, што Фазьлія пальцамі заткнуў вушы, каб ня лопнулі. Потым узяў Кемаль другую чару і, наліўшы віна, падсунуў яе Нічыфару.
— Вось, кумку, хачу выканаць тваё жаданьне, стукнуцца з

табою й выпіць!
Выпіў, адным духам, чару з крывёю, аблізнуў вусны і выгукнуў:
— Хрыстос нарадзіўся, кумку!
„Стоячы памрэм, стоячы, — апрытомнеў ад Кемалевага крыку пратапоп Нічыфар. — Не баяцца, усё, усё, толькі не баяцца, чаму быць, таго не мінуць, пагібель, канец сьвету, канец усяму, няма нічога пасьля гэтага, няма, хлусіць Біблія, няма, а шкада, што няма, сустрэліся б, спаткаліся б з Асманавічамі, чаго іх шукаць, яны нас знайшлі, заўсёды яны нас шукалі, а мы іх ніколі, хай не шукалі, вось жары цяпер гаўно, памры стоячы, Нічыфар, сьпявай, сьпявай, было б найлепш, каб засьпяваў, паспрабую, хачу паспрабаваць, бачыць Бог, як хачу, на злосьць сукіным дзецям, на злосьць Богу, яму, яму на злосьць, звар'яцеў ты, звар'яцеў, як бы Бог у чым вінаваты, каму гэта ты зьбіраешся рабіць на злосьць, выбачай, Усявышні, Ойча наш, каторы ёсьць у небе, а я буду сьпяваць, дай падумаю, якую, якую ж, дзе гэтыя песьні, уцяклі ад мяне ўсе песьні, ня ведаю, да д'ябла, ніводнай, што гэта раніцаю сьпявала Сімана, каб мяне, сьпявай, сьпявай, старая кляча, успомні, сьпявай, сьпявай, ці ведае няшчасны Станоя хаця б адну, а, Божа ж ты мой, якія ж усе няшчасныя, нічога няма мацнейшага ад песьні, эх, як бы я засьпяваў, якія такія сваты, Хусэйнавы сваты, гэта я памятаю, а песьні ня ведаю, забыў я кожную песьню, а ведаю тост, чый тост, адкуль мне ў галаву прыйшоў гэты тост, казаў яго Братамір, павітаў кума, эх, які гэта быў тост, ведаю яго ад першага да апошняга слова, ведаю, ведаю, лепшы, чым песьня, якая такая песьня, прасьпявай ім тост, няхай успомняць, няхай успомняць, калі ўвогуле штосьці памятаюць, а чым памятаюць, маюць яны чым, маюць, маюць, і памятаюць яны, толькі мы ня памятаем, толькі мы забываемся, хто такія, хто такія мы ўсе, віншаваньне для Мітра-ваяводы, ён таксама памятае, а можа й ня памятае, а толькі малоціць языком, прабач, браце, прабач, Мітру, няхай мне кожны выбачыць, кожны, кожны, выбачайце і вы, злачынцы, а што іншае магу я вам казаць, ня ведаю правільных словаў, ня ведаю сапраўдных песень, толькі Братаміраў тост на Хусэйнавым вясельлі, слухайце, слухайце, слухайце, браты й крэўныя, зараз я засьпяваю, прачышчу горла, так, так, давай, ня бойся, няма нічога такога, каб баяцца, кашляні яшчэ раз, дарма, дарма, божа, а шкада, вельмі шкада, якое няшчасьце, якая бяда, здрадзіў мне голас, мелі б што

пачуць, эх, як мне цяжка, ну як жа гэта было, а было гэта так, бачу Братаміра, эх, няшчасны Братамір, стаіць у канцы софры, у Кемалевай хаце, віншуе ўсіх, а глядзіць на Хусэйна й Дэдага, прыгожы, як з карцінкі, а словамі слова даганяе, дай, кажа, Божа, каб прыйшоў я ў дом ваш сёлета, а й вы прыйшлі б у мой дом да канца гэтага году, і многія гады добрага жыцьця, калі Бог дасьць, цалаваліся, як хлеб і віно, лашчыліся, як сапраўдныя браты, заўсёды прыходзілі і брацкую любоў дзялілі, за здароўе і доўгае жыцьцё кожнага майго прыяцеля, і кума, і пабраціма, амінь, дай Божа, паднесьлі нам атруту, што ім на тое сказаць, бедны Братамір, ці скажа ім калі-небудзь і хто-небудзь пра гэта, ня скажа ніхто, усіх нас заб'юць, усіх нас забілі, заб'юць і гэтае дзіця, насяры мне, Мітру, на труну, нічога лепшага я не заслужыў, і труны не заслужыў, толькі ня бойся, толькі ня бойся, але ж што з таго, што нажом, няхай нажом, няхай нажом, забівай, страляй, душы, толькі не нажом, кум Кемаль, паглядзі, які ў цябе добры аўтамат, страляй у мяне, давай, давай, да каго гэта ён, да каго гэта ён, можа да мяне, а можа ня хоча, можа, я ператрываю, як жа я ператрываю, што гэта ты вярзеш, няшчасны Нічыфару, сорам, Нічыфару, спалохаўся ты за сваю сраку й дурную галаву, застаўся безь яе, а навошта табе галава, а навошта табе жыцьцё, як гэта навошта, гэта маё жыцьцё, маё, нічыё іншае, ані тваё, Кемаль, ані тваё, Божа, адно ёсьць жыцьцё, і адзін Бог, выбачай Усявышні, Ойча наш, каторы ёсьць у небе, памры як чалавек, не хачу памірaць, спынілася завіруха, Божа, ці насамрэч спынілася завіруха, ці сьпявае нехта, сьпявае певень, сьпявае певень, а я не магу, а мне не сьпяваецца, і боязна мне, ці прыйдзе Мітар, ці прыйдуць партызаны, што гэта казаў Мітар пра партызанаў, яны адпомсьцяць Асманавічам, яны, яны, але ж не, ня бойся, ніхто нічога ня зробіць, яны мацнейшыя за ўсіх, толькі нажом, і нясьпешна, ня сёньня раніцаю, ня тутака, а нідзе, Божа, спынілася завіруха, мусіць быць гожы дзень, сьпявае певень, ён нічога ня ведае, яму ўсё роўна, заб'юць і яго, няхай засякуць, чый гэта певень, наш певень, няхай яго засякуць, ну, вось і адшукаў, што буду сьпяваць, добра Страхіню, нічога ня бачыць, шчасьлівая й ты, Мара, а ці шчасьлівыя мёртвыя, сьмерць цудоўная, найлепшая ад усяго, забі, даражэнькі, не катуй мяне болей, Кемалю, удар, удар, турча, і нажом, і куляю, і зубамі, і плугам, чуеш, плугам, дзе гэта наш плуг, зламаўся лямеш,

сёлета зламаўся на раскарчоўцы, ці хто яго паладзіў, ды до ўжо, до ўжо баяцца за сваю галаву, хто гэта страляе, дзе гэта страляюць, іржэ конь, Мітроў конь, асёл Мітроў, каб толькі не забілі малога, не далі мы яму імя, няма імені, заб'юць яго бяз імені, ліха маё, ліха нашае, засыпяваю, далібог, каму гэта буду я сьпяваць, ня маю калі, ня дасьць Фазьлія, ня дасьць Зульфа, зараз жа, зараз жа, што ж гэта робіць Зульфа, п'е кроў, ліжа нож, так і маю будзе, не маю, не, чаму не, вазьмі й маю, пі й маю, рэж, рэж, Ойча наш, выбачай, Ойча наш, каторы ёсьць у небе, толькі стоячы, толькі сьпявай, сьпявай, Нічыфару!"
„Назірай, назірай, ёсьць на што паглядзець, — усё круціцца па хаце і разважае пра сябе Кемаль Асманавіч. — Думалі, што мы ня прыйдзем, абложаныя мы, спалохаемся непагадзі й завірухі. А яшчэ кажуць, што мы браты, парсюк вам брат, гэта мы ды вам братамі будзем, лепей бы ў мора скочыў. Ведаем мы вас, ведаем, заўсёды вы нас трымалі за вылюдкаў, за ніжэйшых ад сябе, сьмярдзім вам салам, кажаце, што мы неачэсаныя, думалі, што вы нейкі асобны гатунак, паноў удавалі ды нават, калі былі нашымі сваякамі, і тады трымаліся гэтак, як бы былі вышэйшыя за нас, і глядзелі на нас з вышыні, як бы мы вашыя, а ня вы нашыя, як быццам мы рабы. Кумаваліся мы з вамі, бо мусілі, бо былі вашая ўлада й ваш час, апошняя вашая ўлада, у гэтым вам прысягаю! Аллагам і мёртвым Хусэйнам вам прысягаю!"
Драгішу здрадзілі ногі, ён паваліўся на падлогу, адкінуў галаву на левы бок, вусны ў яго сінія. Упаў, побач зь ім, і сын ягоны Трыфка, прычапіўся да бацькі, трасецца ад страху і плача, толькі ўсхліпы ягоныя невыразныя, прыглушаныя, як бы здалёк, зь нейкай суседняй хаты, альбо з труны, ці з-пад гурбы сьнегу. Пасінелі й апухлі Трыфкавы пальцы на зьвязаных руках, патануў дрот у мясе, і не прыкмеціш яго.
Зульфа штыхом тыкае ў твар Драгішы, той ня рухаецца, ня стогне, як бы калолі камень. Рагоча Зульфага, расшпільвае прарэху, сцыць на Драгішу й Трыфку, гамоніць:
— Дык я цябе выцьверажу пасьля каляднай папойкі, байструча ты ўлахаў!
Дзед Станоя самлеў, упаў ніцма каля стала. Мроіцца яму, што ён на талацэ, што ідзе ён першым касцом, на Брніцы, а можа нават на сьліўлянскіх Брлявах. Адарваўся, аддзяліўся ад усіх, ляціць над лугам, адсякаючы галоўкі чырвоным макам. Клічуць яго, просяць спыніцца, крычаць, што прыгатаванае ўсё да

полудня, ужо зь верхам мяса ляжыць на блясе, а яму дадуць галаву і лапатку, бо ён гэта любіць і належыць так першаму касцу. А ён ня можа спыніцца, павярнуў у кірунку грады, у бок Крылаў. Пад ім велізарныя мурашнікі, а ў мурашоў крылы, яны ляцяць, ляцяць, даганяюць яго, ня мае ён моцы скінуць іх зь сябе, усяго яго пакусалі. Гэта не мурашы, а пчолы, выйшлі на пашу, зьбеглі ад Панты Галубовіча, так, так, гэта Пантавы пчолы, цячэ мёд зь іхных крылаў, клеіцца да ягонага цела, ня можа больш ляцець, падае, падае, і ня можа ніяк спыніцца. Зараз пад ім тая самая паляна, і не паляна, а возера, пасярод вады — драўляны трыножак, ведамы яму гэты трыножак, на ім дзед Вук Югавіч, сьпявае:

Дзе яна сама ўпала,
Там возера стала.
Па возеры вараны конь плыве,
А за ім залатая калыска.
На калысцы сядзіць шэры сокал,
У калысцы той хлопчык,
На горле ягоным рука матчына,
А ў руцэ цётчыны нажы!

Правалілася возера пад дзедам Вукам, пайшоў ён пад ваду разам зь песьняю і з гусламі, няма драўлянага трыножка, цяпер гэтая калыска поўная галоваў, насаджаны яны ўсе на калы і добра яму вядомыя. Іхныя, іхныя, ня могуць быць іншыя, іхныя, ну так, пазнае іх па ўсім, асабліва па вачох. Першая галава — малой Сіманы, затым галава Станы, потым Мары і Братаміра. Палічыў іх, дакладна шаснаццаць, а зусім ззаду пазнае й сваю галаву, а потым пратапопа Нічыфара. Пад горлам у кожнага рукі Асманавічаў і нажы. Брацкія рукі і нажы, ніхто іншы, апроч свайго, так было спаконвеку, няма тут нічога новага. Але дзе ж малое, ня бачыць ён яго, няма ягонай галавы, куды падзелася? Абудзіўся ад страляніны й крыкаў:

— Ганіце быдла ў царкву, Ібрагіііііме!
— Эй, Фэрыдээээ!
— Эй, Ахмэцеееееe!
— Эй, Кемалююююю!

Зульфікар тыкае штыхом Драгішу, крычыць яму, што ўжо разьвіднела, што досыць ужо спаць, час падымацца, прыбылі суседзі, рэжа яму вуха, сячэ пальцы на руках. Потым кажа з

жалем:
— Паглядзі ты на яго, як здранцьвеў! Шкада, клянуся Аллагам, а то карцела мне вельмі гэтую ягоную ўласкую рэч неабрэзаную адсекчы і запхнуць яму ў глотку!
Трыфка не адыходзіць ад бацькі, абняў за шыю, дрыжыць, нібы ў падучцы. Кемаль страціў цярпеньне, ударыў Трыфку нажом у сьпіну, паміж лапаткамі, прыбіў яго да грудзей Драгішавых. Зрабіў гэтак два разы, тады толькі выпрастаўся і пхнуў перад сабою пратапопа Нічыфара:
— У царкву, куме, каб Югавічы маглі адсьвяткаваць Каляды і памаліцца за душу майго Хусэйна!
Праз рыпеньне сьнегу пад нагамі, праз шум і ўсташоўскія загады, што даносіліся з усіх бакоў, Кемаль не пачуў праклёнаў зморшчанага і акрываўленага пратапопа:
— Дай Божа, каб на вякі вякоў улоньне тваё развалілася, дай Божа, каб вада твая высахла, а ўзгоркі ў моры патанулі, дай Божа, каб усе ямы пад табою праваліліся, дай Божа, каб з твайго семені толькі атрута ўзьнялася, каб пад вільчыкам хаты тваёй толькі праказа радзілася й памнажалася, зямля герцэговінская! Дай Божа, каб апроч гэтага сабачага і ліхога паганскага семені нічога не магло ў цябе зачацца і нарадзіцца, а толькі б праказа праказу забівала і зьнішчала, пакуль уся ня вынішчыцца ў нашым гноі, дай гэта Сьвяты Васіль Вялікі!
Мароз шчыпле за вушы й скулы, хвошча вятрыска ўздоўж вуліцы, дым, які валіць ад спаленых хат, ніяк ня можа ўзьняцца ў неба і аддзяліцца ад гэтае пустое і страшнае зімовае белі і згаслых вогнішчаў; жахліва, нібыта выракаюць, выюць і скавычуць сабакі Югавічаў, равуць каровы, гойсаюць перапуджаныя коні, блеюць авечкі, каты сноўдаюць па сьцежках і выгінаюцца каля ног тых, хто жахлівай чарадою, зь перадсьмяротнымі стогнамі, крочыць да царквы, не ўсьведамляючы, што адбываецца і куды гэта іх сёньня вядуць і цягнуць.
Завіруха ўсё мацнее, уздымае зь зямлі калючы сьнег, круціць яго, сыпле на катоў, на сабак, на тлелыя вогнішчы, на Югавічы, на калёну зьвязаных людзей і на яе правадыроў.
Забіваецца гэты сьнег у вопратку і ў бялізну, у бровы і ў косы, у замкі ўсташоўскай зброі, засыпае раны на сколатых шыях, замятае шнары на людзкіх тварах і на ўсё накідвае плашч цудоўнага спакою і нявіннай белі.

Там, у лагчыне, у кірунку Брняца, Вучава і Чэмэрны, у напрамку Зэленгоры і Думашаўскіх Градаў выбухнула таксама белая і густая завея, і невядома, і нябачна, ці крочаць адтуль да царквы ў Югавічах такія самыя калёны ці, можа, якія-небудзь ратаўнікі.
Але ж скуль, у гэтую раніцу, прыйдуць ратаўнікі?
І каго, калі б нават і дайшлі, сталі б ратаваць гэтыя нябачныя ратаўнікі?
— Забыліся мы ў хаце, Кемалю, дзіцёнка Братаміра, — вынырнуў з завірухі, хукаючы на замерзлыя рукі, Фазьлія.
— Бяжы, вяртайся ў хату ды накрый чымсьці Хусэйна!
— А што з малым, забіць?
— Прынясі ў царкву, няхай ходжа вырашыць!
Ці мог бы пасярод гэтае бяды й завірухі Кемалевы словы пачуць пратапоп Нічыфар? Але ж спыніўся, выпрастаўся, як статуя, па-праройску ўсьміхнуўся і пачаў жаліцца ў завіруху:

Лютая клятва падзе на вылюдка!
Пракляне міжволі маці сына,
Пракляне Мара свайго сына Станішу,
Прыкусіў ён ёй, смокчучы, грудзі,
Праліў райскае ёй пітво за пазуху!
Падбег да яго нехта з усташоў, запхнуў пратапопу рукавіцу ў рот і плюнуў у твар. Падышоў да Нічыфара і малады ходжа, які толькі той зімою вярнуўся з школы з Каіру.
— Ала і вера, поп! Буду мужам маці сваёй у гэткую непагадзь, калі гэтую тваю прагу да песьні, як прыйдзем у царкву, не спаталю. Тады рыпі, унутры, паміж іконамі, раві, хрыпі, брашы і вый, скавычы, колькі табе глотка дасьць!
Галава доўгай калёны прайшла праз выдраныя і кінутыя ў сумёты вароты царкоўнай агароджы. Нехта з Асманавічаў націснуў на царкоўныя дзьверы, зьбіў засаўку, трэснуў нагою і зароў:
— Заганяйце быдла ўнутро, каб яго не працягло!
— І агонь запаліце, каб сагрэлася і павесялела! — дадаў малады ходжа Вэлія.
Падышоў і Фазьлія, задыханы, з калыскаю на плячох. Загадаў яму ходжа апусьціць калыску на зямлю, потым адхінуў чорную чабанскую накідку і паглядзеў на зьмерзлае дзіця, якое дрыжэла і бяз плачу смактала палец левай рукі. Паклікаў

Кемаля. Паклікаў і ўсташоўскага камандзіра, свайго стрыя, каржакаватага Фікрэта Асманавіча, які быў нападпітку.
— Клянуся Аллагам, на штых яго трэба і ў агонь! — выдыхнуў Фазьлія.
— А ты, Кемалю, што б ты зрабіў?
— За ногі ды гэтым гаўнюком аб царкоўныя сьцены, каб адпомсьціць за Хусэйна!
Ходжа даў знак Фікрэту, аддаліўся зь ім на пару крокаў у бок, пашаптаўся, а потым, вярнуўшыся да калыскі, сказаў Кемалю.
— І я, — павольна пачаў ходжа, — грукнуў бы яго аб царкву, калі б не было яшчэ больш страшнай, жахлівай кары й помсты, мой Кемалю! Вазьмі яго, ён зараз твой, замест Хусэйна! Ня мусім яго, слава Аллагу, нават атурэчваць, яшчэ неахрышчаны ён і неапаганены!
— Клянуся Аллагам і верай, мне гэта недаспадобы!
— А скажы мне дакладна, Кемалю, калі твая нявестка нарадзіла Хусэйну сына?
— Паўгода таму, калі мы паскідвалі тых улахаў у яму каля Корыта і калі, браце, прыйшла вестка, што выбухнула сэрбскае паўстаньне ў Нэвэсіні[29].
— Значыць, так, Кемалю. Твая нявестка Рабія цяпер ля адной грудзі будзе трымаць Фахрудзіна, сына Хусэйнава, а ля другой гэтага байструка, сына Братаміра, Алію Асманавіча, вось я яму і імя знайшоў!
— Чаму Алія? І чаму ўсё ж не зарэзаць гэтае быдла?
— Увесь час яны нам наракалі, што, маўляў, паўсталі мы ад іхнага прапрапрадзеда Ільлі, які патурэчыўся і перамяніў імя на Алія. Ну, што ж, калі гэта так, яшчэ раз, браты, мы зь імі пабратаемся і пароднімся. І вось што, яшчэ раз зь іхных крыві і семені праб'ецца семя Аліёва!
— У цябе, ходжа, розуму багата! — падскочыў, незаўважна да іх далучыўшыся, Зульфікар.
Скінуўшы зь сябе шынэль, ён перакінуў яго цераз калыску і сказаў з задавальненьнем:
— Аллаг цябе ўратаваў, Алія Асманавіч.
Тымчасам у царкву з бліжняга хлява прынесьлі сена. Раскідалі яго па каменных плітах, па абразох, па драўляных жоўтых сходах, якія вялі да званоў.
Сена кінулі і на зьвязаных і пабітых Югавічаў.
Ніхто не бараніўся, ніхто не варухнуўся, не было ні плачу, ні

сьпеваў. Не сьпяваў і пратапоп Нічыфар, хаця ходжа і выцягнуў рукавіцу зь яго роту, схапіў за падрапаную бараду і сказаў:
— Ану, поп, зачынай гэтую, пра Стояна Кавачавіча, якую ты летась на Каляды сьпяваў у Югавічах! Альбо, калі маеш ахвоту, гэтую наскую, турэцкую, пра агу Чэнгіча[30] ды пра кроў вашую, што праліў ён на Грахаве. Выбірай, хаця мне, душа мая, гэтая апошняя больш даспадобы!
Пратапоп на яго й не паглядзеў. Толькі зусім ціха, ледзь варушачы патрэсканымі й скрываўленымі вуснамі, шапнуў:
— Нічога добрага ня будзе! Нічога ня будзе добрага для цябе, чорная і спустошаная, праклятая зямля герцэговінская!
Прыцягнулі ў царкву й гальлё, запалілі агонь, завалілі дзьверы бярвеньнем.
Узьняўся дым і полымя, пачаўся стогн, енк і віск, як калі пастухі пякуць вужаку на вугольлі.
Ходжа ўзяў калыску, узьняў яе на плечы — высьветліў яго агонь, абгарнула завіруха, і ўсе пачулі тое, што ён вымавіў:
— Віншуй іх з Калядамі, Алія Асманавіч!

Пераклала з сэрбскай Алена Арэшка паводле:
Вук Драшкович. Нож. Београд. Записи, 1982

ЗАЎВАГІ
[1]*Калі яму ўсташоўскі кат у Ясэнаўцы…* — Усташы — узброеныя фармаваньні Незалежнай Дзяржавы Харватыі (НДХ), назва паходзіць ад „усташ“ (харв.) — паўстанец. На чале большасьці аддзелаў стаялі сябры ўсташоўскай харвацкай рэвалюцыйнай арганізацыі, якая была сфармаваная пасьля манархісцкага дзяржаўнага перавароту ў Каралеўстве Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў 6 студзеня 1929 году (пасьля перавароту — Каралеўства Югаславія). Ясэнавац — усташоўскі канцэнтрацыйны лягер у Босьніі.
[2]*Софра* — нізкі стол ці ўрачыстая трапэза.
[3]*Гуслы* — паўднёваславянскі смыкавы інструмэнт, корпус грушападобны, струны, смык кароткі, трымаюць гуслы старчма.
[4]*Нэвэсінскае паўстаньне* — адно з шэрагу антытурэцкіх паўстаньняў, якія ахапілі Босьнію і Герцэговіну ў 1875—1878 гг.
[5]*…калі пала Турцыя… увайшлі ў Герцэговіну аўстрыйскія жаўнеры…*— паводле Сан-Стэфанскай мірнай дамовы (люты

1878 году) Босьнія і Герцэговіна атрымалі аўтаномію, паводле Бэрлінскага трактату 1878 году Босьнія і Герцэговіна адышлі да Аўстра-Вугоршчыны.

[6]*…хату ягонага бацькі Божыдара наведвалі Васа Пэлагіч, Міца Любібраціч, …Богдан Зімоніч..* — Васа Пэлагіч — рэвалюцыянэр, першы прапагандыст сацыялістычных ідэяў у Босьніі і Герцэговіне; Міца Любібраціч, Богдан Зімоніч — кіраўнікі герцэговінскіх паўстаньняў супраць туркаў другой паловы XIX стагодзьдзя.

[7] *Зазірнуў аднойчы… і Пэтар Мрконіч, унук Караджорджы й будучы кароль Сэрбіі…*— Пэтар Мрконіч — Пэтар I, кароль сэрбскі, а пасьля Каралеўства Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў з 1903 па 1921 год, Караджорджа (1768—1817) — нацыянальны герой сэрбаў, кіраўнік Першага сэрбскага паўстаньня 1804—1813 гг. супраць Асманскай імпэрыі, заснавальнік каралеўскай дынастыі Караджорджавічаў, забіты на загад Мілаша Абрэнавіча, кіраўніка Другога сэрбскага паўстаньня.

[8]*Ведаў пратапоп і Нэдэльку Чабрынавіча…* — Нэдэлька Чабрынавіч, сябра арганізацыі „Млада Босна“, якая падрыхтавала замах на аўстрыйскага эрцгерцага Франца-Фэрдынанда ў Сараеве 28 чэрвеня 1914 году; бомба, кінутая Чабрынавічам, не пашкодзіла Францу-Фэрдынанду: ён загінуў у той жа дзень ад кулі Гаўрылы Прынцыпа.

[9]*…а часта й да самога Косава…* — на Косавым полі 15 чэрвеня 1389 году сэрбска-басьнійскае войска пацярпела паразу ад войска турэцкага султана Мурада I, і Сэрбія стала васалам Асманскай імпэрыі.

[10]*…пасьля распаду Аўстрыі і паўстаньня Югаславіі…* — распад Аўстрыі адбыўся пасьля падпісаньня Аўстра-Вугоршчынай міру з Антантаю 28 кастрычніка і капітуляцыі 4 лістапада 1918 году. У выніку аддзяленьня паўднёваславянскіх тэрыторыяў ад Аўстра-Вугоршчыны 1 сьнежня 1918 году паўстала Каралеўства Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў, пасьля манархісцкага дзяржаўнага пераварота 1929 году — Каралеўства Югаславія з „адзіным югаслаўскім“ народам.

[11]*Швабскі* — тут аўстрыйскі.

[12]*…калі ня стала Югаславіі й стварылі Незалежную Дзяржаву Харватыю…* — 10 красавіка 1941 году было абвешчана аб паўстаньні на акупаванай немцамі й італьянцамі тэрыторыі Незалежнае Дзяржавы Харватыі, якая ўключыла ў сябе Босынію

і Герцэговіну.
[13]*…пад час красавіцкае вайны…* — Нямеччына напала на Югаславію 6 красавіка 1941 году, 17 красавіка генэрал Калафатавіч ад імя ўраду падпісаў акт аб капітуляцыі югаслаўскай арміі.
[14]*Погача* — круглы прэсны хлеб.
[15]*Антэ Павэліч* — кіраўнік створанай пад акупацыяй (10 красавіка 1941 году) Незалежнай Дзяржавы Харватыі, яе „поглаўнік“.
[16]*…паміж „кукардамі“ і „чырваназорнымі“…* — кукарды насілі на шапках чэтнікі, узброеныя сілы эмігранцкага каралеўскага ўраду, якія на мэце мелі аднаўленьне Югаславіі як канстытуцыйнай манархіі, ад „чэта“ — аддзел (сэрб.); „чырваназорныя“ — чырвоную зорку на шапках насілі партызаны-камуністы. 4 ліпеня 1941 году Палітбюро Камуністычнай партыі Югаславіі аддала загад пачаць узброеную барацьбу супраць акупантаў.
[17]*Цыцвара* — нацыянальная сэрбская страва з кукурузнай мукі, масла й сыру.
[18]*Ракія* — гарэлка з садавіны альбо вінаграду.
[19]*…Косаўская вячэра і лёс Абіліча з Бранкавічам…* — згодна з народным паданьнем, напярэдадні Косаўскай бітвы князь Лазар запрасіў вялікіх сэрбскіх фэадалаў да сябе на вячэру, паміж імі пачаліся спрэчкі, Вук Бранкавіч абвінаваціў Мілаша Абіліча ў здрадзе, а наступнага дня Мілаш Абіліч прабраўся ў султанскі намёт і закалоў турэцкага султана Мурада I.
[20]*Чакшыры* — усходняе сподняе мужчынскае адзеньне, з вузкімі нагавіцамі, якія зашпільваюцца на баку.
[21]*Арнавуты* (з гр.) — альбанцы.
[22]*„Сьвята славы*“ — сямейнае сьвята ў гонар сьвятога, патрона сям’і.
[23]*Ракія „прэпэчэніца*“ — моцная ракія, два разы перагнаная.
[24]*Каймак* — вяршкі.
[25]*Улах* — абразьлівая назва праваслаўнага сэрба і чарнагорца.
[26]*Балія* — абразьлівая назва для басьнійска-герцэговінскіх мусульманаў.
[27]*Машала* — вокліч зьдзіўленьня й захапленьня.
[38]*Афэрым* (з пэрс.) — брава! выдатна!
[29]*…выбухнула сэрбскае паўстаньне ў Нэвэсіні…* — пачатак узброенай барацьбы чэтнікаў супраць нямецкіх акупантаў у

чэрвені 1941 году ў Босьніі і Герцэговіне.

[30]*…зачынай гэтую, пра Стояна Кавачавіча… гэтую наскую, турэцкую, пра агу Чэнгіча…* — Стоян Кавачавіч (1821—1911), ваявода, гайдук, змагаўся з туркамі і аўстра-вугорцамі; герой народных паданьняў, Ізмайл-ага Чэнгіч (1788—1840), герцэговінскі фэадал, змагаўся з сэрбскімі паўстанцамі ў 1809—1810 гг., герой паэмы харвацкага паэта Івана Мажураніча „Сьмерць Ізмайла-агі Чэнгіча“.

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**

Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000
славянская ідэя

Ян Патачка
Чым ёсьць чэхі?

Рычард Ян Патачка (1907—1977) — адзін з найбольш вядомых сярэднеэўрапейскіх філёзафаў XX стагодзьдзя, самы выбітны, нароўні з Томашам Масарыкам, чэскі мысьліцель адыходзячага веку. Будучы вучнем і сябрам Эдмунда Гусэрля, студэнтам Марціна Гайдэгера, Патачка на працягу ўсяго жыцьця быў цесна зьвязаны з фэнамэналёгіяй і зрабіў у яе разьвіцьцё значны ўнёсак (як філёзаф, выкладчык і маральны аўтарытэт ён зрабіў агромністы ўплыў на два пакаленьні чэскіх гуманітарыяў). Спэцыяліст у абсягу старажытнай філязофіі, эстэтыкі, філязофіі гісторыі, чэскай гісторыі і культуры (асноўныя працы: *Prirozeny svet jako filosoficky problem s Telo, spolecenstvi, jazyk, svet s Uvod do fenomenologicke filosofie s Nas narodni program*). Яго творы характарызаваліся спалучэньнем клясычнай эўрапейскай эрудыцыі і драматычнага досьведу жыхара Прагі XX ст. Заняткі спэкуляцыйным мысьленьнем не зашкодзілі яму вызначыцца ў адміністрацыйнай і грамадзкай дзейнасьці. Прафэсар Карлавага ўнівэрсытэту ў Празе, адзін з трох першых рэчнікаў „Хартыі-77“ — усе гэтыя функцыі ён спаўняў самааддана і ахвярна. Памёр Патачка пасьля сэрыі допытаў у паліцыі.

I.

Чэхі — малы сярэднеэўрапейскі народ, які насяляе адасоблены ад іншых, калісьці вельмі цяжкадаступны край (Чэхія) і суседнюю, разьлеглую на шляхах зямлю (Марава). Былі і такія часы, калі Эўропа зусім ці амаль не цікавілася чэхамі, былі і іншыя, калі сьледам за драматычнымі калізіямі пра чэхаў раптоўна ўзгадвалі, каб гэтак жа хутка забыцца на іх. Гэты амаль дзесяцімільённы народ гаворыць заходнеславянскай мовай, досыць цяжкой для навучаньня. Ён багата запазычыў з эўрапейскае спадчыны, але Эўропа вельмі мала ўзяла ад яго з-за моўнага бар'еру. Імёны некаторых з чэхаў — палітыкаў, музыкаў, спартоўцаў — набывалі розгалас час ад часу, зь літаратуры ж паўсюдна знанаю стала хіба што постаць „удалага ваякі Швэйка". Па-за гэтым пра народ, які пасьля першай сусьветнай вайны заняў зусім не апошняе месца спаміж эўрапейскіх малых дзяржаваў, ведаюць у сьвеце няшмат, а ўсё, што зь ім зьвязанае, прызнаецца трывіяльным і нецікавым, ці, прынамсі, падаецца гэткім.

Чэхі — тыповы *малы* народ. „Вялікі" і „малы" — узглядам пэўных народаў гэтыя адзнакі нельга лічыць падставовымі колькаснымі катэгорыямі. Неабавязкова рахаваць свае душы на мільёны, валодаць вялікай тэрыторыяй, дый увогуле яе мець, каб стацца вялікім народам. Наўрад ці можна назваць малым народам галяндцаў, яшчэ ў меншай ступені — габрэяў. Веліч пэўнага народу почасту бывае зьвязана зь велічынёю яго тэрыторыі, аднак не наўпрост, а пры дапамозе тых задачаў, якія зьвязвае з сваёй тэрыторыяй народ. Амэрыканцы сталіся колькасна вялікім народам, толькі спраўдзіўшы тую задачу, што самі сабе паставілі — авалодаць цэлым кантынэнтам. Іхнае рэлігійна-вальналюбнае стаўленьне да сьвету і да сябе саміх зрабілася падставаю іх сапраўднае велічы. Расейцы — вялікі народ, бо яны ажыцьцявілі ўспадкаваную ад Бізантыі ідэю імпэрыі, распасьцёршы сваю краіну ад Ціхага акіяну да межаў Кітаю. Былая веліч немцаў, у нечым заўважная і па сёньня, палягала на іх ролі апірышча эўрапейскага Захаду й пасьлядоўнага правадніка ўнівэрсалісцкае ідэі сярэднявечнага хрысьціянства. Пашырэньне на ўсход ды калянізацыя новых народаў, нягледзячы на свае злавесныя формы, усё ж не былі для немцаў толькі рэалізацыяй іх уласных патрэбаў. Некалі і французы лічыліся *la grande nation*, бо ўсур'ёз узяліся выконваць

засталую ад Рымскае імпэрыі ролю: прадстаўляць, ачаляць ды бараніць Заходнюю Эўропу.

Скарыстаўшы аналёгію з адрозьненьнямі, якую Кант рабіў паміж матэматычнаю і дынамічнаю „велічынямі“ ў пачуцьцёва-эстэтычнай сфэры, можна весьці гаворку пра колькасную і дынамічную веліч народаў, пры гэтым першая, без сумневу, грунтуецца на другой. Стары Рэтцэль[1] трымаўся тае думкі, што велічыня прасторы абумоўлівае духовую веліч, аднак нам здаецца, што адно другая зь іх — сапраўдная. Грамадзтва можа часта мець разам зь вялікай тэрыторыяй і вялікія гістарычныя задачы, але наўрад ці духовая веліч народу наўпрост вынікае з памераў яго прасьцягу. Важнай, аднак, ёсьць іншая тэза Рэтцэля: прастора, ад якой залежыць колькасная веліч, мае не прыроднае, а гістарычнае вымярэньне, вызначанае тымі спосабамі, празь якія чалавецтва, у сваіх гістарычных праявах ды формах, засвойвала гэтую прастору. Так, у гістарычнай прасторы *Imperium Romanum*, у адрозьненьне ад дзяржаваў Індыі, Партыі ды Ўсходняе Азіі, сталася ня толькі мэтафарычнаю, але й сапраўды ўнівэрсальнаю дзяржаваю. Паза яе межамі існавала адно магма напаўаселых народаў ды неасвоеных прасьцягаў.
Важна зазначыць, што маштабы велічы таго ці іншага народу гэткія ж зьменлівыя, як і гістарычныя межы прасторы. Калі ў сярэднявечных варунках фэўдальнае раздробленасьці ўлады, браку камунікацыяў, мізэрнае сацыяльнае мабільнасьці ўрэшце ўсё ж былі асвоеныя Паўночная і Цэнтральная Эўропа, такая аднародная, сьпярша дэспатычна кіраваная, а пасьля ператвораная ў цэнтар дзяржавы зямля, як Чэхія, пачынаючы з X і да XVII ст. уважалася за вялікую тэрыторыю.

Няцяжка заўважыць, што і колькасьць насельнікаў пэўнае краіны ёсьць вельмі адносным гістарычным чыньнікам. Таму лічбы падобнага кшталту нельга супастаўляць абстрактна, яны патрабуюць параўнальнага, стасоўна суседніх краінаў, аналізу ды ўліку сацыялягічных фактараў. Насельнікі Чэхіі з часоў Сярэднявечча, пачынаючы з хвалі каляніза цыі, — гэта, як і ў суседніх краінах, у вялікай ступені ўжо жыхары гарадоў. І ўжо з

часоў гусіцкіх войнаў яны гавораць тутэйшаю славянскаю моваю. Вядома, што ў XV стагодзьдзі Чэхія была ў стане выставіць на вайну досыць вялікае войска, а значыць, давесьці падобным чынам сваю перавагу, сваю „веліч“.
Сярэднявечная Чэхія была некалі полем для ажыцьцяўленьня вялікіх гістарычных задач. З аднаго боку, краіна, да канца XII стагодзьдзя на 90% пакрытая пракаветнымі лясамі, станавіла ідэальны аб’ект для заваёвы, зь іншага — чэхі здаўна былі дастаткова арганізаванымі, каб не дазволіць Захаду сябе проста так паглынуць. Падобная краіна зь непазьбежнасьцю мусіла стаць адным з вызначальных для эўрапейскае гісторыі месцаў, пытаньне было толькі ў тым, хто будзе праводзіць у жыцьцё яе эўрапейскае прызначэньне. У гэтым сэнсе мясцовае насельніцтва зь ягонаю славянскаю моваю станавілася значэнным чыньнікам. Вядома, мова не была ні адзіным, ні, пагатоў, вырашальным момантам у жыцьці грамадзтва, якое склалася тут, але менавіта яна, з часоў велічы Чэхіі, вызначала яго адметнасьць.

Чэхі чэрпалі сваю гістарычную веліч з тых самых крыніцаў, што і астатнія народы Эўропы, а значыць, і праблемы чэхаў у бальшыні сваёй былі тоесныя эўрапейскім. Вось жа, і ў Чэхіі вырашаліся праблемы сусьветнага маштабу — у той ступені, у якой тагачасная Заходняя Эўропа пакрывала сабой гістарычны Сусьвет. Справа гонару пераплятаецца ў тагачасных падзеях з справаю лёсу: ужо апошнія чэскія каралі — Пржэмыславічы — ведалі, што маюць альбо стацца імпэратарамі, альбо загінуць — і велічна загінулі[2].
У кожным разе, Чэхія зь яе дынастыяй за паўтара стагодзьдзя робіцца падмуркам для палітычнае арганізацыі ўсяе Сярэдняе і Ўсходняе Эўропы на заходні ўзор. А пазьней менавіта тут прагучыць адказ на вялікае пытаньне эпохі, пытаньне сэкулярызацыі заходняга хрысьціянства. У гэтай справе Чэхія была фарпостам, паўсталым да пачатку ўласна Рэфармацыі й заняпалым пад час вялікіх змаганьняў XVII стагодзьдзя.
Гэты заняпад ня тычыўся існаваньня самой чэскае дзяржавы, але ён стаўся знакам перамяшчэньня Чэхіі на пэрыфэрыю сусьветнае гісторыі, знакам яе правінцыялізацыі й страты былое велічы. Надышоў час „малой“ гісторыі чэхаў. І ў гэтай

гісторыі такая лякальная зьява, як тутэйшая мова, робіцца галоўнай праблемай для надыходзячай эры Асьветніцтва. У гэтым выявілася супярэчлівасьць асьвечанага абсалютызму. З аднаго боку, цэнтралізаваная імпэрыя Габсбургаў рабіла нібыта ўсё, каб адабраць тутэйшай мове найменшую пэрспэктыву для разьвіцьця, з другога ж, цікавіцца ёю вымушалі дзяржаўныя праграмы распрыгоньваньня сялянства. Моўны нацыяналізм школы Гердэра моцна спрычыніўся да канчатковага расколу чэскага грамадзтва, які адбываўся паводле крытэрыю мовы. Менавіта з гэтага расколу й паўстала мадэрнае чэскае грамадзтва, якое разбудоўвалася фактычна „зьнізу“, таму што вышэйшыя слаі ў бальшыні сваёй карысталіся зусім не славянскаю моваю.

„Малая“ гісторыя чэхаў ёсьць гісторыяй змаганьня гэтага „будаванага зьнізу“ грамадзтва за сваё разьвіцьцё ды раўнапраўнасьць. Зацятая барацьба, сьпярша чыста культурніцкага, а пасьля ўсё болей палітычнага зьместу, складае цэлую эпоху, ажно да першае сусьветнае вайны. І гэтая барацьба прыносіла плён, хаця ніжэйшыя слаі й ня мелі ні істотнае палітычнае ці эканамічнае моцы, ні вялікага духовага заплечча.
Абставіны ўзьнікненьня новага чэскага грамадзтва выглядаюць неспрыяльнымі. Яму супрацьстаіць палітычная ўлада, паноўная дынастыя, дзяржаўныя інтарэсы імпэрыі. Індустрыя і капітал знаходзяцца пераважна ў руках нямецкамоўных насельнікаў краіны, якія матывуюць свае перавагі і вялікімі здабыткамі нямецкае культурнае спадчыны. У часы, калі германская імпэрыя пачынае дамінаваць на кантынэнце й навязвае свой пратэктарат Аўстра-Вугоршчыне, у чэхаў адсутнічаюць найменшыя замежнапалітычныя шанцы на перамогу. Ім супрацьстаяць спрыяльныя чыньнікі, выяўляючы ўнівэрсальную тэндэнцыю эпохі: імкненьне сацыяльных нізоў да раўнапраўя, лякальная колькасная перавага славянскамоўных насельнікаў, а таксама хісткая, нерашучая палітыка манархічнае ўлады. У XVIII стагодзьдзі, адначасна з здабыцьцём аўтаноміі для вышэйшае школы, чэскасьць выходзіць па-за межы прадвызначанага ёй уладамі фальклёрнага існаваньня. Дзякуючы гэтаму чэскі рух атрымлівае пэрспэктыву для

разьвіцьця, а палітычныя лёзунгі і патрабаваньні набываюць больш канкрэтныя абрысы.
Няцяжка зразумець, што апісаная намі барацьба наклала свой адбітак на ўсё духовае жыцьцё грамадзтва. Так, літаратура мусіла быць тут літаратураю для народу, паколькі славянамоўныя вярхі адсутнічалі і па сутнасьці толькі зараджаліся, і пры гэтым унікаць залішне вострых клясавых супярэчнасьцяў. Самабытная чэская навука шчыравала на ніве роднай мовы, культуры і, перадусім, гісторыі, а мастацтвы, у прыватнасьці, музыка, ставілі нацыянальныя, гэта значыць, зусім не мастацкія задачы. Мастакам і навукоўцам, якіх не задавальнялі абумоўленыя гэтым межы, даводзілася паступацца на карысьць чужой мовы ды інтэрнацыянальнага атачэньня. Грамадзтва патрабавала нацыянальнага кансэнсусу, і ціск, які яно з гэтай мэтай аказвала на асобу, ствараў неспрыяльныя варункі для вышуканых духовых пошукаў дый, як сталася заўважна пазьней, для фармаваньня палітычна актыўных асобаў з эўрапейскім кругаглядам.
Грамадзтва, якое, па сутнасьці, складалася зь вяскоўцаў ды дробнае буржуазіі, — ня самая ўрадлівая глеба для нараджэньня лідэраў. Лідэраў, здольных прымаць рашэньні, браць на сябе адказнасьць і кіраваць барацьбою нават і тады, калі ад яе варта чакаць адно маральных здабыткаў. Брак тае вышэйшае клясы, якую, насуперак усім мэтамарфозам буржуазнае эпохі, захавалі нашыя бліжэйшыя суседзі, мае для чэхаў сапраўды фатальнае значэньне. Немцы і аўстрыйцы, палякі і вугорцы ў XIX стагодзьдзі мелі даволі сваіх дзеячоў з вышэйшае клясы, каб вырашаць вялікія палітычныя задачы. Роля гэтых людзей у часы амасаўленьня ды нівэлізацыі грамадзтваў мела і адмоўны бок — яны часьцяком рабілі фатальныя ўчынкі — аднак жа, яны іх, прынамсі, рабілі. Усе суседзі чэхаў, нягледзячы на страшэнныя сацыяльныя ўзрушэньні, ажно да другой сусьветнай вайны заставаліся „нацыямі паноў“ (*Herrenvulker*). Гісторыя нашага грамадзтва паказвае, як моцна мы адрозьніваемся ад іх, па-свойму перажываючы і асэнсоўваючы паняцьці і ідэі, нават калі яны былі пазычаныя ў іншых. Прыклад Масарыка сьведчыць, што і ў такім грамадзтве, як чэскае, асоба можа знайсьці сабе прастору для дзейнасьці, аднак, гэтая дзейнасьць застаецца апрычонаю й безвыніковаю для грамадзтва ў цэлым.

Падагульняючы, мы можам сказаць наступнае: чэскасьць захоўвала сваю веліч да тае пары, пакуль знаходзілася нагода для таго, каб паставіць яе апрычонасьць на службу задачаў сусьветнага маштабу, як гэта было ў позьнім Сярэднявеччы. Чэхі мелі веліч, пакуль заставалася нетэматызаванаю іхная чэскасьць. Мадэрны чэскі рух, наадварот, выходзячы з памянёных вышэй прычын і быў асуджаны на нязначнасьць. Чэскасьць ператварылася ў мясцовую адметнасьць, якая засталася па заняпадзе ідэі ўнівэрсальнасьці і ўнівэрсальных інстытуцыяў Эўропы і якая перахавала ў сабе гэтыя асаблівасьці.

Зразумела, што гэтая розьніца паміж вялікай і малой гісторыямі нязносным цяжарам вісела над мадэрнымі чэскімі дзеячамі, і яны з усіх сіл спрабавалі пераканаць сябе, што прорва не такая ўжо і вялікая. Такое памкненьне можа мець карысьць тады, калі яно прыводзіць да таго, што высьвечвае неабходнасьць *пошуку* істотных задач; аднак яно таксама можа прыводзіць да прэтэнцыёзнага ілюзіянізму. Пачувацца *адзіным* законным спадкаемцам некалі вялікага народу — гэтага зусім не дастаткова; неабходныя доказы, даць якія могуць толькі ўласныя ўчынкі. Трэба добра разумець, што прэтэнзія на тое, каб быць адзіным спадкаемцам, не такая ўжо і ясная рэч, і толькі непарыўнасьць моўнае традыцыі ня можа яе абгрунтаваць. Калі больш як сто пяцьдзясят гадоў таму Бэрнард Бальцана заўважыў, што самасьвядомасьць чэскамоўнага насельніцтва Багеміі трэба ўздымаць, зьвярнуўшыся да гістарычнага прыкладу сярэднявечнае Чэхіі — радзімы сучаснае адукацыі, то ягоныя словы належыць трактаваць якраз у сэнсе пошуку больш рашучай пастаноўкі задачы. Не зусім тое ж самае было тады, калі выбітны гісторык Францішак Палацкі пераносіў словы Бальцаны на гусіцкі рух, які ў ягоных вачох стаўся ня толькі прадвесьцем эманцыпаванай гуманнасьці сучаснага сьвету, але і зваротам да глыбіняў народнай душы зь ейным першапачатным дэмакратызмам; ён настойваў на тым, што акурат у гэтым руху ўзьнікла й замацавалася асноватворная ідэнтычнасьць чэхаў. Масарык пазьней аддаў даніну павагі філязофіі гісторыі Палацкага, назваўшы яе нямецкай клясыкай зь яе ідэяй гуманнасьці (*Humanitдtsidee*), у імя якой, урэшце, і адбылося „адраджэньне чэскага народу“. Але гэтую ідэю немагчыма

ўявіць сабе без Рэфармацыі, найранейшыя праявы якой ізноў-такі паўсталі ў Чэхіі. Так чэхі, падараваўшы Захаду рэфармацыйны рух, нібыта наперад адплацілі яму ўсе пазнейшыя пазыкі за кошт гэтага рэфармацыйнага духу. Праўда, нашыя пазытывісцкія гісторыкі так і не знайшлі ў Гуса ды „чэскіх братоў“[3] ані сьледу таго самага гуманізму, а нашыя лібэральныя палітыкі ня ўцямілі, што ў Масарыка йдзецца пра вельмі асабіста афарбаваную разнавіднасьць мадэрнай ідэі гуманнасьці. У інтэрпрэтацыях, якія прапанавалі Масарык і Палацкі, мы сутыкаемся хутчэй з фантазіямі, таму што яны не паддаюць узьніклыя ў гэтай сувязі праблемы чыста тэарэтычнаму разгляду: яны імкнуцца прадзерціся скрозь гістарычныя дзеі, уключаючы ўжо існуючае грамадзтва ў кантэкст унівэрсальнай гісторыі, якая можа надаць яму большае, чымся вузка лякальнае, значэньне.

Разам з гісторыкамі мы ўважаем, што чэскую праблему можна зразумець толькі ў рэчышчы эўрапейскіх падзеяў, асабліва, у позьнесярэднявечнай Эўропе; разам з палітыкамі мы ўважаем, што мадэрная чэскасьць непадзельна зьвязана з уздымам сацыяльных нізоў ды пэўнай нівэляцыяй эўрапейскага грамадзтва напрыканцы XVIII стагодзьдзя. Мы ўважаем таксама, што паўставаньне мадэрнае чэскасьці ёсьць падзеяю, вартаю больш пільнай увагі, бо яно становіць сабой не мясцовае й выпадковае здарэньне, але прататып для ўсіх грамадзтваў, утвораных „зьнізу“. Некалі паняволеныя слаі дамагаюцца спачатку раўнапраўнасьці, пасьля — перавагі, і ўрэшце — адзінаўладзьдзя. Мадэрная чэскасьць зьяўляецца, пэўна, першым пасьпяховым вырашэньнем праблемы, што дзе-нідзе стаіць і па сёньня, напрыклад, у краінах Балтыкі ці на Балканах. Чэхі ўтвараюць першае эўрапейскае грамадзтва падобнага тыпу, якое дабіваецца пабудовы — у межах гістарычна магчымага — адносна незалежнай дзяржаўнай сыстэмы, а пасьля таго, як гэта было дасягнута, ствараюць нацыянальную, як мастацкую, так і навуковую, літаратуру, засноўваюць сваю сыстэму адукацыі і будуюць досыць магутную народную гаспадарку з высокаразьвітай індустрыяй ды тэхнікай. У гэтым сэнсе чэхі, нягледзячы на сваё „маленства“ ці нават *насуперак* яму, набываюць значэннасьць, далёка большую, чымся вузка лякальная.

Не зважаючы, аднак, на гэткія відочныя посьпехі, чэхі — гэта

таксама і найтрагічнейшая форма адбудаванага „зьнізу“ грамадзтва: у моманце, калі да мэты ўсіх намаганьняў было рукой падаць, чэхам нястала *нутраное* моцы. Гэта, верагодна, зьвязана з апісанай грамадзкай структурай і будзе вытлумачана ў далейшым.

<…>

[1] Пар. F. Rdtzel, *Politische Geographie*, Muenchen 1897.

[2] Род Пржэмыславічаў правіў ад IX ст. у Чэхіі, ад XI ст. у Мараве, пазьней таксама ў Кладзку, Лужыцы й частцы Сылезіі. Мужчынская лінія роду перарвалася ў 1308 годзе. (*Зацем перакладніка.*)

[3] „Чэскія браты“, або „Братэрская супольнасьць“ — заснаваны ў 1457 г. рэфармацыйны рух, які кіраваўся спадчынаю гусіцкае традыцыі. Адным зь ягоных біскупаў быў філёзаф і пэдагог Ян Амос Каменскі. (*Зацем перакладніка.*)

VI.

Што заставалася рабіць Габсбургам у зьняможанай вынікамі Трыццацігадовае вайны Сьвятарнай Рымскай імпэрыі, як не разьвіваць уласныя спадчынныя землі? Да таго ж, трэ было адбівацца ад туркаў, прылучаць нанова ды кантраляваць вугорцаў, а таксама стрымліваць экспансію французаў, якія намагаліся заняць месца ўнівэрсальнага эўрапейскага цэнтру, якое раней належалася імпэрыі. Якраз гэтым і займаліся Габсбургі, выкарыстоўваючы тыя сродкі, якія выпампоўваліся зь іх спадчынных, перадусім з чэскіх, уладаньняў. Найважнейшы слой чэскае станавае дзяржавы, буйная шляхта і магнаты, пад канец Трыццацігадовае вайны перакінуўся да Габсбургаў, бо памкнуўся атрымаць здабычу, што несьлі з сабой канфіскацыі ды прымусовыя продажы маёнткаў эмігрантаў. Аднак сьледам мінулай ішлі новыя доўгія войны, паглынаючы велізарныя грошы: на Балканах, пры Райне, у Нідэрляндах. Толькі чэскія землі, найперш, уласна Чэхія, а таксама Сылезія з Маравай, мелі права абмяркоўваць падаткавую квоту. Своекарысьлівая чэская шляхта, прадстаўнікам якой збольшага бракавала шырокіх палітычных даляглядаў, пачала цяпер скарачацца ў памерах: хаця станавае прадстаўніцтва ўсё яшчэ захоўвала за сабою права абмяркоўваць падаткавую квоту, аднак на іх саміх аказваўся ўсё больш ціск, каб перавесьці, фактычна,

найважнейшую ў той час крыніцу даходаў — зямлю — пад падаткавы кантроль цэнтральнае ўлады, дзеля чаго складаліся ўсё больш дакладныя кадастры. Станавае прадстаўніцтва, як магло, процістаяла гэтай тэндэнцыі, аднак яму давялося саступіць; беспасярэднія і ўскосныя, а таксама надзвычайныя падаткі ўзрасталі такімі тэмпамі, што ў апошнія гады кіраваньня Карла VI незадаволенасьць у Чэхіі сталася ўсеагульнаю і прывяла, ужо за часоў Марыі Тэрэзіі, да крызысу самой чэскай дзяржавы. (Заўважым, што і аддзяленьне Сылезіі было б, відаць, немагчымым, калі б Прусію — дзяржаву, што ўзмацнілася пад канец XVIII стагодзьдзя й, наперакор Габсбургам, несла на ўсход пратэстантызм і Асьветніцтва, — не ўспрымалі так, як збавіцельку.) Тое, што мы абачылі вышэй, гісторык Ёзэф Пэкарж выразна выявіў у сваёй працы аб чэскіх кадастрах XVII і XVIII стагодзьдзяў[4], гаворачы пра памеры эксплюатацыі на чэскіх землях.

Дзяржава Габсбургаў у духоўным пляне была заснавана на ідэі Контрарэфармацыі. Чэскім краёвым патрыётам не заставалася нічога іншага, як трымацца гэтага кірунку: яны намагаліся паказаць, што зусім не саступаюць у гэтым іншым краём, наадварот, яны такія ж добрыя каталікі, пабожныя людзі з пабожнае краіны.

Даходаў, якія чэская й мараўская шляхта разам з імпэрскім домам у часе Барока мела зь сельскай гаспадаркі, хапала даволі, каб уся краіна аквецілася безьліччу пазорных цэркваў, сьвятыняў для пілігрымак і замкаў і зрабілася цэнтрам самабытнае позьнебарочнае архітэктуры. У яе стварэньні бралі ўдзел ня толькі Дынцэнгофэр і Сантыні, але й такія венскія майстры, як Гільдэбрант і Фішэр фон Эрлях. Росквіт перажывае таксама барочны жывапіс, а ўжо з XVII стагодзьдзя, дзякуючы Міхну ды іншым, паўсюдна пашыраецца музычная культура. Нягледзячы на сваю правінцыялізацыю, Чэхія ўсё ж не была культурнаю пустыняю. Нават і родная мова мела ў сабе яшчэ прыцягальнасьць: ёсьць прыклады таго, як прыбылыя з-за Райну прафэсары юрыдычнага факультэту на працягу XVIII стагодзьдзя авалодвалі чэскай мовай; усё гэта, аднак, было хутчэй выняткам. Найважнейшыя слаі, магнаты, шляхта ды багатыя месьцічы, старанна апаноўвалі нямецкую і французскую мовы.

І ўсё ж такі ад Асьветніцтва — той духоўнай плыні, якая

ўяўляла сабой найноўшы зь Сярэднявечча спосаб праяўленьня эманцыпацыі і ягоных мысьліцельных і жыцьцёвых формаў, якія з таго часу пачалі прадвызначаць эўрапейскае жыцьцё, — барочная дзяржава Габсбургаў і Чэхія была адрэзана, без чаго яна ня мела ўласнай пэрспэктывы.
Прусія, якая пад канец XVII стагодзьдзя рэзка ўзмацнілася, выпісала на сваіх штандарах лёзунгі Асьветніцтва на цэлае пакаленьне раней, чым землі Габсбургаў. Краіне, мала абцяжаранай традыцыямі, гэта ўдалося лягчэй: усё можна было пачаць наноў, у той час як спадчыньнікі Габсбургаў стаўлялі задачу перабудаваць стары, гістарычна ўспадкаваны арганізм у сучасную дзяржаву. Да гэтага арганізму належалі Чэскае каралеўства, Вугоршчына ды аўстрыйскія спадчынныя землі. Чэская шляхта, якая мелася б прадстаўляць чэскае дзяржаўнае права, была ня ў стане рабіць гэта пасьля структурных зьменаў, прынесеных Трыццацігадоваю вайною. У эпоху абсалютызму яна не праявіла ніводнай палітычна значэннай ініцыятывы. Іначай было ў Вугоршчыне, дзе напоўніцу карысталіся тымі магчымасьцямі, што давала ёй роля абаронцы Габсбургаў ад непрыяцеляў. Чэхія й Вугоршчына як дзьве найбуйнейшыя зямлі габсбурскай дзяржавы азіраліся назад на далёкую гістарычную мінуўшчыну.
Марыя Тэрэзія спрабавала злучыць спадчыну Габсбургаў з сучаснай дзяржаўнай сыстэмай. Язэп II працягнуў ейную справу; пры гэтым ён адмовіўся ад Контрарэфармацыі як духовага апірышча імпэрыі і адчыніў дзьверы Асьветніцтву. Тым самым была выбіта глеба з-пад чэскага традыцыяналізму. Новую дзяржаву больш не цікавілі гістарычныя арганізмы ды дух, што іх сілкаваў. Чэхія, Марава, засталая частка Сылезіі ды ўласна аўстрыйскія абшары ў манархіі ўважаліся „нямецкімі землямі“, якім супрацьстаўляліся вугорскія. Дзякуючы гэтаму ўпершыню зазначыўся той дуалізм, які поўніцай праявіўся пасьля, цягам XIX стагодзьдзя. Старое дзяржаўнае права публічна не было скасавана, але яго практычнаму прытарнаваньню стаўляліся перашкоды. Была ўведзена ці, прынамсі, заплянавана адзіная адміністрацыя для ўсіх „нямецкіх земляў“. Але найбольш пасьпяховым чынам было зьдзейсьнена пераўтварэньне сыстэмы адукацыі ў сувязі зь перабудовай дзяржавы. За выняткам народных школаў (*Volksschulen*) на правінцыі, плянаваўся пераход усёй вышэйшай

школы на нямецкую мову, і гэта ўжо шырака практыкавалася. Сацыяльнае расслаеньне крочыць нага ў нагу з моўнай дыфэрэнцыяцыяй: „зьнізу“ на большай частцы чэскіх земляў гавораць па-чэску, „зьверху“ — па-нямецку. Чэскасьць, такім чынам, пазбаўлялася якой-кольвечы пэрспэктывы. Маральна састарэлая ды ізаляваная ад сучаснае адукацыі, зьведзеная да бяспраўнага, запрыгоненага сялянства і беднага насельніцтва гарадоў, чэскасьць, здавалася, мусіла ўпасьці ахвяраю ўбранага ў нямецкамоўныя шаты Асьветніцтва і яго наймагутнейшага чыньніка — самаўладнае, абсалютысцкае дзяржавы.
Да самага свайго канца Габсбурская манархія імкнулася выканаць задачу стварэньня адзінае й мадэрнае дзяржаўнае сыстэмы, аднак, так і не дасягнула гэтай мэты. Гэта часткова тлумачыцца сутнасьцю эманцыпацыі, правадніком якое абвясьціла сябе абсалютысцкая імпэрыя, падпісаўшыся пад такімі прынцыпамі Асьветніцтва, як усеагульны дабрабыт, роўнасьць перад законам, свабода прафэсіі ды гандлю. Надзвычай важная падзея, скасаваньне прыгоннай залежнасьці сялянаў, у выніку якой ужо для большай часткі насельніцтва свабода была замацавана законам, затым увядзеньне падаткаабкладаньня панскіх маёнткаў, якія дагэтуль падаткамі не абкладаліся, — гэта былі вялікія крокі на шляху да роўнасьці; свабода перасоўваньня, магчымасьць паводле свабоднага выбару стварaць сям’ю ды даваць адукацыю дзецям, былі вялікімі крокамі на шляху да свабоды. Расьце самасьвядомасьць сялянаў; натуральна, у іх зьяўляецца жаданьне павысіць сваё месца на сацыяльнай лесьвіцы, чаму перашкаджае моўны бар’ер. Гэты бар’ер дзейнічаў не ў спадзяваным сэнсе, але расколваў існуючае грамадзтва. Адзінству традыцыйнага станавага грамадзтва наўрад ці нешта пагражала, таму што паны заўсёды патрабавалі служак. Але грамадзтва, якое было заснаванае на прынцыпе роўнасьці, расколваецца там, дзе гэтая роўнасьць сустракае на сваім шляху перашкоду: тут ёю быў моўны бар’ер. Тыя, каго закранула эманцыпацыя, ужо не здавальняюцца праўнымі ды эканамічнымі свабодамі: селянін цяпер уласьнік сваёй зямлі, ён можа зарабіць сабе на пражыцьцё ўласнымі рукамі, і гэтая свабода стаецца крыніцай усіх канкрэтных свабодаў. Селянін якраз і хоча набыць канкрэтную свабоду: як чалавек, які гаворыць сваёй уласнай мовай і які выгадаваўся ў пэўнай

традыцыі, які, урэшце, мае гістарычную сьвядомасьць. Гэтага, аднак, не прадугледжвала ані Асьветніцтва, ані асьвечаны абсалютызм. Праўда, памкненьні да новага, узьнікаючага „зьнізу“ эгалітарнага грамадзтва не былі надта ўсьвядомленымі; аднак паўстае — дарма што надзвычай вузкае — кола інтэлектуалаў рознага сацыяльнага паходжаньня — шляхоцкага, буржуазнага, часткова гэта ўжо сялянскія сыны (як Ёзэф Юнгман, бацька чэскага нацыяналізму), — і гэтая група імкнецца да таго, каб мацаваць вольналюбную сьвядомасьць і выпрацаваць тэарэтычны фундамэнт, які б грунтаваўся на сучасных уяўленьнях аб сутнасьці народу.

З часоў Асьветніцтва чэхі сталі ў пэўным сэнсе новым народам, таму што яны ў адрозьненьне ад даўнейшай, гіерархічнай і моўна індыфэрэнтнай Багеміі стварылі эгалітарнае грамадзтва, абумоўленае *матчынай мовай*. Гаворка йдзе пра грамадзтва вызваленых служак. Аднак яны вызваліліся ня самі — гэта б вымагала ажыцьцявіць рэвалюцыйны ўчынак. Яны *былі вызваленыя* дзякуючы захадам сваіх паноў; яны былі значна менш радыкальна настроеныя, чымся паны-вызваліцелі, заклапочаныя хутчэй уласнымі патрэбамі і па сутнасьці кансэрватыўныя, бо традыцыя, якая зьвязвала іх з чэскасьцю, была чужая Асьветніцтву. Чэхі былі далёкія ад таго, каб захапляцца бюракратычна структураванаю цэнтралістычнаю ўнітарнаю дзяржаваю і прыносіць ёй сваё іство ў ахвяру. Але гэткая дзяржава была новай, мадэрнай універсаліяй, падобна таму, як сярэднявечнае ды барочнае хрысьціянства было даўнейшай універсаліяй. Не прыняць гэтыя новыя ідэі азначае заставацца ў межах партыкулярнасьці. Аднак мадэрныя ўніверсаліі больш суадносяцца з фактычна ўніверсальным, таму што існуе не ўніверсальная дзяржава, а толькі ўнітарныя дзяржавы. Сярэднявечны ўніверсалізм сустракаў і лучыў паміж свабой моўныя, культурныя, рэгіянальныя адметнасьці Эўропы як нешта дадзенае зьверху. Але мадэрны ўніверсалізм імкнецца гэтыя адметнасьці зьнівэляваць. Там жа, дзе людзі, ужо перажыўшы эманцыпацыю, застаюцца ў сутнасьці кансэрватыўнымі, апрычонае дзякуючы ім мусіць набыць значэньне і стаць рэальнасьцю, у той час як дзеля ўніверсальнага ніхто і пальцам не зварухне.

Мадэрны нацыяналізм падаецца мне ўвогуле аджылым паняткам і састарэлай рэаліяй. Пасьля таго як злучальны

пачатак хрысьціянскага Сярэднявечча адышоў у нябыт, засталося тое, што лучыла: адметнасьці, этнічнасьць, мова ды раздробленыя традыцыі; і аказалася, што больш няма нічога дадзенага зьверху, будзь гэта партыкулярнае, зь якім мы прызвычаіліся жыць, паспрабаваўшы зрабіць яго канкрэтным органам, калі нават не крыніцай чалавечнасьці. Гэта слушна пагатоў у тым сэнсе, што мы „завязаныя“ на фактычным/выпадковым і бяз гэтага ня ў стане жыць; але як нам належыць судакранацца зь іншым, ці існуе толькі гэтае паасобнае й выпадковае і ці было яно само тым адзіным, што супольнае нам усім?

У Аўстра-Вугорскай манархіі сканцэнтравалася „аджылая праблема“ Эўропы. Марыя Тэрэзія мела ў пэўным сэнсе рацыю, калі ў адрозьненьне ад асьветніцкага ўнівэрсалізму Язэпа II упорыста датрымвалася барочнага ўнівэрсалізму ды контрарэфармацыйнага каталіцызму і не хацела саступаць: апошні яшчэ высака трымаў штандар унівэрсальнай манархіі, заснаванай на хрысьціянстве шляхты і царквы; існавала нешта звышэмпірычнае, на якім можна было сысьціся і якое ўяўляляла тады яшчэ дзейсную грамадзкую сілу. Абмяняць гэтую інстанцыю на няпэўнасьць рацыянальна-тэхнічнага розуму падавалася вялікай рызыкай. Ужо мелася імкненьне зьмяніць гістарычныя дзяржаўныя арганізмы, але без удзелу ў гэтым хісткага непастаяннага „рацыё“. У далейшым чальцы дынастыі будуць вагацца паміж паставамі Марыі Тэрэзіі і Язэпа II, маці й сына, ня ў стане зрабіць выбар. Якім чынам паяднаць шматлікія нацыянальныя традыцыі, нямецкую, чэскую, вугорскую, польскую, румынскую, харвацкую ды іншыя? Ці трэба выкарыстоўваць нямецкую мову ў якасьці афіцыйнае, як таго вымагае здаровы сэнс, бо ўсё ж такі нямеччына была ня толькі рацыянальным сродкам камунікацыі паміж народамі манархіі, але і ўяўляла сабой заразом апрычоную традыцыю, жывую нацыянальную стыхію, якая правакавала іншыя ды, пасьля таго як пракаціласа хваля Асьветніцтва, мусіла стацца сродкам прыгнёту. То ж бо Асьветніцтва само спарадзіла цяжкасьці, што аказаліся ўрэшце невырашальнымі для дзяржаўных дзеячаў манархіі.

Моўны нацыяналізм, які ўсюды пашыраўся разам з рамантызмам, знайшоў сабе ў Сярэдняй ды Ўсходняй Эўропе ідэальную глебу. На эўрапейскім захадзе было іначай: у

Францыі, напрыклад, мова саступала ў сваім значэньні дзяржаве. У Аўстрыі былі ж народы, дзяржавы якіх больш не існавалі, але як народы якія захаваліся: чэхі, палякі і — паколькі за часоў Язэпа Вугоршчына была прылучана да манархіі (як пасьля за Мэтэрніхам) — вугорцы. Аднак цяпер зьяўляецца яшчэ адзін спэцыфічны момант — славізм. Ён, як і вывядзеньне нацыянальнасьці з мовы, усходзіць да Гердэра, які нат пажыў у Расеі і спрабаваў даць дэфініцыю „славянскім народам“. З гэтага гледзішча манархія была населеная славянскімі й неславянскімі народамі. Падзел „славянскі-неславянскі“ хутка быў пераасэнсаваны ў палітыцы як „славянскі-антыславянскі“. І тады было зусім натуральна, што пэўныя народы сталіся носьбітамі славізму, а іншыя антыславізму. Дарма што немцы ў манархіі дзякуючы посьпехам славянаў усё больш хінуліся да антыславізму, першымі ж пратаганістамі антыславізму ўсё ж былі вугорцы. Насуперак ім перадусім чэхі, а таксама славакі, спрабавалі абгрунтаваць і выбудаваць славізм.

Чым жа тады ёсьць, з пункту гледжаньня сацыялёгіі, працэс гэтак званага чэскага адраджэньня? З структураванага паводле станавых прынцыпаў грамадзтва, якое было надзвычай моўна індыфэрэнтным, паўстала зарыентаванае на цэнтралізаваную дзяржаўную ўладу разнароднае грамадзтва, у якім вярхі гавораць па-нямецку, а нізы ў чэскіх правінцыях па-славянску. Акурат з гэтага ўзьніклі тады *два* самастойныя, моўна адно ад аднаго адрозныя грамадзтвы, чыя нутраная структура, як і наагул у мадэрным буржуазным грамадзтве, была абумоўлена эканамічна. Чэскамоўнае грамадзтва мела шырокую базу, ягоныя вярхі складаліся з „інтэлігенцыі“, але яму не ставала багатае гандлёвае й прамысловае буржуазіі, а таксама шляхты (асобныя прадстаўнікі якой, праўда, залічалі сябе да яго, аднак выконвалі па сутнасьці адно функцыю інтэлектуалаў). Падставай для ўтварэньня гэтага новага грамадзтва, *новай* нацыі, такім чынам былі — у пазытыўным сэнсе — эманцыпацыя ў духу Асьветніцтва і — у нэгатыўным сэнсе — асьветніцкі цэнтралізм. Гэты працэс таксама ўзмацняўся перадрамантычнымі й рамантычнымі ідэямі. Гісторыкі падзяляюць яго на некалькі этапаў: у якасьці выходнага пункту Ёзэф Пекарж разглядае барочны патрыятызм контрарэфарматараў, тады надыходзіць пэрыяд Асьветніцтва,

пад час якога чэскасьць (як і славянскасьць увогуле) стаецца прадметам дасьледаваньня, чые вынікі фіксуюцца пераважна на нямецкай мове. Трэці этап — рамантычны, ён „завязаны“ на мове, згодна зь ім нацыянальнасьць акрэсьліваецца паводле моўнай прыкметы. Але не ўжываньне мовы зьяўляецца пры гэтым вырашальным і новым, а стварэньне абумоўленага гэтай моўнай прыкметай замкнёнага грамадзтва, якое ўва ўсіх сваіх функцыях, як духовай, так і палітычнай, у гаспадарчай і адміністрацыйнай галінах, пачуваецца згуртаваным ды самастойным і імкнецца такім быць. Ясна, што гэткае чэскае грамадзтва не магло займець гэта лёгка, таму што сродкі для дасягненьня сваёй самастойнасьці яно магло сіляць і назапашваць з абмежаваных рэсурсаў сялянства і дробнай буржуазіі; апроч гэтага яно не ўспадкавала анічога, ні ў духовым стасунку, ні ў матэрыяльным.
Аднак сьпярша яму на дапамогу прыходзіць рамантызм. У Аўстрыі напалеонаўскіх войнаў ён зь відавочных прычынаў здабыў афіцыйную падтрымку: Аўстрыя ператварылася ў касьцяк антынапалеонаўскае кааліцыі і болей за іншых спрычынілася да таго, каб зруйнаваць французскую гегемонію ў Эўропе, напрыканцы, ведама, у хаўрусе з Расеяй. Каталіцкая веліч рамантыкаў часова знайшла прытулішча ў Вене, народнасьць „песьцілася“ з палітычных матываў, а з гэтага якраз і карыстала новае, пражываючае родавыя схопкі чэскае грамадзтва і яго маладая літаратура. Тры вялікія, зьвязаныя паходжаньнем ці адукацыяй з Вугоршчынай славакі пратэстанцкага веравызнаньня Шафарык, Колар і Палацкі прыўнесьлі новы дух у чэскія дачыненьні, пазначаныя пячаткай язэпізму (*Josephinismus*). Колар ды Шафарык пасьля вызвольнай войны навучаліся ў Ене, Шафарыкаў прыяцель Палацкі чэрпаў адтуль рамантычны дух. Колар пераклаў па-славянску зацемкі Гердэра пра побыт у Расеі і заснаваў на іх сваю ідэю „славянскае ўзаемнасьці“, якая, праўда, сьпярша датычыла толькі духовасьці, але крыла ў сабе і палітычныя наступствы. Славянскасьць узьнімае самасьвядомасьць славян сьпярша *ўнутры* Аўстрыі — мы не малыя, таму што мы складаем у Аўстрыі бальшыню насельніцтва. А вонках Аўстрыі гэта азначала — мы вялікія, таму што існуе неабсяжная славянская імпэрыя, што грае ў Эўропе вызначальную ролю і ў будучыні будзе дамінаваць у ёй. У вачох Колара ўсё было амаль

славянскім, уся Нямеччына да самае Эльбы ды ўся Паўночная Італія. Колар склаў фантастычную кнігу пра славянскую старажытную Італію і напісаў салідную паэму, дзе адлюстраваў своеасаблівае вандраваньне па славянскім сьвеце, накшталт паэмы Дантэ пра падарожжа па сьвеце хрысьціянскім. Напісаны гекзамэтрамі пралёг да гэтае паэмы — гэта ня што іншае, як паэтычны пераказ разьдзелу „Ідэяў да філязофіі гісторыі чалавецтва“ Гердэра, прысьвечанага славянам. Палацкі спачатку таксама хацеў стаць паэтам і стварыў эпас аб падзеях 1812 году, своеасаблівую „Вайну і мір“.

Галоўны твор Шафарыка, „Славянскія старажытнасьці“, быў прысьвечаны грунтоўнаму выкладу ўсіх крыніц пра славян у антычных ды бізантыйскіх аўтараў. Яму рупіла прадставіць славян трэцім элемэнтам, які зь сівое даўніны ўтвараў Эўропу. Палацкі пазьней станецца патрыятычным гісторыкам: ён засвоіць думку Бальцаны, што самасьвядомасьць чэхаў абудзілася дзякуючы звароту да вялікіх *духовых* учынкаў іхных продкаў. Але тымчасам як Бальцана, праўдападобна, меў на ўвазе часы Карла IV, Палацкаму ўяўляўся перадусім гусіцкі рух, які ён раскрыў у сваім значэньні для бацькаўшчыны і ўсяго чалавецтва. Магчыма, нават відавочна, што ён тлумачыў гусіцкі рух некарэктна, але ўсё ж такі ён улавіў гэтую найбольш значную праяву чэскае велічы і стварыў у найвышэйшай ступені прэтэнцыёзную трактоўку значэньня чэскае гісторыі для мадэрнае Эўропы.

Зразумела, што людзі, якія прадстаўлялі славізм, узглядам Аўстрыі займалі зусім іншае становішча, чымся немцы і вугорцы. Немцы ў Аўстрыі бачылі ў манархіі вядучую сілу Германскага Зьвязу, сучасную наступніцу імпэрыі[5].

Вугорцы не адчувалі ў сваёй традыцыі ні лучнасьці з імпэрыяй, ні зь яе наступнікамі і хацелі мець цьвёрдыя гарантыі сваёй незалежнасьці і сваёй самастойнай дзяржаўнай сыстэмы. У адрозьненьне ад гэтага, для чэхаў было важна тое, што Аўстрыя выпадала зь нямецкае прасторы і што славянская бальшыня пачала выходзіць на палітычную сцэну. Нагода ўголас заявіць аб гэткай пазыцыі, натуральна, надарылася ўпершыню толькі пасьля сакавіка 1848 году, пасьля падзеньня Мэтэрніха й канца да гэтага часу практыкаванага абсалютызму, варожага якой-любя нацыянальна ці этнічна скіраванай прапагандзе. Аднак 1848 год ясна паказаў, што між тым плён рэформаў Язэпа II,

распрыгоньваньне сялянаў ды эканамічны лібэралізм, рэалізаваўся на *нацыянальным* узроўні і што сацыяльная дыфэрэнцыяцыя на чэскіх землях зайшла так далёка, што можа мець ужо і палітычнае выражэньне.
Для інтэлектуалаў, якія сталі палітыкамі (прыкладам, Палацкага), палітычная арыентацыя вызначылася сама сабою: яны выступалі супраць выбараў у Франкфурцкі Нацыянальны Сход, таму што з Германскім Зьвязам іхная краіна ня мела нічога супольнага; яны выразна падкрэсьлівалі, што прававыя дачыненьні іхнай краіны з імпэрыяй пасьля яе распаду страцяць сваю моц. Дынастыя была перакананая ў тым, што манархія мусіць шукаць свайго паратунку, абапіраючыся на славянскую частку насельніцтва. Адсюль вынікала тая кансэрватыўная пастава, якой пасьлядоўна да канца жыцьця датрымліваўся Палацкі (і якую так высьмейваў Маркс). У адрозьненьне ад гэтага, вугорцы ажыцьцяўлялі радыкальны ўціск на манархію, дамагаючыся аднаўленьня самастойнай вугорскай дзяржавы і рыхтуючы рэвалюцыю. Рэвалюцыя ў Вене была нацыянальнаю і лібэральнаю: урад Пілердорфа ўрэшце саступіў іхнаму націску, і канстытуцыя, прынятая ім 25 красакавіка 1848 году, ухваліла іх права выбіраць у Франкфурцкі Фэдэральны Сход. Гэтая канстытуцыя, разам з гэтым, катэгарычна адмаўляла самую ідэю самастойнае дзяржавы чэхаў. Тымчасам як вугорцы знайшлі паразуменьне зь венскімі лібэраламі і дамагліся свабоды, здабыўшы прыхільнасьць усёй лібэральнай сусьветнай грамадзкасьці, чэхі засталіся ні з чым. Іх тэндэнцыя не была радыкальнаю; яны разьлічвалі, хутчэй, на тое, што іхная ляяльнасьць да „загрожанай“ дынастыі будзе шчодра адплочана. Пангерманскім настроям яны супрацьставілі славянскі кангрэс, праведзены ў Празе ў чэрвені 1848 году[6].
Ведама, існавала й невялікая група радыкальных дэмакратаў, якія, за прыкладам вугорцаў, маніліся спраўдзіць нацыянальныя памкненьні гвалтоўным чынам. Яны ўзялі ў рукі зброю, пабудавалі барыкады і сталіся першымі ў Аўстрыі паўстанцамі, разьбітымі аддзеламі князя Віндышгрэца. Тым самым страціў свой сэнс славянскі кангрэс, а першае палітычнае выпрабаваньне мадэрнае чэскасьці пацярпела паразу. Лібэральны сьвет цалкам праігнараваў той факт, што стаўленьне вугорцаў да тых невугорскіх народаў, што жылі ў іх

гістарычнай краіне (славакі, румыны, чэхі), было надзвычай нелібэральным. Гэта, здаецца, не было ўжо так несправядліва, бо славяне ўспрымаліся як рэакцыйная сіла. Падзеі разгортваліся так, што пасьля Віндышгрэцавай перамогі паноўная дынастыя ўжо ня брала ў разьлік таго парлямэнту, што засядаў сьпярша ў Вене, а пасьля ў Крэзіры (Кромнержыжы). Таму чэскія нацыянальныя патрабаваньні больш зусім ня зводзіліся да мовы. І ўсё-такі манархія не дала рады з вугорцамі і мусіла заклікаць на дапамогу Расею, дзякуючы якой хоць і быў зломлены вугорскі супраціў, але вугорцы адначасна пераканаліся ў справядлівасьці іхнае антыславянскае палітыкі і стратэгічных кірунках яе будучага ажыццяўленьня: у прыватнасьці, бязьлітаснасьці да іншых нацыянальнасьцяў у Вугоршчыне, перш як Расея зможа зазначыць сваю калясальную вагу і зноў заявіць правы на панаваньне ў Эўропе.

Калі ў 1849 годзе абсалютызм у Аўстрыі быў адноўлены, у Чэхіі й Вугоршчыне бытавалі зусім адрозна матываваныя чаканьні распружаньня сытуацыі: вугорцы маглі — асабліва зважаючы на антырасейскі кірунак, якога Аўстрыя адкрыта трымалася ў часе Крымскае вайны — разьлічваць на тое, што іхная антыславянская тэндэнцыя будзе належным чынам ацэнена і ў іншай частцы дзяржавы, тымчасам як чэскія спадзяваньні, якія ўскладаліся на славянскую салідарнасьць унутры і за межамі імпэрыі, былі надзвычай утапічнымі — яны не знаходзілі рэальнай падтрымкі ні ў мадэрных эўрапейскіх працэсах, ні ў славянскім сьвеце, у тым ліку і ў Расеі. Да таго ж пад час падзеяў 1848 году выразна выявіліся сацыяльныя й палітычныя дачыненьні, якія характарызавалі чэскае і нямецкае грамадзтвы. Яны адмежаваліся адно ад аднаго і ад гэтага часу разьвіваліся самастойна. Калі пасьля ў 1859 годзе нэаабсалютысцкую сыстэму зьмяніў новы ўрад, вугорцы выступілі супраць навязанай ім звонку канстытуцыі і ў 1863 годзе зрынулі яе, дарма што й гарантавала ім больш прывілеяванае становішча, чымся чэхам. Германская вайна, у якой Аўстрыя была пераможана Прусіяй, толькі паскорыла паварот да дуалізму, які спраўдзіўся ў 1867 годзе. Тое, што чэхам паміж 1859 і 1867 гадамі ўдавалася ўсё лепш і лепш адстойваць свае інтарэсы насуперак захадам немцаў, абумовіла посьпех, які ў кіраўнічых палітычных колах Вены атрымала ідэя

дуалізму, згодна зь якім у невугорскай частцы манархіі забясьпечвалася панаваньне немцаў, а ў вугорскай частцы — мадзяраў. У Празе ды бальшыні чэскіх гарадоў чэхі троху-патроху бралі верх: набыў значэньне „рух сокалаў“ (чэскі гімнастычны зьвяз), прэсу і яе ўплыў ніхто больш ня стрымліваў, а палітычнае жыцьцё дыфэрэнцыявалася і радыкалізавалася ў нацыянальным сэнсе. Гэтыя працэсы тармазіла палітыка аўстра-вугорскага дуалізму, якая пачала праводзіцца ў жыцьцё. Адбылося наступнае, а іменна: вугорцы зрабілі свае патрабаваньні больш радыкальнымі, імкнуліся ажыцьцявіць сваю праграму з абсалютнай бязьлітаснасьцю і пасьлядоўнасьцю і — перадусім з 1871 году — перанялі замежную палітыку ўсёй манархіі ў свае рукі; германска-аўстрыйскі хаўрус 1879 году быў творам прызначанага ў 1867 годзе прэм’ер-міністра Д’юлы Андрашы. У 1875 годзе Каламан Тыса, тагачасны вугорскі міністар нутраных справаў, заявіў, што ў Вугоршчыне няма ніякага славацкага народу, зьліквідаваў усе славацкія арганізацыі, сканфіскаваў іх маёмасьць і перасьледаваў найбольш выдатных дзеячоў славацкага публічнага жыцьця. Тое, што палітыцы „язэпізму“ не ўдалося навязаць чэхам, для славакаў у Вугоршчыне сталася рэальнасьцю. Ажно да 1918 году яны ня мелі ніводнае ўласнае публічнае вышэйшае школы і гімназіі, і нават царква сталася інструмэнтам мадзярызацыі.

Чэхі на досьведзе сваіх няўдач навучыліся тактыцы малых крокаў. З псэўдалібэральнае канстытуцыі 1867 году яны выгадалі для сябе ўвесь пажытак, які можна было выгадаць: канстытуцыю яны патрактавалі ў сэнсе прызнаньня чэскай дзяржаўнасьці, а ў 1880 годзе дабіліся раўнапраўнасьці чэскае мовы зь нямецкаю; яны заснавалі вышэйшую тэхнічную школу на чэскай мове, а пасьля падзялілі ўнівэрсытэт на чэскую й нямецкую часткі. Гэта было значэннай падзеяй у духовым жыцьці чэхаў, таму што адцяпер усе абсягі навукі проста *мусілі* разьвівацца на чэскай мове. Вось жа, моўная праграма рамантыкаў сталася сапраўднасьцю ў пазытывісцкую эпоху. Сьледам за гэтым распачыналася барацьба за першынство чэскай мовы, прынамсі, у той частцы чэскай тэрыторыі, дзе жылі пераважна чэхі. Яна натыкалася на ўсё больш моцны супраціў немцаў. Карацей, у гэтай зацятай барацьбе за кожны лапік зямлі чэхі дабіваліся таго, каб стаць грамадзянамі

першага гатунку; тым ня менш поўнай раўнапраўнасьці ім так і не ўдалося дасягнуць. Урад спрабаваў перавесьці ўвагу на сацыяльныя ды эканамічныя пытаньні. З 1908 году ў Аўстрыі было ўведзена ўсеагульнае й роўнае выбарчае права, але да паразуменьня паміж чэхамі ды немцамі так і не дайшло.
Усё гэта мы павінны браць пад увагу, разглядаючы разьвіцьцё эканомікі і культуры. Чэскім немцам з часоў асьветніцтва было лягчэй уладкоўвацца на цэнтральныя пасады дзяржавы, пазьней яны ўспрымалі посьпехі Германскае імпэрыі як сваю моцную падтрымку. Яны не маглі не адчуваць духовай повязі з здабыткамі шматстайнай сусьветнай культуры; іхная руплівасьць, іхная высокая культура ды іхная ўпорыстасьць станаўко прычыніліся да разбудовы індустрыі, сыстэмы аховы здароўя і транспартных шляхоў. Неўрадлівасьць зямель не была для іх перашкодай, бо гэта кампэнсавалася тым, што паблізу Мосту і Духцава працавалі высакатэхналягічныя вугальныя шахты, у Лібэрцы дзейнічала ўзорная тэкстыльная фабрыка, у Ябланцы быў распачаты выраб біжутэрыі, і, нарэшце, існавалі яшчэ славутыя ў той час заходнечэскія курорты. Працоўная сіла, збольшага з чэскіх рэгіёнаў, лёгка паддавалася германізацыі, але хутка і тут разгарэлася зацятая барацьба за абарону сваіх нацыянальных правоў, і ў выніку на ўсім абшары Судэцкай краіны засталіся прыкметныя чэскія меншасьці. Чэхі сустрэлі разьвіцьцё капіталізму сьпярша не зусім адназначна, аднак ужо ў дзевяностыя гады XIX стагодзьдзя вельмі вялікія прамысловыя прадпрыемствы былі ў чэскіх руках, а дабрабыт узрос так, што чэхі мелі ў 1911 годзе ў банках і ашчадных касах больш за два мільярды кронаў капіталу (у той самы час Нямеччына мела толькі ў ашчадных касах больш за 18 мільярдаў, уся Аўстрыя — 6,3 мільярды); у 1912 годзе асноўны капітал чэскіх банкаў складаў прыблізна 245 мільёнаў кронаў, а сума асноўнага балянсу — 2,6 мільярды. У 1890 годзе чэхі на ўласныя сродкі заснавалі Акадэмію Навук і Мастацтваў, якую фінансаваў Ёзэф Глаўка (1831—1908), багаты архітэктар, які па ўсёй імпэрыі ўзводзіў больніцы, урадавыя будынкі і г.д. Задоўга да першай сусьветнай вайны чэхі валодалі не адным машынабудаўнічым заводам у Празе; у той час значнага эканамічнага ўздыму яны маглі канкураваць на роўных з тымі прадпрыемствамі, якія знаходзіліся ў нямецкіх руках.

Якім жа было духовае жыццё гэткага грамадзтва, калі ўсё-такі яно перш-наперш было змушанае дбаць пра хлеб свой надзённы? Скуль чэрпала яно сілы для гэтага зьнясільваючага жыцьця, у якім посьпехі былі такімі рэдкімі, а працы не было канца? Гэткае грамадзтва ня мела прасторы для ўзьнікненьня самастойнага спэкуляцыйнага мысьленьня, для мастацтва, якое б разгортвалася ў чыстых эмпірэях духу. Амбіцыі гэткага кшталту ўспрымаліся б кожным членам гэтага грамадзтва як нешта нерэалістычнае, неспалучальнае зь яго сутнасьцю ды структурай, як індывідуалісцкі выхад за ягоныя межы. У грамадзтве вызваленых парабкаў, якія сьпярша мусяць навучыцца, як імкнуцца да большай свабоды і самарэалізацыі, культура непазьбежна набывае рысы народнае пэдагогікі: яна скіравана якраз да гэтага грамадзтва, а не да „людзей“ ці да „чалавецтва“.

<…>

[4] *Josef Pekaš, Ieskй katastry 1654-1789*. У:*Ieskэ uasopis historickэ XIX, 1914, s. 341.*

[5] Маецца на ўвазе Сьвятарная Рымская імпэрыя германскай нацыі. (*Зацем рэд.*)

[6] Славянскі кангрэс адбываўся ў Празе 2—12 чэрвеня 1848 г. і сабраў дэлегатаў ад славянскіх народаў габсбурскае дзяржавы, а таксама прадстаўнікоў іншых славянскіх краінаў. Ён быў распушчаны ў выніку чэрвеньскага паўстаньня ў Празе. Яго ўдзельнікі выдалі адозву да эўрапейскіх народаў, у якой патрабавалі раўнапраўнасьці для ўсіх нацыяў і народнасьцяў.

Зь нямецкай мовы пераклаў Аляксей Крукоўскі паводле:
Co jsou Cesi? Maly prehled fakt a pokus o vysvetleni /Was sind die Tschechen? Kleiner Tatsachenbericht und Erklдrungsversuch. Praha, 1992.

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**

Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

да Зьместу 1(6)-2000
славянская ідэя

Ян Станкевіч Маскальшчына і Эўропа

Ян Станкевіч (1891-1976) — цэнтральная постаць беларускага нацыяналізму XX стагодзьдзя, мовазнаўца, гісторык, тэарэтык нацыянальна-вызвольнага змаганьня, аўтар першага поўнага перакладу Сьвятога Пісьма на беларускую мову. Зьмешчаны ніжэй тэкст быў упершыню выдрукаваны на старонках рэдагаванага Вацлавам Ластоўскім ковенскага часопіса „Крывіч" (№ 4 за 1923 год) пад псэўданімам Брачыслаў Скарыніч. Тэкст публікуецца з захаваньнем шэрагу моўных асаблівасьцяў аўтара.

“Нямецкая інтэлігентная моладзь, кажа В.Ф., мае новую моду: знайшла Дастаеўскага, глытае яго творы і захоплюецца ім. Гэта шырыцца там як пошасьць, так што нямецкія мысьліцелі пачынаюць зварочаць увагу, пісаць шмат аб гэтым. Дастаеўскага ў Нямеччыне лічаць тыповым Маскалём, а яго погляды тыпова маскальскімі. Гэныя погляды розьняцца гэтак ярка ад поглядаў заходняга Эўропэйца а Немца ў асобнасьці, што твораць праўдзівую іх працілежнасьць; нямецкія мысьліцелі бачаць у іх „погляд Усходу“, які стаіць рэзка проці „поглядаў Заходу“ і пытаюцца, ці не зьяўляецца зацікаўленьне нямецкай моладзі Дастаеўскім знакам, што ўсходні погляд пачынае праходзіць у Эўропу і выцясьняць там дагэтулешнія погляды Заходу. Яны пытаюцца, ці з гэтае зьмены поглядаў трэба цешыцца, ці, наадварот, змагацца зь ёю?

У гэтым кірунку Немцы ад нас асталіся: мы, чэская інтэлігенцыя, знайшлі Дастаеўскага і яго літаратурных маскальскіх сяброў на цэлае пакаленьне раней. Мы глыталі гэныя кнігі ўжо ў дзевяцьдзясятых гадох, перад трыццацьма гадамі. Таксама на нас рабілі яны глыбокі ўплыў. Як Славяне, мы былі духова бліжэйшымі маскальскім пісьменьнікам, мы былі мяккія, як яны; дзеля гэтага нас іхняя навука гэтак ня дзівіла, як цяпер дзівіць цьвярдых Немцаў. Ім гэта нешта зусім новае, аб чым не маглі й падумаць. Нам ня было новым, бо ў нашай душы Ўсход заўсёды ходаўся з Заходам, а дзеля гэтага мы заўсёды былі толькі напалавіну заходнікамі.
У чым жа асноўная розьніца, якой немагчыма пагадзіць паміж жыцьцёвымі поглядамі Заходу і Ўсходу?
На Заходзе адрозьнююць дабро ад зла *законам*. Людзі заходняга сьвету маюць інстынктыўнае пачуцьцё меры і ўдзержуюць свае пачуваньні ў азначаных межах; людзі Дастаеўскага ня маюць пачуцьця гэтае меры і сваіх пачуваньняў і запальчывасьцяў (страсьцяў) ня ўстрымліваюць. Эўропейская культура паважае жыцьцё на гэтым сьвеце і стараецца, каб яно было гарманічнае. Яна пераканана, што чалавек мае й *мусіць* мець гэтулькі духовае сілы, каб усьцерагчыся праступку, што чалавек павінен і мусіць умець сабе *загадаць*, што павінен і можа *сам сабою авалада*ць. Гэткае думаньне заходняга сьвету ёсьць арыстакратычнае. Яго ідэалам ёсьць чалавек удасканальнены духоўна й фізычна. Эўропа думала гэтак спрадвеку; пераняла гэты погляд на жыцьцё ад антычных Грэкаў і захавала сабе яго дагэтуль.
Наадварот, людзі Дастаеўскага (і іншых маскальскіх пісьменьнікаў) адрозьнююць добро ад зла не законам, але толькі *пачуцьцём*, дык ім шмат з таго, што мы лічым благім, не здаецца благім.

Асобы маскальскіх раманаў ня маюць пачуцьця меры, ня стрымлююць сваіх пачуцьцяў і запальчывасьцяў, але яны бязудзержныя і ня стыдаюцца гэтага, наадварот, хваляцца гэтым. Жыцьцё на гэтым сьвеце Маскалю быццам недарагое. У маскальскіх раманах блізу што ня знойдзеце паміж інтэлігентамі чалавека гарманічнага. Маскалі задаюць сабе страшное пытаньне, які апошні сэнс мае тутэйшае жыцьцё і ці

мае наагул які сэнс? Некаторыя адказуюць, што яно сэнсу зусім ня мае, здаецца ім залішняй наша маральнасьць, наша дысцыпліна, наша самапасьвята — хадзіла-б, значыцца, толькі аб тое, каб найбалей на гэтым сьвеце „ўжыць“. Іншыя правяць, што мэтаю жыцьця мае быць Бог, але іх Бог такі надлюдзкі, такі накшы ад хараства й сілы гэтага жыцьця, такі іншы, чымся чалавек, што да яго чалавек і даступіцца ня можа; а з гэтага становішча немагчыма наагул якоесь гарманічнае людзкое жыцьцё. Людзі Дастаеўскага (і рэшты), ня маючы за што пэўнае прыдзержыцца, няпэўныя, хісьлявыя, несупакойныя, бываюць жэртвамі цёмных інстынктаў, не патрапяць сабе загадаць. *„Чалавек ня ёсьць гаспадаром сваіх інстынктаў“* — гэта найакуратнейшае пераканаьне Дастаеўскага (і рэшты). Чалавекам валадае або Бог, або чорт і *нельга праціівіцца злу*. А гэта найгрунтаўнейшы духоўны разьдзел паміж Заходам і Ўсходам.

Сьвет Дастаеўскага (і іншых Маскалёў) ня мае ніякае самасьвядомасьці заходняга чалавека. „Я чалавек і нічога людзкога не адракаюся!“ — „Мы ўсе грэшнікі!“ Вось вучэньне Дастаеўскага. З гэтага становішча ніякае розьніцы няма паміж людзьмі найнягоднейшымі і найдабрароднейшымі. Усе роўныя. Усходні чалавек пакорны, бо ня можа змагацца сам з сабою; заходні горды, бо змагаўся сам з сабою і ў змаганьні перамог. Мы, Чэхі, перад вайною хінуліся да думкі, што правільнейшы і вышэйшы погляд маскальскі, усходні, мы былі такія кволыя, што ледь самі сябе не пыталіся, ці ня ёсьць быцьцё нашага малога народу толькі перашкодаю ў разьвіцьці народу вялікага й магутнага, паміж якога нас доля паставіла.

Цяпер, аднак, мы вылечыліся ад гэтае ўсходняе хваробы. А калі кажа хто, што маскальскі погляд — гэта погляд маладога народу, які з часам сусім возьме верх над поглядам састарэлага заходняга сьвету, здаецца нам, што гэта погляд *абмылковы*. Ці ня гэты маскальскі фаталізм барджэй будзе пераняты з далёкага Арыенту, якога культура шмат, шмат старэйшая, чымся нашая?

Толькі стары чалавек збываецца энэргіі, сашчапляе рукі, робіцца фаталістам.

Але чалавеку маладому й дужому карціць гэтая абломаўская

нядзейнасьць, гэта неабарона ад зла. Чалавек малады верыць, што яго воля дужэйшая за ўсё іншае, а сваёй энэргіяй рупліва адкідае перашкоды на шляху да сваёй мэты. Дык ці не заходняя Эўропа маладзейшая, чымся ўсходняя Маскальшчына? *Ці не барджджэй Маскальшчына патрабуе адраджэньня ад Эўропы*, а не наадварот? Ці не патрэбна, каб арыентальную апатыю там адмяніла сьвежая, радасная, маладая энэргія Заходу?
Каторы погляд возьме верх сярод белых на зямлі: погляд заходні ці ўсходні? Некаторыя кажуць, што быццам гэта будзе ўсходні.
Заход ад гэтага бароніцца, Заход яшчэ ня хоча стацца другім Кітаем, а мы, Чэхі, нягледзячы на тое, што па крыві належым да Славян, значыцца, да Ўсходу, прылучаемся ў гэтай справе да Заходу.
Не, ня хочам паарыентальшчыцца, ня хочам загразнуць у арыентальную летаргію, містыцызм, фаталізм. Гэта мы, навучаныя цяжкімі дазнаньнямі, сказалі сабе зараз па вайне.
У Нямеччыне аб гэтым пытаньні думаюць толькі цяпер. А гэта таксама адзін з сымптомаў глыбокага змучаньня і слабасьці, гэтага раней так гордага, а цяпер гэтак крэпка паніжанага народу.
Нельга ня згодзіцца з вывадамі В.Фастр аб поглядзе заходнім і ўсходнім. Аднак некаторыя пабочныя яе думкі ў гэтай стацьці вымагаюць папраўак.
Зусім справядліва адносіць аўтарка Маскалёў да ўсходняе культуры, але нельга гэтага рабіць з усімі Славянамі. Славяне, як з цывілізацыйна-культурнага боку, так па свайму геаграфічнаму палажэньню і блізкай кроўнасьці па крыві з Балтамі (Ліцьвінамі, Латышамі й інш.) ды, хоць далейшай радні, з другімі арыйскімі народамі, адносяцца да заходу. Дзе вы знойдзеце ў Славян гэты шчыра азіяцкі містыцызм, што даходзіць ажно да хлыстаўства, дзе знойдзеце абшчыны (сябрыны), дзе знойдзеце непраціўленьне злу?
Старавечныя Грэкі пачыналі Азію на ўсход ад Дону, дзе й прырода мае азіяцкі выгляд, іншы, чымся на захад ад гэнае ракі, але ніколі не пачыналі Азіі ад Дняпра ці Нёмна.
Іншая справа Маскалі: у іх ня толькі ўсходняя цывілізацыя з тонкім заходнім колерам, але, як шчыра прызнаюцца „эўразійцы“, няма Маскаля, у жылах якога не цякла б мангольская кроў.

Асобна трэ сказаць некалькі слоў аб Украінцах. Іхныя пісьменьнікі кажуць, што паўночна-заходняя земляробская Ўкраіна, з сваёй заходняй цывілізацыяй, перамагла паўднёва-ўсходнюю сьцепавую й замяніла яе сьцепы ў нівы, але зь сьцяпоў погляд усходні больш пашырыўся па Ўкраіне, чым погляд заходні. Перавага земляробскае Ўкраіны над сьцепавой дала перамогу этнічную ўкраінскаму элемэнту, ад перамогі заходніх поглядаў над сьцепавымі, усходнімі, украінскія мысьліцелі спадзяюцца перамогі ўкраінскае нацыянальна-палітычнае ідэі і лічаць патрэбнай працу дзеля дапяцьця гэтае перамогі заходніх поглядаў у Ўкраіне.
Што В.Фастр так лёгка залічыла Славян да Ўсходу, можна выясьніць прывычкаю бачыць у Маскалёх „славянскіх старшых братоў“ і гэткім парадкам асаблівасьці маскальскія перанасіць на ўсіх Славян, бо інакш нарушылася б жаданая славянская суцэльнасьць. Калі маскальскі погляд мог шырыцца ў Чэхаў, калі ён можа шырыцца ў Беларусаў, дык гэтаму прычына тая ж, чаму ён цяпер шырыцца і ў Немцаў, прычына, як кажа В.Ф., у зьнямозе і слабасьці. Тут аналёгія чыста біялёгічнага закону: да слабога чалавека лёгка прыстаюць усялякія хваробы.
Палітычныя ж сымпатыі Чэхаў да Маскальшчыны рабілі тое, што маскальскія погляды не здаваліся ім такімі дзіўнымі й прыкрымі, якімі яны здаюцца хоць бы Немцам. Словы В.Ф., што Чэхі паміж Немцаў і Маскалёў, я разумею ў значэньні культурных уплываў, бо геаграфічна — паміж Чэхіяй і Маскальшчынай ляжыць Украіна.
Трэба такжа адцеміць, што Дастаеўскі быў не Маскаль, але абмаскалены Беларус, якога і бацькі, пэўне, былі абмаскаленыя. Як абмаскалены, Дастаеўскі, мог выказываць у сваіх творах чыста маскальскія погляды, тым балей, што ён дасканальна знаў маскальскае жыцьцё. Але нам апрача гэтага здаецца, што ў творах Дастаеўскага маюцца і элемэнты заходнія, беларускія. Якраз гэтыя беларускія, заходнія элемэнты й зьяўляюцца тым мостам, па якім творы Дастаеўскага робяцца даступнымі заходняму чытачу. Ведама, гэтаму памагае яшчэ геніяльнасьць Дастаеўскага як псыхолёга і мастака слова.

Пад гэткім назовам чэская пісьменьніца Волька Фастр надрукавала стацьцю ў № 230 Narodni politiky. Дзеля таго што ў

стацыці разглядаецца вельмі цікаўнае і Беларусам пытаньне, падаём яе цэлую ў перакладзе.

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

да Зьместу 1(6)-2000
Балканы

Ягор Новікаў
Ёсіп Броз Ціта, альбо Праўдзівая гісторыя росквіту і падзеньня панславізму ў Югаславіі

Ад даўніх часоў вядома шмат выпадкаў, калі паасобныя ідэі, народжаныя ў рэлігійных грамадах і філязофскіх гуртках, аб'ядноўваліся з часам у адну магутную плынь і за малы час поўнасьцю зьмянялі выгляд сьвету. Яны выціралі адны дзяржавы з мапы і прыводзілі іншыя да вяршыняў магутнасьці, яны нішчылі старадаўнія цывілізацыі і прыводзілі новыя культуры да росквіту. Нам дастаткова згадаць узьнікненьне хрысьціянства за вялікай антычнай культурай альбо падзеньне бліскучых эўрапэйскіх манархій пад націскам жаўнераў, якія спавядалі ідэі волі, роўнасьці і братэрства. І кожны раз навершам гэтых ідэй былі людзі, вядомыя сваёй годнасьцю ці сваімі заганамі: прарокі, рэфарматары і тыраны, здольныя надаць абрыс ідэям, злучыць іх з павевамі часу і павесьці за імі людзей. Шматлікія эпохі перамен адзначаліся менавіта іхнымі імёнамі.

Але гісторыя ведала і іншыя прыклады садружнасьці паміж выдатнымі асобамі і ідэямі. Шмат разоў бывала, што нейкія ідэі і вучэньні ўзьнікалі імгненна ў адказ на крызысы грамадзтва як

рэцэпты хуткага вырашэньня пэўных праблем. Самі сабою не былі яны здольныя ні праіснаваць доўга, ні прынесьці нейкіх значных гістарычных, грамадзкіх ці культурных зьмен. Яны нават не маглі адваяваць у традыцыйных поглядаў месца ў грамадзкай сьвядомасьці. Але часам, пастаўленыя воляй Фартуны ў спрыяльныя ўмовы і ўзьнятыя на шчыт выключна таленавітымі правадырамі, яны давалі выдатныя прыклады дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва. Урэшце, няздольныя да разьвіцьця, яны падалі, цягнучы за сабой краіны і народы. І ўсё ж самой сваёй непадобнасьцю да традыцыйных гістарычных і культурных узораў чалавецтва, самой прывіднасьцю свайго існаваньня і падманлівым бляскам яны стваралі міты, здольныя ашукаць адных і стаць гатовай прынадай для іншых.
Адным з такіх мітаў стала пасьляваенная Югаславія, створаная геніем Ёсіпа Броз Ціта, якая забясьпечыла дабрабыт і мірнае існаваньне некалькіх малапрыхільных адзін да аднаго народаў, але пасьля ягонае сьмерці распалася зь вялікім кравапраліцьцем і войнамі. Тым ня менш, яна пасьпела зьявіць узор дзяржаўнага панславізму і ўзмацніць агонь панславізму ў іншых краінах, населеных славянамі. Гэты міт мы паспрабуем апісаць у гэтай гісторыі: якім чынам Югаславія ўзьнікла і расквітнела і чаму непазьбежна мусіла пасьці. Мы ня пішам гісторыі Югаславіі ці жыцьцяпісу Ёсіпа Броз Ціта і таму адразу зазначым, што будзем згадваць толькі тыя падзеі і факты, якія маюць непасрэднае дачыненьне да міту панславісцкае Югаславіі.
Чалавек, якому было наканавана аб'яднаць народы паўднёвых славянаў і дасягнуць вяршынь улады, Ёсіп Броз, пазьней вядомы пад мяном Ціта, нарадзіўся ў 1892 годзе ў харвацкай вёсцы Кумравец, недалёка ад мяжы са Славеніяй, якая, як і Харватыя, уваходзіла тады ў склад Аўстра-Вугорскае імпэрыі. Ён быў адным з пятнаццацёх дзяцей харвацкага каваля Франьё і славенскае сялянкі Марыі і дзяцінства сваё правёў у беспрасьветнай нэндзе і галечы.
Ад малых год спазнаўшы беднасьць, Ёсіп імкнуўся да заможнага жыцьця, але мары яго сягалі далей за жаданьні звычайнага сялянскага хлопца. Ён марыў аб шыкоўных палацах, дарагіх аўтамабілях і прыгожых строях. Таксама яго неадступна вабілі жанчыны. Трэба сказаць, што такая ўвага да радасьцяў жыцьця рабіла Ёсіпа вельмі прывабным і

прыцягальным чалавекам і надзейна ахоўвала яго ад агідных скрайнасьцяў. Нават ува ўладзе ён быў нязьмерна далёкі як ад збытэчнае прагі асалоды даўніх Нэрона і Калігулы, што загубіла іх саміх і атруціла рымскую грамаду, так і ад ілжывага аскетызму ягоных сучаснікаў Сталіна і Гітлера, гатовых кінуць сваіх падданых у жабрацтва ў імя цьмяных ідэалаў. Дамогшыся прыемнага жыцьця для сябе самога, ён не перашкаджаў у гэтым і югаслаўскім абываталям.

У пошуках лепшае долі Ёсіп зьмяніў шмат заняткаў. Частыя перамены разьвілі ў ім надзвычайнае ўменьне сыходзіцца з новымі людзьмі і заваёўваць сяброў. Нават свае слабасьці, як залішнюю ўвагу да свайго выгляду і схільнасьць да раманаў з жанчынамі, ён умеў ператвараць у вартасьці, бо ставіўся да іх з гумарам і ўмеў дараваць іншым тое, што дараваў сабе. Ад гэтых самых часоў ішла і выключная здатнасьць Ёсіпа Броз да дасягненьня кампрамісаў, што дапамагала яму ў далейшай дзяржаўнай дзейнасьці шчасьліва праводзіць свой карабель у найвузейшыя пратокі паміж небясьпечнымі палітычнымі рыфамі.

Перамены працы супадалі ў яго зь пераменамі месцаў. У свой час ён пасьпеў пажыць у сталіцы Харватыі Загрэбе, славенскай Любляне, Празе і Вене. Пад час сваіх падарожжаў ён вывучыў нямецкую і чэскую мовы. Усё гэта ў спалучэньні зь мяшаным харвацка-славенскім паходжаньнем напоўніла яго сьвядомасьць новым касмапалітызмам і дазволіла пазбыцца местачковасьці, што так уласьцівая многім балканскім і ня толькі балканскім дзеячам.

Пад час першае сусьветнай вайны Ёсіп Броз быў рэкрутаваны ў аўстра-вугорскае войска. Ён стаў камандзірам узводу, ваяваў напачатку на сэрбскім, а тады на расейскім фронце і быў узнагароджаны. У 1915 годзе ён быў цяжка паранены і ў непрытомным стане ўзяты ў расейскі палон, дзе прабыў да 1920 году. Калі ён вярнуўся дадому, большасьць паўднёваславянскіх земляў была аб’яднаная ў Каралеўства Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў, надалей перайменаванае ў Югаславію. Дома ў Харватыі Ёсіп Броз пазнаёміўся зь мясцовымі камуністамі, стаў сябрам партыі і заняўся падпольнай дзейнасьцю. Тамсама ён атрымаў мянушку Ціта, якая стала яго другім іменем назаўсёды. Да канца жыцьця ён так і ня стаў сапраўдным камуністам, а многія іншаземцы

называлі пазьнейшую Цітаву Югаславію дзіўнай формай сацыял-дэмакратыі. Мы думаем, што далучэньне яго да камуністычнае партыі было формай пратэсту супраць югаслаўскае рэчаіснасьці 20-х гадоў і праявай імкненьня да ўлады.
Як то ні было, Ціта актыўна браў удзел у дзейнасьці камуністычнае партыі. У 1928 годзе ён быў пасаджаны ў турму, дзе прабыў да 1934-га. У выніку гэтых падзей да пачатку другой сусьветнай вайны ён стаў адным зь вядучых дзеячоў югаслаўскага камуністычнага руху і зацятым ворагам каралеўскай улады. Ён таксама загартаваў свой характар і набыў неацэнны досьвед. Пазьней Гімлер гаварыў аб ім: „Ён наш вораг, але мне хацелася б, каб у нас у Нямеччыне быў бы тузін такіх Ціта — правадыроў вялізнае рашучасьці і моцных нэрваў“.
Але якімі б выдатнымі якасьцямі ні валодаў Ёсіп Броз Ціта, ён наўрад ці здолеў бы перамагчы сваіх ворагаў у другой сусьветнай вайне, дамагчыся ўлады і заснаваць другую Югаславію, калі б не знайшоў перад сабой такіх гістарычных абставін, якія спрыялі яму. Для таго, каб зразумець падзеі, якія дапамаглі Ціта прыйсьці да ўлады, нам варта было б зазірнуць трохі назад, у XIX стагодзьдзе, калі фармавалася этнічная сьвядомасьць паўднёваславянскіх народаў і стасункі паміж імі, якія прадвызначылі падзеі XX стагодзьдзя.
Балканскія славяне ў XIX стагодзьдзі былі разьяднаныя паміж некалькімі дзяржавамі. Славенцы ад даўніх часоў уваходзілі ў склад каронных аўстрыйскіх земляў і ня мелі амаль ніякага досьведу самастойнага дзяржаўнага існаваньня. Харвацкае каралеўства ад XII стагодзьдзя было злучана асабістай уніяй з Вугорскім каралеўствам, якое ў сваю чаргу было адной зь дзьвюх частак Аўстра-Вугорскае імпэрыі. Памкненьні харватаў заўсёды разрываліся паміж вернасьцю дынастыі Габсбургаў і імкненьнем вызваліцца ад вугорскага панаваньня. Басьнійскія мусульмане былі нашчадкамі сярэднявечных багамілаў, якія прынялі ісламу пад час турэцкага панаваньня. Яны захоўвалі вернасьць асманскім султанам, а ў далейшым былі такімі ж вернымі падданымі Аўстра-Вугорскае кароны. Сэрбы і чарнагорцы насялялі дзьве невялічкія дзяржавы, якія сваёй упартай барацьбой здолелі вызваліцца ад турэцкага панаваньня і, гордыя сваімі перамогамі, хацелі распаўсюдзіць свой уплыў

на іншыя славянскія народы.
Паміж балканскімі славянамі стаяла шмат непераадольных бар'ераў: рознасьць рэлігіі; старая варожасьць, якую гістарычная памяць на Балканах захоўвае, як у ніводным іншым месцы; і, урэшце, натуральнае для XIX стагодзьдзя імкненьне да стварэньня нацыянальных дзяржаваў. Але былі і рэчы, якія аб'ядноўвалі гэтыя беспакойныя народы. Усе яны, апроч славенцаў, размаўлялі на розных гаворках аднае мовы, пазьней вядомай як сэрбскахарвацкая. Усе яны бачылі пэўную выгоду аб'яднаньня ў барацьбе супраць культурнага і палітычнага націску мацнейшых народаў. Так яны існавалі побач у стасунках узаемнае любові-варожасьці. Ідэі паасобнага існаваньня былі звычайна мацнейшыя, але час ад часу ідэі аб'яднаньня набывалі сілу ў адказ на пэўныя палітычныя зрухі. Вядучай і найвядомейшай з аб'яднаўчых ідэй была ідэя панславізму. У балканскіх умовах яна значыла вяртаньне да ўяўнае першапачатковае еднасьці і аб'яднаньне славянскіх народаў, нібыта калісьці разьяднаных несправядлівым лёсам гісторыі, у адну магутную дзяржаву, здольную супрацьстаяць іншамоўным суседзям. Яна таксама значыла ўтварэньне адзінай культуры і адзінае літаратурнае мовы пры паступовым збыцьці этнічных асаблівасьцяў.
Гэтая ідэя асабліва моцна ўзьнімалася на шчыт у Сэрбіі. Але пры ўсёй сваёй славянскай рыторыцы яна мела мала агульнага са славянамі і была перанесеная ў Сэрбію з Асманскай імпэрыі, якой яна ў сваю чаргу дасталася ў спадчыну ад Бізантыі. Гэта была старая імпэрская ідэя аб'яднаньня многіх народаў у імя вялікай манархіі, калі ўсё мясцовае і нацыянальнае станавілася неістотным і губляла значэньне перад зьзяньнем адзінае вярхоўнае ўлады. Перанесеная ў Сэрбію, гэтая ідэя пражыла дзіўную мэтамарфозу, калі аб'яднаньне ў імя вярхоўнае ўлады было замененае на аб'яднаньне ў імя славянскае еднасьці, але для апраўданьня такой самай імпэрскай экспансіі.
Гэтая перамена адбылася таму, што якой бы жорсткай ні была барацьба сэрбаў супраць турэцкага панаваньня, яна была формай суіснаваньня двух народаў і прывяла да безьлічы узаемных культурных запазычаньняў. Так адбылося, што ў выніку барацьбы з дэспатыяй сэрбы самі перанялі дэспатычныя ідэі і памкнуліся да стварэньня сваёй імпэрыі. Гэта не было нечым незвычайным. Яшчэ Цэзар адзначаў, што „на ваяроў

увогуле моцна ўплываюць звычаі той краіны, дзе яны доўга знаходзяцца“. Вось гэтыя ідэі ў другой палове XIX стагодзьдзя сэрбская палітычная эліта і культурныя дзеячы, такія, як лінгвіст Вук Караджыч, вылучылі для абгрунтаваньня сваёй экспансіі на Балканах.
Але ідэі панславізму, альбо „ілірызму“, не здабылі б такой масавай прыхільнасьці, каб не сустрэлі падтрымкі іншых славянскіх народаў, асабліва ж харватаў. Нацыянальны рух харватаў у другой палове XIX стагодзьдзя быў занадта слабы, каб супрацьстаяць культурнаму і палітычнаму ўціску Вугорскае кароны. Яны спадзяваліся, што хаўрус з сэрбамі дасьць ім магчымасьць разьвіць сваю нацыянальную існасьць. Харвацкія культурныя дзеячы, такія, як Людэвіт Гай, ужо з 1842 году вылучылі ідэю стварэньня самастойнага паўднёваславянскага каралеўства. У 1850 годзе ў Вене яны прыйшлі да паразуменьня з сэрбскімі вучонымі аб стварэньні адзінае літаратурнае мовы на аснове самых чыстых сэрбскіх і харвацкіх гаворак Герцэговіны. Такія паводзіны харватаў сталі трывалым узорам паводзін невялікіх народаў. У барацьбе за самастойнасьць яны вымушаныя ўступаць у хаўрус з мацнейшымі суседзямі і нават успрымаць варожыя для сябе аб’ядноўчыя ідэі, бо яны ня ўпэўненыя ў сваіх сілах. Але трывала стаўшы на ногі, яны адмаўляюцца ад усялякага патранату і імкнуцца да поўнай незалежнасьці.
Так адбылося ў выніку другой сусьветнай вайны. Магутны панславісцкі рух прывёў да ўтварэньня Каралеўства Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў (пазьней Югаславія). Але пазбыўшыся небясьпекі мадзярызацыі, харваты цяпер маглі аддаць свае сілы змаганьню за поўную незалежнасьць. Заняпаду панславісцкіх ідэй шмат паспрыяла збытэчнае сэрбскае дамінаваньне ў першай Югаславіі, розрух і карупцыя. Адзін з выдатных харвацкіх палітыкаў Стэпан Радзіч быў застрэлены проста ў будынку парлямэнту чарнагорскім дэпутатам. Таму калі ў 1941 годзе Югаславія ўпала пад націскам нямецкіх войскаў, большасьць харватаў вітала гэтую падзею. Першая спроба пабудаваць панславісцкую дзяржаву не ўдалася.
Але нацыяналізму розных народаў Югаславіі рукі былі разьвязаныя ў вельмі нешчасьлівы час. У гады жорсткай другой сусьветнай вайны пад нямецкай акупацыяй ён ператварыўся ў самы выродлівы шавінізм і прывёў да нястрымнага імкненьня

вынішчыць усіх чужынцаў. Асабліва вялікіх памераў узаемнае вынішчэньне дасягнула ў Незалежнай Харвацкай Дзяржаве, абвешчанай нацыяналістамі-усташамі. Нягледзячы на назву, большасьць яе жыхароў складалі менавіта сэрбы, якіх усташскія карнікі забівалі ў ходзе рэйдаў па гарадох і вёсках ці ў канцэнтрацыйных лягерох. У самым вядомым зь іх, Ясэнавацы, было забіта больш за 70 тысяч сэрбаў, габрэяў і цыганоў. Сэрбскія партызаны, альбо чэтнікі, адказалі жорсткім тэрорам супраць харватаў. Басьнійскія мусульмане, пакінутыя паміж двух агнёў, узялі таксама ўдзел у гэтай бойні. Гэтая хваля акрутных і бессэнсоўных забойстваў, а таксама супрацоўніцтва нацыяналістаў з акупантамі прывялі да дыскрэдытацыі, хай сабе і часовай, нацыяналістычных рухаў. Надышоў час новага ўздыму аб'ядноўчых тэндэнцый. Носьбітамі гэтага ўздыму былі партызанскія войскі, якія пад кіраўніцтвам Ціта ўпарта адваёўвалі ў немцаў, усташаў і чэтнікаў мястэчка за мястэчкам у непраходных басьнійскіх гарах. Паколькі ідэалёгіяй партызан быў камунізм, то і іхнае тлумачэньне панславісцкіх ідэй набыло дзіўнаватае адценьне камуністычнага інтэрнацыяналізму. За іншым часам гэта выглядала б недарэчна, але ўва ўмовах няспыннага кравапраліцьця было тым выйсьцем, якое ўратавала шмат чалавечых жыцьцяў і захавала краіну ад поўнага разбурэньня. У занятых партызанамі гарадох і вёсках адразу ж спыняліся міжэтнічныя забойствы. Такая разумная палітыка цярпімасьці надала партызанам усеагульную папулярнасьць і прыхільнасьць. Хаця сам Ціта і ягоныя паплечнікі прыпісвалі свае посьпехі сваёй вызваленчай барацьбе супраць немцаў ці сацыяльнаму руху камуністаў супраць архаічнай каралеўскай улады, прыватна і яны прызнавалі, што перамога дасталася ім найперш у змаганьні з нацыяналістамі.

Як ні дзіўна, імкненьне да аб'яднаньня было абумоўленае і ходам разьвіцьця сэрбскае і харвацкае дзяржаўнасьці. Сэрбы, якія складалі большасьць партызанаў, зноў, як і пасьля першай сусьветнай вайны, хацелі замацаваць свой уплыў ува ўсёй Югаславіі. Харвацкая ж дзяржаўнасьць зайшла ў тупік са змрочнай і крывавай Незалежнай Харвацкай Дзяржавай. Ёй патрэбныя былі новыя людзі, якія, не забываючыся на харвацкія нацыянальныя ідэі, маглі б наладзіць мірнае суіснаваньне харватаў зь іншымі народамі. Адным з такіх людзей быў

партызанскі афіцэр, пазьнейшы прэзыдэнт Харватыі Франьё Туджман.
Але ня толькі гэта вяло да стварэньня новай Югаславіі. Яшчэ адной прычынай была незвычайная асоба Ціта. Апрача ягонай палітыкі талеранцыі, і сэрбаў, і харватаў вабіла ягоная цярпімасьць і дружалюбнасьць у будзённым жыцьці да людзей самага рознага паходжаньня і поглядаў. Ягонымі бліжэйшымі сябрамі і паплечнікамі былі статэчны і ўраўнаважаны сэрб Аляксандар Ранкавіч, разважлівы і пэдантычны славенец Эдвард Кардэль, няўрымсьлівы рэвалюцыянэр-чарнагорац Мілаван Джылас і таленавіты генэратар ідэй габрэй Мошэ П'ядэ. За жыцьцёвай цярпімасьцю Ціта неадступна ішло ягонае жыцьцялюбства. Нават яго незьлічоныя раманы з рознымі жанчынамі на фоне крыві і забойстваў выглядалі як вельмі прывабная праява чалавечых пачуцьцяў. Пры гэтым можам зазначыць, што гэта ніколі не перарастала ў нерашучасьць альбо мяккасьць, якія ўвогуле ніколі не былі характэрнымі для балканскіх народаў. Яго цьвёрдасьць і воля былі ўзорнымі для ўсіх і ў часы перамог, і ў часы паражэньняў. Таму пасьля поўнага вызваленьня Югаславіі ад немцаў у 1945 годзе нават ня ўзьнікла пытаньня аб кіраўніку новай дзяржавы. Ім мог быць толькі Ціта.
Як правадыр краіны, Ціта зрабіў усё, каб не дапусьціць новага зьбегу тых самых абставін, якія загубілі першую Югаславію. Каб ня даць ніводнаму з югаслаўскіх народаў яўнай перавагі ў справах дзяржавы, Югаславія была падзеленая на шэсьць рэспублік, якія паводле сваёй тэрыторыі і насельніцтва прыкладна ўраўнаважвалі адна адну. Яны валодалі такой аўтаноміяй, каб быць у стане вырашаць унутраныя праблемы, але недастатковай, каб зрабіць нейкія сэпаратысцкія захады. Да таго ж здольнасьць рэспублік да сэпаратызму зьмяншалася мяшаным складам насельніцтва ў некаторых зь іх. У Босьніі мусульманская, сэрбская і харвацкая грамады жылі ўва ўмовах традыцыйнага хісткага балянсу. На тэрыторыі Харватыі існавалі традыцыйныя сэрбскія анклявы, населеныя нашчадкамі памежных вайсковых пасяленцаў Аўстрыйскае кароны. У самой Сэрбіі былі аўтаномныя тэрытарыяльныя ўтварэньні вугорцаў у Ваяводзіне і альбанцаў у Косаве, ступень самастойнасьці якіх ад Сэрбіі на працягу жыцьця Ціта няўхільна павялічвалася.

Да гэтага Ціта паклапаціўся і аб вырашэньні моўнай праблемы. У 1954 годзе ў Новым Садзе, як 104 гады таму ў Вене, югаслаўскія мовазнаўцы дамовіліся аб унармаваньні адзінае літаратурнае сэрбскахарвацкае мовы пры захаваньні асаблівасьцяў мясцовых гаворак. Мы бачым, што ў моўнай праблеме, як і ў дзяржаўным будаўніцтве, Ціта хацеў дасягнуць бясьпечнага адзінства, але захаваўшы кожнаму народу прастору для разьвіцьця сваёй існасьці.
Такое памяркоўнае вырашэньне этнічных праблем Ціта спалучыў з даволі свабоднай палітычнай сыстэмай і досыць эфэктыўнай рынкавай эканомікай, адкінуўшы савецкія сталінскія стэрэатыпы. Нават улада Камуністычнае партыі скарыстоўвалася ня так для задушэньня дысыдэнцкага руху, як для ўтаймаваньня этнічнае варожасьці. Усё гэта зрабіла Югаславію самай спакойнай, свабоднай і заможнай краінай Усходняе Эўропы і спарадзіла незьлічоныя міты аб трыюмфе непарушнай еднасьці паўднёвых славян.
Ёсіп Броз Ціта, чалавек, які найбольш спрычыніўся да ўзьнікненьня гэтых мітаў, мала верыў у іх. Аднойчы ён горка зазначыў, што ўсё створанае ім упадзе пасьля ягонае сьмерці. Такое самае адчуваньне стала гнясьці ўсю Югаславію разам з пагаршэньнем ягонага здароўя пры канцы 70-х. Эліта і паспольства аднолькава сумна чакалі сьмерці краіны за сьмерцю Ціта. У глыбіні ўсе ўсьведамлялі, што Ціта на некалькі дзясяткаў год замарозіў, але так і ня зьнішчыў тых абставінаў, якія рабілі немагчымым далейшае існаваньне Югаславіі.
Ёсіп Броз Ціта ня здолеў перамагчы тое, што перамагчы немагчыма — натуральнае імкненьне народаў да незалежнага існаваньня. Ён не паяднаў сэрбаў, харватаў, мусульман, славенцаў, чарнагорцаў і македонцаў. Ён адно здолеў супрацьпаставіць іх нацыянальныя памкненьні адно адному і ўраўнаважыць іх. Югаслаўскае адзінства было вынікам гэтага найхітрэйшага балянсу, адзіным гарантам якога быў Ціта. Пазьней, пасьля сьмерці Ціта, старыя ворагі-сябры, сэрбы і харваты, ізноў пайшлі поруч у разбурэньні гэтага балянсу, як раней ішлі поруч у яго стварэньні. Пасталелы і дужы харвацкі нацыянальны рух усё больш схіляўся да патрабаваньняў поўнай незалежнасьці Харватыі. Для сэрбаў захаваньне адзінства Югаславіі было найбольш пэўным спосабам захаваць сэрбскую супольнасьць у межах адзінае дзяржавы. Таму яны рашуча

выступалі супраць усіх спробаў аддзяленьня Харватыі. Але захаваць еднасьць яны маглі, толькі ўзмацніўшы пазыцыі самой Сэрбіі ў Югаславіі. А гэта зноў штурхала харватаў на яшчэ мацнейшы сэпаратызм. Так, нібы ў зачараваным сьне, Сэрбія рухалася да разбурэньня будынку, дзе яна была нарожным камянём.

Сама ідэя паўднёвага панславізму ўтрымлівала шмат прыхаваных заганаў. Панславізм, як тэорыя экспансіі, заахвочваў і экспансійную палітыку. Таму Югаславія бязь ценю сумненьня заяўляла свае прэтэнзіі на Юлійскую Краіну, населеную італійцамі, уключала Ваяводзіну, дзе жыло шмат вугорцаў, і пераважна альбанскае, няхай сабе толькі ў колькасным сэнсе, Косава. З уключэньнем чужародных элемэнтаў панславізм губляў свой сэнс і ставіў пад сумненьне існаваньне краіны, апраўданьнем якой ён быў. Да таго ж чужынцы, найперш альбанцы, раструшчвалі Югаславію знутры. Іх чужыя звычаі, клянавы лад, разьюшаная злачыннасьць і высокая нараджальнасьць ператварылі цэнтар старадаўняй сэрбскай цывілізацыі ў Косаве ў пекла для саміх сэрбаў. Праблема Косава адыграла адну з вырашальных роляў у падзеньні Югаславіі ды так і засталася нявырашанай.

Дзіўным чынам, існаваньне самой Югаславіі і яе актыўная замежная палітыка здаваліся нелягічнымі і выпадковымі ў дачыненьні да ідэяў панславізму. Панславісцкі камуністычны ўрад Югаславіі зацята супрацьстаяў панславісцкаму камуністычнаму ўраду Савецкага Саюзу. Савецкі Саюз, гэтаксама як і Югаславія, пераняў панславісцкія імпэрскія ідэі ў сваёй дзяржавы-папярэдніцы — Расейскай імпэрыі. Гэтаксама, ён надаў ім камуністычнае адценьне і ўжыў для апраўданьня сваёй экспансіі, у тым ліку і на Югаславію. Як гэта заўсёды здараецца, два аднольковыя палюсы адштурхнулі адзін аднаго. На працягу свайго існаваньня Савецкі Саюз і Югаславія заставаліся спаборнікамі, а часам ворагамі. У 1948 годзе Ціта рэзка разарваў адносіны са Сталіным. У 1968 годзе Югаславія асудзіла савецкую інтэрвэнцыю ў Чэхаславаччыне. На пачатку 70-х з нагоды этнічнай напружанасьці паміж сэрбамі і харватамі Брэжнеў запрапанаваў Ціта „братнюю“ дапамогу, ад якой той адмовіўся.

Больш за тое, югаславы, нават сэрбы, ставіліся да расейцаў зь лёгкай пагардай. Калі ў іх пыталіся, як яны ставяцца да

расейцаў, у адказ чуліся словы, здольныя страшэнна зьдзівіць любога расейца: „Як да малодшых братоў“. Сапраўды, югаславы ставіліся і ставяцца да расейцаў як разумны, але слабейшы старэйшы брат ставіцца да малодшага брата, дурнаватага боўдзілы. Да яго можна часам зьвярнуцца па дапамогу ў дваровай бойцы, але ўвесь час пасьміхацца зь яго і трымацца на адлегласьці. Гэта мела свой адмоўны бок. Самое існаваньне двух варожых цэнтраў панславізму абвяргала ягоную тэорыю. Да ўсяго, вельмі складана было растлумачыць, чаму рэспубліканскія ўрады Любляны і Загрэбу мусілі падпарадкоўвацца цэнтральнаму ўраду Бялграду, калі той не жадаў ні ў чым саступаць ураду Масквы, які прэтэндаваў на сусьветнае дамінаваньне.
Гэтыя і іншыя супярэчнасьці няўхільна вялі Югаславію да падзеньня. Ёсіп Броз Ціта памёр у 1981 годзе. На ягоных хаўтурах здавалася, што разам зь ім хавалі і Югаславію, краіну, якую ён стварыў нанова і прывёў да росквіту. Пасьля ягонае сьмерці не знайшлося чалавека, роўнага яму паводле таленту і папулярнасьці, які б мог працягнуць існаваньне Югаславіі. Краіна праіснавала яшчэ некалькі год, а тады распалася ў агні войнаў, канчаткова пахаваўшы вучэньне панславізму і ідэю паўднёваславянскае еднасьці. Але гэтыя сумныя падзеі ўжо не зьяўляюцца тэмай нашай гісторыі. Яны ўжо сталі і яшчэ стануць прадметам досьледу іншых дзеяпісцаў.
Югаславія загінула, бо была ўвасабленьнем нетрывалае і прывіднае ідэі панславізму. Панславізм узьнік як часовая зьява, адказ на пэўную палітычную сытуацыю. Ён ня мог праўдзіва паяднаць занадта адрозныя народы і стварыць трывалую дзяржаву. Нават у спрыяльных умовах, узьняты найталенавіцейшым чалавекам, пасьля кароткачасовага росквіту ён прыйшоў у заняпад, выклікаўшы крывавыя міжэтнічныя войны. Тым больш мы ня думаем, што ён можа прынесьці нейкі плён у іншы час у іншым месцы ў менш спрыяльных умовах.

[image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

Балканы

Алеш Дэбэляк
Сутоньне ідалаў
Успаміны пра былую Югаславію

Алеш Дэбэляк — славенскі паэт і эсэіст, адзін з найбольш вядомых пісьменьнікаў Цэнтральнай Эўропы. Спэцыяліст у галіне параўнальнага літаратуразнаўства. Цікавіцца постмадэрнізмам. Аўтар паэтычных кніг *Zamenjave, zamenjava* (1982), *Imena smrti* (1985), *Slovar tisine* (1987), *Minute strahu* (1990), зборніку прозы *Pisma iz tujine* (1992), некалькіх томікаў эсэяў *Melanholicne figure* (1988), *Postmoderna sfinga* (1989).

I.

Хто цяпер памятае Вукавар?

Усе прыкметы часу сьведчаць, што кліч „няхай жыве разнастайнасьць“ зрабіўся дэвізам гэтага канца тысячагодзьдзя. На глянцавых старонках модных часопісаў і на рагах бэрлінскіх, нью-ёркскіх і парыскіх вуліц можна ўбачыць сьляды гэтага „трыюмфу разнастайнасьці“: сары прыйшло на зьмену дзелавому касьцюму, а заношаныя анучы гіпі — элегантнаму крою *alta moda di Versace*. Трыюмф разнастайнасьці праяўляецца на старонках ранішніх газэт, што змагаюцца за нашу ўвагу пры дапамозе тэлевізійна прыгожых, усыпляльных вобразаў далёкіх краін і экзатычных іншаземцаў, якія намагаюцца адцягнуць нас ад таго, што Гегель называў

„ранішняй малітвай буржуазіі“.

У сапраўднасьці гэтыя іншаземцы зусім не падобныя да нас, бо нам належыць улада — пульт дыстанцыйнага кіраваньня ў руцэ — над апошнім прытулкам нашае самоты. Гэтыя ўцекачы і вандроўнікі, працаўнікі-імігранты і перамешчаныя асобы адрозьніваюцца ад нас. Бегучы ад рэпрэсіяў ды галечы, яны плацяць высокую цану за сваю „іншасьць“ на кожнай заходняй мяжы, якую спрабуюць перасекчы.
„Разнастайнасьць — гэта рэсурс, які эгалітарызм страўнікаў і мазгоў ставяць пад пагрозу зьнікненьня“, — абвяшчаюць з трыбуны палітычныя лідэры перад тым, як накіравацца на абед у аплот сваёй дыпляматычнай і эканамічнай улады. Імпэрская мудрасьць Даўнінг-стрыт, Белага Дому і Ке Д’Арсэ ўзьвяла гэты пазбаўлены вокнаў аплот знарок, каб „лідэры свабоднага сьвету“ выпадкова не заўважылі, як іхнае падобнае да Пілатавага ўмываньне рук прывяло да палітычных вівісэкцыяў, што ператварылі суседзкія двары ў перадавыя лініі сьмертаноснага вар’яцтва.
Дый чорныя, белыя, жоўтыя і чырвоныя твары, што сарамліва ўсьміхаюцца з рэклямы *United Colors of Benetton*, крычаць пра той самы трыюмф. Разнастайнасьць — гэта абяцаньне надзеі, што расьце, у катастрафічным сьвеце, дзе надзея зрабілася раскошай жменькі абраных. Разнастайнасьць — гэта слабы праменьчык надзеі, за які ўхапіліся жанчыны, геі, лесьбіянкі, нэгры, турэцкія працоўныя ў Нямеччыне, мараканцы і альжырцы ў Францыі, амэрыканскія тубыльцы, курды і тыбэтцы, тамілы і літоўцы. Мабыць, яны лічаць, што праменьчык разнастайнасьці дазволіць-такі ім дыхаць пад добра скамечаным каўпаком сучаснага грамадзтва, якое яшчэ ўчора здавалася аднародным, але чыя форма і сутнасьць зьмяняюцца хутчэй, чым яго напалоханыя члены здольныя гэта ўспрыняць.
У сьценах інтэлектуальных цэнтраў Заходняй Эўропы і Паўночнай Амэрыкі гіерархі асьветы нясуць слова новай філязофіі разнастайнасьці, талерантнасьці і мультыкультуралізму. Гэта самыя апошнія слоўцы зь лексыкону суіснаваньня ў складаным, узаемазалежным грамадзтве, дзе людзі больш не абавязаны падпарадкоўвацца

ўплыву амэрыканскага *melting pot*-у і яго слабенькай эўрапейскай копіі.
Пад час эпічнага пэрыяду сусьветнай эміграцыі XIX стагодзьдзя разнастайныя культуры, рэлігіі і тоеснасьці зьмяшаліся так, што стала зусім немагчыма іх адрозьніць. Імкнучыся адаптавацца ў грамадзтве, прадстаўнікі меншасьцяў былі вымушаныя размаўляць на мове паноўнай культуры. Сёньня, як сьцьвярджаюць экспэрты, мы можам цешыцца здабыткамі так званага постсучаснага грамадзтва, якое зблізу нагадвае салатніцу. Карысьць яе — у магчымасьці разгледзець кожны з інгрэдыентаў, не хвалюючыся аб тым, што з салатай нешта здарыцца пры разьмешваньні, бо менавіта яно і вызначае канчатковы смак.

Зразумела, усё гэта гучыць прагрэсіўна і натхняльна.
Але тыя з нас, хто нарадзіўся ў краіне шматтысячных палітычных мітынгаў і бліскучай камуністычнай рыторыкі, якую выкарыстоўваў Ціта, каб прывабіць цяплічных левых Эўропы і Амэрыкі, тыя з нас, каго школьнікамі выстройвалі ўздоўж „маршрутаў урачыстага сьледаваньня“ па былой Югаслаўскай фэдэрацыі, каб мы махалі сьцягамі Вялікаму Маршалу, тыя з нас, хто ашаломлена глядзеў, як сэрбскія масы ў аргазьме назіраюць за сьвяткаваньнем шасьцісотай гадавіны паражэньня іхных продкаў у бітве з туркамі на Косаўскай раўніне, а альбанскія касавары, што трапілі ў пастку ўсталяванага сэрбамі апартэіду, не наважваюцца сунуць і носу на вуліцы ўласных гарадоў і вёсак, тыя з нас, хто зблізу назіраў, як паталягічна амбіцыйныя пісьменьнікі, самаабвешчаныя „бацькі нацыі“ і няўдалыя паэты мяняюць пёры на спускавыя гачкі кулямётаў зь непахіснай верай ў тое, што гэта найлепшы спосаб пераканаьня масаў у неабходнасьці аб’яднаньня ўсіх сэрбаў ў адной дзяржаве, тыя з нас, хто з жахам глядзеў, як помсьлівыя югаслаўскія падбрэхічы, прыкрываючыся дэмакратыяй, зьнішчаюць рэальна існуючую культуру разнастайнасьці, — мы, жыхары калі ня сэрца Эўропы, дык ейнай ускраіны, зьяўляемся адзінымі, каго бяда навучыла той ісьціне, што шырокім масам людзей пляваць на разумнае суіснаваньне ў „разнастайным грамадзтве“.
Масам больш падабаюцца прывабныя сырэны, чые песьні былі

для іх такімі зразумелымі, — сырэны атрыманых у спадчыну міталягічных архетыпаў, сырэны пляменных традыцыяў. Людзі ўвабралі словы і мэлёдыі гэтых песень з малаком мацярок. Пакаленьне за пакаленьнем, яны навучаліся ім з казак, якія ўвечары распавядалі іхныя дзяды. Калектыўная памяць любой нацыі даражыць досьведам мінулага, безь якога не бывае летуценьняў аб будучыні.

Давайце прыпынімся на гэтым: пад час крызысу мы ўсе — у рознай ступені — здольныя знаходзіць атавістычны прытулак у даўно спраўджанай стратэгіі выжываньня, якая дапамагала нашым продкам вытрымаць зьмену ідалаў безь неабходнасьці мяняцца самім. І ці ня робіцца гэтая калектыўная памяць, што прывязвае нас да ўспадчыненых формулаў, наймацнейшай менавіта тады, калі мы сутыкаемся з выклікам новых даляглядаў, пераживаем крушэньне старых рэжымаў, пачынаем велічны шлях да сьветлае будучыні?

Вось чаму калектыўная памяць — гэта палка з двума канцамі: адзін канец абараняе крыніцу бясьпекі ад пагрозы высыханьня, а другі перасьцерагае ўсіх членаў грамадзтва ад разьвіцьця крытычных здольнасьцяў і незалежнасьці ад традыцыі. Нацыя прыстасоўваецца да сучаснай парадыгмы толькі калі сацыяльныя паводзіны вызначае не племянны шаман, а разважлівыя і здольныя асобы, якія клапоцяцца пра супольны дабрабыт на аснове ўсеагульнай згоды.

Калі нацыя пасьпяхова, з розумам вызначае, у чым заключаецца яе супольнае дабро, адбываецца пераход ад аднастайнае супольнасьці да структураванага грамадзтва, ад традыцыі да сучаснасьці. Адначасова яна павінна вызваліць сябе ад міталягічнай цыклічнай канцэпцыі часу, у якой сталае зьяўленьне адных і тых прататыпаў сьцірае адрозьненьні паміж учора, сёньня і заўтра. Толькі час як непаўторная прагрэсія, хуткаплынны, бесьперапынны бег зьменлівых імгненьняў, можа сапраўды спарадзіць сучасную сьвядомасьць. Сучаснае ўяўленьне пра час кажа, што мінулыя падзеі самі сабою зьяўляюцца не прадпісаньнем нашых учынкаў у цяпершчыне, а нагодай для крытычнай самаацэнкі, што грунтуецца на памылках мінулых пакаленьняў. Калі таленавітая асоба паглыбляецца ў лябірынты сваёй памяці, чалавецтва ўзнагароджваецца чарговым шэдэўрам мастацтва. Калі ж цэлая нацыя засмоктваецца вірамі памяці, чалавецтву пагражае

катастрофа. Уцёкі ў памяць — гэта права і прывілей людзей мастацтва, якія плацяць за нарцысізм сваіх дасягненьняў асабістай ізаляцыяй. Калектыўныя ўцёкі ў мінулае, якія выкарыстоўваюцца для апраўданьня крывавай сучаснасьці, робяць іншых адказнымі за шавінізм, перакідваюць правіны на плечы тых, хто не зьяўляецца носьбітам калектыўнае памяці „этнічна чыстай“ нацыі і асуджаныя быць ейнымі ахвярамі.

Слова і справа не разыходзяцца адно ў мітах. Таму не павінна зьдзіўляць, што цяперашняя сэрбская эліта ўцягнулася ў вайну словаў і зброі дзеля таго, каб адрадзіць колішні мэнталітэт, а разам зь ім культурную і нацыянальную ідэнтычнасьць. Ідэфікс сэрбскіх інтэлектуальных, палітычных і вайсковых лідэраў (не гаворачы ўжо пра абсалютную большасьць сэрбскага простага люду), навязьлівая мара пра Вялікую Сэрбію можа ператварыць успрыманьне цяперашняй зьнішчальнай вайны ва ўспрыманьне яе як подзьвігу патрыятычнае велічы. Дымавая заслона сэрбскага *amor patriae* засьціць вочы і дурыць галовы шмат каму з назіральнікаў з боку.
Падумайце: хто зараз памятае Вукавар? Горад на мяжы Харватыі і Сэрбіі. Горад палацаў у стылі барока, зьбяднелай арыстакратыі і *Sachertorten*, які зьяўляўся адным з самых усходніх аванпостаў цэнтральна-эўрапейскай культуры. Зараз яго ніхто ня памятае. Насамрэч, здаецца, што ўжо шмат зімаў мінула ад таго часу, як узброеная банда сэрбскіх ваякаў з падтрымкай Бялграду зраўняла зь зямлёй гэты харвацкі горад, хаця ўсё здарылася толькі ў лістападзе 1991 году. Каменя на камені не пакінулі ад таго, што яшчэ нядаўна было чароўным правінцыйным местам з насельніцтвам у 100 тысяч чалавек. „Вызваленым“, паводле афіцыйнай сэрбскай прапаганды. Лёс Вукавару такі ж або, прынамсі, вельмі падобны да лёсу Сараева. І на жахлівых руінах Сараева выпаляць сваю прымірэнчую люльку палітычныя сілы Захаду, а потым і заходняя грамадзкасьць, якая прынамсі на крок апярэджвае сваіх лідэраў у справе змаганьня супраць дасюль нябачанай сэрбскай кампаніі генацыду. Гэты крок аддзяляе мараль ад палітыкі, хоць мараль і не дапамагае нам выратаваць нічога, акрамя душы. Мы ня можам выратаваць мусульманаў, ахвярных ягнятаў новага сусьветнага бязладзьдзя. Калі хто і

выжыве, іх запруць у спэцыяльных рэзэрватах як ціхі дакор чалавецтву. З націскам на слове „ціхі“.
З прыняцьцем у 1986 годзе ганебнага „Мэмарандуму Сэрбскай Акадэміі мастацтва і навукі“ сэрбская гісторыя — багатая на народныя песьні, танцы і архітэктуру — забілася ў агоніі на мапах бялградзкіх камуністычных генэралаў, якія вывелі зь яе сэрбскі варыянт *„Drang nach Westen“*, „рушма на Захад“.
У гэтым дакумэнце сэрбскія акадэмікі, члены вышэйшага і самага аўтарытэтнага інтэлектуальнага цэнтру Сэрбіі, далі палітычнае і псэўдагістарычнае абгрунтаваньне крывавай сэрбскай агрэсіі, што пазьней было па-майстэрску выкарыстанае Мілошавічам. Незавершаны, праўда, Мэмарандум моцна паўплываў на насельніцтва, зьявіўшыся ў друку пасьля таго, як некаторы час распаўсюджваўся ўпотай. Асноўная ўвага ў ім рабілася на цьверджаньні, што пад час мінулых войнаў Сэрбію зазвычай пазбаўлялі ейных тэрыторыяў. Міталягічная інтэрпрэтацыя фактаў пазьней дзейнічала як галоўная крыніца сучаснага сэрбскага апэтыту да заходніх земляў.
Меркаваньне, што „тое, што сэрбы заваёўваюць у вайне, потым губляюць у мірны час“, было надзвычай папулярным. Яно мела вялікую ірацыянальную сілу перакананьня ня толькі з-за тагачаснага гістарычнага скрушэньня ідэалаў, аб якім яно, у прынцыпе, і сьведчыць, а найперш таму, што выйшла з-пад пяра Добрыцы Чосіча, самага выбітнага сэрбскага пісьменьніка сучаснасьці, паважанага „патрыярха нацыі“, які кароткі час быў прэзыдэнтам мілошавіцкае абскубленае Югаславіі.
Сьцьвярджаючы, што сэрбы — добрыя ваяры, але дрэнныя грамадзяне, шматлікія раманы Чосіча, „Мэмарандум“ і моцная ідэалягічная навала інфармацыі, што яму папярэднічала, сыходзіліся на адным: усе сэрбы павінны жыць у адной краіне! Гэта значыла яднаньне трох розных групаў сэрбскага насельніцтва. Сэрбская меншасьць у Харватыі (нашчадкі ўцекачоў, што ратаваліся ад войска Атаманскай імпэрыі ў XVI і XVII стагодзьдзях, а пазьней, за Габсбургаў, ператварыліся ў „панцырных баяраў“ паўднёва-ўсходняга аўстрыйскага ўзьмежжа) павінна быць аб’яднаная любым коштам з самой Сэрбіяй ды з насельнікамі сэрбскіх анкляваў у Босьніі. Тут праваслаўнае сэрбскае насельніцтва тысячагодзьдзі жыло адносна мірна побач са славянамі-мусульманамі ды каталікамі-

харватамі. Гэтак, падтрымаўшы гучныя заклікі да пачатку нацыяналістычнае вайны, сэрбская супольнасьць, што жыве на захад ад сэрбскай дзяржаўнай мяжы, выказалася за разьвязаньне крывавай вайны супраць сваіх суседзяў, адкінуўшы магчымасьць пошукаў разумнага палітычнага дыялёгу.

Бессаромна выкарыстоўваючы ў сваіх інтарэсах спадчынны страх перад прыгнётам і фізычным вынішчэньнем (сапраўды, вялізная колькасьць сэрбаў загінула ад рук правых харвацкіх нацыяналістаў за час другой сусьветнай вайны), калі ня ўсе, дык большасьць бялградзкіх паэтаў засьпявалі ва ўнісон з ідэолягамі-папулістамі. Яны абуджалі ў сэрбах ваяўнічы настрой, называючы іх „рэшткамі выразанага народу“, ашукваючы іх хоць і палітычна эфэктыўнымі, але абсурднымі азначэньнямі сэрбаў як выбранага і нават „сьвятарнага“ народу.

Нядзіўна, што ў гэтай радыкальна нацыяналістычнай казцы ўсе дэталі мінулага падпарадкаваныя адзінай мэце: яны падтрымліваюць заклік, што праз 10 год пасьля сьмерці Ціта нарэшце надышоў час, калі Сэрбія павінна ўрэшце вызваліцца, што ідэя ўзнаўленьня і структура сяроднявечнага сэрбскага каралеўства павінны заставацца непахіснымі, куды б ні ступаў бот сэрбскага жаўнера.

У спрытных рукох учорашніх камуністаў і сёньняшніх нацыянал-сацыялістаў косаўская півоня ператварылася з сымбалю колішняе агрэсіі супраць сэрбаў у сучасны сымбаль сэрбскай агрэсіі супраць усіх нясэрбаў. Косаўская півоня — кволая кветка, якая нарадзілася з сэрбскай крыві, пралітай стагодзьдзі таму — у цяперашняй сэрбскай дзяржаве была з энтузіязмам прыўлашчаная шматлікімі ваенізаванымі арганізацыямі і бандамі наймітаў.

Гісторыя з кветкай вельмі прыдатная для апраўданьня цяперашняга выразаньня басьнійцаў, якія з атаманскімі туркамі, што перамаглі сэрбскіх лыцараў у Косаўскай бітве, ня маюць нічога супольнага апроч ісламскай рэлігіі. Значкі, брошкі, наколкі, на якіх прысутнічае вобраз косаўскай півоні, сёньня больш не навяваюць ціхую тугу па сярэднявечных героях Сэрбіі, што палі ад рук ворагаў. Ад жорсткіх рук сэрбскіх забойцаў, злачынцаў і барбараў, што зацята помсьцяць за даўнішнія паразы, косаўскія півоні як сымбаль сэрбаў-

ахвяраў зьвялі. Сёньня яны зьяўляюцца жалобным *memento mori* па ахвярах сэрбскага палітычнага вар'яцтва.

Вось чаму вайна на Балканах так шакуе замежных аглядальнікаў. Ваяўнічы сымбалізм косаўскіх півоняў зьяўляецца люстэркам толькі для тых, каго пераборлівае засваеньне гісторыі падштурхнула да найвялікшай жорсткасьці. Для мяне папулярныя цьверджаньні аб „трыюмфе разнастайнасьці" ніколі не былі простай філязофскай тэорыяй. Як я магу прыгадаць, адрозьненьні паміж народамі заўсёды былі асновай досьведу майго існаваньня на перакрыжаваньні розных культураў. Калі да мяне прыйшлі госьці з Захаду, я — з выглядам шчасьлівай спрактыкаванасьці, якая адчуваецца ў лесьніка ў ягоным стаўленьні да свайго хвойнага лесу, нават калі чары таго — усяго толькі вынік звыклага чаргаваньня сухіх і дажджлівых дзён, а ня нейкіх адмысловых намаганьняў — давёў ім, што ганаруся нашай фэдэратыўнай разнастайнасьцю. Я лічыў разнастайнасьць югаслаўскай рэчаіснасьці натуральным фактам.

У Скадарліі, старым месьце Бялграду, задымленым ад грыляў ды шашлычніц з пожагамі і ўслаўленым у песьнях часоў першай сусьветнай вайны, я ўпершыню ўбачыў, як мужчыны ходзяць, не зашпіліўшы кашулі, з-пад якіх відаць валасатыя грудзі. Яны лускалі сланечнік і выплёўвалі шалупіньне на тратуар. Упершыню я зразумеў прыхаваны пазытыўны сэнс выразу „шырокая славянская душа". Гэтым азначэньнем так часта злоўжываюць, што мы, славенцы, неахвотна яго ўспрымаем, але нашыя імпульсіўныя браты-сэрбы ня могуць жыць безь яго. Мае сабутэльнікі колькі гадзінаў запар пілі за маё, абсалютна чужога незнаёмца, здароўе толькі таму, што даведаліся, хто я такі. Бо мы ж усе „славянскія браты", хіба ня так?

У маёй памяці моцна заселі танклявыя мінарэты ў басьнійскіх вёсках, дзе я — адначасова зьбянтэжаны і зачараваны — назіраў за вусатымі мужчынамі ў вышываных кашулях, што сядзелі за столікамі ля кавярняў і мружыліся ад сонца, нібы сышоўшы з старонкаў бліскучага раману Мешы Сэлімавіча „Сьмерць і дэрвіш", які разам з раманамі Івы Андрыча быў сапраўды векапомным сымбалем Босьніі. Тут былі сэрбскія

манастыры, пазалочаныя фрэскі якіх зьяўляліся пераканаўчым прыкладам творчае магутнасьці Ўсходняга Хрысьціянства, магутнасьці, зь якой я пазьней са зьдзіўленьнем сутыкнуўся пад час вандровак у Паўночнай Італіі і якую пабачыў на скляпеньнях базылікі Сан-Марка ў Вэнэцыі.
Добра ўмацаваныя муры Дуброўніка бароняць незалежны дух сярэднявечнай незалежнай рэспублікі Рагуза і адраджэнскую мудрасьць гарадзкога дэвізу *„Non bene pro toto libertas venditur auro“* (Свабоды ніколі ня купіш за золата), які ваяўнічая жорсткасьць чарнагорскіх рэзэрвістаў узяла на выпрабаваньне пад час вайны 1991—1992 году. Мая памяць аднаўляе застоены смурод на шырокай дуброўніцкай Страдун, галоўнай вуліцы места, дзе ў халадку завулкаў зацьвіталі і вянулі кветкі летняга каханьня маіх аднагодкаў — гладкая забрукаваная прастора здавалася больш прыдатнай для эратычных дасьледаваньняў, чым роўны асфальт Любляны ці Загрэбу.
На момант аддаўшыся ў палон ілюзіяў, я ўявіў сабе, што нібыта магу ўваскрэсіць слодыч кавуна, які аднойчы мне адрэзалі два ветлівыя кіроўцы грузавіка, калі я вандраваў стопам усьцяж даліны македонскае ракі Вардар. Я ехаў дахаты ў сваю родную даліну, што схавалася ў Альпах, яны — далей, развозіць па заходнеэўрапейскім абшары прадукцыю ўрадлівых македонскіх палёў. Але нам усё ж было па дарозе.
Пад час паездкі я са зьдзіўленьнем даведаўся, што не адзін цешуся разнастайнасьцю югаслаўскай мазаікі. Мэлядычныя паніжэньні голасу гэтых неадукаваных людзей былі сьведчаньнем таго самага гонару і зачараваньня. Хоць мы і адрозьніваліся адзін ад аднаго вопраткай, мовай, рэлігійнымі пераканаьнямі ды густам у музыцы, у нас было нешта агульнае: мы былі блізкімі незнаёмымі. Я знаходзіўся за тысячу кілямэтраў на поўдзень ад роднага места, у якім, між іншым, працавалі *Gastarbeiter*’амі сябры маіх дальнабойшчыкаў, каб пасьля шчыра нахвальваць найбагацейшую паўночную рэспубліку ў кожнай вёсцы фэдэрацыі. Мы расплочваліся за напоі на ўзбочынах аднымі і тымі амаль нічога ня вартымі дынарамі. У нас у кішэнях ляжалі амаль тыя самыя пашпарты, пераплеценыя ў тую самую чырвоную вокладку з тым жа прэтэнцыёзным сацыялістычным гербам.
Адной з рэчаў, якімі мяне зачаравала геаграфія Македоніі, была збляклая прыгажосьць Старога Скоп’я, дзе я шукаў рэшткі

шчырай паўднёвай гасціннасьці, што была ўслаўленая ў адной з найчульлівейшых элегіяў югаслаўскай літаратуры, „Тузе па Поўдні“ — элегіі пра сонечныя землі дзяцінства. Канстанцін Міладзінаў (1830—1862) напісаў яе ў сваім жахлівым маскоўскім выгнаньні. У тавэрне з той самай назвай, паціху пацягваючы македонскае брэндзі *масьціку*, я разважаў аб нясьцерпным болю ад страты роднае зямлі, аб псыхалягічных пакутах выгнаньнікаў, загнаных у чужыя дамы чарговым абсурдным рашэньнем Камуністычнага Інфармбюро, палітэканоміяй беднасьці або таталітарным урадам. Калі я рабіў марныя высілкі ўзгадаць у памяці радкі з „Тугі па Поўдні“, элегія напаўняла мяне горкім усьведамленьнем таго, што досьвед эміграцыі быў лёсавырашальным для ўсяго спэктру культураў Югаславіі.

Я ня мог і падумаць, што ўжо празь дзесяць год пасьля наведваньня Скоп’я маім басьнійскім, македонскім і сэрбскім сябром давядзецца не на словах зьведаць усю горыч тае элегіі ва ўсіх сталіцах абыякавай Заходняй Эўропы, дзе яны хаваліся ад пякельнага агню вайны, які жэр безабаронныя Сараева, Гораждэ, Мостар, дзе яны ратаваліся ад сэрбскага зьвярынага прагненьня „Паўднёвай Сэрбіі“ — так бялградзкія архітэктары старанна спраектаванай катастрофы клічуць Македонію, — і дзе яны пазьбягалі мабілізацыі ў войска Мілошавіча, войска, дзе афіцэры забівалі сваіх жа зрэкрутаваных людзей, калі тыя адмаўляліся браць удзел у бандыцкім гвалтаваньні мусульманскіх жанчын.

Тым лянотным летнім днём, нахадзіўшы ногі, я бы зачараваны сядзеў на вузкай вулачцы Старога Скоп’я і нават ня мог уявіць сабе, што „Туга па Поўдні“ — гэта нешта большае, чымся спробы ў рамантычнай паэзіі, гэта сучаснае ўвасабленьне тугі па Радзіме, якая зрабілася станам душы для шматлікіх „перамешчаных асобаў“ былой Югаславіі. Сёньняшняя рэчаіснасьць горшая нават за самыя жудасныя начныя мроі. Некалькі гадоў пазьней я зайшоў выпіць піва ў *Chelsea Hotel* у Нью-Ёрку. Я накіраваўся туды, бо яго пакоі былі сьведкамі першых парасткаў амэрыканскага мастацкага авангарду. Я хацеў заглыбіцца ў атмасфэру тае радыкальнае авантуры, якая зрабіла культуру амэрыканскага народу неад’емнай часткай выхаваньня ва ўсёй „сусьветнай вёсцы“ — той гатэль прытуліў быў пад сваім дахам Дэльмара Шварца і Лу Рыда, Джэніс

Джоплін і Леанарда Коэна. Пасёрбваючы цеплаватае *Rolling Rock*, я раптам канчаткова ўсьведаміў тое, да чаго дасьпяваў доўгі час. У тое імгненьне я ўразумеў, што на фармаваньне маёй культурнай ідэнтычнасьці паўплывалі тры магутныя фактары: мая родная славенская традыцыя, традыцыя сусьветнай масавай культуры і, урэшце, унікальны досьвед югаслаўскага культурнага спляценьня, дзеля якога мая пілігрымка ў скоп'еўскую кавярню была нагэтулькі ж экзыстэнцыйна важнай, як і наведваньне *Chelsea*.

Наўрад ці рамантыка была тым, што вабіла македонскіх каралёў дарог да Славеніі, але не была тым і звычайная цяга да ўзбагачэньня. Да яе дадавалася зачараваньне адрознасьцю Славеніі. Бо далёкая паўночна-заходняя частка Югаславіі — правінцыя Аўстра-Вугоршчыны ў мінулым — уяўлялася гэтым нашчадкам атаманскіх васалаў незвычайна экзатычнай, да таго ж, Славенія была часткай той самай краіны, дзе жылі і яны. Самыя экзатычныя рэчы знаходзяцца пад рукой. Фройдава канцэпцыя *das Unheimliche* сапраўды ўбірае ў сябе тыя малазаўважныя зьявы нашага штодзённага жыцьця, якія — урэшце кімсьці ўбачаныя — зачароўваюць усіх наўкола. І менавіта гэта было вымярэньнем нашага югаслаўскага суіснаваньня, што прывяло ў сваёй экстрэмальнай форме да жорсткай дэзынтэграцыі фэдэратыўнае дзяржавы. Безумоўна, трымаць жыцьцё ў напружаньні паміж роднай і замежнай культурамі асабліва цяжка, калі яно прымушае цябе сумняваццa ў абгрунтаванасьці тваіх собскіх перакананьняў. Але толькі гэта можа прынесьці нейкі плён. Спроба ж пазбавіцца гэтага напружаньня паварочваецца для нас помстай. Калі Бялград прагне абсалютнай улады, адрозьненьні паміж яго нацыянал-сацыялістычнай палітыкай і палітыкай іншых рэспублік паступова робяцца невымернымі.

Сэрбская нецярпімасьць да ўсяго іншага ўзьняла свой Мэдузаў голаў яшчэ ў Косаве, задоўга да пачатку вайны. Палітыка апартэіду, якую сэрбскі рэжым праводзіў больш за дзесяць год, дзеля таго каб зламіць дух адвечных жыхароў Косава, альбанцаў, выцякала зь перакананьня, што адно сэрбская культура можа ўважацца вялікай. У той час, як кулі рыкашэцілі над альбанскімі хатамі, а прадстаўнікі сэрбскае меншасьці агнём і мячом выбівалі іхных насельнікаў з-за мураваных дувалаў, бялградзкая прапагандысцкая машына літаральна

захлёбвалася ў зьневажаньні косаўскага народу, адмаўляючы яму ў праве звацца людзьмі, прыніжаючы іх да ўзроўню жывёлаў, прыдатных толькі для вынішчэньня. Гэтак касавары ператварыліся ў д'яблава семя: „ісламскія фундамэнталісты", „дэмаграфічная бомба запаволенага дзеяньня", „нецывілізаваныя выродкі". Толькі вынішчыўшы ліха чужынскае прысутнасьці на целе нацыі, сэрбскі народ урэшце можа стацца вольным, крычалі плюгавыя сэрбскія гебэльсы. Жорсткае стаўленьне да косаўскага народу вызначыла для Бялграду зручную формулу яго ваяўнічых зносінаў зь іншымі нясэрбамі. Са сваіх паранаідальных пазыцыяў сэрбы ў кожным бачылі лютага ворага: славенцы — гэта „лёкаі Вены", харваты — „забойцы-ўсташы", басьнійцы — „ісламізаваныя сэрбы" або „ісламскія маджахеды", Захад канвульсуе ў ціскох „змовы Ватыкану з Чацьвертым Райхам". І гэтак далей. Вы можаце адвольна працягнуць сьпіс: асноўная мадэль перад вамі. Усё нязвыклае, адрознае, чужое вартае адно пагарды, выкараненьня, зьнішчэньня. Адрозьненьні, дзеля якіх Югаславія некалі сталася прыкладам эўрапейскага багацьця культураў, незваротна зьніклі ў віхурах вайны.

II.

„Дакраніся да мяне сваёй каленкай пад сталом…"

Я прызнаю: дзякуючы шчасьлівым абставінам і эфэктыўнаму супраціву славенскай краёвай абароны прасэрбскаму югаслаўскаму войску пад час Дзесяцідзённай вайны мяне абмінула неабходнасьць эміграцыі. І менавіта таму я шкадую свайго страчанага Поўдня на тым мэтафізычным узроўні, які ня мае нічога супольнага з нашай былой урадавай структурай. Мая туга па Поўдні — гэта не настальгія па цэнтралізацыйнай палітыцы Бялграду. Наадварот, мая туга па Поўдні ўбірае ў сябе выпадковыя згадкі аб п'янкім водары сьліовага цьвету ў басьнійскіх садох. Яна — у пранізьлівых крыках напаўдзікіх бакланаў на македонскім возеры Дойран. Яна адбіваецца ў крышталёвым блакіце пячоры на харвацкай высьпе Бішава, якая па сваёй прыгажосьці пакідае далёка ззаду нашмат больш ведамую Грота-Адзура на высьпе Капры. Калі Андрэ Жыд насамрэч хацеў бы зьбегчы адтуль, ён, пэўне, патрапіў бы ва ўладаньні марскіх багоў у глыбокіх блакітных водах Бішава.

Мая туга па Поўдні паціху зь пяшчотай напявае далмацкія песьні пра каханьне, якія мы, славенскія школьнікі, любілі больш, чым мэлянхалічныя народныя напевы нашае перадальпійскае рэспублікі. Мая туга па Поўдні аблепленая прыватнымі размовамі, што вяліся сярод бялградзкіх літаратараў, якія цяпер зьехалі на эміграцыю, а раней удзельнічалі ў дэбатах адносна творчасьці Дэрыды і Рыльке, у палымяных дыскусіях аб гістарычных раманах сэрбскага пісьменьніка Мілаша Црнянскага і заблытаных апавяданьнях славенца Драгі Янчара. Яна мкнецца выявіцца ў тым даўно пазабытым запоі на пляжах Спліту, гораду на далмацкім узьбярэжжы, дзе непарыўна зьмяшаліся харвацкая і італьянская мовы. Яна — у напаўскураным касяку, забітым травою, якую адзін знаёмы вырасьціў на высьпе Віс.

Мая туга па Поўдні муркоча лірычныя вершы Джоні Штуліча, вакал-гітарыста легендарнага рок-гурту *Azra*, якога на канцэртах у любой частцы былой Югаславіі горача віталі натоўпы ўзбуджаных тынэйджэраў, сярод якіх быў і я. Хоць ён і сьпяваў пра тое ж, што і Лу Рыд, толькі па-харвацку, такі, з хрыпкай, голас быў толькі ў яго; гэты голас ў тыя часы, калі над усім красаваў вайсковы бот, выяўляў ягоную індывідуальнасьць, якая зараз магла б падацца павярхоўнай. Ён ненавідзеў пазёрства і, сьпяваючы, ніколі не нахіляўся ўперад. У гэтым палягала нашая духоўная тоеснасьць. Ён не абяцаў Валадарства Нябеснага на зямлі; наадварот, для яго сьвет быў Свэдэнборскім пеклам, прыкрытым маскай нябёскіх ідалаў. Калі ён сьпяваў пра шпацыры па цьмяна асьветленым горадзе позна ўначы і пра людзей, якіх ненавідзяць з-за таго, што яны належаць да тае ці іншае меншасьці, ён заўжды абапіраўся на непарыўную ўпэўненасьць у тым, што найпрасьцейшы выбар — найгоршы, і што ты мусіш пакласьці сваё жыцьцё, каб абараніць свае пераканаьні. Калі я вучыўся ў каледжы, мне давялося ўпершыню яго пабачыць у Мэмарыяльнай залі Любляны. Я інстынктыўна адчуў, што перада мною прарок. Яго заклік да веры ў сябе, у анархію і волю быў адразу прыняты цэлым пакаленьнем маладых югаславаў, якія, молячыся розным багом, шанавалі толькі аднаго прарока: прарока ад рок-н-ролу.

Аднойчы, ужо даўна, пад час маёй вандроўкі па Карнацкім архіпэлязе ў Адрыятычным моры, мне выпадкова давялося

прачытаць насьценны надпіс на адной далёкай высьпе, куды карабель зь вялікай зямлі заходзіць толькі двойчы на тыдзень. Накрэмзаныя ўздоўж нетынкаванай сьцяны вясковае тавэрны, гэта не былі тыя цалкам бессэнсоўныя апакаліптычныя брыдоты, якімі сталіся графіці сёньня. Наадварот, там літары прапаведвалі вечную праўду Каханьня. Маё сэрца ёкнула і пачало грукацець шпарчэй.

Я багатварыў Юга-рок, бо для мяне ён стаў сапраўды дзейсным ладам жыцьця, які зьбліжаў мяне з тымі людзьмі, што маглі адчуваць радасьць і сум, і ім не былі патрэбныя для гэтага лішнія словы. Тут, на гэтай закінутай скалістай высьпе пасярод Адрыятыкі, я знайшоў такую блізкую мне па духу кароткую фразу, якая выказвала ўсё маё захапленьне рок-сьпеваком, што простымі словамі распавёў аб нашых агульных дылемах у сваёй душасутрасальнай музыцы. Надпіс быў: „Штуліч — бог“. То было ўсё, чаго я хацеў. Я патрапіў дамоў.

Той запал, які поўніў песьні Штуліча пра гора горкае і надзвычайную духоўную моц *ізгояў* грамадзтва, быў запалам, што сьведчыў. Для тых з нас, хто валтузіўся пад сцэнай, гэты запал прарываўся праз пласты нашых падлеткавых нормаў паводзінаў і рабіўся адзнакай тае прыступнасьці, што дала магчымасьць цэламу пакаленьню маладых югаславаў знайсьці саміх сябе ў Штулічавай лірыцы. Гэта было магутнае і прадбачлівае сьведчаньне пра канец сьвету, на які забыліся багі і які карціць занядбаць самім людзям.

Юга-рок ніколі не хацеў хаваць свайго закліку за песьнямі пастушкоў пад македонскую дуду, якія мацяркі нашых рок-музыкаў слухалі, робячы ў полі. Безумоўна, Юга-рок трымаўся на ўнівэрсальным спалучэньні басу, гітары, бубнаў і вакалу, але ён таксама не цураўся ўплыву паўднёваславянскіх народных мэлёдыяў.

Падсумую: калі нашыя заходнія аднагодкі вучыліся музыцы па стандартных *Yellow Submarine* і *Rock'n'Roll Music*, гітарысты-пачаткоўцы ўсёй Югаславіі спрабавалі імітаваць арыгінальныя рытмы басьнійскага блюзу, і зрабіў несьмяротным галавакружна папулярны сараеўскі гурт *White Button* у песьнях „Сэльма“, „Ня сьпі, мая салодкая“ і „Іх віна — у горкім віне“, чые куплеты я і мае сябры сьпявалі на калідорах Першага сараеўскага, загрэбскага Клясычнага і люблянскага Шэнтвіцкага каледжаў з тым аматарствам, якім было адзначана

ўсё наша юнацтва.
Слова „аматар“ этымалягічна паходзіць ад „захапленьня рэччу самой па сабе“. Нашая абмежаваная асалода ад недасканалага прадукту таго захапленьня была, мабыць, перадусім, адной магчымай узнагародай за веру ў наш супольны, няхай і спрэчны, мэнталітэт, заснаваны на культурах Цэнтральнае Эўропы, Балканаў, Міжземнамор’я і Панонскай даліны.
Я ўпэўнены, што Юга-рок даў мне той рэдкі шанец пажыць у шматкультурным грамадзтве задоўга да таго, як паняцьце мультыкультурнага грамадзтва атрымала афіцыйную ахоўную афарбоўку палітычнае правільнасьці.
Неўзабаве пасьля пачатку цяперашняй Балканскай вайны я вяртаўся дахаты са Злучаных Штатаў праз Парыж. Чакаючы цягніка на адной халаднаватай станцыі мэтро, я раптам пачуў пагалосак знаёмай з далёкіх часоў, з далёкага сьвету мэлёдыі. Нешта пяшчотнае і неадольнае пацягнула мяне туды, адкуль даносілася тая песьня.
Малады цёмнавалосы хлопец, перад якім на падлозе ляжаў перавернуты скамечаны капялюш, журботна кранаў струны гітары, гледзячы проста перад сабою. Ніхто зь іншых мінакоў і ня думаў спыняцца. Нашто ім трэба?
Але мяне ажно скаланула, калі я літаральна ў адно імгненьне прызнаў лірычную баляду, што аднойчы дапамагла мне выказаць боль маладога разьбітага сэрца. Мною адразу апанавала вострая, яшчэ прыемная настальгія, мяне здушыў струмень эмоцыяў, калі я слухаў непастаўлены голас таго сьпевака, голас, які надзвычай моцна адбіваўся рэхам у сьценах падземкі. Паслухайце, паслухайце ўважліва песьню, якую сьпяваў мой няшчасны зямляк:

Нехта кахае мяне
марыць аба мне
паглядае ўпотай
але я ня ведаю хто
нехта кахае мяне
калі я дзесьці бадзяюся
пераходжу вуліцу
нехта такі як сам я
я вывучаю твары
я аглядаю натоўп
нехта шукае мяне

але я ня ведаю дзе
нехта кахае мяне
аддае мне сваю душу
нехта тут чужы
як і я чужы
цень нэонавага сьвятла
большае
жар у цябе ў вачох
цябе выдае
сёньня ўвечары ты можаш
распытваць пра мяне зноў
засунь рукі ў кішэні
і ціхененька ідзі.

У сваёй *Biographia Literaria* Колрыдж піша, што „сапраўдную сілу маюць ня тыя вершы, што мы прачыталі, а тыя, да якіх мы вяртаемся“. Я не адзіны, хто зноў і зноў перажывае падобныя пачуцьці, слухаючы Штулічаву лірычную „Людзі самоты“. Усе тыя з нас, хто заўсёды шукае блізкую душу на чыгуначных вакзалах, у аэрапортах, у залях чаканьня, каго-небудзь, хто стаўся сьведкам тых дзеяў, што адбываліся на тэрыторыі ўсёй былой Югаславіі ў адным і тым жа рытме, таго, хто з аднолькавым экстазам слухаў тых самых рок-сьпевакоў і чытаў творы тых самых паэтаў, адчуваюць тое самае. Імёны гэтых сьпевакоў і паэтаў так і не прагучалі ў Заходняй Эўропе, але для нас яны былі тым сьвятлом, што мігцела ў канцы тунэлю палітычнага цемрашальства.
Калі ты не ўсьведамляеш таго, што ты згубіў, ты не згубіў анічога. А я вельмі добра ведаю, што згубіў: досьвед тае адметнае насычанае тоеснасьці — прадукту ўнікальнага і ўжо не для ўсіх прывабнага сусьвету, што кідае выклік — тоеснасьці з вайсковымі амбіцыямі Бялграду. Пазбаўлены жаўруковае песьні па-над балоньню славенскае ракі Соры, навальніцаў над Карстам або бязгучнага багацьця мінэралаў у вострахрыбетных Юліянскіх Альпах, гэты сусьвет мог бы выглядаць даволі бедна, гэтак сама, як і мая маладосьць, калі б у ёй не было рок-музыкі, кніжок і сяброўства, якое і яднала нас у тым, што было шырачэзнай югаслаўскай супольнасьцю.
Я ўпэўнены, што рок-музыка ўжо ня будзе ўспрымацца мною так, як раней, з прычыны гвалтоўнага распаду Югаславіі. Я

ўзрастаў не на легендарнай мудрасьці *Beatles* або завываньнях Міка Джагера; самым галоўным былі арыгінальныя мэлёдыі *White Button*, бялградзкіх „Ідалаў“, македонскіх „Хлеба і солі“ і вялікага мноства іншых гуртоў, чые напаўзабытыя імёны калісьці сымбалізавалі сапраўднае выхаваньне пачуцьцяў цэлага пакаленьня, некалькі дзясяткаў тысячаў прадстаўнікоў якога зьехаліся некалі даўно, о Божа, як даўно, на першы югаслаўскі Вудсток у невялічкай вёсцы пад Бялградам. Той досьвед вымусіў нас наіўна паверыць, што пазытыўныя вібрацыі нашых калектыўных намаганьняў пакладуць пачатак новаму жыцьцю ў гармоніі, так, як жывуць зоркі, як суіснуюць чатыры пары году.

Стрэлы на Балканах заглушылі тыя пазытыўныя вібрацыі. Зоркі Юга-року расьсеяліся па самых розных куткох Зямлі. Зоркі застылі. І з усіх чатырох пораў году на землях на поўдзень ад маёй новай краіны пануе толькі адна — глыбокая і цёмная зіма сьмерці.

Маё горла сьціскаецца, сьціскаецца ўсё ў нутрох, калі я ў адзіноце сумую па маім Поўдні. Ужо першы стрэл у вайне за Славенію абсалютна ясна зазначыў, што гэты сум сягае каранямі ў глыбіні незваротнага мінулага. Чэслаў Мілаш трапна апісаў гэтае пачуцьцё ў адным з мэлянхалічных радкоў сваёй „Элегіі для N.N.“: „І сэрца не ўмірае, калі табе здаецца, што ўжо яму пара“. Бо сэрца мае на тое свае падставы, пра якія розум і не здагадваецца, мэтафізыка майго раскавалкаванага сэрца дасюль выцякае са згадак пра маё разьдзеленае мінулае, ад якога я не магу адмовіцца.

Орды фанабэрлівых афіцэраў і п’яных рэзэрвістаў анэксавалі *Heimat* — сацыяльную, нацыянальную і палітычную структуру чыйгосьці дому. Але мы, вечныя дзеці, адмаўляемся прызнаць тое, што хтосьці пазбавіў нас *Heim*’у — адзінага пазасталага ў нас прытулку: наша ўяўная супольнасьць, інтымныя закуточкі нашае памяці, рака, што цячэ пад Трыма Мастамі Любляны, цьмяныя зоркі над гарой Скарлаціцай, твары закаханых, цьвет магноліяў, цнатлівая бель сьцежак гарадзкога парку. Туга па мінулым, якога не павернеш.

Цяпер я ясна ўсьведамляю, што мінулае ў маёй памяці ня мае аніякай сувязі з сучаснасьцю. Я пераканаўся ў гэтым за тыя дзесяць дзён кароткага сьпякотнага лета 1991 году, якія, магчыма, і не зьмянілі сьвету, але адзначылі пачатак новае эры

для мяне і маіх землякоў. Аднойчы, пад час тае дзесяцідзённае вайны за Славенію, калі югаслаўскія танкі ўжо абкружылі сталіцу маёй краіны, я йшоў пешкі па абсалютна бязьлюдных вуліцах люблянскага прадмесьця, каб пабачыцца з бацькамі і сястрою.
Яны нейк туліліся разам зь іншымі жыхарамі іхнага невялікага дому ў сутарэньнях, якія ніколі дагэтуль не выкарыстоўваліся па сваім першапачатковым прызначэньні. Яны не былі падобнымі на належным чынам абсталяваныя бамбасховішчы, дзе ўсё было прызначанае для таго, каб дапамагчы выжыць, і якія былі прадуктам усёпранікальнае панічнае боязі магчымых атак Захаду, якую Ціта старанна культываваў з мэтай падтрыманьня кантролю над сваёй камуністычнай імпэрыяй. Гэтыя сутарэньні заўжды служылі толькі сьпіжарняю: грубыя негабляваныя паліцы ўздоўж сьценаў, разламаныя раскладныя столікі і добра абшарпаныя крэслы на падлозе — усё зносілі сюды мае руплівыя бацькі, якія ў маладосьці мужна перанесьлі „сем посных гадоў“ пасьляваеннай Югаславіі.
Паліцы прагіналіся пад цяжарам шматлікіх слоікаў з хатнімі марынадамі, памідорамі і сьлівовым варэньнем. Бутэлькі з *„тэранам“* — цёмна-чырвоным карсцкім віном — пабліскваліскрозь пыл; пад імі бялеў вэрхал старых газэтаў. У ровар упёрліся лыжы. У дальнім куце месьцілася вялізная старасьвецкая камода, дзе ляжалі часопісы ды кнігі, якія я купіў за час навучаньня ў Люблянскім унівэрсытэце, а пасьля, перад ад'ездам у Злучаныя Штаты, перахаваў у вільготнай скарбоўніцы сутарэньняў.
Пераканаўчы голас радыёкамэнтатара нагадаў, што мы павінны ўзяць з сабой у сховішчы ежу і дакумэнты. Ледзь чутнае грукаценьне аўтаматычнае зброі далятала з цэнтру гораду. Славенскія апалчэнцы намагаліся вылічыць пераапранутых у цывільнае югаслаўскіх снайпэраў, некаторым зь якіх удалося ўцячы, каб пасьля ўдасканальваць сваё майстэрства забіваць з вокнаў сараеўскіх шматпавярховак. У летняй сьпякоце дрыжэла паветра, завывалі сырэны, перасьцерагаючы аб магчымым авіянападзе, нейкі сабака шнырыў па суседніх дварох, а за ім бегала цэльная зграя яму падобных: вуліцы апусьцелі.
„Вайна“, — бясконцую колькасьць разоў думалася мне ў тыя некалькі дзён. Гэта была сапраўдная вайна. Гэта было не кіно пра слаўныя дні партызанкі, дзе Рычард Бартан здымаўся ў

ролі маладога маршала Ціта, які выводзіць свае дывізіі зь нямецкага абкружэньня, у фільме „Суцьеска“ (1973) — разьдзьмутай дзьвюхгадзіннай эпапэі аб легендарнай бітве, у якую мы да ачмурэньня гулялі на нашых пыльных дзіцячых пляцоўках. Ішла сапраўдная вайна, дзеці румзалі ў бамбасховішчах, іхныя бацькі, пераадольваючы страх, углядаліся ў цемру, а мае калегі раптам заўважылі, што неадкладная неабходнасьць абароны нашага краю ператварыла іх з загадчыкаў складоў, вярстальшчыкаў ці студэнтаў эканомікі ў адданых змагароў.

Я кінуўся ў абдымкі сястры, маці ды бацькі, шчасьлівы ад магчымасьці зноў іх пабачыць. Словаў ня трэ было. Дастаткова было дакрананьняў. Гэта было самым галоўным: да Дзесяцідзённае вайны я ніколі так ясна не ўсьведамляў, што маё жыцьцё нагэтулькі моцна зьвязанае з жыцьцём маіх любых людзей.

Нягледзячы на тое, што Славенія атрымала досьвед вайны ў адносна памяркоўных формах, вайна прынесла нам штосьці, чаго мы б ніколі не дасягнулі пры міры. Беспасярэдняя пагроза фізычнага зьнішчэньня ўзмацняе мэтафізычнае ўспрыняцьце суб’ектам тае любові, пра якую Дэні дэ Ружмон піша ў сваёй кнізе „Міты каханьня“ (1961): „Толькі дзякуючы любові штосьці ёсьць тым, чым яно ёсьць, дзеля любові яно набывае адпаведныя формы і рухаецца, усё: блізкае і далёкае, сусьвет і індывід, жаданьне, пакуты і радасьці“. Прадчуваньне магчымасьці згубіць любага чалавека сталася неадрыўнай часткай карэнным чынам зьменена спосабу сьветаўспрыманьня людзей.

Мая сястра, яшчэ ня верачы сваім вачом, разглядвала зашпількі маёй бронекамізэлькі, выдадзенай мне як вайсковаму рэпарцёру CNN. А я пакрочыў у наш абстаўлены ў вясковым стылі кабінэт і павольна адчыніў хісткія дзьверы, што вялі ў яго.

Тое, што я ўбачыў, было незабывальнай праявай тугі па Югаславіі. Перада мною была інтэлектуальная Югаславія ў разрэзе, тая Югаславія, у якой я нарадзіўся і якую я любіў, але ад чыйго імя бялградзкія генэралы зараз, не міргнуўшы вокам, гатовыя былі сьцерці зь зямлі цэлыя гарады і ператварыць у пыл вёскі разам з жыхарамі. Я застаўся стаяць, агаломшаны і ўзрушаны. З траншэяў, у якіх славенскія салдаты змагаліся

супраць югаслаўскага войска, супраць афіцэраў ды жаўтаротых добраахвотнікаў з Косава і Чарнагорыі, Македоніі і сэрбскіх узгор'яў, капрызам гісторыі мяне занесла ў гэтую кельлю, да гэтага старога сялянскага судніка, ад гары да долу забітага кнігамі на бальшыні моваў былой Югаславіі, кнігамі, якія ня толькі абумовілі маю акадэмічную і літаратурную кар'еру: яны сфармавалі мяне самога.

Тут стаялі невялікія кніжачкі з сэрыі „Слова і думка", што пазнаёмілі мяне з пачуцьцёвым сьветам пэрсыдзкае паэзіі ў сэрбскіх перакладах. Побач прытуліліся пранікнёныя эсэі Чэслава Мілаша, ягоныя „Мары з бухты Сан-Францыска"; пазьней, у Нью-Ёрку, я змагу параўнаць раскошны дызайн амэрыканскага выданьня са сьціплай вокладкай майго сэрбскага перакладу, чый выдавец з Ваяводзіны заслужыў удзячнасьць цэлага пакаленьня маладых чытачоў. Скарочаныя варыянты працаў Авэроэса, Плятына і Арыстотэля, выдадзеныя ў Загрэбе, зьбіралі пыл пад свае аднолькава бледна-жоўтыя вокладкі, па якіх я мог беспамылкова вызначыць пакой студэнта філязофіі, калі начаваў у дамох сваіх сяброў у Нішы, Охрыдзе або Вінкаўцы.

Тут ляжалі нумары македонскага літаратурнага часопісу „Малады змагар", дзе я марыў апублікаваць свае першыя вершы. Тамы Башляравых летуценьняў аб прасторавай паэтыцы ды Бэнжамінаў „Маскоўскі дзёньнік", выдадзеныя ў Сараеве на дзіўнаватым варыянце сэрбскахарвацкае — выніку аднолькавае любові басьнійскага перакладчыка і да сэрбскай, і да харвацкай лексыкі, да чаго ў мэлёдыцы сказаў дадаваўся нясьмелы намёк на ранішні покліч муэдзіна. Бродзкі, Лятрэамон, Цьвятаева і Мандэльштам, сэрбскія пераклады якіх — невялікія, у непрывабных белых вокладках — я знаходзіў і купляў у кнігарнях Новага Саду і Любляны. Зборнік вершаў майго сябра Томаша Шаламоўна ў перакладзе, што пабачыў сьвет у Чарнагорыі.

Па-майстэрску і з замілаваньнем пераплецены поўны гадавы выпуск прэстыжнай сэрыі „Сто найлепшых раманаў сусьвету" ў славенскім перакладзе, напаўпахаваны пад старымі нумарамі бялградзкага часопісу „Літаратурныя навіны" і загрэбскага *Quorum*'у, дзе на працягу некалькіх год я меў пэрсанальную паэтычную калёнку і свайго собскага перакладчыка. „Апісаньне сьмерці", кніга кароткіх апавяданьняў сэрбскага габрайскага

паэта Давіда Альбагары зь сяброўскім прысьвячэньнем аўтара. Стосы самых разнастайных літаратурных аглядаў, альманахаў, анталёгіяў з маімі працамі, перакладзенымі на розныя мовы, шэраг зборнікаў і невялікіх часопісаў, у стварэньні якіх я з энтузіязмам удзельнічаў, пакуль яны таксама ня зьніклі або не былі праглынутыя ўсё больш глыбокай бездань нацыяналістычнай выключнасьці.

З гэтых лёгкіх віхурчыкаў пылу з жоўтых хрыбецінаў кнігаў ды з перагорнутых сотні разоў старонак, з гэтых фантастычных апавяданьняў, у якія я так часта паглыбляўся — з жарсьцю чытача па прызваньні ды пераканаьні, не ўсьведамляючы нават мовы, на якой быў напісаны твор — славенскай ці сэрбскахарвацкай, на якой я размаўляў амаль гэтак жа вольна, як і на роднай, дзякуючы частым вандроўкам на Поўдзень; з павялых твараў выдаўцоў, пісьменьнікаў ды перакладчыкаў, якія для мяне асацыяваліся збольшага зь літаратурнымі фэстывалямі ды неафіцыйнымі чытаньнямі ў якім-кольвек пакоі ў Цэціні і Сараеве, Бледзе і Струзе, — з гэтых цьмяных вобразаў сплялося танюткае павучыньне блізкіх сяброўскіх адносінаў, для якіх папраўдзе не існавала ні нацыянальных, ні моўных бар'ераў. Гэтыя сяброўскія стасункі нарадзіліся ў салодкай пустэчы вечнасьці, да якой нас магла прылучыць адно толькі муза мастацтва; і мы сьвята верылі ў існаваньне гэтае музы, бо былі няздольныя верыць ніводнай Вялікай Ідэі.

Мы інтуітыўна разумелі, што дзеяч мастацтва можа разважаць аб сваім собскім натхненьні — як і аб духу гістарычнай эпохі — толькі зьяўляючыся маргіналам у сваім грамадзтве. Шматлікія нумары славенскага часопісу „Літаратура", харвацкага *Quorum*'у ды сэрбскага „Літаратурнага слова" зьмяшчалі вершы і апавяданьні, творы, кожны з каторых быў доказам нашае веры ў тое, што літаратура, якую мы стваралі на працягу 80-х, была адной вялізнай мэтафарай, вельмі сьмелай самой па сабе: заставацца самім сабою па-за межамі нацыянальных ідэалёгіяў, палітычных партыяў ды гістарычных праграм разьвіцьця. Незадаволеныя той атмасфэрай, у якой дысыдэнцкія кнігі ўхваляліся выключна з прычыны вастрыні іхнае крытычнае пранікнёнасьці, дзе ўсе пазабыліся на эстэтычныя стандарты, мы скіравалі сваю творчасьць на пакручастую сьцежку дэпалітызаванай літаратуры. Мы, асабліва на старонках *Quorum*'у, зноў і зноў падкрэсьлівалі, што, калі тыя альбо іншыя

пастуляты маралі і выкрышталізаваліся з алегорыяў гісторыі ды мэтафараў штодзённых прамоваў, ня трэба спэцыяльна вымагацца, каб падкрэсьліць адмысловы эфэкт тых самых пастулятаў.

На працягу 80-х *Quorum* быў тым агнём, да якога імкнуліся матылі нашых літаратурных поглядаў, што лёталі толькі ўначы, дый тое зь перасьцярогай: нашы вершы заўважаліся адно тымі, хто падзяляў нашу веру ў тое, што, каб кампэтэнтна разважаць аб навакольным сьвеце, чалавек павінен сьпярша заглянуць у змрочныя віры сваёй собскай псыхікі. Пішучы ў безаблічных шматпавярхоўках Новага Бялграду, у мансардах дамоў загрэбскага Верхняга Гораду або ў адным з былых мяшчанскіх кварталаў Любляны, мы горача і аддана спрачаліся наконт значэньня мэтафікцыі і чыста адвольных стыляў, але нас яднала асноватворнае перакананьне ў тым, што ўсьведамленьне паэтам гістарычных варункаў ягонае творчасьці палягае ва ўжываньні мовы і прыняцьці мясцовых традыцыяў.

Для заходняга чытача, прагнага да дысыдэнцкае літаратуры, гэтае перамяшчэньне фокусу азначае пэўную згубу рамантычнага арэолу ва ўсходнеэўрапейскай драме „пісьменьнік супраць цэнзара“. Але коштам звужэньня чытацкае аўдыторыі мы дасягнулі свабоды ў справе напісаньня лірычных разважаньняў, чый кволы агеньчык мы зноў і зноў мусілі бараніць ад лютых вятроў *poüsie engagй*.

Мы не вынаходзілі ровару. Але мы адчувалі, што, баронячы нашыя інтраспэкцыйныя радкі, мы адначасова баронім вялікую ідэю свабоды. Грамадзкі прэстыж з кожным днём усё большага кодла пісак, чыё зьбяднелае ўяўленьне вяло да кароткачасовага ўпіваньня палітычнай славай, пастаянна прымушаў нас рэагаваць на танныя закіды адносна таго, што мы, нібыта, зьбягаем ад рэчаіснасьці, туляючыся сярод бясконцых касмалёгіяў ды філязофскіх парадоксаў у стылі апавяданьняў Борхеса, чыя папулярнасьць прыдала цэламу пакаленьню маладых югаслаўскіх літаратараў зьняважлівы эпітэт „бархесіянскага“.

Між тым, сапраўды важную ролю ў нашым фармаваньні як пісьменьнікаў граў ня Борхес, безумоўна, аўтарытэтны, а сэрбска-жыдоўскі пісьменьнік Даніла Кіш. У яго аповедах гісторыя і індывід адбіваліся адно ў адным з такой адметнай

тугой па экзыстэнцыйнай містэрыі, якая для нас, жыхароў краіны, дзе мір быў толькі кароткай пярэрвай паміж войнамі, была нашмат больш зразумелай, чымся бясконцыя лябірынты прыдумак аргентынца. Больш, чым у „Алефе“ ці „Садзе, у якім разьбягаюцца сьцежкі“, мы шукалі ў „Магіле для Барыса Давідовіча“, „ Заўчасных журботах“ ды „Энцыкляпэдыі мёртвых“ магчымыя шляхі свайго вызваленьня ад путаў часьцяком павучальнае літаратуры, у якой аўтар выконваў адну-адзіную функцыю: быць стаўпом грамадзянскае мужнасьці.

На шчасьце, назіраючы за праблемамі нашага собскага грамадзтва, мы зразумелі, што сілы дабра і зла не былі начыста разьяднаныя той лініяй, якая аддзяляла камуністаў ад некамуністаў, мы мусілі былі ўбачыць, што складаная рэчаіснасьць патрабавала адпаведнага ёй комплекснага адлюстраваньня ў літаратуры. Такім чынам, Цэнтральная і Ўсходняя Эўропы сталіся сьведкамі зрухаў у выкарыстаньні паэзіі, якую так часта напаўнялі экзальтаваным палітычным або маральным „высакародным мысьленьнем“, якога, як аднойчы трапна заўважыў Чэслаў Мілаш, ня можа быць у вершах.

Было пэўным дзівам тое, што мы, маладыя славенскія літаратары, успрынялі Джойсаў пастулят *non serviam* у справе дасягненьня незалежнасьці Славеніі ў 80-я гады; ужо пад час Дзесяцідзённае вайны мы адразу ж адказалі на заклік да грамадзянскае пільнасьці. У згодзе з нашай філязофіяй палітычнае абстынэнцыі, мы пакінулі ў баку літаратуру і прадэманстравалі сваю недвухсэнсоўную жыцьцёвую пазыцыю на тэлебачаньні і радыё, у газэтных калёнках і нават у шэрагах краёвай абароны.

Нашы сталейшыя калегі сарвалі свае заслужаныя аплядысмэнты пры дапамозе крытычнага дыстанцыяваньня і бязьлітаснага скальпэлю праўды для таго, каб стаць выразьнікамі ідэяў так званага „сацыялізму з чалавечым тварам“. Наша эстэтычнае ўяўленьне, тымчасам, фармавалася на падставе іншых фактараў. Мы сканцэнтравалі нашыя творчыя таленты вакол праблемы, якая, мажліва, і не прыцягвала ўвагі грамадзтва, але была і застаецца спатоеным выклікам. Замест сацыялізму і справы яго пышнага пахаваньня мы засяродзіліся на шнарах, драпінах, зьмяцінах ды грымасах

на тварах індывідаў. Мы жылі сваім пранікненьнем у глыбіні чалавечай душы, што перад абуджэньнем вядзе маўклівую барацьбу супраць агоніі, калі царства сьмерці пачынае адступаць, але яшчэ цалкам не зьнікае, і душа можа прасьцесенька заблукаць сярод паранаідальных ды трывожных ценяў.

Паэт можа сьведчыць пра свой час толькі тады, калі ягоныя мэтафары вольныя ад вонкавай неабходнасьці, незалежныя ад таго лягеру, у якім яны ўзьнікаюць. Гэта было нашым дагматам, і мы доўга распавядалі пра гэтае невялічкае адкрыцьцё на ўсіх мовах колішняе Югаславіі. Але гэта ня значыць, што нашае „пакаленьне без харызматычных настаўнікаў“, як выразілася неяк прэса, заплюшчыла вочы на сацыяльную ды гістарычную рэчаіснасьць наўкол сябе.

Усё было наадварот. Пішучы звычайныя апавяданьні пра звычайных людзей, мы паспрабавалі выявіць наступствы сацыяльных зьменаў для людзей, мы паспрабавалі выявіць уплыў сацыяльных зьменаў, усіх тагачасных бядотаў на людзкія пачуцьці, спосаб мысьленьня, невялічкія радасьці. Часовае сужыцьцё ў тым гета, дзе мы пачуваліся як удома дзякуючы ўзаемападтрымцы і агульным памкненьням, прымусіла кожнага з нас паасобку кінуць намаганьні выразіць словам той змрочны сьвет, у якім жыць нікому не хацелася, але ўсё ж такі мелася. Тады і ўзьнікла ў нечым эратычная калектыўная літаратурная творчасьць, набыў свае абрысы пэўны культурніцкі мэнталітэт, над фармаваньнем якога я працаваў пад час 80-х.

Палітычныя ідалы югаслаўскага экспэрымэнту разьбіліся ўшчэнт менавіта тады, калі танкі пачалі выпаўзаць з гарнізонаў у навакольлях Любляны, каб сілай, любымі сродкамі ўтрымаць існаваньне калектыўнай дзяржавы. Маскі зьляцелі. Злачынцы ва ўніформах танчылі, а цэлыя плыні безыменных уцекачоў рынуліся насустрач няяснай будучыні. Разбуральная хваля неўтаймаванага мілітарызму імкліва неслася ўперад. Штандары мясцовых фюрэрчыкаў з кожным днём узьвіваліся ўсё вышэй і вышэй. Сьвет пачынаў крышыцца, як счарсьцьвелы хлеб.

У цесным пакойчыку на Адзінаццатай вуліцы нью-ёрскага Ніжняга Іст-Сайду сядзіць група студэнтаў і інжынэраў, архітэктараў і паэтаў, якія яшчэ ўчора жылі ў адзінай дзяржаве,

але ўжо сёньня ў кожнага зь іх свая краіна. На стэрэа грае падрапаная кружэлка. Адзін харвацкі сэрб, вядомы эстрадны выканаўца з краіны, што больш не існуе, запісаў гэты зборнік народных напеваў задоўга да таго, як пачалі выкарыстоўваць тэхналёгію лязэрных дыскаў.
Звонку шумліва кіпіць, занятая сваімі справамі, сталіца ХХ стагодзьдзя. Таму мы схіліліся ўперад і стаілі наш подых, каб лепей убіраць у сябе гэтую старую песьню на словы аднаго харвацкага паэта. Радэ Шарбэджыя сьпявае яе прыемна мяккім голасам чалавека, які і ўявіць сабе ня мог, што аднойчы мэлянхалічнае пасланьне з парэпанае кружэлкі застанецца для яе слухачоў адзінай згадкай аб іхнай радзіме. Яны ведаюць: Тэадор фон Адорна меў рацыю, калі напісаў у сваім эсэі пра Гайнрыха Гайнэ, што бяздомнасьць сталася нашым лёсам, што наша мова, як і мы самі, чэзьне ў выгнаньні.
Тыя з нас, хто па сваёй волі зьехаў у заморскае выгнаньне яшчэ задоўга да пачатку вайны на Балканах, кіруючыся неўсьвядомленым жаданьнем пэўных зьменаў у асабістым жыцьці, цешылі сябе збавіцельнай думкай аб тым, што цяпер ужо яны маглі ў любы момант вярнуцца ў сваю новую рэспубліку ў перадгор'ях Альпаў, якую цмок вайны толькі зьлёгку зачапіў сваім хвастом. Аднак, разам з нашымі менш шчасьлівымі сябрамі са спустошаных рэгіёнаў былое Югаславіі, мы адчувалі, што жывем гайнаўскім жыцьцём, жывем пошукамі дарогі дамоў. Мы не пакідалі надзеі знайсьці месца, якое было б для нас рэальным у экзыстэнцыйным пляне, гэтак сама як дзяцінства можа зьяўляцца адзіна магчымай рэальнасьцю для чалавека мастацтва.
Дзяцінства паўднёвых славян, якія жылі ў агульнай дзяржаве, цяпер назаўсёды згублена, і мы ўсе разам яшчэ больш уважліва прыслухоўваемся да гукаў песьні, якую слухалі дагэтуль сотні разоў, і нягледзячы на тое, што яна была напісаная пра канкрэтнага чалавека, нечаканыя павароты гісторыі выкрываюць у ёй мэтафару нашага агульнага лёсу.

Не скарайся гадом, Інэс,
...дакраніся да мяне сваёй каленкай пад сталом,
маё пакаленьне, маё каханьне.
Сяброўка, што сядзіць поруч мяне на пацёртай канапе, пачынае плакаць. Маленькі, ледзь заўважны струменьчык сьцякае ў яе

па шчоках і сьведчыць, што яна нашмат старэйшая за свой пашпартавы ўзрост. Ейныя сьлёзы — гэта знак таго, што наша сумеснае слуханьне гэтае сэнтымэнтальнае песьні, якую хлопцы сталіцаў правінцыяў ад Альпаў да Вардару сьпявалі, каб скарыць сэрцы дзяўчынаў, ператварылася ў сымбаль нашых агульных памкненьняў. Гэтак, „дзіўныя імгненьні настальгіі, каханьня ды самоты“, пра якія сьпяваецца далей, зьяўляюцца не эфэмэрным гістарычным дакумэнтам, а той цудоўнай формулай, якая замацоўвае наша перабываньне ў выгнаньні сярод вечна маладых краявідаў таго стану душы, у якім мы — заўсёды ўдома.
Любляна—Нью-Ёрк, ліпень 1993 году.

Пераклаў з ангельскай са скарачэньнямі Анатоль Прасаловіч паводле:
Ales Debeljak. wilight of the Idols. Recollections of a lost Yugoslavia.
White Pine Press, © 1994

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000
Балканы

Кшыштаф Чыжэўскі Косаўскія варыяцыі

Кшыштаф Чыжэўскі, падарожнік па Сярэдняй Эўропе, польскі культурны дзеяч. Галоўны рэдактар часопіса „Краснагруда", што выдаецца ў Сэйнах, вялікі сябар Беларусі. Апошнія ягоныя публікацыі на беларускай мове - „Вяртаньне Сярэдняй Эўропы" („Фрагмэнты", 1/1998), „Комплекс Атлянтыды, або Сярэдняя Эўропа пасьля канца сьвету" (ARCHE-Парнаграфія).
Гэты тэкст перададзены ў рэдакцыю аўтарам.

Вось і мяжа Македоніі. Далей ісьці нельга. З узвышша, на якім спыняюся, адкрываюцца мне неаглядныя замглёныя разлогі Косава — краіны, імя якой далі волялюбныя чорныя птахі. Прынамсі, так мне патлумачыў Агім Чаўдарбаша, разьбяр. Аднак на ягоных птахах, што паселі проста на траве пасярод саду ў вёсцы Джаглавіцы, аточанай блізкім суседзтвам сэрбскіх сялібаў, яскрава-белых, былі шорсткія плямы. У іх мармуровападобную паверхню ўядаліся путы, нябачныя здалёк і адрозныя ня столькі нават колерам, колькі фактурай матэрыялу. Толькі дакрануўшыся, можна было зразумець, чаму ніводзін зь іх ня меў сапраўдных крылаў і не імкнуўся лётаць. Шорсткасьць надавала белі іншае адценьне, што прыціскала волю надмерным цяжарам.
Тады, стоячы на мяжы, я нібыта кранаўся белых драздоў Агіма — нашая эўрапейская надзея, вера, любоў, вольнасьць, роўнасьць і братэрства пакідалі гэтае сьмяротнае нябачнае ўвязьненьне. Быў сакавік 99-га. Іржавы змрок клаўся мутным ападкам на дно краіны, аточанай з усіх бакоў пасмамі гор, —

нібыта ў закураны казан Сыбілы, гледзячы ў які, яна вяшчуе нядобрае. Косава прыціскала душу да самае зямлі. Апошнія птахі, сьцятыя змрокам непазьбежнасьці, западалі ў адхланьне сьмяротнага сну, зь якога наўрад ці былі здольныя абудзіцца. Цераз даліну цугам цягнуліся ўцекачы. Выходзілі ўсе тыя, хто прыехаў сюды са сьвету, каб спыніць анёла сьмерці. Яны знаходзіліся ў Косаве з кастрычніка мінулага году, калі пасьля чарговае крывавае акцыі супраць альбанскага насельніцтва непадалёк Дрэніцы, адкрытае журналістамі *Reuter*, NATO пачало пагражаць налётамі, а Рычард Голбрук дамаўляўся зь Мілошавічам пра вывад сэрбскіх войскаў і вяртаньне выгнаных, за чым меліся сачыць каля дзьвюх тысячаў міжнародных прадстаўнікоў. Я бачыў іх твары зблізку, з узбочыны шашы — твары наглядальнікаў АБСЭ, дактароў, журналістаў, дзеячаў гуманітарных арганізацыяў і абаронцаў правоў чалавека. Усе яны зьбянтэжана апускалі вочы, прадчуваючы хуткую навальніцу, што павінна была вось-вось абрынуцца на пакінуты імі край, на які паволі спускалася цемра, крыніца якой, відаць, забруіла сёньня тут, у Косаве. Я мог уцякаць.
На аэрадроме ў Скоп'і панаваў жахлівы тлум і паніка. Зарэзэрваваныя квіткі яшчэ не гарантавалі месца ў самалёце. На шчасьце, мой маршрут быў зь перасадкамі — мусіў пасьпець у Вене на самалёт да Будапэшту, таму мяне пасадзілі без чаргі… Да аўтобуса, напханага пасажырамі, як бочка селядцамі, што меўся ўжо рушыць у бок самалёта, нечакана падышоў нейкі начальнік у цёмных акулярах і, тыцнуўшы пальцам у двух гаротнікаў, загадаў: „Вы і вы — на выхад…"

Лячу над Косавам. Эўрапеец, які ўцякае. Хутка ўжо ўсё будзе добра, на Шыпалі я ведаю кожны заканурак, пайду выпью добрую *венскую* каву, спакойна, нясьпешна, культурна… Унізе блізка сарака тысячаў сэрбскіх жаўнераў набліжаюцца з поўначы да межаў Косава. Ізноў надышоў час генэрала Раткі Младзіча, арганізатара этнічных чыстак у Босьніі, і Аркана, кіраўніка парамілітарных атрадаў. Хіба два дні мінула, як мірная канфэрэнцыя ў Рамбуе і Парыжы скончылася поўным фіяска — падрыхтаванае пагадненьне падпісаў толькі альбанскі бок. Голбрук яшчэ паляціць у Бялград, будзе пужаць налётамі, але ня здолее ўжо спыніць распрацаванае сэрбскімі

камандзірамі апэрацыі „Падкова“, якая павінна была стацца, урэшце, „апошнім вырашэньнем“ косаўскае праблемы, у аснове якой ляжала б ня столькі пытаньне ўціску тых ці іншых правоў альбанцаў або іх дыскрымінацыі, колькі „прынцыповая зьмена этнічнае структуры спрадвечных сэрбскіх земляў“. Праз 4 дні, 24 сакавіка, калі на Югаславію ўпадуць першыя бомбы NATO, сэрбскае наступленьне, у выніку якога дзясяткі тысячаў касавараў стануцца выгнаньнікамі з уласных сялібаў, ужо разгорнецца на поўную сілу. Сьвет будзе гаварыць пра *пачатак* вайны, аднак для сэрбаў і косаўскіх альбанцаў вайна толькі ўвайшла ў новую фазу. І тыя, і другія выбралі вайну нашмат раней.

Мілошавіч яшчэ ў кастрычніку 1991 году, на канфэрэнцыі ў Гаазе, адхіліў прапанову лорда Карынгтана даць сэрбам, што жывуць у Харватыі і Босьніі, шырокія правы, аж да магчымасьці мець асобны парлямэнт і падвойнае грамадзянства. Адхіліў, бо ведаў, што ў адказ на гэта ад яго будуць вымагаць наданьня гэткіх самых правоў і косаўскім альбанцам. Прынцып, які называлі „ККК“ (*Kraina Kao Kosovo*), яго не цікавіў. Мілошавіч быў гатовы ахвяраваць сэрбамі з Харвацкае Краіны, каб вырашыць праблему Косава паводле ўласнага пляну. Першым крокам сталася ўсталяваньне ў Косаве апартэіду, які, з-за апартунізму палітыкаў, колькі год і Эўропа, і большасьць асяродкаў сэрбскае апазыцыі недаацэньвалі і ня бачылі. За некалькі месяцаў, пачынаючы зь ліпеня 1990 году, 90% альбанцаў былі звольненыя з працы ў дзяржсэктары. У наступным годзе са школаў і ВНУ выдалілі каля 45 тысячаў альбанскіх выкладчыкаў і студэнтаў. Міжнародныя арганізацыі паведамлялі пра самыя жахлівыя ў Эўропе парушэньні правоў чалавека, аднак ніхто не хацеў гэтага слухаць. Апублікаваны ў Брусэлі рапарт Канфэрэнцыі Вольных Прафэсійных Сувязяў аж у 1993-м сьцьвярджаў, што „масавая этнічная чыстка ў косаўскіх інстытутах яшчэ раз пацьвярджае, што яе мэтай ёсьць не этнічная дыскрымінацыя на розных узроўнях, а радыкальная зьмена нацыянальнае структуры Косава“. Выглядае так, што Мілошавіч толькі чакаў адпаведнага моманту. Ён прагнуў канфрантацыі, а не дыялёгу і супрацоўніцтва. Адным зь першых ягоных крокаў супраць югаслаўскае эліты была атака на палітыкаў праюгаслаўскае арыентацыі — такіх, як Азэн Власкі ды Махмут Бакальлі.

Разам з тым рэжыму ў Бялградзе выразна не падабаліся паводзіны косаўскіх альбанцаў, што пасьля 1989 году канчаткова страцілі веру ў даўнейшых дзеячаў камуністычнае фармацыі, якіх зьмяніла маладая інтэлігенцыя, згуртаваная ў такія арганізацыі, як Таварыства Філёзафаў і Сацыёлягаў Косава або Таварыства Пісьменьнікаў Косава, якім кіраваў Ібрагім Ругова. Іх першым маніфэстам сталася пэтыцыя „За дэмакратыю супраць гвалту“, складзеная ў духу поглядаў Гандзі. Падтрыманыя грамадзтвам, яны ў сьнежні 1998 году ствараюць уласную палітычную партыю — Дэмакратычную Лігу Косава, кіраўніком якой стаўся Ругова. У 1991 годзе, праз год пасьля таго, як Мілошавіч пазбавіў Косава аўтаноміі і распусьціў косаўскі парлямэнт, альбанцы абвяшчаюць Косава рэспублікай (прызнае яе толькі Альбанія), а яшчэ праз год пераважнай большасьцю галасоў выбіраюць сваім прэзыдэнтам Ібрагіма Ругову. Так Косава крок за крокам ішло да незалежнасьці абсалютна мірным шляхам. Уціск з боку бялградзкіх уладаў вымагаў ад альбанцаў надзвычайнае самаарганізацыі, аж да ўтварэньня падпольнае дзяржавы з уласным урадам, сыстэмай адукацыі, абароны, аховы здароўя і г. д., фінансаванай з т. зв. „падатку на незалежнасьць“ (3 % ад месячнага прыбытку), які згадзілася сплочваць на карысьць Косава альбанская дыяспара. Дзякуючы ўсяму гэтаму, яны здолелі добра прыстасавацца да функцыяваньня ва ўмовах вольнага рынку, прыватнага прадпрымальніцтва і самакіраваньня. Як гэта ні дзіўна, але сэрбы, якія, здавалася б, мелі доступ да „кармушкі“, зрабіліся закладнікамі дзяржаўнае галоты і карупцыі, што яскрава выявілася пад час дасьледаваньня маёмаснага стану жыхароў Косава. Гэтая акалічнасьць таксама дадала жару ў агонь сэрбска-альбанскіх узаемаадносінаў, і без таго напружаных. Яшчэ адной балючай праблемай былі сэрбскія ўцекачы з Босьніі і Краіны, якіх улады не пускалі ў Бялград і якім адмаўлялі ў югаслаўскім грамадзянстве, сілком прымушаючы асядаць у Косаве. Адной зь першых акцыяў, якімі альбанскі партызанскі рух засьведчыў сваё існаваньне, сталася мінаваньне будынка ў Прызрэне, прызначанага для сэрбскіх уцекачоў з Краіны.
Ругову ўсё цяжэй і цяжэй было трываць паўсюдныя парушэньні і прытрымлівацца абранае палітыкі пасіўнага супраціву. Мілошавіч, які ніколі больш ня пойдзе на такое поўнае

парушэньне грамадзянскіх правоў, як у 1990 годзе ў Косаве, трымаўся пры ўладзе дзякуючы кааліцыям, у чым яму пэўным чынам дапамагала стратэгія альбанскіх лідэраў, якія, байкатуючы агульнасэрбскія выбары, кожны раз аддавалі прыхільнікам Мілошавіча 40 месцаў у парлямэнце, якіх хапіла б, каб скінуць яго. Іншая справа, што ў сэрбскае апазыцыі ніколі нават думкі не ўзьнікала пра дыялёг з альбанцамі, дыялёг, празь які яны маглі б разам дамагчыся зьмены ўлады ў Югаславіі.
Калі ў 1996 годзе распачынае актыўныя дзеяньні Армія Вызваленьня Косава (УИК), Мілошавіч знаходзіць магчымасьць выкарыстаць і яе — прынамсі, яна была нашмат больш „выгодным“ партнэрам для ажыцьцяўленьня ягоных косаўскіх плянаў, чым пацыфіст Ругова. УИК (*Ushtria ulirimtare e Kosovd’s*), увогуле, утварылася яшчэ напрыканцы 1992 году, аднак доўга ніхто ня верыў у ейнае існаваньне, былі нават размовы пра тое, што гэта сэрбская правакацыя. Упершыню касавары пабачылі яе байцоў у форме на пахаваньні настаўніка, забітага сэрбскай паліцыяй у вёсцы Лаўшэ ў 1997 годзе. Пачутыя ад іх словы пасьля доўга гучалі ў вушах: „Мы будзем змагацца, покуль апошні сэрбскі паліцянт і жаўнер ня сыдзе адсюль“. Можна шмат казаць пра мааісцкую ідэалёгію, што ляжала ў аснове гэтага руху або пра сувязь з мафіяй і з сумнеўным бізнэсам. Але часы зьмяняліся, а разам зь імі зьмяняліся ўладныя арганізацыі і структура іх складнікаў, зьмяняўся кантэкст, у якім яны дзейнічалі. Для жыхароў Косава, якія пад канец 90-х канчаткова ўпэўніліся, што палітыка, якую вядзе Ругова, не дае ніякага плёну, а ўціск з боку Бялграду ўсё мацнее, партызаны УИК здаліся абаронцамі і зьдзяйсьненьнем мараў пра незалежнасьць. Час канфрантацыі набліжаўся паскоранымі тэмпамі.

Калі ўвесну 1997 году пачаліся хваляваньні ў Альбаніі, што спрычыніліся да распаўзаньня анархіі па ўсім краі, у Косава трапілі дзясяткі тысяч адзінак узбраеньня, скрадзенага з паліцэйскіх і вайсковых сховішчаў. Узбраеньне тое было, праўда, дрэннае якасьці, аднак зь ім партызаны сталі пачувацца нашмат больш упэўнена. Тым часам у сьнежні таго ж году сэрбскі генэрал Мамчыла Пэрышыч распачынае

буйнамаштабную вайсковую апэрацыю ў Косаве. Пераломным стае люты 1998-га, калі ў адказ на забойства байцамі УИК двух паліцыянтаў сэрбы зьнішчылі каля дваццаці вёсак у раёне Дрэніцы і пакінулі па сабе больш за сто ахвяраў, у асноўным старых, жанчынаў і дзяцей.
Ці можна было ўжо тады казаць пра пачатак вайны? Калі кіравацца выслоўем „Вайна пачалася ў Косаве, у Косаве і скончыцца“, дык вайна пачалася яшчэ ў 1980 годзе, пад час травеньскіх маніфэстацыяў, крывава задушаных паліцыяй, на якіх касавары патрабавалі для свайго краю статусу паўнавартаснае рэспублікі. Такім чынам, у пэўным сэнсе, Косава яшчэ з тых часоў знаходзілася ў стане вайны, якая ў лютым 98-га, бясспрэчна, увайшла ў новую фазу. Калі фармаваньні УИК пры канцы 1997-га налічвалі толькі 300 ваяроў, дык пасьля падзеяў у Дрэніцы іх колькасьць вырасла да 15 тысячаў. Узмоцненая гэткім чынам УИК за пяць месяцаў вызваліла каля 30% тэрыторыі рэспублікі. У ліпені распачалося вялікае наступленьне сэрбскіх войскаў. Міжнародная Фэдэрацыя Правоў Чалавека з трывогаю сыгналізавала пра тое, што больш за 100 тысячаў альбанцаў мусілі пакінуць свае хаты. Улады Чарнагорыі, якія прынялі каля 40 тысячаў бежанцаў, інфармавалі, што больш пратрымаць ня здольныя і замыкаюць мяжу. Рапарт арганізацыі „Дактары бязь межаў“ інфармаваў пра „шматлікія выпадкі масавых экзэкуцыяў, адсечаныя галовы, вырваныя вочы, масавыя пахаваньні“. Зразумела, былі ахвяры і з сэрбскага боку, гінулі цыганы і гаранцы (славяне мусульманскага веравызнаньня), аднак суадносіць гэтую лічбу з колькасьцю забітых альбанцаў можна было бадай што толькі ў дрэніцкай прапорцыі. Журналістаў у край ня вельмі дапускалі, няшмат інфармацыі даходзіла да грамадзкае думкі, а адсутнасьць тэлевізійных сюжэтаў на заходніх тэлеканалах яшчэ раз сьведчыла, што палітыкі ня лічаць косаўскую праблему надта ўжо вартай увагі. Менавіта верасьнёўская вандроўка журналістаў *Reuter* у ваколіцы Дрэніцы і адкрыцьцё імі новых фактаў масавага тэрору выклікала актывізацыю міжнароднае супольнасьці і нават на нейкі час адцягнула яе ўвагу ад узброенае барацьбы. Але яшчэ пад Каляды таго году сэрбы распачалі наступленьне ў раёне Падуева, што на поўначы Косава. Бялград казаў пра „лякальную апэрацыю, якая мае на мэце захоп забойцы сэрбскага паліцыянта“, на што шэф

місіі назіральнікаў АБСЭ заўважыў зьедліва: „Ніколі ня думаў, што для пошуку крымінальнікаў патрэбныя танкі“.
Міжнародны Чырвоны Крыж паведаміў, што ў выніку гэтае апэрацыі каля 6 тысячаў альбанцаў зрабіліся ўцекачамі. Паводле афіцыйнае статыстыкі, колькасьць касавараў, выгнаных са сваіх хат, за 1998 год склала 300 тысячаў.
Так, гэтая вайна пачалася не тады, калі NATO скінула першыя бомбы на Югаславію. На час майго паветранага падарожжа над Косавам ужо не было іншае магчымасьці стрымаць армію, што рухалася там, унізе, армію, якой кіравалі найлепшыя ў Эўропе спэцыялісты па этнічных чыстках. Адначасова было ўжо занадта позна бараніць альбанцаў ад тэрору і выгнаньня. Зараз даводзіцца плаціць за косаўскую летаргію міжнароднае супольнасьці, за трагічную, паводле вынікаў, бесклапотнасьць аўтараў Дэйтанскіх мірных пагадненьняў, што наагул праігнаравалі праблему Косава, не падрыхтаваўшы для яе аніякага вырашэньня. А гэта быў, можа, апошні момант, калі можна было прадухіліць катастрофу. Ледзьве ня ўсе яе прадчувалі, і ледзьве ня ўсе выявіліся бясьсілымі.
Тады, калі я назіраў з самалёта за маленечкімі танкамі ўнізе, што рухаліся ўздоўж белае рыскі дарогі, згадаўся мне адзін дзіцячы сон, які часта паўтараўся, нязьменна выклікаючы прадчуваньне нейкае катастрофы, што адбываецца побач, за танюткай мяжой сьвету нашых гульняў. Найбольшы страх выклікала ня тое, што мелася быць, а набліжэньне чагосьці змрочнага, што мела свой вібруючы гук і пакідала саладкаваты прысмак на вуснах. Зараз штосьці падобнае, непазьбежнае, канцэнтравалася на паўночных межах Косава. Згадваліся мне разнастайныя дыскусіі, на якіх вялося пра вышэйшасьць аднаго народа за іншы, пра мэгаляманію нашае цывілізацыі, пра заклятую ману ў мітах, культуры і палітыцы, пра пачынаньні дзеля ўласнага інтарэсу, пра баязьлівае ўніканьне ды інтэлігенцкія адгаворкі — пра ўсё, што адцягвае ўвагу ад супастаўленьня сябе з рэальнасьцю, такой, якой яна ёсьць. Усё гэта я ўсьведамляў пад час размоваў са знаёмымі, спатканьняў і роздумаў. Тады яно ставала звычайным элемэнтам падарожжа і жыцьця на памежжы, але сапраўдную сваю сутнасьць — атрутную, непазьбежную, сканцэнтраваную ў тым войску ўнізе, ужо падрыхтаваным ідэалягічна і эмацыйна да сканчэньня экстэрмінацыі суседняга народу, — яно выявіла толькі зараз. Я

быў уражаны, я сьніў у самалёце жудасны дзіцячы сон, які ўжо ня быў сном. Ва ўсякім разе, з таго, у што мы гулялі ў Эўропе, атрымалася катастрофа.
Думаў я, канечне, і пра сэрбаў, пра югаславаў, якіх ведаў добра, часта бываючы ў іх. Згадваўся адразу рух рукі, з маху выкіданае зьнізу ўверх перад абліччам, які так часта дэманстраваўся пад час размовы і мусіў падкрэсьліваць як іх упэўненасьць у сваёй рацыі, так і жаданьне адным махам скасаваць усе акалічнасьці і камплікацыі, з гэнай рацыяй зьвязаныя, пра існаваньне якіх яны самі здагадваліся. Згадваўся і выраз *ne ma problema*, які яны паўтаралі вельмі часта, як запэўненьне, што яны ня маюць нічога агульнага з палітыкай — і гэта павінна было вызваляць ад адказнасьці, — і яшчэ тое, што любую нязгоду або крытыку, скіраваную нават у бок прэзыдэнта, зь якім часта яны самі не згаджаліся, яны ўспрымалі як асабістую, няздольныя ўзгодніць сябе з пакрыўджанай народнай душой; і яшчэ воклічы высакародных абаронцаў дэмакратычных выбараў у Бялградзе, якія яны кідалі ў бок паліцыянтаў: „Ня нас біце, ідзіце ў Косава біць!“; і яшчэ выказваньні пра альбанскіх кабетаў, як пра „машынкі дзеля вытворчасьці дзяцей“, што сустракаюцца ў найлепшых літаратурных часопісах; і яшчэ перакананьне ва ўласнай цывілізацыйнай вышэйшасьці, бо каб не яны, сэрбы, дык альбанцы да сёньня пасьвілі б авечкі ў гарах… Югаславія працягнула ім руку, дапамагла, а яны, няўдзячныя, цяпер прагнуць незалежнасьці (якраз у гэты момант робіцца той жэст, хуткі, каб своечасова адштурхнуць магчымыя заўвагі пра тысячы ахвяраў, якіх тая „працягнутая рука“ каштавала, пра гвалтоўнае далучэньне альбанцаў — якіх ніхто не пытаўся, жадаюць яны гэтага ці не, — да югаслаўскае фэдэрацыі).
Косава спакон веку было праклёнам для сэрбаў. Яно стрымлівала ўсталяваньне дэмакратыі, якая — гарантаваўшы грамадзянскія свабоды і вольныя выбары — магла выклікаць страту правінцыі, на 90% заселенай альбанцамі, яно ўзмацняла дыктатарскую ўладу, мацавала агрэсію нацыяналістаў і, урэшце, прывяло вайну, якая раней была дзесьці далёка — у Славеніі, Харватыі, Босьніі і Герцэговіне — на парог іх уласнае хаты: ажно ў Бялград і іншыя сэрбскія гарады. Зь іншага боку, гэты пэрыфэрыйны рэгіён, абцяжараны значным багажом народнае міталёгіі, у калектыўнай сьвядомасьці паўставаў

адным з духоўных цэнтраў. Ці маглі сэрбы яго адрачыся? А ці маглі палякі адрачыся Вільні й Львова? Гэта было нялёгка. Каб ня даць замкнуць сябе ў нацыянальным міталягічным гета, каб пасьпець за зьменлівай рэальнасьцю і не сфальсыфікаваць яе, была патрэбная вялікая праніклівасьць, уменьне далёка бачыць і адвага, бо дзеля зьнішчэньня комплексу „нацыянальнае здрады“ патрэбнае было такое асяродзьдзе, кшталту парыскае *Kultury*, якога сэрбы ня мелі і ня маюць.
Я разважаў пра тое, як цяжка часам абстрагавацца ад калектыўных настрояў, асабліва ў крызысную для народу часіну. Згадваліся Мір'яна Мяцінавіч, Іван Чалавіця і некаторыя іншыя бялградцы, якія здолелі захаваць унутраную незалежнасьць, плацячы за гэта дарагую цану ізаляцыі і цярпеньня. Бо ўсе мы нібыта розныя і грэх было б абагульняць, ажно тут раптам сорак тысячаў індывідаў апынаюцца ў адным войску, пад адзіным камандаваньнем — дзеля агульнае справы, якую маюць супольна зрабіць, — ці мае тады нейкае значэньне тое, што адны ад другіх чымсьці адрозьніваюцца? Нацыяналізм ёсьць шаленствам як супольнасьці, так і індывідаў — перасьцерагаў Даніла Кіш. Адасобленасьць ды індывідуалізм яшчэ ад яго не ратуюць. Ён стварае „бачнасьць індывідуальнасьці“, „індывідуалістаў без індывідуальнасьці“. Ён лёгка чапляецца таксама і да тых, хто ня лічыць сябе нацыяналістам і ставіцца да яго пасыўна, хто страчвае пільнасьць разам з самакрытычнасьцю і сумненьнямі ва ўласнай рацыі. Адваяваная ў штодзённым жыцьці — у тым казане, дзе гатуецца прапаганда нянавісьці, нацыянальнага турба-фольку, культу патрыятычных мітаў і племянных герояў, — непрыналежнасьць зьяўляецца тым мінімумам, які нас перасьцерагае ад дэмана нацыяналізму.
Даніла Кіш— сэрбскі і эўрапейскі пісьменьнік. Ягоныя кніжкі маюць значэньне для нас сёньня не таму, што тычацца Югаславіі, дзе пасьля яго сьмерці выбухнула вайна, а, хутчэй, з тае прычыны, што яны пра нас, эўрапейцаў. Разважаючы пра сэрбаў, я ўвогуле ня маю адчуваньня, што краіна, якую яны насяляюць, шмат чым адрозьніваецца ад тае, у якой мне давялося жыць, у якую я ўцякаў тады самалётам. Праўда, мы разьмежаваныя паміж сабой — бязь візы да іх не патрапіш, а яе цяжка дастаць. (Югаславія — адна з рэдкіх краінаў Эўропы, што трымае візавы рэжым.) Дый тыя, хто жыве ў Польшчы, Вене

ці Эўрапейскім Зьвязе, зусім не пазбаўленыя тых складнікаў, якімі яны прыпраўлялі сваю сьмяротна небясьпечную выбуховую сумесь. Наш характэрны жэст на першы погляд іншы — спакойна выцягненая перад сабой рука, якая нібыта імкнецца штосьці фамільярна паляпаць, упэўненая ў сваёй рацыі, аж покуль не адчуе мяжы, краю прасторы, за якую ня можа заходзіць, бо тая адразу ж стае прасторай пагрозы. Тады рука хуценька адсоўваецца і, як звар'яцелы камэртон, вымахвае ў абодва бакі, з усяе моцы намагаючыся абараніцца ад чагосьці, што магло б з тае цёмнае бездані выпаўзьці. Мы таксама маем сваё бесклапотнае *no problem*, дакладней, *take it easy*. Маем ледзьве прыхаваную пыху цывілізацыйнае мяжы, часам з расізмам, што выяўляецца, напрыклад, у стаўленьні да цыганоў. Маем нацыяналізм — кшталту згаданага Кішам сартраўскага тыпу, мсье Жуля, які — закаханы ва ўласны „французскі" статачак — шторазу бялее ў кавярні, калі замаўляюць *ангельскую* гарбату, і менавіта дзякуючы гэтай уласьцівасьці мсье Жуль стае кімсьці, набывае індывідуальнасьць… Гэткіх тыпаў дастаткова ня толькі на Балканах.

Існуе гіпотэза, нібыта ўсё тое, што адбываецца напрыканцы XX стагодзьдзя ў краінах былой Югаславіі, ёсьць праявай схаваных гістарычных працэсаў, якія тут адбываюцца са спазьненьнем, прасьцей кажучы, ёсьць звычайным анахранізмам для ўсяе астатняе Эўропы. Мне асабіста нашмат больш пераканальнай падаецца думка Ральфа Дагрэндорфа, успадкаваная ім ад свайго настаўніка, Эрнэста Гельнэра, выбітнага дасьледчыка праяваў нацыяналізму ў гісторыі чалавецтва. Дык вось, Гельнэр перад самай сьмерцю меў сказаць свайму вучню, што „тое, што робіцца зараз на Балканах, — зьява цалкам сучасная. Гэтых людзей мабілізавалі пазбаўленыя згрызотаў сумленьня правадыры, што іграюць на адрозьненьнях, у якіх самі людзі дрэнна разумеюцца".

Эўрапейцы складаюцца са шматлікіх нагрувашчаных адна на адну слаявінаў, хутказапальных і мітатворчых, здольных у любы момант актывізавацца, дзякуючы правадыру, кшталту Мілошавіча. Гэтаму спрыяе грамадзкая культура, якая — пры дапамозе лягічнае формулы *take it easy* — культывуе нашыя спрадвечныя чалавечыя слабасьці, а на любую спробу змаганьня з унутранымі хібамі чапляе эпітэт

„заангажаванасьць“, што напрыканцы стагодзьдзя набыў пэяратыўнае адценьне.
Наіўным з майго боку было б спадзявацца, што, па ўрэгуляваньні на Шыпалі, усё стане на свае месцы. Здавалася б, нічога не адбываецца, і я магу спакойна напіцца *венскай*, але гэта была толькі бачнасьць спакою. Я адчуваў падсподны непакой, які ўвесь час павялічваўся. Вось-вось пачнецца. Празь некалькі дзён газэты пачнуць паведамляць пра новую вайну і на экранах тэлевізараў мы будзем бачыць начныя налёты на Югаславію. Людзкія галовы апануе жудасная блытаніна. З аднаго боку, гэтая імклівая вайскова-паветраная акцыя занадта агрэсіўная, нібыта хтосьці намагаецца рашучымі дзеяньнямі заглушыць сваю запозьненасьць, сваю ранейшую крывадушнасьць, што дазваляла заплюшчваць вочы на злачынствы дыктатара, цэлае лета весьці зь ім перамовы, прымаючы на веру ўсе ягоныя хлусьлівыя абяцаньні.
Зь іншага боку, ня менш гучная антыамэрыканская гістэрыя значнае часткі эўрапейскае інтэлігенцыі, якая — у сваёй слабасьці і разгубленасьці, мармычучы штосьці пра пацыфізм і патрэбу перамоваў, пра юрыдычныя працэдуры і адмаўленьне гвалту, а насамрэч проста ня здольная зьмірыцца зь відавочным і яшчэ менш здольная выпрацаваць канкрэтныя прапазыцыі шляхоў вырашэньня праблемы, якая, дарэчы, у ейным арганізьме і нарадзілася — знайшла сабе ахвярнага казла ў вобразе NATO і злосных амэрыканцаў. Ня ўсе на гэта паддаліся, усьведамляючы, што калі Эўропа сама ня вырвецца са сваёй летаргіі, у якую заглыбілася яшчэ за часоў вайны ў Босьніі, а таксама з заклятага маастрыхцкага кола і з-пад дыктату эўра, калі не пачне браць у свае рукі справы ўсяго кантынэнту, выпрацоўваць уласныя антыцелы супраць такіх зьяваў, як этнічныя чысткі на Балканах, надыдзе хаос і спыніцца працэс яднаньня. „Мы паставілі Маастрыхт вышэй за Сараева. Цяпер сплочваем даўгі“, — пісаў пад час бамбаваньняў Тымаці Гартан Эш.
З пачаткам налётаў NATO на Югаславію пачаліся размовы пра вайну ў абарону правоў чалавека, першую гэткага кшталту ў гісторыі, якая сьведчыць пра хуткі надыход лепшых часоў у новым тысячагодзьдзі. Старажытныя рымляне казалі: *Si vis pacem, para bellum* (Калі хочаш міру, рыхтуйся да вайны). Тады гэта азначала ўзмацненьне ўласнае абароны, сёньня —

вайсковую інтэрвэнцыю супраць іншае сувэрэннае дзяржавы. Гэтая новая вайна ня мела іншых інтарэсаў, акрамя ўсталяваньня спакою, спыненьня забойстваў і вяртаньня дадому ўцекачоў. Але яна мела адразу некалькі плянаў зьместу, сярод якіх нам нялёгка зарыентавацца. Абвешчаная вайна Мілошавічу покуль прайграная, бо ён застаўся пры ўладзе. Сэрбы ж, якія ад пачатку налётаў мелі ахвяры сярод цывільнага насельніцтва, заўжды ўспрымалі гэтую вайну, як скіраваную супраць свайго народу. Сэрбскія тэатральныя рэжысэры, што ставілі калісьці творы Вацлава Гаўла, напісалі яму: „Што мы такога зрабілі табе, што на нас кідаюць бомбы?“ У адказ пачулі: „Нічога не зрабілі, але ваш рэжым катуе вашых суайчыньнікаў. А калі ён робіць гэта з альбанцамі, значыць робіць і са мной. Вось галоўная прычына: калі нехта паранены, я паранены таксама. Гэта падставовы прынцып людзкое салідарнасьці, што сягае цераз межы дзяржаваў і рэгіёнаў“. Ці зразумелі яны адказ прэзыдэнта Чэхіі?

А касавары ці разумелі, што адбываецца, ці разумелі, што гэтая вайна вядзецца за правы чалавека? Гучыць досыць абстрактна, як у эўрапейскіх дыпляматычных салёнах. Там, у гарах, вайна ішла за Косава, за вольнасьць. Можа, гэта тое самае, што і правы чалавека? Можа, сьвет ваюе за Косава? Калі б гэта было так, дык усьлед за налётамі рушылі б і наземныя войскі, вызваляючы правінцыі. Тымчасам пачалося бамбаваньне сэрбскіх гарадоў…

Адразу пасьля ўзяцьця сэрбамі ў палон трох амэрыканскіх жаўнераў мы пачулі пра адзін з найгалоўных прыярытэтаў вайны за правы чалавека: перш за ўсё дбаць пра ўласную скуру. „Гэта мэнтальнасьць пакаленьня, якое хацела б мець прынцыпы, аднак ня здольнае аплочваць іх існаваньне, — такую характарыстыку пад час вайны даў пакаленьню Біла Клінтана Джордж Сорас. — Калі прынцыпы і асабістыя зацікаўленьні супярэчаць, перамагаюць асабістыя зацікаўленьні“.

Праціўнікі гэтай вайны аргумэнтуюць сваю пазыцыю тым, што курдаў ці тыбэтцаў міжнародная супольнасьць гэткім чынам не абараняла, але мяне гэткія аргумэнты не пераконваюць. Калі некага хвалюе лёс курдаў, ён павінен рабіць усё, каб умяшаньне ў Косаве мела посьпех. „Што было, тое было“, але не „хай усё будзе, як ёсьць“. Хай сабе і столькі. Хай сабе і ў

Косаве.
Яшчэ адной праблемай стае акрэсьленасьць мэтаў і прынцыпаў, за якія ідзе змаганьне. Зараз Эўропа гэткае акрэсьленасьці ня мае. Больш за тое, сёньня аналіз падзеяў рэдка грунтуецца на маральных прынцыпах, ад якіх мацнеюць гістарычныя сувязі і адчуваньне прыналежнасьці да аднае культурнае і гістарычнае супольнасьці. У такой сытуацыі нашмат цяжэй кінуцца ў бойку за свабоду Косава, як калісьці лорд Байран кінуўся ў бойку за свабоду суседняе Грэцыі. Гэта адбывалася на пачатку XIX стагодзьдзя, а грэкі былі першым народам на Балканах, які ў гэткай барацьбе перамог. Пад час тае вайны выявілася вялікая эўрапейская салідарнасьць. Байран, даведаўшыся пра вынішчэньне туркамі грэцкіх паўстанцаў, разам з сотнямі іншых добраахвотнікаў з Эўропы рушыў у Грэцыю. Канечне, некаторыя бачылі ва ўсім гэтым звычайную барацьбу хрысьціянаў з мусульманамі; канечне, *клефты*, што сталіся галоўнай сілай паўстаньня, больш нагадвалі звычайных рабаўнікоў, чымся рамантызаваных герояў Старажытнае Эляды; канечне, Мэтэрніх лічыў грэцкіх паўстанцаў небясьпечнымі экстрэмістамі і пагрозай для спакою Эўропы, а ў Вене ў 1822 годзе, пад час кангрэсу эўрапейскіх манархаў, які ён узначальваў, не захацеў нават даць аўдыенцыі грэцкаму паслу, што прыехаў прасіць дапамогі; усё гэта, аднак, не пазбаўляла Байрана веры, што ён змагаецца і памірае за слушную справу, за свабоду і незалежнасьць краю, большасьць жыхароў якога жадалі яе ўсім сэрцам. У сёньняшняй Эўропе няшмат знойдзецца сьмелых, здольных узьняць пытаньне пра „свабоду“ і „незалежнасьць“ для Косава. Затое шмат хто разважае пра стабільнасьць у рэгіёне, непарушнасьць існага *status quo*, пагрозу з боку альбанскіх экстрэмістаў… Зьяўляюцца дыпляматычныя хітрыкі, маўчаньні, завуаляваныя выказваньні. Зьяўляецца *Kosovo Correctness*, новая культура мяжы.
Я ўцякаў ад Косава з самае мяжы Македоніі, разам зь іншымі, якія адводзілі вочы. Я ўцякаў зь месца, дзе бруіла крыніца цемры. І куды б я ні пайшоў, яна апыналася перада мной. Не было куды ўцякаць. Нават калі я засынаў — ужо ў хаце — перад вачыма ў мяне стаялі белыя дразды Агіма Чаўдарбашы. Як хацелася вызваліць іх з путаў! Я ведаў, што не змагу не вярнуцца ў Косава.

Пераклаў з польскай Андрэй Скурко паводле аўтарскага тэксту.

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000
Балканы

Драга Янчар
Славенскія маргіналіі

Драга Янчар (нар. 1948) — славенскі пісьменнік. З адукацыі юрыст, працаваў драматургам на кінастудыі „Вібафільм“. У 1974 годзе быў арыштаваны і асуджаны на год пазбаўленьня волі за „варожую прапаганду“. Ад 1987 да 1991 году — кіраўнік славенскага ПЭН-цэнтру. Цяпер рэдагуе часопіс „Славенская маціца“. Ягоны раман „Галернік“ быў перакладзены на беларускую мову Іванам Чаротам.

Час ідзе, лянотная рака славенскага жыцьця-быцьця цячэ далей, рашучыя ўчынкі, натхнёная жарсьць і юнацкі імпэт больш не імкнуцца перакуліць гэты сьвет. Нарэшце ў нас зьявілася тое, пра што мы калісьці маглі толькі шаптаць: мы маем дэмакратычнае грамадзтва з усімі адпаведнымі інстытутамі, маем свабоду слова і друку, ёсьць у нас свая дзяржава, вольнае прадпрымальніцтва, мы разумныя, адукаваныя, таленавітыя, мы здольныя з усім гэтым удала спраўляцца. Цяпер усё залежыць толькі ад нас саміх. Пры канцы стагодзьдзя стварылася прастора, у якой мы можам разгарнуць усялякую прыватную, разумовую ці вытворчую ініцыятыву — ніхто нам больш не загражае. Нашыя асабістыя і дзяржаўныя свабоды забясьпечаныя, славенскі народ — як этнічную, гістарычную і культурную супольнасьць — ніхто больш не пазбавіць права на роўнасьць і матэрыяльны ды культурны росквіт. Славенскае нацыянальнае пытаньне цяпер сапраўды вырашаецца толькі намі, славенцамі. Такім чынам,

можна сьцьвердзіць, што славенскае нацыянальнае пытаньне, у якім мы можам поўнасьцю разьлічваць толькі на саміх сябе, фармальна вырашанае.
Аднак мы нечым незадаволеныя, нам бракуе чагосьці грунтоўнага.
На думку большасьці інтэлектуалаў і дастатковай колькасьці іншых незадаволеных грамадзянаў, ход падзеяў часам дае асечку. Але ці можа ў дэмакратыі ўсё ісьці бездакорна і роўна? Бездакорна і роўна ўсё спрацоўвае толькі ў недэмакратычных краінах, а найперш у дыктатурах. Значны кавалак нашае гістарычнае памяці прыходзіцца на пару, калі ўсё ў нас рабілася правільна і найясьнейшым чынам. Усе, ад Ціта і Кардэля да найніжэйшага дзяржфункцыянэра, ведалі, як практычна і тэарэтычна растлумачыць кожную драбязу, каб справы ішлі ў правільным кірунку і да таго ж адзіна магчымым правільным парадкам. Пакуль гэты парадак не рассыпаўся...
Карацей кажучы, праблема не ў незадаволенасьці, а ў тым, што славенскае грамадзтва няздольнае і непадрыхтаванае ўспрымаць крытычную інтанацыю гэтае незадаволенасьці. Праблема ў тым, што пераважае недастатковая, нізкая культура той большасьці, якая насамрэч гэтую дэмакратыю прадстаўляе і ўвасабляе. Такі ўзровень культуры часьцяком нават не дасягае парогу талерантнасьці, што ляжыць у аснове павагі да іншадумцаў, ужо ня кажучы пра ўспрыманьне і публічнае абмеркаваньне крытыкі, яе ўкараненьне як неабходнае ўмовы энэргіі і дынамікі разьвіцьця грамадзтва. Славенцы пераважна бурчаць і енчаць, як бурчэлі і енчылі ў былой сыстэме. У Славеніі не сутыкаюцца розныя канцэпцыі разьвіцьця, розныя погляды на эканоміку, навуку, палітыку, культуру, хаця такія канцэпцыі і погляды існуюць, у тым ліку і ў палітычных партыяў. Аднак грамадзкасьць не гатовая прыняць гэтую рознасьць на ўзроўні, вышэйшым за чапляньне, буркаценьне, перадузятае навешваньне палітычных ярлыкоў. Шмат чаго было зроблена, пералом пры канцы стагодзьдзя быў рашучым і беспаваротным, але ўсё адно мала падставаў для таго, каб чалавек, хоць трохі крытычна настроены, сёньня ўзьняў голаў і сказаў: „У нас ёсьць дэмакратыя, у нас ёсьць дзяржава, і справа толькі за часам“.
У нас ёсьць дэмакратыя, але якая?
У нас ёсьць дзяржава, але якая?

Нашая дзяржава паўстала пасьля стогадовага змаганьня за культурную і матэрыяльную роўнасьць, нашая дэмакратыя ўзьнікла на тле супраціву таталітарызму. Нашая дзяржава абвяшчае культуру асноўнай крыніцай самое сябе. Але пасьля таго як суцішылася захапленьне агульнаэўрапейскімі і ўласнымі пераўтварэньнямі, падзеньнем ідэалягічных бастыёнаў, зьнікла й моц энэргіі супраціву. У выніку мы зноў зьдзіўляемся станам духу, які пануе ў гэтым грамадзтве, назіраем за бязьлітасным прысвойваньнем грамадзкае прасторы і маёмасьці. Крытычныя задумы кола людзей, якія інтэлектуальна падрыхтавалі магчымасьць пераўтварэньня грамадзтва, у новае грамадзтва ня ўключаныя, бо калі б гэта здарылася, дынаміка разьвіцьця была б зусім іншай. І крытыка, і творчыя думкі ня маюць сёньня патрэбнага рэзанансу, захопленая інфармацыйная прастора іх хутка расьцярушвае, дэклясуе ці, навогул, мінімалізуе. Мы сёньня зьвяртаемся да глухіх людзей, б'емся ў глухія сьцены — раней у іх, прынамсі, мікрафоны былі.

Што, што я павінен ствараць у краі, дзе запанавала лянотная інэрцыя, палітычны прагматызм, дух заштатнай правінцыі, шэрай масы, якая нівэлюе, падмінае, цягне ў балотную твань усіх, хто вылучыўся, хто хоча разварушыць змрочнае навакольле? Адсюль вынікае: калі ж, як не цяпер, хто ж, як ня мы? Патэтычнае пытаньне, якое мела свой сэнс, ну, скажам, у 1987 годзе, сёньня гучыць крыху сьмешна. Хаця акурат сёньня гэтым сьмешным донкіхотаўскім воклічам трэба кіравацца. *Я стаю паміж дзьвюма эпохамі*, побач са мною — сябры і аднагодкі. У свае пяцьдзясят, верагодна, я апошні, самы малады прадстаўнік таго донкіхотаўскага пакаленьня, якое што было моцы супраціўлялася таталітарнай сыстэме, хаця, каб выжыць, даводзілася і да яе прыстасоўвацца. Я пагаджаюся з новымі творчымі людзьмі ў тым, што сёньняшняя Славенія павінна жыць без таго надрыву, таго абсурднага ды безупыннага надрыву, накіраванага на перамену рэчаў і наданьне рэчам ды самому жыцьцю сэнсу. Дэмакратычная, самастойная, эўрапейская Славенія, іншымі словамі — нармальная Славенія некалі падавалася нам Аркадыяй. У Аркадыі ня трэба нічога рабіць, каб зьмяніць сьвет, у ёй мы будзем пісьменьнікамі і паэтамі. Аднак, як не было, так і няма той Аркадыі, дзе ў нармальным славенскім і эўрапейскім,

дэмакратычным і лібэральным грамадзтве, што набыло культурную своеасаблівасьць і касмапалітычны размах, мы маглі б прысьвяціць сябе эстэтыцы і жыць нармальным жыцьцём. Я шмат уласнай энэргіі і бяссонных гадзінаў прысьвяціў дзейнасьці супраць ненармальнага становішча ў грамадзтве, выкрываў крывадушша дзяржавы і ейную інэрцыю. Мне ставала дурноты гэтым займацца. Але ваяваць за нармальны стан рэчаў цяпер?

Ці ж я поўны вар'ят?

Ня толькі ў глябальных пытаньнях Культуры, Народу, Эўропы, Разьвіцьця, але і ў дробных, для кагосьці зусім нязначных, вымалёўваюцца абрысы найгоршай спадчыны самаўладнага апартунізму, нядбайнасьці, мэнталітэту абыякавасьці і ляноты ў самым заняпалым стане. Гэта спадчына прымітывізму і бяздумнасьці, нязьменнасьць якіх перашкаджае разважаньню і дзейнасьці.

У малога народу спараджаецца свой спэцыфічны погляд на рэчы. У тым ліку нямала ў ім правінцыйнай непрыязнасьці. Славенцы схільныя прытрымлівацца думкі, што іх заўсёды прыгнятаў нехта іншы. Ва ўсім вінаватыя Бялград ці Масква. Пагаджуся, што шмат у чым гэта адпавядае рэчаіснасьці, але гэтак сама можна дашукацца віны Вены і Рыму. Між іншым, больш за ўсё грамадзянаў Славеніі прыціскалі ня нейкія сэрбы, ці „паўднёўцы", як іх яшчэ называюць, а гэта мы з паўднёвым запалам самі шкодзілі адзін адному. Забойствы, судовыя працэсы, дробныя перасьледы і цкаваньне — гэта ж усё зроблена працавітымі славенскімі рукамі. Вынікі гэтай плённай працы дастаткова паважныя: пасьля 8 траўня 1945 году забіта 14 000 чалавек, 28 000 асуджана, у 200 000 чалавек канфіскавалі маёмасьць. Хто можа растлумачыць, якая сіла выціснула з гэтага народу такую напорлівую прагу да гвалту? Вядома ж, людзі, што не ўспрымаюць сур'ёзна гэтыя лічбы, нічога не патлумачаць. Але лічбы давядзецца яшчэ шматкроць узнаўляць. Вынікае, справа ня толькі ў лічбах і ліках, а перш за ўсё ў чалавечых лёсах, што за імі стаяць. Не, гэта не „непадрыхтаванасьць да дэмакратыі", гэта няздатнасьць да вядзеньня чалавечага дыялёгу, талерантнасьці і спачуваньня, неабходных у любой грамадзянскай супольнасьці. Таталітарызм прыжыўся на людзкой непрыязнасьці, пагардлівасьці, абыякавасьці, ён выкарыстоўваў і разьвіваў

гэтыя адвечныя чалавечыя заганы. І гэта ўласьціва ня толькі камуністычнаму таталітарызму — любому. Мы пахавалі камунізм, але засталася ў людзях былая нецярпімасьць. *Дэмакратыя зусім яшчэ ня выпрацавала імунітэту* супраць крывадушша, як і супраць неталерантнасьці і непрыязнасьці. Пытаньне аб тым, ці напэўна наша будучыня зьвязаная з Эўропай, не стаіць, і таму ўзьнікае іншае: а ці будзе яна на належным узроўні славенскай. Нават калі яна і будзе славенскай, гэта яшчэ ня значыць, што яна не набудзе прымітыўнага, вульгарнага ды некультурнага выгляду.
Пры канцы XX стагодзьдзя ў незалежнай дзяржаве, дзе зацьвердзіліся інстытуты дэмакратыі, узьнікае элемэнтарнае пытаньне: ці будзе ў нашых краях палаць захапляльнае творчае агніска, вакол якога завіруе жыцьцё і праца, ці мы ператворымся ў закуток сьвету, прызначаны для абслугоўваньня вялікіх сыстэмаў лібэральнага капіталізму, і будзем на ўсіх узроўнях адно па-лёкайску пераймаць нечыя дасягненьні ў тэхналёгіі, навуцы, мастацтве, спосабах жыцьця і мысьленьня?
Дзесяць год выявілі, што ўлада і палітычныя сілы Славеніі ня маюць бачаньня славенскай будучыні. Славенія ператварылася ў краіну стагнацыі і гойдаецца на хвалях, бы човен, дзе няма ні стырнавога, ні вясла, а ўсе схапіліся за край, глядзяць у ваду і чакаюць эўрапейскай плыні, якая іх абавязкова ўздыме, зацягне ў іншае рэчышча і вынесе наперад. Грамадзтва павінна мець сваю ўласную канцэпцыю разьвіцьця на аснове сваёй культуры, палітычнай сыстэмы, дэмакратыі, інфармацыйнай прасторы... Калі гэта зьдзейсьніцца, менш будзе кпінаў з нашай дробнасьці, са славенскага ліліпуцтва, якое не абміне падкрэсьліць толькі сапраўдны ліліпут. Мая перакладчыца, якая брала ўдзел у некалькіх сэмінарах славенскае мовы, літаратуры і культуры на філязофскім факультэце Люблянскага ўнівэрсытэту, аднойчы са зьдзіўленьнем заўважыла: „Чаму ўрачыстая прадмова на адкрыцьці гэтага цудоўна арганізаванага мерапрыемства заўсёды пачынаецца словамі: мы, славенцы, маленькі эўрапейскі народ з маленькай эўрапейскай мовай? Гэта ж не перашкаджае вам мець адну з найбольш цікавых літаратураў у Эўропе“. Лепш бы замест гэтага сказалі: мы, славенцы, якіх толькі 2 мільёны, кожны год друкуем 4000 новых кніг, украінцы ж, напрыклад, просім

прабачэньня, на 60 мільёнаў жыхароў выдаюць толькі з 1000 найменьняў кніг на ўласнай мове. Комплекс сваёй нешматлікасьці мы пераадольвалі дзякуючы настойліваму руху пратэсту, у якім значную ролю адыграла творчасьць.
Бо насамрэч мізэрнасьць ці веліч краіны вызначаецца мізэрнасьцю альбо веліччу ейных жыхароў і творцаў. І пад творчасьцю я тутака разумею ня толькі стварэньне раманаў, песень ці карцін, але й палітычныя, сацыяльныя ды іншыя задумы і праекты.

Пераклала са славенскай Алена Пятрова паводле
Drago Jancar, Slovenske marginalije, Nova Revija, 206/1999.
Скарачэньні рэдакцыі.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
[image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

геапалітыка

Рычард Пайпс Мінуўшчына Расеі і яе будучыня

Рычард Эдгар Пайпс (нар. у 1923 годзе ў Цешыне, у Польшчы, жыве ў ЗША ад 1940-га) — амэрыканскі гісторык і палітоляг, адзін з найбольш аўтарытэтных заходніх дасьледнікаў гісторыі Расеі і СССР. Аўтар 15 кніжок, сябар выдавецкіх радаў у 10 выдавецтвах. З 1963 — прафэсар гісторыі Гарвардзкага ўнівэрсытэту. Быў таксама дырэктарам Цэнтру расейскіх дасьледаваньняў Гарварду, дырэктарам па справах Савецкага Саюзу і Ўсходняй Эўропы ў Радзе нацыянальнай бясьпекі ЗША. Пры канцы 1999 году надрукаваў артыкулы *Portent of the Russian Elections* і *Outrages of Chechnya*, у якіх аналізуе сытуацыю ў Расеі.

Расея для тых з нас, хто чакаў, што па каляпсе савецкага рэжыму гэтая краіна, хоць павольнай і рванай, але ўсё ж незваротнай хадой, ступіць на дарогу прыняцьця заходніх вартасьцяў, сталася ў апошніх гадох вялікім расчараваньнем. Праўда, мы ў нашых думках закліньваліся на кірунку, якім — хоць і з выкарыстаньнем розных мэтадаў — памкнулі прыбалтыйскія дзяржавы, Чэхія, Польшча й Вугоршчына, то бок краіны, што толькі нядаўна вызваліліся ад камунізму. Адначасова мы не заўважалі відзежу, што бачыўся многім расейцам, якія, зрынуўшы камунізм, спачатку былі ахопленыя энтузіязмам і лічылі, што даволі абвесьціць Расею

дэмакратычнай і рынкава арыентаванай дзяржавай, і іх краіна ў кароткі час ператворыцца ў другія Злучаныя Штаты.

Урэшце не рэалізаваўся ніводны з гэтых сцэнароў. Расея па спадзеўным пачатку прыйшла да цяжкавызначальнага рэжыму, які ня ў стане даць сваім грамадзянам ані дабрабыту і свабодаў уласнай капіталістычнай дэмакратыі, ані падставовай пэўнасьці эпохі росквіту камунізму.
Гэтая абставіна спрычыніла ў Расеі глыбокае расчараваньне. Камуністы на апошніх парлямэнцкіх выбарах атрымалі найбольшую колькасьць галасоў*.
Амаль палова выбаршчыкаў аддала свае галасы кандыдатам, якія адмаўляюць дэмакратызацыю і рынкавую эканоміку, глядзяць на Захад як на ворага, што імкнецца скарыць Расею, і прагнуць „цьвёрдай рукі“. Да нядаўна мы нават не дапускалі, што перамога ў чэрвеньскіх прэзыдэнцкіх выбарах можа дастацца камуністам ці нацыяналістам, паміж якімі, у прынцыпе, няма вялікае розьніцы: і тыя, і другія прагнуць аднаўленьня страчанай імпэрыі і разгрому дэмакратычных інстытуцыяў, што ў Расеі толькі пачынаюць нараджацца.
Гэтая абставіна — хоць яе рашуча крытыкуюць ангажаваныя назіральнікі — пры ўсім пры тым яскрава паказвае, як моцна памыляюцца новыя славянафілы кшталту Аляксандра Салжаніцына: паводле іх, карані ўсіх расейскіх праблемаў палягаюць у марксізьме, на які яны глядзяць як на чужародную для Расеі пошасьць, прынесеную з Захаду. Аднак калі й *праўда*, што марксісцкая тэорыя была імпартаваная з Захаду, дык трэба дадаць, што марксізм *у практыцы*, як спосаб улады, набыў свой выключна дэспатычны характар менавіта ў Расеі. У заходніх краінах марксізм пасьля таго, як пад выглядам сацыяльнай дэмакратыі трапіў да ўлады, разьвіўся ў сацыяльную дэмакратычную дзяржаву; у Расеі — гэтаксама як і ў бальшыні тых краінаў трэцяга сьвету, якія прынялі яго за свой, — прывёў да ўзьнікненьня таталітарызму.
Безумоўна, што адрознасьць разьвіцьця той самай ідэалёгіі ў двух розных асяродзьдзях паказвае, што палітычная культура Расеі варожая да палітычных і эканамічных інстытуцыяў Захаду і выяўляе схільнасьць перафармуляваць заходнія ідэі ў духу, які супярэчыць прынцыпам грамадзянскай супольнасьці. Вельмі праўдападобна, што дакуль расейцы не ўсьвядомяць, што

менавіта ў іхнай культуры трэба зьмяніць, датуль яны ня змогуць стаць „нармальным“ грамадзтвам, — а тымчасам да гэтага бальшыня зь іх імкнецца.
** Маюцца на ўвеце парлямэнцкія выбары 1996 году. — Рэд.*

* * *

Дык якія элемэнты гістарычнага разьвіцьця Расеі зрабілі яе жыхароў збольшага неўспрымальнымі да заходніх уплываў і адначасова схільнымі паддавацца антызаходняй дэмагогіі? Найперш хочацца вытлумачыць гэта нацыянальным характарам: расейцы ад прыроды іншыя, гэта людзі, замяшаныя зь іншае дзежкі, чым якія ангельцы, французы ці швэды. Аднак гэтага адказу прыняць нельга. У канцы сярэднявечча Расея складалася зь дзьвюх частак. Цэнтрам першай была Масква. Другая — Ноўгарад — была квітнеючай гандлёвай гарадзкой дзяржавай, якая, дзякуючы сваім сувязям з Ганзэйскай лігай, мела шырокія гандлёвыя кантакты з усёй паўночнай Эўропай. Культура Ноўгараду, заснаваная менавіта на гандлі, стымулявала ўтварэньне дэмакратычных інстытуцыяў, што ня толькі адпавядалі сваім заходнеэўрапейскім аналягам, але ў некаторых аспэктах іх і пераўзыходзілі.
Ноўгарад быў рэспублікай, кіраўнікі якой выбіраліся, прычым перад уступленьнем на пасаду абавязкам новага ўладара было прысягнуць, што ён будзе паважаць прывілеі й правы грамадзянаў, якія выразна абмяжоўвалі ягоныя паўнамоцтвы. Выбарнымі былі і іншыя высокія пасады. Маёмасьць грамадзянаў ахоўвалася ад незаконных замахаў. Законы прымаліся *вечам*, у якім мог узяць удзел кожны свабодны чалавек. Расейская гарадзкая дзяржава вельмі нагадвала аўтаномныя камуны сярэднявечнай Эўропы, якія значна паспрыялі разьвіцьцю свабоды і ўлады закону ў Заходняй Эўропе.
На бяду для Расеі Ноўгарад пры канцы XV стагодзьдзя быў заваяваны аўтакратычнай маскоўскай дзяржавай, якая зьліквідавала *вечa*, імем маскоўскага цара канфіскавала ўсе землі, а тысячы чальцоў ноўгарадзкага верхняга пласту дэпартавала далёка ўглыб расейскіх абшараў. І хоць Ноўгарад не праіснаваў да нашых дзён, ужо сам факт ягонай наяўнасьці

ў гісторыі Расеі паказвае, што ўяўленьне аб прыроджаным антызаходнім чуцьці расейцаў цалкам памылковае.
Гэта пацьвярджаецца і фактамі сучаснай расейскай культуры. На знакамітыя літаратурныя, музычныя і жывапісныя творы, якія ўзьніклі ў Расеі ў апошнія два стагодзьдзі, моцна паўплываў Захад, і наадварот: сам Захад ахвотна прызнаў іх за свае. Цяжка было б знайсьці чалавека, які б сумняваўся, што, да прыкладу, Пушкін, Тургенеў, Талстой, Чэхаў, Чайкоўскі або Стравінскі, Кандзінскі або Шагал не належаць заходняй культуры.
Тут мы апынаемся перад вялікай загадкай: вось краіна, якая распасьціраецца на ўзьмежжы Эўропы і жыхары якой маюць такі самы фізычны выгляд, як і ўсе эўрапейцы; краіна, якая ў апошнія тры стагодзьдзі настойліва імкнулася да таго, каб быць успрыманай за складнік Эўропы, і якая, як у палітычнай, гэтак і ў культурнай сфэры, давяла сваю здатнасьць такім складнікам быць; і ўвадначас гэтая самая краіна сьцьвярджае, што для яе амаль немагчыма збудаваць грамадзкі і палітычны рэжым, заснаваны на агульнапрынятай у Заходняй Эўропе мадэлі. Што ж хаваецца за гэтай супярэчнасьцю?

* * *

Тут да месца будзе невялікае адступленьне. Меркаваньні, якія я буду разьвіваць у наступных радкох, абапіраюцца на дапушчэньні, што меркай, паводле якой Расея (а аналягічна і іншыя супольнасьці, што знаходзяцца па-за культурным абсягам Захаду) мае разглядацца, зьяўляюцца заходнія інстытуцыі і практыкі. Такая аснова аргумэнтацыі ў наш час ня вельмі папулярная, бо нагадвае самамэтавыя довады, ужываныя заходнеэўрапейцамі ў часы піку сваёй імпэрыялістычнай экспансіі дзеля апраўданьня падпарадкаваньня, а часьцяком і паняволеньня іншых расаў. Уяўленьне пра расавую вышэйшасьць эўрапейцаў, і перадусім паўночнаэўрапейцаў („арыйцаў“), што дасягнула сваёй ганебнай кульмінацыі ў Галакосьце, абсалютна — і цалкам апраўдана — сябе здыскрэдытавала. Аднак нашай рэакцыяй сталася ўхіленьне да супрацьлеглае крайнасьці. У амэрыканскіх унівэрсытэтах палітычна карэктнай пазыцыяй лічыцца сёньня „мультыкультуралізм“. Гэты няясны нэалягізм

сьцьвярджае, што вартасьць усіх культураў роўная. Культура заходняя — калі тая праз шкоду, нібыта няспынна чыненую чалавецтву, ня лічыцца проста другаснай — ляжыць недзе на адным роўні з астатнімі.
Сучасныя модныя дактрыны, ствараныя ў імкненьні загладзіць расісцкія падыходы мінуўшчыны, церпяць ад уласных недахопаў. Далёка не апошні зь іх — крывадушнасьць. Хоць мы й адкінулі ўяўленьне, што людзі неэўрапейскага паходжаньня — барбары, або што яны ў дачыненьні да нас нейкія другасныя, усё ж мы ўвесь час натыкаемся на ацэнкі іншых супольнасьцяў, заснаваныя на нашым, заходнім гледзішчы. Калі паважаны прадстаўнік Ірану наказаў верным мусульманам забіць пісьменьніка, які нібыта абразіў прарока Мухамэда, нашы галоўныя „прагрэсіўныя“ пісьменьнікі былі надзвычай абураны. Факт, што такі загад мог знаходзіцца ў абсалютнай згодзе з ісламскім правам, ніхто ня браў пад увагу. Мы становімся ў апазыцыю да практык, якія жанчын у краінах трэцяга сьвету асуджаюць на падпарадкаванае становішча, а ў некаторых афрыканскіх супольнасьцях выліваюцца нават у іх фізычнае калечаньне, — аднак і тут такія мэтады могуць адпавядаць мясцовым культурным традыцыям. Гэтыя і шматлікія іншыя прыклады паказваюць, што велізарная частка таго, што разумеецца як „мультыкультуралізм“ (з ганьбаваньнем Захаду як яго спадарожнай зьявай), ёсьць толькі позай, справакаванай часткова пачуцьцём віны, часткова саманянавісьцю.
Факт, што нехта ставіць заходнюю культуру ў прыклад і адстойвае яе як узор для сучаснага сьвету, насамрэч не нясе ў сабе ніякіх адзнак расавай вышэйшасьці. Эўропа з розных прычынаў была першым кантынэнтам, які разьвіў інстытуцыі, што ўтвараюць нарожныя камяні сучаснага жыцьця, — прававыя сыстэмы ды афіцыйную практыку, навуку і тэхніку, інфармацыйныя і транспартныя мэханізмы, рух людзей, капіталаў і тавараў. Усё гэта разам няўхільна вядзе да інтэграваньня сьвету ў адзіную супольнасьць. Сучасная эпоха і экспансія заходніх уплываў, беручы практычна, — гэта адно і тое ж. Сьпіс краінаў, што маюць найбольшы прыбытак у пераразьліку на душу насельніцтва, сёньня амаль супадае са сьпісам тых, што найбольш прынялі заходнія мэтады і звычаі. І наадварот: да краінаў найбяднейшых належаць найперш тыя, што гэтым шляхам — з тае ці іншай прычыны — ня рушылі.

Расея — зусім не вынятак з гэтага правіла. Ейнае глыбока ўкарэненае непрыманьне Захаду сьведчыць пра няздольнасьць прыладзіцца да сучаснага сьвету і мае сваім вынікам беднасьць і заняпад. Цяпер ужо больш чым відавочна, што тэорыя, сфармуляваная славянафіламі XIX стагодзьдзя — то бок што Расея мусіць крочыць сваім „апрычоным“ шляхам, — на практыцы можа прывесьці толькі да катастрофы. Аднак жа Генадзю Зюганаву, лідэру расейскай камуністычнай партыі і аднаму з галоўных кандыдатаў у нядаўніх прэзыдэнцкіх выбарах, гэты факт зусім не перашкаджае выстаўляць патрабаваньні, каб сьвет прызнаў „наша неад'емнае права ісьці ўласным шляхам, які адпавядае нашым традыцыям і ўмовам“. Тым ня менш і надалей застаецца абсалютна незразумелым, што гэта, уласна, за „наш шлях“, — інакш кажучы, няясна, якіх традыцыяў Расея мусіць трымацца і да якіх умоваў мелася б прыстасоўвацца. Урэшце, у расейцаў іхнае „права“ ніхто й не аспрэчвае. Праўда, у сьвятле апошніх восемдзесяцёх гадоў перад намі паўстае пытаньне: куды б такі шлях мог прывесьці?

* * *

Чаму ж, уласна, для Расеі так праблематычна прыняць заходнюю мадэль грамадзтва? Ці ж не ўчынілі гэта зь вялікім посьпехам ужо некалькі азіяцкіх краінаў — а тыя, між тым, з усіх гледзішчаў ад Эўропы намнога больш далёкія!
Тлумачэньне палягае ў некалькіх чыньніках, адны зь якіх суб'ектыўныя, іншыя — аб'ектыўныя (псыхалягічна абумоўлены супраціў, узмоцнены гістарычнаю спадчынаю).
Пачатак жывучага антызаходняга стаўленьня Расеі прасочваецца ў яе рэлігійнай спадчыне. Глыбіня рэлігійнага чуцьця расейскага грамадзтва як цэлага ўжо доўгі час ёсьць вельмі спрэчным пытаньнем, бо рэлігія ў Расеі ў надзвычай вялікай ступені працятая прымхамі і забабонамі. Але бясспрэчна, што пераважная бальшыня расейскага люду (найперш сялянства, якое ўтварала ажно 80 % ад усіх жыхароў) на працягу соцень гадоў верна і аддана ўшаноўвала абразы, пэдантычна трымалася царкоўных постаў і сьвятаў, і — калі ішлося пра чалавека пісьменнага — чытала рэлігійную літаратуру. Значная колькасьць расейцаў ажно да трыццатых гадоў нашага стагодзьдзя, калі антыцаркоўная кампанія

камуністычнай партыі разгарнулася напоўніцу, з многіх гледзішчаў усё яшчэ жыла ў сярэднявеччы, і сьвецкай культурай, характэрнай для адукаванай эліты Захаду, заставалася практычна некранутая.

Паміж верай, якую вызнаюць расейцы, і іхным стаўленьнем да Захаду існуе — хоць на першы погляд гэтага можна і не заўважыць — цесная матэрыяльная сувязь. Як каталіцызм, гэтак і пратэстантызм у вачох праваслаўнай царквы заўсёды былі адхіленьнямі, заплямленымі паганскім клясыцызмам і філязофскім рацыяналізмам. Пра тое, наколькі дзейсным быў такі падыход, сьведчыць той факт, што, калі туркі ў 1453 годзе здабылі Царград і разьбілі Бізантыйскую імпэрыю, цэнтар праваслаўя, расейскае духавенства гэтую катастрофу апраўдвала як божую кару за прыкладна стогадовай даўнасьці спробу Бізантыі зьяднацца з Рымам. Па распадзе Бізантыі і турэцкай акупацыі Балканскага паўвостраву маскоўскае самаўладзьдзе засталося практычна адзінай праваслаўнай дзяржавай ува ўсім сьвеце. У выніку гэтага праваслаўе — пачынаючы зь сярэдзіны XV стагодзьдзя — было атаясамлена з расейскасьцю і ператварылася, такім чынам, у нацыянальную рэлігію.

Гэты сынтэз рэлігіі й нацыянальнай прыналежнасьці — каталіцызм і пратэстантызм, наадварот, былі і да сёньняшняга дня застаюцца верамі наднацыянальнымі — меў далекасяжныя вынікі. Варожасьць, зь якой праваслаўная царква ставілася да заходніх адменьнікаў хрысьціянства, з часам зьмянілася і набыла сэкулярызаваны выгляд. Гэтаксама як праваслаўе бескампрамісна ставілася да заходняга хрысьціянства, так і расейскі народ паступова прыйшоў да адчуваньня, што ягоны характар з Захадам неспалучальны. А дзеля таго што расейцы не адчувалі сябе роднаснымі з тымі сваімі суседзямі, якія зьвярталіся да адной з рэлігіяў Усходу — ісламу, будызму, канфуцыянства, — дык пачалі самі сябе ўважаць за асаблівы і выключны выпадак.

Гісторыкі даўно ўжо заўважылі, што калі бальшавікі ўвялі ў жыцьцё трэці інтэрнацыянал і абвесьцілі Маскву галоўным цэнтрам сусьветнага камунізму, яны міжволі пры гэтым гралі — насуперак свайму ваяўнічаму атэізму — менавіта на вышэйзгаданых пачуцьцях. У гэтым яны пайшлі па сьлядох расейскіх князёў XVI стагодзьдзя, якія па падзеньні Царграду

абвесьцілі цэнтар сваёй імпэрыі за трэці і апошні „Рым“.
У эпоху, калі ролю разумовых і маральных арыенціраў іграюць замест веры навука і ідэалёгія, можа падацца, што шукаць карані палітычных узаемінаў у рэлігійных падзеях мінуўшчыны — перабольшаньне. Аднак сэкулярызм — зьява выключна новая. Карані шмат чаго з таго, ува што мы верым — хоць свае погляды мы й фармулюем на навуковай і ідэалягічнай базе, — як выяўляецца пры бліжэйшым разглядзе, палягаюць у рэлігіі. Мільёны расейцаў, пляскаючы дэмагогам, што асуджаюць „сапсаваны“ й „заразны“ Захад, несьвядома паўтараюць стаўленьне, што ўзьнікла шмат стагодзьдзяў таму ў найвышэйшых колах праваслаўнай царквы, зь якіх затым пашырылася на ўсё насельніцтва.

* * *

Такога роду стаўленьне, што замінае расейцам карыстацца заходнім досьведам і сучаснымі ведамі, — гэта яшчэ ня ўсё: зьменам замінаюць і перашкоды інстытуцыйныя, якіх насамрэч вялізнае мноства. На першае месца я б тут паставіў позьні і часава абмежаваны досьвед з прыватнай уласнасьцю.
Тут, на Захадзе, мы схільныя ставіцца да панятку прыватнай уласнасьці як натуральнага закону, дадзенасьці, якая нам гарантуе, што маёмасьць і правы, якія мы маем, належаць нам цалкам, і мы можам зь імі абыходзіцца сваім адумам. Гэтую маёмасьць і правы мы ахоўваем ад замахаў ня толькі суграмадзянаў, але й дзяржавы: мы пэўныя, што ўрад ня мае права абкладаць нас падаткамі бяз згоды на тое нашых прадстаўнікоў ці што ён ня можа падняць рукі на нашую ўласнасьць, ня даўшы нам прыстойнай замены. Аднак для таго, каб гэтыя „натуральныя“ і безумоўныя прынцыпы сталіся трывалым складнікам нашай культуры, насамрэч спатрэбілася шмат часу і нямала жорсткіх канфліктаў. Гісторыя Ангельшчыны, краіны, што дала сьвету парлямэнцкую дэмакратыю, поўніцца такімі сутыкненьнямі паміж народам і каронай, сутыкненьнямі, выкліканымі каралеўскім умяшаньнем у маёмасныя правы падданых і перадусім самавольным падаткаабкладаньнем.
Гэтыя сутыкненьні скончыліся трыюмфам сувэрэннасьці народу — як у Ангельшчыне, так і паўсюдна ў сьвеце. Меркаваньне,

што ўласнасьць складаецца ня толькі з панятку матэрыяльнай маёмасьці, але й з жыцьця і свабоды, спапулярызаванае Джонам Локам і перанесенае з Ангельшчыны ў Злучаныя Штаты, набыло значны ўплыў і ў Эўропе. Паўсюдна, нават у краінах, ахопленых абсалютысцкімі рэжымамі, прыказка, што каралі ўладараць, але не валодаюць, сталася безумоўнай ісьцінай; шырокавядомая сэнтэнцыя рымскага філёзафа Сэнэкі кажа, што „каралям належыць улада, людзям жа маёмасьць“. Парушэньне гэтага прынцыпу ўспрымаецца як тыранія.
Расеі ўвесь час гэтыя ідэі былі чужымі. Цар абыходзіўся з усёй імпэрыяй як з выключна сваёй маёмасьцю, а сьвецкіх земляўласьнікаў уважаў за сваіх арандатараў, якія трымаюць маёнткі дзякуючы ягонай міласэрнасьці ў залежнасьці ад іх вернасьці ў службе. Складнікам сувэрэннасьці, такім чынам, было валоданьне зямлёй і людзьмі. Рэжым гэтага кшталту, вызначаны нямецкім сацыёлягам Максам Вэбэрам як „патрыманіяльны“, праіснаваў у Расеі ў практычна некранутым выглядзе ажно да канца XVIII стагодзьдзя, а ў некаторых аспэктах нават да пачатку стагодзьдзя дваццатага. Прыватная ўласнасьць на зямлю, не абмежаваная нейкімі ўмовамі, — то бок асноўная форма прадукцыйнага пашырэньня багацьця — зьявілася дзякуючы „Даравальнай грамаце дваранству“ Кацярыны Вялікай толькі ў 1785 годзе, але распаўсюджвалася яна выключна на шляхту; звычайныя сяляне і надалей ураблялі зямлю, якая належала ці то дзяржаве, ці то памешчыкам. Магчымасьць жа стацца земляўласьнікамі, праўда, тэарэтычную, сяляне атрымалі толькі ў 1861 годзе, а практычную ажно ў 1906-м, інакш кажучы, яшчэ пры памяці некаторых нашых сучасьнікаў. Аднак ужо празь некалькі дзесяцігодзьдзяў прыватная ўласнасьць на зямлю была зьліквідаваная сталінскімі калектывізацыйнымі захадамі. Адсутнасьць прыватнай уласнасьці на зямлю мела велізарны ўплыў на ўсе бакі расейскай гісторыі. У Ангельшчыне кароль склікаў парлямэнт, бо звычаі забаранялі беспасярэдне абкладаць сваіх падданых падаткамі бязь іхнай згоды на тое; чым больш грошай кароне патрабавалася — пераважна на пакрыцьцё бясконцых ваенных выдаткаў, — тым большую ўладу яна мусіла саступіць парлямэнту. Ключавым момантам пры вырашэньні вялікіх канстытуцыйных крызаў XVIII стагодзьдзя, якія выліліся ў сталае перамяшчэньне

заканадаўчых правамоцтваў ад кароны да парлямэнту, быў кантроль за дзяржаўнымі фінансамі, ажыццяўляны ніжняй палатай парлямэнту.
Расейскія цары, наадварот, ня мусілі склікаць ніякіх прадстаўнічых органаў, бо валодалі ўсім. Так званыя земствы, што некаторымі гісторыкамі захоплена параўноўваюцца з заходнімі парлямэнтамі, да апошніх зусім не падобныя: яны ня мелі ніякіх фінансавых паўнамоцтваў і адзінай іхнай задачай было ўхваляць рашэньні, прынятыя ў Крамлі. Улада царскага абсалютызму была, такім чынам, зусім неабмежаванай; яна мела нашмат больш гнятлівы выгляд, чым які заўгодна зь ейных заходніх аналягаў, улада якіх дзейсна абмяжоўвалася існаваньнем прыватнай уласнасьці і павагаю да яе. Самаўладзьдзе ажно да пачатку XX стагодзьдзя здолела захавацца ў амаль ня зьмененым выглядзе дзякуючы таму, што было фінансавана самадастатковым.

* * *

Роля абмежаваньня найвышэйнай палітычнай улады не была адзінай, якую адыграў у гісторыі інстытут уласьніцтва. Вялікае значэньне можна яму прыпісаць і пры ўсталяваньні ўлады закону, што замяніла недасканалую ўладу людзей. Паміж уласьніцтвам і правам заўжды існавала цесная сувязь: адной з характарыстычных рысаў уласьніцтва ёсьць права не дазваляць іншым асобам беспадстаўна ўмешвацца ў маёмасьць дадзенага чалавека. Кажучы словамі Макфэрсана: „Уласьніцтва ад звычайнага часовага ўладаньня адрозьнівае тое, што ўласьніцтва ёсьць прэтэнзіяй, якая будзе адстойвацца грамадзтвам ці дзяржавай, звычаямі, канвэнцыямі ці законам“. Уласьніцтва, такім чынам, ёсьць неабходнай перадумовай існаваньня звычаёвага ці пісанага права, а ўвадначас і ўсяго, што зь ім зьнітоўваецца. Джэрэмі Бэнтам амаль дзьвесьце гадоў таму напісаў: „Уласьніцтва і ўлада былі народжаныя ў адно імгненьне і ў адно імгненьне мусяць памерці. Да таго, як узьнік закон, не было і ўласьніцтва; калі мы адхілім закон, усякае ўласьніцтва зьнікне“.
Цесныя дачыненьні, што існуюць паміж гэтымі дзьвюма інстытуцыямі, таксама высьвятляюць вызначальную ролю, якую ў палітычным разьвіцьці Ангельшчыны і іншых

ангельскамоўных краінаў, дзе прыватная ўласнасьць была разьвітая найбольш поўна, адыгрывалі людзі зь юрыдычнай адукацыяй. Пачынаючы ад сэра Джона Фартэск'ю, які жыў у XV стагодзьдзі, ангельскія юрысты-тэарэтыкі былі сувэрэннымі і найвышэйшымі арбітрамі ў пытаньнях, датычных непісанага статуту іхнай радзімы. Менавіта яны стварылі прынцып — цэнтральны для сучаснае дэмакратыі, — што закон вышэйшы і за ўладара, і за падданага.

У Расеі падобнага разьвіцьця не адбылося. Адсутнасьць прыватнай уласнасьці перашкаджала ўзьнікненьню прававых інстытуцыяў: канфлікты што да зямельнай маёмасьці, якія ў Ангельшчыне XVIII стагодзьдзя складалі пераважную бальшыню ўсіх судовых разбораў, у Расеі вырашаліся афіцыйнымі распараджэньнямі. Думаю, досыць паказальнай ілюстрацыяй ёсьць тое, што незалежныя суды і прававы статус, неабходны для іхнае чыннасьці, у Расеі зьявіліся толькі ў 1864 годзе, то бок у эпоху чыгунак і тэлеграфу. У гісторыі Расеі ніколі не здаралася, каб нехта пытаўся юрыстаў-тэарэтыкаў на іхнае меркаваньне што да канстытуцыйнасьці ўладных захадаў. Канфлікты паміж грамадзянамі і дзяржавай былі рэччу зусім невядомай. Нават у сёньняшняй посткамуністычнай Расеі спробы прыцягнуць урад да суду на падставе абвінавачваньня ў неканстытуцыйных паводзінах ува ўсіх без выняткаў выпадках беспасьпяховыя.

У гэтай сувязі нельга не згадаць пра прыгоньніцтва, якое належыць да згубнай спадчыны патрыманіялізму. Заходняя Эўропа, безумоўна, таксама была знаёмая з прыгонным правам, але тут яно было адной з адзнак фэўдалізму і ў канцы сярэднявечча зьнікла. У Расеі, дзе фэўдалізму не існавала, яно было адзнакай абсалютызму; зьявіўшыся на самым досьвітку сучаснай эпохі, у XVI і XVII стагодзьдзях, прыгоньніцтва было зьліквідаванае толькі ў 1861 годзе. Зважаючы на тое, што цар ад усіх расейскіх памешчыкаў патрабаваў слугаваньня і перадусім удзелу ў фармаваньні ягоных узброеных сілаў, прытым нягледзячы на той факт, што яму не ставала грошай на адэкватнае фінансавае кампэнсаваньне іхных выдаткаў, неабходна было шукаць іншыя мэтады іхнай падтрымкі. Гэтая падтрымка ў краіне, багатай на землі, якой, пры гэтым, было мала працоўнае сілы для іх апрацоўкі, прыняла выгляд мусовае працы сялянаў, прывязаных да зямлі.

Такім чынам, прыгон быў вынікам мусовае службы дзяржаве, абавязак нясеньня якой ляжаў на драбнейшай шляхце. І хоць прыгоньніцтва не было тоесным з рабствам, яно пераняло некаторыя з найгоршых рысаў апошняга: прыгонны таксама меў патрэбу ў законам гарантаваным праве, між іншым, і ў праве ўласьніцкім. Прыгоньніцтва, практычна як і рабства, намаўляла душам сялянаў пагарду да права і ўласьніцтва і выклікала ў іх люты і зласьлівы супраціў да ўсякай аўтарытарнасьці. Што для такога селяніна магла значыць дзяржава, калі адзіным, што ён зазнаў ад яе, было вымаганьне падаткаў і адлічэньняў — і нічога ў адказ?! Апрача таго, прыгон перашкаджаў разьвіццю ў расейскага селяніна пачуцьця патрыятызму — бо як бы ён мог адчуваць сваю свайню зь дзяржаўнымі чыноўнікамі або з памешчыкамі, што абыходзіліся зь ім, як з быдлам?
Цалкам магчыма, што найбольш шкодная частка спадчыны расейскай мінуўшчыны палягае менавіта ў вышэйапісанай праблеме. Расейскі народ не атрымаў аніводнага шанцу, каб у яго разьвілася хаця б нейкая пашана да ўласьніцтва і закону ці ўсьведамленьне нацыянальнае аднолькавасьці. Яму намаўлялася, каб ён — калі няма іншага шляху — слухаўся ўлады або каб супраць яе паўстаў, калі акалічнасьці рабілі гэта магчымым. Аднак выгады і абавязкі грамадзянскай еднасьці былі рэчамі, якіх ніхто яму не паказаў і якія так і засталіся яму чужымі.

* * *

Расейская дзяржава, якая да самага досьвітку сучаснай эпохі існавала ў форме найэкстрэмальнейшага абсалютызму, абапіралася не на мандат выбаршчыкаў, а толькі на сілу. Зважаючы на вельмі нераўнамернае разьмеркаваньне грамадзянскіх правоў між сваімі падданымі, яна нават была ня здольная ўзьдзейнічаць на нацыянальнае пачуцьцё. Імпазантны супраціў расейцаў іншаземным агрэсарам нельга блытаць з патрыятызмам — імі рухала хутчэй не пачуцьцё свайні зь землякамі, а непрыхільнасьць да іншаземцаў, прычым гэтыя пачуцьці звычайна зьнікалі практычна адразу пасьля таго, як вайна пакідала расейскія межы.
Улада, што абапіраецца толькі на сілу, мусіць — бо такая

лёгіка сытуацыі — зноў і зноў падаваць людзям доказ сваёй магутнасьці. Адным са спосабаў, як гэта можна зрабіць, ёсьць тэрытарыяльнае пашырэньне дзяржавы. Велізарныя імпэрыі выбудоўвалі і іншыя краіны, аднак ніводная зь іх не расла так несупынна і за свае заваяваньні не стаяла так люта, як Расея. Паводле маіх разьлікаў, маскоўская дзяржава штогод на працягу 150 гадоў зь сярэдзіны XVI да канца XVII стагодзьдзя заваёўвала тэрыторыю, роўную сваёй плошчай сёньняшняй Галяндыі.

Так, пераважную частку новых земляў складала голая пустка; аднак гэтыя заваёвы мелі велізарны ўплыў на думкі простых расейцаў і давалі ім магчымасьць пышыцца з усьведамленьня, што калі нават іх краіна ня самая багатая і цывілізаваная ў сьвеце, дык, бясспрэчна, самая вялікая. Паэт Міхаіл Лермантаў, што жыў і тварыў у часе здабываньня расейскімі войскамі Каўказу, піша пра расейца, які мусульманскаму ўраджэнцу гор казаў, што той, як толькі трапіць пад царскую ўладу, зможа горда прамовіць: „Так, я раб, але раб гаспадара сусьвету“. Расейскі экспансіянізм і мілітарызм, які быў вытокам першага, мелі — як гэта было і ў іншых выпадках — свае паралелі на Захадзе, аднак у Расеі панятак вялікадзяржаўнага статусу набыў асаблівую значнасьць. Як манархі, гэтак і іхныя камуністычныя наступнікі рабілі сваю ўладу легітымнай, ствараючы вобраз наяўнасьці дзеяздольнай улады. Ці можна было знайсьці лепшы спосаб прышчапіць уласнаму народу пераканаьне пра марнасьць усякага супраціву, як паказаць яму, што Расеі баіцца ўвесь сьвет?

Паміж вялікадзяржаўным статусам Расеі і ейнай унутранай стабільнасьцю такім чынам узьнікла вельмі цесная сувязь. Адной з галоўных прычынаў (навукоўцы, прыхільныя да тэорыі, паводле якой гісторыя разумеецца як бесьперастанная клясавая барацьба, згадваюць яе вельмі рэдка) падзеньня царызму ў 1917 годзе было сталае зьніжэньне праўнасьці ягоных прэтэнзіяў на вялікадзяржаўнае становішча. Гэтае падзеньне было вынікам шэрагу падзеяў: паразы ў Крымскай вайне 1854—56 гадоў; дыпляматычнай паразы, што адбылася па Балканскай вайне 1877—78 гадоў; краху ў канфлікце зь Японіяй у 1904—05 гадох; і, нарэшце, шматлікіх поўных паразаў, якімі расейцаў у часе першай сусьветнай вайны шчодра адорвалі немцы. Манархія ў выніку гэтых горкіх і

зьневажальных падзеяў страціла ў вачох падданых „мандат нябёс“; гэтаму яшчэ больш паспрыяў той факт, што яна ня здолела ўправіцца з радыкальным тэрарызмам, які буяў на яе ўласнай тэрыторыі.
Гэтая гістарычная спасылка, такім чынам, тлумачыць, як сталася магчымым, што з усіх імпэрыяў, якія распаліся па другой сусьветнай вайне, ніводная ня мела такіх цяжкасьцяў з прыстасаваньнем да дэкалянізацыі, як Расея. Вялікабрытанія, чыя імпэрыя калісьці распасьціралася па ўсёй зямной кулі, са сваімі стратамі звыклася хутка; гэтак жа сталася з Францыяй, Партугаліяй і іншымі эўрапейскімі каляніяльнымі дзяржавамі. Каляніяльныя ўладаньні, хоць і былі крыніцай гордасьці, а па магчымасьці й зыску, для гэтых дзяржаваў не былі чыньнікам, які б дапамагаў ім ува ўмацаваньні іхнае ідэнтычнасьці. Напрыклад, у Ангельшчыне пачуцьцё нацыянальнае прыналежнасьці было моцна разьвітае ўжо ў XVI стагодзьдзі, то бок раней, чым яна ўвогуле заваявала нейкія значныя заморскія тэрыторыі.
Аднак жа ў Расеі ўсьведамленьне нацыянальнае прыналежнасьці заўсёды было непарыўна зьвязана зь імпэрыяй; ейная страта выклікала агаломшаньне й вусьціш. Ані раптоўны правал жыцьцёвага роўню, ані размах злачыннасьці не трывожыць сёньня многіх расейцаў больш, і ўвадначас нічога ў іхных вачох не зьніжае так прэстыжу ўлады, як імклівая страта вялікадзяржаўнага статусу. Іх краіна, якая за камуністамі была супэрдзяржавай і раўнацэнным супернікам Злучаных Штатаў, сёньня — як ім падаецца — успрымаецца як краіна трэцяга сьвету, як пакорны прымальнік вялікадушнай дапамогі Захаду. Значная частка прыцягальнасьці камуністычна-фашыстоўскай кааліцыі вынікае менавіта зь ейнае абяцанкі зноўку здабыць для Расеі статус шанаванай (іншымі словамі такой, што наводзіць страх) вялікай дзяржавы.

* * *

Гэта што да мінуўшчыны Расеі. А што ж яе чакае ў будучыні? Пачуцьцё выключнасьці і, увадначас, ізаляванасьці, якое расейцы ўспадкавалі ад праваслаўнай царквы, на жаль, жывое. Сёньняшнія расейцы ўсё яшчэ пачуваюцца жыхарамі нейкай ускраіны, народам *sui generis*, які не належыць ані Эўропе, ані

Азіі. У стаўленьні да іншаземцаў праяўляецца моцная параноя: якімі б ні былі іхныя ўзаемíны, расейцы, нягледзячы ні на што, мяркуюць, што Захад утварае варожы блёк, які пэўна наважаны так ці інакш Расею „здабыць“. Напрыклад, паводле нядаўняга апытаньня грамадзкага меркаваньня, 60% расейцаў вераць, што заходнія дзяржавы прапаноўваюць Расеі эканамічныя рады (а, праўдападобна, і дапамогу) толькі таму, каб краіну аслабіць.

Дзеля ілюстрацыі гэтага шырока пашыранага меркаваньня я б хацеў тут прывесьці адно маё ўласнае ўражаньне. Некалькі гадоў таму мне пашчасьціла ўдзельнічаць у Швайцарыі ў канфэрэнцыі, на якую зьявіўся і адзін расейскі ўрадавы функцыянэр. За абедам, седзячы паміж двух расейскіх пасланцоў, ён скардзіўся, што заходнія дзяржавы змовіліся не дапусьціць ягоную краіну на міжнародныя рынкі. У якасьці доказу ён прывёў факт, што ў папярэднім годзе Расея закупіла 600 тысячаў японскіх аўтамабіляў, тымчасам як Японія іх з Расеі імпартавала толькі 20 тысячаў. Ані розьніцы ў якасьці расейскіх і японскіх машын, ані вострай і бескампраміснай канкурэнцыі паміж японскімі і амэрыканскімі аўтавытворцамі, што суправаджаецца амэрыканскімі нараканьнямі на закрытасьць японскага рынку, ён заўважаць не жадаў. Адзінае, што ён бачыў, былі „яны“, якія зрадзіліся супраць „нас“.
Хай такія падазрэньні і ірацыянальныя, адчуваньне, што Расея знаходзіцца ў абцугох варожага Захаду, надзвычай актуальнае. Расейская параноя жыве ўласным жыцьцём: пацьверджаньня сваіх поглядаў шукае і знаходзіць ува ўсім, што б ні здарылася, прычым пажыўную глебу дало ёй перадусім нядаўняе рашэньне Захаду пашырыць NATO да самых межаў былога Савецкага Саюзу. Гэты крок выклікаў у расейцаў глыбокі страх, а да таго ж узмацніў іхнае перакананьне, што нягледзячы на іх самаабвешчаньне прыхільнікамі дэмакратыі і рынкавай эканомікі, іншыя лічаць іх проста парыямі, ня годнымі паўнавартаснага сяброўства ў супольнасьці нацыяў. Я ня ведаю ніводнага расейца, без увагі на палітычную прыналежнасьць, якога б пашырэньне задавальняла. Якраз наадварот: плянаваньне пашырэньня NATO грае на руку нацыяналістам, якія карыстаюцца страхам перад Захадам і сьцьвярджаюць, што Расея — калі ёй суджана выстаяць у гэтым варожым сьвеце —

мусіць прыступіць да аднаўленьня сваёй імпэрыі і адбудовы ўзброеных сілаў.
Гэта некаторыя з чыньнікаў, якія робяць цьмянымі далейшыя пэрспэктывы ў міжнародных дачыненьнях. Аднак велізарныя цяжкасьці Расеі даводзіцца пераадольваць і дома: усё адно, ідзецца аб пераходзе ад таталітарызму да дэмакратыі ці ад плянавай эканомікі да эканомікі рынкавай. Як дэмакратыя, гэтак і рынкавая эканоміка, абедзьве гэтыя характарыстычныя рысы сучаснай эпохі забясьпечваюцца існаваньнем прыватнай уласнасьці і пастуляванаю ёй уладай закону, якія, як мы ўжо ведаем, ня маюць глыбокіх каранёў у расейскай культуры.
У апошнія пяць гадоў мы былі сьведкамі ліхаманкавага падзелу маёмасьці, манапольным уласьнікам якой была камуністычная партыя. Па роспуску апошняй гэтая маёмасьць сталася нічыйнай. Аднак падзел, які хутчэй быў падобны да раскраданьня і зь якога ў пераважнай ступені нажыліся старыя камуністычныя апаратчыкі, дагэтуль ніякім чынам не падняў павагі да прыватнай уласнасьці. Па-першае, тут мае значэньне тое, што нованабытая маёмасьць была атрыманая з дапамогаю сродкаў, якія знаходзіліся па-за рамкамі закону. А па-другое, новыя ўласьнікі нерухомасьці і прамысловых прадпрыемстваў нярэдка распрадаюць іх за даляры, якія потым вывозяць з краіны і ўкладаюць у замежныя банкі. „Прыватызацыя“ такога кшталту не прыносіць расейскай эканоміцы практычна ніякай карысьці і толькі ўзмацняе пашыранае меркаваньне, што капіталізм і спэкуляцыя — тоесныя паняткі.
Вядома ж, нават у падобных працэсах можна знайсьці пазытыўныя аспэкты. Перавод нацыянальнага багацьця ад дзяржавы ў прыватныя рукі хутка прагрэсуе: з прыватнага сэктару сёньня выходзіць ці ня тры чвэрці расейскага ВУП. Інакш кажучы, дзяржава эканоміку ўжо не кантралюе, а значыць і ня можа ўжываць яе ў якасьці зброі для падпарадкаваньня сабе грамадзтва. Да таго ж кожны ўласьнік нейкай маёмасьці беспасярэдне зацікаўлены ўва ўладзе закону — прынамсі, да той ступені, да якой яму гэта выгадна. Бо нават тады, калі ён сваё багацьце нажыў незаконна, ён спадзяецца, што закон ягоную маёмасьць абароніць. Цалкам магчыма, што Барыс Ельцын і рэфарматары, якімі ён да нядаўняга свайго ўхілу ўбок быў аточаны, наўмысна падтрымлівалі прыватызацыю ў імкненьні стварыць непераадольныя

перашкоды для кожнага, хто б пажадаў аднавіць камунізм. Пакуль, аднак, новы парадак мяжуе з анархіяй. Сталася ўжо традыцыяй, што расейскія ўлады адмаўляюць грамадзянам у праве мяшацца ў дзяржаўныя справы. Палітыка абмяжоўваецца выкананьнем афіцыйных рашэньняў; закон у Расеі — хутчэй ня прынцып, які мусіць стаяць па-над уладаром ды падданым і быць абавязковым для абодвух, а толькі адміністрацыйны інструмэнт. У выніку гэтага расейская дзяржава кожнага разу, калі ёй не стае фізычнае сілы, каб прымусіць выконваць свае дырэктывы, фактычна стаецца імпатэнтам.

Вось якое становішча склалася за апошнія пяць гадоў. Парлямэнт ня мае на рашэньні Крамлю ніякага ўплыву; галасаваньні ў ім у найлепшым выпадку ёсьць паказьнікам настрояў грамадзтва. Дума, ніжняя палата парлямэнту, складаецца з індывідуальна неадказных палітыкаў, галоўны інтарэс якіх — даць ход сваім асабістым і грамадзкім пачуцьцям фрустрацыі. Ня так шмат часу мінула, калі істотная частка Думы папросту ігнаравала ўсякія канстытуцыйныя нормы і галасавала за скасаваньне дамовы, падпісанай расейскім прэзыдэнтам у канцы 1991 году, паводле якой Савецкі Саюз спыняў сваё існаваньне, а ўзьніклым па яго распадзе рэспублікам гарантавалася незалежнасьць. Гэта практычна тое самае, як калі б брытанскі парлямэнт абвесьціў Канаду ці Індыю тэрыторыяй, залежнай ад Ангельшчыны і падпарадкаванай ейным законам.

Сучасная Расея ёсьць хутчэй не адзінай, агульнай дзяржавай, а аб'яднаньнем 89 квазісувэрэнных гаспадарстваў, рэгіёнаў, фармальна прывязаных да Масквы, але насамрэч занятых уласнымі правінцыйнымі інтарэсамі. Губэрнатары… дзейнічаюць як самаўладцы і ўказаньняў з цэнтру прытрымліваюцца акурат у той ступені, у якой гэта ім выгадна. Вядома нямала фактаў, калі губэрнатары, што ў сваім рэгіёне маюць вялікую папулярнасьць, адмаўляліся ісьці на саступкі Маскве.

З вышэйсказанага можна зрабіць выснову, што асноўны дзейсны сродак, які Маскве застаецца, — гэта фінансы, найперш вылучэньне субсыдыяў правінцыям (адна зь нямногіх магчымасьцяў кантролю, якую цэнтар дагэтуль мае ў сваім распараджэньні), замежныя пазыкі і друк банкнотаў. Крэмль кантралюе і бальшыню тэлеканалаў; ён скарыстоўвае гэта

дзеля падтрымкі наяўнага прэзыдэнта. Што да астатняга, можна сказаць, што расейскі ўрад практычна не існуе. Насельніцтва, якое — калі нейкую вышэйшую ўладу ўвогуле прызнае — прыслухоўваецца да мясцовых прадстаўнікоў, а ўрадавыя дэкрэты пераважна ігнаруе. Ясным доказам служыць той факт, што прэзыдэнт Ельцын няздольны кантраляваць нават уласныя ўзброеныя сілы: ягонае ўрачыстае абяцаньне, асабіста дадзенае пры канцы сакавіка з тэлеэкрану**, што расейскія вайскоўцы неадкладна скончаць баявыя апэрацыі ў Чачэніі, упала на неўрадлівую глебу.
** *Гаворка ідзе пра сакавік 1996 г. — Рэд.*

* * *

Палітычная сытуацыя ў Расеі — беручы ўвогуле — моцна нагадвае становішча, якое пераважала ў пэрыяд паміж адрачэньнем цара ў лютым 1917 году і бальшавіцкім путчам у кастрычніку таго самага году, — з той важкай розьніцай, што сёньня Расея не знаходзіцца ў стане вайны і ўтапічныя фантазіі ўжо ня могуць зачараваць ані інтэлігенцыю, ані масы. Тым ня менш, як і ў сфэры эканамічнай, карціна ўвогуле зусім не такая змрочная. Сучасны ўрад у гісторыі Расеі першы, які можа ганарыцца народным мандатам; наяўны прэзыдэнт быў абраны ўсеагульным галасаваньнем, а канстытуцыю ўхваліў усенародны рэфэрэндум. У краіне, дзе ўладу традыцыйна здабывалі не кансэнсусам, а толькі спадчынна ці ў выніку дзяржаўнага перавароту, такая легітымнасьць беспрэцэдэнтная. Нарэшце расейцы займелі магчымасьць збудаваць жыцьцяздольную дэмакратычную дзяржаву.
Ці будуць яны здольныя гэтай магчымасьцю скарыстацца, пакажа час. Многія расейцы верылі, што Ельцын захавае свае пазыцыі незалежна ад таго, хто выйграе прэзыдэнцкія выбары. Дасьледаваньні грамадзкай думкі, праведзеныя ў першым квартале гэтага году, выявілі дзіўную супярэчнасьць: колькасьць выбарцаў, якія сказалі, што аддадуць свой голас лідэру камуністаў Зюганаву, штомесяц расла, і адначасова практычна аднолькавым тэмпам мацнела і перакананьне, што Ельцын і надалей застанецца галавою дзяржавы.
Увесь час жывыя сумненьні што да будучыні Расеі ў пераважнай ступені вынікаюць з палітычнае недасьведчанасьці

расейскага люду. За камунізмам „выбары“ былі проста пустой урачыстасьцю, ад якой адно вымагаўся ўдзел 99 % выбаршчыкаў, якія б пацьвердзілі сваё задавальненьне наяўным становішчам. Апошнія сапраўдныя выбары з удзелам некалькіх партыяў адбываліся ў Расеі ў дакамуністычны пэрыяд, яшчэ ў лістападзе 1917 году, калі 44 мільёны выбаршчыкаў, старэйшых за дваццаць гадоў, абіралі сваіх прадстаўнікоў на Ўстаноўчы Сход. Гэта значыць, што ў 1991 годзе, калі адбываліся наступныя дэмакратычныя выбары, пэўны досьвед у свабодным абіраньні кандыдатаў, партыяў і партыйных праграмаў мелі грамадзяне ў веку 94 гадоў і большым.

Недасьведчаны электарат мае схільнасьць хутка зьмяняць свае палітычныя прыхільнасьці. Сёньняшнія расейцы чакаюць, што галава іхнай дзяржавы будзе некім накшталт чараўніка: яны гатовыя даверыць яму неабмежаваную ўладу, і ён, вядома, мусіць ужыць яе дзеля вырашэньня ўсіх іхных праблемаў, але хутка і безбалесна. А дзеля таго, што ў рэальным жыцьці дзівосаў не бывае, заканамерна надыходзіць расчараваньне. Так сталася ў канцы восемдзясятых гадоў за Міхаіла Гарбачова, чыя папулярнасьць у той момант, калі выявілася, што перабудова не вырашае ўскладаных на яе задачаў, рэзка зьнізілася; здарылася так і за Ельцына; і беспахібна зноў сталася б у тым выпадку, калі б быў абраны, скажам, Зюганаў. Раней ці пазьней — баюся, праўда, што хутчэй гэта будзе пазьней, чым раней, — расейцы нарэшце ўсьвядомяць, што ад іхных праблемаў няма хуткіх лекаў і што перад імі ляжыць надзвычай складаная задача збудаваньня сучаснай дзяржавы і сучаснай эканомікі ад самых падмуркаў. А датуль мы будзем сутыкацца з такім нясьпелым і наіўным электаратам, які існуе цяпер; калі верыць дасьледаваньням, адзін зь дзесяцёх выбаршчыкаў хацеў бы ўшанаваць прэзыдэнцкай пасадай блазна і крыкуна Ўладзімера Жырыноўскага, аўтара палітычнага трактату пад назвай „Пляваць на Захад“.

* * *

Дык запытаймася ж: калі ўзяць усё вышэйсказанае пад увагу, наколькі вялікая небясьпека таго, што дойдзе да аднаўленьня камунізму і камуністычнай імпэрыі? Ці ўдалося б камуністам

павярнуць хаду гісторыі, калі б яны перамаглі ў прэзыдэнцкіх выбарах?

Афіцыйная праграма камуністычнай партыі, створаная на пляцформе заходнеэўрапейскай сацыяльнай дэмакратыі, здаецца абсалютна бяскрыўднай. Яна канкрэтна дыстанцыюецца ад усякага жаданьня ўвесьці ў практыку асноўныя прынцыпы камунізму і перадусім ад скасаваньня прыватнай уласнасьці. Аднак ёсьць намінкі, што гэтая афіцыйная праграма — адно шырма, за якой схаваныя сапраўдныя намеры камуністаў. У расейскім палітычным жаргоне для яе існуе прыдатнае вызначэньне „праграмы-мінімум“, то бок беспасярэдне ажыцьцяўляльнага пляну, за якім свайго шанцу падпільноўвае канчатковая мэта — „праграма-максымум“.

Як бы такая праграма-максымум выглядала ў эканамічнай сфэры, абсалютна ясна паказвае законапраект аб эканамічнай рэформе, які нядаўна прапанавала камуністычная фракцыя ў Думе. Гэты закон выразна пашырыў бы ролю дзяржавы ў кіраваньні эканомікай, а на прыватнае прадпрымальніцтва наклаў бы строгія абмежаваньні. Валоданьне зямлёй сталася б незаконным, цэны падлягалі б рэгуляваньню, замежныя інвэстыцыі трапілі б пад строгі кантроль. Эканоміка як цэлае зноў была б падпарадкаваная пляну. Што да палітычных намераў камуністычнае партыі, тыя пакуль ясна не фармуляваліся, аднак мы можам з пэўнасьцю меркаваць, што і іхным узорам была б мінуўшчына.

Няма сумневаў у тым, што перамога камуністаў у расейскай эканоміцы выклікала б значныя зьмены: імклівую інфляцыю, назапашваньне неліквіднай прадукцыі, зьніжэньне, а, магчыма, і спыненьне замежных інвэстыцыяў. Мне ўсё ж вяртаньне да камунізму здаецца крайне непраўдападобным. Камунізм ня быў толькі ідэалёгіяй; ён быў комплекснай зьявай, складзенай з розных узаемна зьвязаных інстытуцыяў, да якіх належыць улада адной партыі, паліцыйны тэрор, дзяржаўная манаполія на сродкі вытворчасьці і адукацыйную дзейнасьць, рэлігійны ўціск і гэтак далей. Камунізм атамізоўваў грамадзтва, а людзей пазбаўляў права ўтвараць незалежныя аб’яднаньні нават самага бяскрыўднага кшталту.

Увядзеньне такога рэжыму забрала ў расейскіх камуністаў два дзесяцігодзьдзі, ад 1917 да 1937 году: дваццаць гадоў,

запоўненых рэвалюцыяй, грамадзянскай вайной, калектывізацыяй і масавымі забойствамі, якія эўфэмістычна называліся „чысткамі“. Абсалютна немагчыма ўявіць, каб які заўгодна расейскі ўрад мог сабе падначаліць грамадзтва так, як гэта было раней. Нават калі дапусьціць, што назад, у таталітарызм, можна было б загнаць старэйшае пакаленьне, звыклае да падпарадкаванага становішча, усё ж такі расейская моладзь да трыццаць пяцёх гадоў, якая, паводле ўсіх сьведчаньняў, да ўсякай ідэалёгіі ставіцца празь меру скептычна, не скарылася б да слугаваньня дзяржаве. Мы можам адно здагадвацца, наколькі магутнай была б хваля супраціву, што супраць падобнае спробы ўзьнялася б сярод чальцоў клясы новых уласьнікаў (значную частку якіх утвараюць былыя камуністычныя функцыянэры), якія б сваю сьвежанабытую — незалежна ад таго, законна ці не — маёмасьць адназначна не саступілі бяз бойкі.
Памяркоўнейшая ж форма камунізму папросту немагчымая. Камуністычны рэжым мусіць быць адзіным: ён ня можа дазволіць сабе трываць нават абмежаванага ў аб’ёме прыватнага ўласьніцтва ці свабоднага выказваньня думак. У канцы восемдзясятых гадоў мы былі сьведкамі таго, што вынікам марных намаганьняў Міхаіла Гарбачова ўнесьці ў сыстэму пэўную ступень свабоды і ажывіць такім чынам значна пачэзлую эканоміку быў хуткі развал Савецкага Саюзу. Няма ніякіх падставаў верыць, што б наступная спроба злучыць камунізм з элемэнтамі капіталізму аказалася больш пасьпяховай.

* * *

Праўдападобна, такім чынам, што Расея без увагі на тое, хто стаўся пераможцам нядаўніх прэзыдэнцкіх выбараў, будзе доўга яшчэ патанаць у хаосе, уласьцівым псэўдадэмакратычнаму і квазікапіталістычнаму рэжыму. Паводле ўсяго, найгоршым варыянтам, які можа настаць у сапраўднасьці, ёсьць усталяваньне аўтарытарнай улады, якая хоць і ліквідуе палітычнае суперніцтва і будзе ўладарыць праз дэкрэты, але ўвадначас будзе трываць значную эканамічную і нават інтэлектуальную свабоду. За ўзор тут можна скарыстаць прыклад піначэтаўскага Чылі, які ў сёньняшняй Расеі мае

немалую колькасьць прыхільнікаў. Вельмі праўдападобна, што такі рэжым быў бы пераходнай формай, але не да таталітарызму, а да дэмакратыі.
Аднаўленьне імпэрыі — нягледзячы на ўсю тую настальгію, зь якой пра яе згадваюць расейцы — таксама нам падаецца досыць непраўдападобным. Досьвед заходніх імпэрыялістычных дзяржаваў паказвае, што калёніі, атрымаўшы незалежнасьць, назад ужо не павернуць. У кожнай вызваленай калёніі разьвіваецца ўласная эліта, што будзе мець выключнае зацікаўленьне ў наколькі магчыма вечным захаваньні правамоцтваў і прывілеяў, атрыманых ёй дзякуючы незалежнасьці. Наўрад ці чыноўнікі, што сталіся міністрамі, або сяржанты, зь якіх атрымаліся генэралы, пакорліва б вярнуліся да свайго былога становішча. Зьмяняецца і структура экспарту і імпарту, агмень якіх перасоўваецца ад былой мэтраполіі да іншых краінаў; разам з гэтым зьмяняецца і ўся эканоміка. Гэтыя меркаваньні падказваюць, што новыя самастойныя рэспублікі пад панаваньне Масквы можна было б вярнуць хіба грубай сілай. А гэтае сілы Расеі не стае: ясным доказам таму служыць яе няздольнасьць падначаліць сабе мініятурную Чачэнію.
Безумоўна, магчыма, што Масква, дзякуючы камбінацыі мэтадаў эканамічнага перніка і бізуна і скарыстаўшы прыцісканае становішча расейскіх мяншыняў, што жывуць у „блізкім замежжы“, магла б загнаць адшчэпленыя рэспублікі ў цясьнейшы саюз. Але ўсё ж такі складана сабе ўявіць, як дзякуючы гэтаму можна было б аднавіць саму імпэрыю. Такі крок патрабаваў бы такіх жа манумэнтальных намаганьняў, як і дзеля аднаўленьня камунізму.
Падсумоўваючы, можна сказаць, што ў нас ёсьць падставы для асьцярожнага аптымізму. Цяжар гісторыі сапраўды вельмі прыгнятае Расею, чым толькі замаруджвае ейнае разьвіцьцё, аднак не асуджае краіну на нерухомасьць. Надзея, якую нашу ў сабе асабіста я, абапіраецца на меркаваньне, што Расея, краіна, што прэтэндуе на становішча прызнанай сусьветнай супэрдзяржавы, не захоча застацца ўбаку ад сьвету XXI стагодзьдзя.
Пераклаў з ангельскай Сяргей Сматрычэнка паводле Commentary 6/1996.

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**

Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000
гісторыі

Адам Глёбус
Шавініст расейскі

Адам Глёбус, літаратар і выдавец, мастацкі рэдактар часопіса ARCHE, адыграў рэвалюцыйную ролю ў разьвіцьці беларускага мастацтва, паэзіі, прозы і выдавецкай справы 80-х і 90-х. Апошнія кнігі — “Новы дамавікамэрон” (“Літаратура”, 1998; у польскім выданьні “Demonokameron”, ZBP, 1998), “Кантамінацыі” (“Наша Ніва”, 1999). У 1999 годзе выйшлі таксама ягоныя апавяданьні “Пачварнік” і “Графітыст” (“Наша Ніва”), “Прымусь сябе жыць у Лагойску” (“Маладосць”). Сярод рэалізаваных за апошні год расейскамоўных выдавецкіх праектаў — фундамэнтальныя “Классики философской мысли”, “Библиотека лирики”, “Мастера культуры”. У ARCHE-“Кабеты” было надрукаванае ягонае эсэ “Яна і я”, а ў ARCHE-“Паталёгіі грамадзтва” — аўтапартрэтнае апавяданьне “Выдавец”.

У раённым судзе абвясьцілі прысуд Шавіністу. Як на тое, што ён утварыў, далі зусім мала: тры з паловаю гады ўмоўна. Шавініста вызвалілі з-пад варты.

А пачалася гісторыя з арыштам позна ўвечары. Шавініст паліў кніжкі. Са злаьслівай радасьцю ён абдзіраў вокладкі, рваў старонкі й шпурляў у полымя. Языкі агню зь лёгкім пошумам танчылі на кардоне з папераю.

— Усё агнём пойдзе! Вось вашае месца, беларуска-жыдоўскія літаратары! Гарыце вы ясным полымем, жыды з паджыдкамі! Інародцы паскудныя, панапісвалі маразмаў, столькі паперы перавялі, на паразуменьне спадзяваліся! Трасцы вам у рэбры, — рудабароды Шавініст пашураваў у грубцы доўгай чапялою.
— Усё спалю да апошняга слоўца, да астатняй кропкі, да перадсьмяротнай думкі. Пыл і забвеньне, такі лёс чакае ўсё нярускае на гэтых землях…
Шавініст, на гора сабе, быў адукаваны, меў пасаду дырэктара мастацкай акадэміі, жыў у трохпавярховым асабняку ў цэнтры сталіцы. Меў ён сабаку, бацьку-акадэміка, высозны плот вакол дома й садзік: тры крывыя яблынькі, сьліву і грушу. Сад зьдзічэў, але штовосень колькі жаўтабокіх антонавак зьяўляліся на галінах.
Дробныя яблыкі й заманілі ў сад трох школьнікаў-пяцікласьнікаў. Дзеці выбілі дошку ў плоце. Улезьлі ў сад. Двое сталі пад яблыняю, а трэці ўскараскаўся на дрэва й паспрабаваў стрэсьці пачастункі.

Сабака, што жоўтым вокам сачыў за зьніштажэньнем жыда-беларускіх кніжак, пачуў чужынцаў, ускінуўся й зайшоўся густым брэхам. Шавініст сыкнуў на сучку й загнаў у пакой, а сам пракраўся ў сенцы, надзеў ватоўку, у кішэні якой хаваўся рэвальвэр.
— Ну, жыдава з бульбашамі, я вам зараз уляплю, — пырскаючы прасьпіртаванай сьлінаю, прасіпеў Шавініст і выскачыў на ганак з узьнятым над ускудлачанай галавою пісталетам.
На судзе самы меншы з хлопцаў скажа, што зусім не спалохаўся п'янога барадатага дзядзькі, які выйшаў з дому з цацачным, падалося, рэвальвэрам. Дзядзька хістануўся, яго павяло, і ён паваліўся на кветнік. Вядома, хлопчык схлусіў. Якраз ён перапалохаўся болей за астатніх, бо не пачаў сьмяяцца, а матануў да дзіркі ў плоце. Баязьлівасьць ратуе. Два сьмялейшыя пачалі гігікаць з п'янога рускага Шавініста. Той падняўся зь зямлі, навёў рулю на дзіця, што сядзела на яблыні, і стрэліў. У доме зайшлася брэхам пакінутая сучка.
У залі суду хлопчык з забінтаванай галавой раскажа: як спалохаўся настаўленай рулі, як паспрабаваў схавацца за галіну, як убачыў іскры. Як звалiўся з дрэва й апынуўся ў

бальніцы — ня памятае.
Шавініcту пашанцавала. Бацька-акадэмік наняў найлепшага сталічнага адваката. Той пераканаў судзьдзю, што Шавініст патрапіў у хлопчыка выпадкова. Дзіўным чынам са справы зьнік эпізод бойкі Шавініста зь міліцыянтамі. Стары дасьведчаны адвакат-яўрэй выратаваў ад турмы Шавініста расейскага. Нашто?

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **4-03-2000**

Ігар Сідарук
Выкраданьне вепрука
Усім, хто пра смаленьне вепрука пісаў, прысьвячаецца

Ігар Сідарук - празаік-фантасмагорык, драматург-сюррэаліст, выказьнік маргінальнай сьвядомасьці, майстар чорнага бурлеску, жыве ў Кобрыні, працуе ў берасьцейскім Тэатры лялек. У 1999 годзе выйшлі ягоныя апавяданьні "Бабусечкі" ("Калосьсе"), "Каравайчык-34" і "Сажалка" ("Крыніца"), "Аўтобус колеру бэз" ("Наша Ніва").

Грысь Чаравячка ўвесь Божы дзень ды добры жмут ночы жлукціў каламутную первачыну. Трэба сказаць, што жлукціў ён яе і дзень таму, і тыдзень, і месяц, і яшчэ шмат-шмат гадоў да тых знамянальных падзеяў, якія неўзабаве разгорнуцца перад ягоным займглістым позіркам і пра якія ён нават яшчэ й не здагадваецца.

Не здагадваецца разам зь ім і ягоная жонка Марыля Чаравячка. Праўда, хоць тая ж сівая первачына была для яе не такое прыцягальнае смакаты, як для Грыся, аднак і гэтую сухастойную ды заўважна струхлелую кабетухну ніводная лішняя шклянка наравіла не прамінуць. А пакуль самлелая ад усё ж такі залішняе дозы гарэлкі Марыля пахропвае на ўзбуранай бруднай канапе за сьпінаю Грыські, сам ён,

акуліўшы ў гарапашнае сваё нутро немаведама якую па ліку шклянку, гучна гэпае кулачочкам па сталешні ды таксама з каторы ўжо раз ускрыквае гучна-горка:
— От, сучка!
Сучкаю была іхная шалапутная дачка Наталка. Толькі ўвесну яна бразнула клямкаю адзінаццацігодкі, ледзь дацягнуўшы да паўнасталага атэстату, як ужо ў ліпені ёй заманілася выскачыць замуж. Ды як мага хутчэй, хоць ты разьбіся, каб, значыць, ані хвіліны болей не заставацца ў роднай бацькоўскай хаце!.. Бо тут, бач ты на сучку, як ужо ванітуе. Бо тут і не жыцьцё зусім, а нейкае п'янотнае гарыва. Бо тут нават прыстойна паесьці — і тое няма як. Бо тут хоць якая лішняя тысяча ўперваецца ў цукар ды дрожджы, а яна вымушана даношваць-пераношваць сукенкі яшчэ з восьмае-дзявятае клясы. Добра!.. Грысь, можа б, іншым разам і прамаўчаў, бо ці мала якое лухты ў дурной сваёй гарачцы маладыя не намалоцяць. Але ўсё ж тое Наталка выдала ім толькі сёньня. Малочна-туманнаю раніцою, калі прывалаклася невядома адкуль, уся бы ў апараным летуценьні, яны дружна накінуліся на яе: „Дзе ты, блядзючка падкалодная, перакочвалася?!“ Грысь нават хапянуўся за сукаватую паляняку, ды Наталка раптам цопка перахапіла ягоную руку, выкруціла паляняку ды, сама замахнуўшыся, зьмяюкаю сыкнула ашаломханаму бацьку ў твар:
— Ану, сьціхніце!
— Што??! Ах ты, блядзючка!.. — здаецца, больш спуджана, чым злосна, агрызнуўся Грысь.
— Яшчэ раз назавеце „блядзючкаю“ — не пагляджу, што бацька, так вось гэтым сукам у лабэшню і ўперу!.. — па ўсім было відаць, што жартаваць у Наталкі не было аніякіх намераў.
— Намеры ў яе былі нашмат шырэйшыя ды глябальнейшыя. Пра гэта яна й паведала, не зыходзячы зь месца ды ўсё яшчэ трымаючы ў руцэ паляняку:
— Рыхтуйцеся, заўтра сваты прыедуць.
— Якія… сваты? — схапілася скручанымі пальцамі за свае асьмяглыя, патрэсканыя вусны Марыля.
— Звычайныя, з ручнікамі. Замуж я выходжу, — канстатавала, як неабвержны факт, Наталка ды адкінула, нарэшце, прэч бярозавую сукаватку.
— Га! — раптам, бы дурны, рагатнуў Грысь. — За каго?

— А… — сьцепанула плячыма дачка. — Вы ўсё роўна ня ведаеце.
— А нас ты спытала? — імкнучыся напоўніць праўдзівай пагрозаю свой голас, толькі хрыпла вычавіла зь сябе Марыля.
— Не пытала й пытаць не хачу, — зноў сказала, як адрэзала, Наталка, накіроўваючыся да ганку.
— Ну, тваю ж маць!.. — штурхануў Грысь нагою струхлелую калоду. Лёгкая, тая адразу перакулілася ды адчувальна выцяла Грыся па той самай назе. — Ты што гэта, сур'ёзна?
— Сур'ёзьней не бывае, — абярнулася, ужо стоячы на парозе, Наталка. Так што рыхтуйцеся, — зноў паўтарыла, як загадала, яна. — У суботу вясельле.
— А во табе вясельле! — скруціў раптам зьверскую дулю Грысь, падскочыў да Наталкі ды сунуў тую дулю ёй проста ў нос. — Во! Во!..
— Пачакай ты, дачушка… — усё ніяк не магла пакінуць у спакоі свае перасьмяглыя вусны Марыля, гэтак жа нэрвова цярэбячы іх пальцамі. — Ты ж кажаш, заўтра сваты толькі прыедуць…
— Заўтра сваты прыедуць, а вясельле — у суботу! — рашуча ўзялася за клямку дзьвярэй Наталка, ані не зьвяртаючы ўвагі на зьверскія бацькавы дулі. — Мы з Алікам усё ўжо рашылі.
— З Алікам? А хто гэта? — няўцямна ўстаўбурыла на яе маленькія сьлязьлівыя вочы маці.
— Жаніх мой, мама. Гарадзкі ён… Ад яго сваты заўтра й будуць. У суботу — вясельле.
— А чаго так хутка? А чым жа іх сустракаць? А дзе ж жыць вы будзеце? — неспакой усё болей апаноўваў хоць і прашпіртаванае, аднак усё такі матчына сэрца Марылі. І тут нечакана здагадка наскрозь працяла ўсё тое ж дрыжачае сэрца. Марыля прыкусіла ражок бруднай хусьцінкі: — Вой, Наталка, ты бярэмянная, ці што?..
— Байстручка нагадавала, бля… — ужо было зноў ледзь не зьляцела запаветнае слоўка Грыські, ды красамоўны доччын пагляд на адкінутую сукаватку своечасова яго спыніў.
— А ня вашая справа, — нават не міргнула на гэта Наталка. — Ня схочаце вясельля тут — у Аліка справім. А сваты заўтра прыедуць па-любому. Хочуць зірнуць, як мы жывем тут. Ну, і з вамі, значыцца, пазнаёміцца. Ха, было б з кім…
— Ты як на бацькоў, га? — дапытвала сваё Марыля.

— Вой, мамка! Бярэменная ці не бярэменная — гэта ўжо час пакажа… — неяк задумна-мэлянхалічна сказала Наталка ды памкнулася ступіць у чарноцьце роднае хаты. Але затрымалася, бо пачула, як маці выпусьціла з грудзёў сакрушальны ўздых:
— Ды чым карміць-та, сватоў гэных?..
— На гарэлку грошы знаходзіце, то й на закуску знойдзеце, — як адрэзала Наталка ды ўрэшце бразнула за сабою дзьвярыма.
— От, сучка! — зноў бабохнуў кулаком па стале Грысь. Аднак на гэты раз троху цішэй, бо да гэтага часу зьбіў той надта ўжо абы-які кулачок на горкі яблык.
Асабліва муляла Грысю зусім ня тое, што дачка вырашыла выскачыць замуж, ані не зважаючы на бацькоўскае меркаваньне. І ня тое, што ён, Грысь, і блізка ня бачыў на вочы таго самага гарадзкога Аліка-жанішочка. І нават ня тое, што маладыя ўсё вырашылі-разьмеркавалі бяз хоць бы якога іхнага саўдзелу. Асабліва рэзалі яму, бы вузельчыкі на гумцы ў дзіравых трусах, Наталчыны словы пра грошы, што знаходзяцца на гарэлку, і якіх вечна бракуе на харч.
Што яна, дурніца даўгалыгая, ведае пра грошы?! І што пра гарэлку? Бач, сорам ёй вочы коле, што бацькі п’юць. Хай пажыве зь іхнае, Грысева ды Марылінае, невядома яшчэ… як сама… можа, болей за іх будзе. Дый хіба яны п’юць?! Так, выпіваюць. Як і ўсе нармальныя людзі, ня больш і ня менш. А яна!.. бач ты на яе!.. „Знаходзіце грошы!… то знойдзеце й на харч!..“
Ён што — тыя грошы, бы клёпкі, кляпае? Ці яму ў рот зь неба крупы-кіўбасы валяцца? Ён жа не куркуль які, бы той суседзік ягоны, Андрэй Шупейка. Тры кіёскі з парфумаю-чакалядамі пасярод мястэчка трымае ды яшчэ парачку адкормных парсючкоў у хлеўчуку на падворку дзержыць. І што? Жонка ягоная, Верка, кажуць, зьбіраецца ад яго ўцякаць. Надта ж Андрэй, бы жаба ў балота, у палітыку прэцца. І начальства местачковае ў яго ледзь не штодня па вечарох кватаруе. І сам ён, як толькі вольны выходны выпадае, у сталіцу матаецца (куды й каго толькі, цікава, цікава!..). І нават местачковыя знаўцы цьвердзяць, што як была пяць год таму першая прэзыдэнцкая кампанія, нібыта Андрэйка самага апальнага кандыдата як мае быць падтрымаў. І ня толькі грашыма, а яшчэ тым-сім. О, ці не да яго цяперака першы куркуль местачковы й матаецца? Ну, то ня дзіва, што справы ягоныя… бы хер у

масьле… а тут!.. хоць ты зачавіся!.. Сваты, бляха!.. Патрэбныя яму тыя сваты, бы сабаку на срацы скула!..
Грысь зноў пацягнуўся да бутэлькі, зьмесьціва якое ўжо боўталася на самым донцы.
Рэшткі самагонкі піліся, як звычайная вада; нават вада магла зараз паказацца Чаравячку смачнейшаю. І пакуль ён марудна глыкаў гар, якая нават ня смыліла, у галаве барухалася, бы чорт у палонцы, тупое, ірванае шмацьцё думак:
„Парсючкі, чакаляды… Прэзыдэнцкі гранатамётчык… Як устану — панам стану!.. Жывем, бы мышы ў засерні… Ладна! Гарэлкі я вам… ад пуза… яшчэ ёсьць… у хлеўчуку прыкапана… А жраць чаго?.. То ж няма нічога!.. Ну, Наталка! Ну, сучка!.. От, зараза! Тут шкварку добрую… І сальцісона! А то падумаюць… Што шпань-галадрань якая! Што… Сьвербіянка ёй… шмоньку дзярэ!.. А-а!.. Пляваць!.. Дурная дачка — дурное й вясельле. Бач ты, у гараду сьмятана смачнейшая. І гною менш… І сьвіньні ня рохкаюць. От, бы вас усіх і накарміць тым гноем сьвінячым… Тым гноем!.. Сьвінячым!..“ А ў той момант, як апошняя кропля первачыны кранулася сьценак перапаленага Грысевага страўніку, шмацьцё думак з галавы ягонай некуды раптам сплыло, і на вольнае месца нечакана ўстрэміўся авантурны ды ва ўсіх адносінах рызыкоўны плян.
Грысь ацяжэла адштурхнуўся ад стала, узьняўся, спрабуючы захаваць раўнавагу. Калі падлога выраўнялася ды зноў выпрасталася больш-менш паралельна столі, ён вызірнуў у вакно: там панавала самая сярэдзіна цёмнае і, на шчасьце, бязьмесяцавае ліпеньскае начы. „Сама тое!“ — падумаў Грысь ды пачаў катурхаць сваю жонку:
— Марыська, уставай!
— А! Што?.. — спалохана падхапілася заспаная Чаравячка.
— Ціха! — Грысь вырачыў на яе страшныя вочы. — слухай… — ён падсеў ушчыльную да жонкі, наблізіў да яе свой гарачы чырвоны твар.
— Што? Што ты?.. — усё ніяк не магла даўмецца Марыля, чаго ён ад яе хоча.
— Ды ціха ты! — ужо злаваўся Грысь. — Наталку разбудзіш… Слухай, што я табе скажу…
— А што такое?
— Гаўно рабое! — нецярпліва лаянуўся Чаравячка ды пачаў урэшце п’янотна, хутка, празь пень-калоду распавядаць жонцы

пра сваю авантуру.
Яна, рачачы на яго вокамігам ацьверазелыя вочы, то адмоўна матляла галавою, то спалохана адсоўвалася да сьцяны, то проста ды гэтак жа страшна глядзела яму ў твар, ані ня верачы, што ўсе гэтыя мужавы словы насамрэч ды па-сур'ёзнаму.
— Ох, Грысю! — сполах так і гнуў ейную няшчасную постаць да ўскалмачанае пасьцелі. — Ты гэта напраўду?..
— Напраўду, бляха, напраўду!
— І не баішся?
— А-а!.. — толькі разануў рукою паветра Грысь. — Але разам трэба.
— Што — разам?
— Ну, ісьці… Разам! Адзін я не давалаку…
— Вой, не! — Марыля нават не заўважыла, як раскусіла да крыві на губе больку. — Дурное ты…
Далей, аднак, Марыля не дагаварыла. Бо Грысь узьняўся з канапы, пачаў злосна ўзьдзерваць ногі ў старыя свае нагавіцы, што віселі на вяроўцы ў запеччы. Адна нага, зараза, усё ніяк не хацела лезьці ў калашыну, і ён, як стаяў, так і бразнуўся сярод хаты.
— Вы зусім там падурэлі ці што? — пачуўся раптам заспаны голас Наталкі з бакавушкі. Яна яшчэ нешта прамармытала няўцямнае ды сьціхла. Грысь трохі перачакаў, так-сяк урэшце прасунуў нагу ў калашыну ды пачаў падымацца з падлогі. Марыля борздка зьлезла з канапы, падхапіла яго пад локаць.
— А няўжо пойдзеш?.. — глядзела на яго, як на добраахвотнага чарнобыльца-сьмяротніка, жонка.
— Э! — толькі злосна рыпнуў зубамі Грысь. — Ад вас — хіба толькі… — адсунуў ён жонку прэч ды, ірванўшы з запечка тую самую вяроўчыну, на якой боўталіся ягоныя дзіравыя нагавіцы, пачаў скручваць яе ў жмутак.
Убачыўшы такое, ды падумаўшы раптам чорт ведама што, Марыля ледзь не самлела. Але ў наступную хвіліну яна ўжо вісела на шыі Грыся ня горш за любую вяроўку ды мёртваю хваткаю абшчапіла яго рукамі, рызыкуючы задушыць нашмат раней адмеранага Грысю часу.
— Не, не! — ані не зважаючы на ноч, залямантавала яна на ўсю хату. — Ат, дурны! Кінь вяроўку, кажу!..
Насустрач Грысю, які абсалютна не чакаў такога скруту і які пад цяжарам павіслае на ім жонкі зусім страціў раўнавагу (а зь

ёй у яго да гэтага часу й без таго былі вялікія праблемы), раптам імкліва пачала набліжацца падлога. Ён яшчэ са зьдзіўленьнем пасьпеў адзначыць, што хоць паміж ім і падлогай была гэткай „буфэрнай зонаю“ ягоная ўласная жонка Марыля, але чамусьці першаю да нямытае масьціны дакранулася ягоная няшчасная лабэшня, а ўжо потым загрукацела і ўсё астатняе, уключаючы й яго гарапашную постаць, і сухакосную Марыську.

— Вы дасьцё сёньня паспаць ці не? — на гэты раз Наталчын голас быў не такі заспаны ды поўніўся ўжо не жартоўнаю злосьцю.

— Дамо, дачушка, дамо, — з лагоднай інтанацыяй, што зусім не адпавядала крытычнай сытуацыі, у якой яны апынуліся, адказала, лежачы на Грысю ды са спалохам касавурачыся на бакавушку, Марыля. А потым, будучы ўсё яшчэ зьверху, выдыхнула яму ў твар: — Вяроўка табе нашто?..

— Ну, не засіліцца ж я хачу, ё-маё! Для дзела, значыць!..

Марыля яшчэ трохі паляжала на мужу, відаць, канчаткова пераконваючыся, што ён не зьбіраецца зводзіць рахункі зь няшчасным сваім жыцьцём, падумала аб нечым сваім бабскім ды патаемным і, урэшце, рашылася:

— Адзін ня пойдзеш.

— А на халеру ты мне!.. — занаравіўся быў Грысь, узбрыкваючы пад Марыляю.

— Ціха, ваяка. Яшчэ пападзешся…

— Ладна, — урэшце прымірэнча пагадзіўся Чаравячка ды пачаў выкачутвацца з-пад жонкі. — Аднаму яно… я ж казаў… напружна занадта… Пасобіш!

Чаравячкі сяк-так падняліся. Стараючыся не рабіць болей лішняга шуму-глузду, на цырлах падаліся да дзьвярэй. Ужо на парозе Марыля, праціскаючыся за Грысем скрозь дзьверы, зноў схапіла яго за руку ды выдыхнула тое ж самае, з чаго пачынала: „Ох, Грысю!.. Дурное ты…“

Але Грысь, здаецца, яе не пачуў. А калі й пачуў, дык не было зараз на сьвеце такое сілы, якая магла б яго пераканаць, што задуманае ім — надта ўжо дурная й бязглуздая справа…

* * *

Ноч была чорнаю, хоць выбі вока.

Нават зоры кудысьці пахаваліся, зацягнутыя нечаканымі хмарамі. На шчасьце, дождж яшчэ не цярушыў, магчыма, толькі

зьбіраўся; інакш на прысушанай за дзень ды змочанай вільгацьцю зямлі яны б пакідалі досыць выразныя адбіткі сваіх атопкаў. З кожнай хвіляю сярод дрэваў адчуваўся ўсё большы пошум ветру, і гэта таксама спрыяльна клалася на іхную начную авантуру.

Грысь ішоў трохі папарадзе, Марыля старалася ступаць зь ім крок у крок. Яны нават ня йшлі, а валачыліся дрыготкімі прывідамі, сагнуўшы сьпіны крукамі, ня надта цьвёрда ставячы ногі ў разору паміж градаў… Час ад часу то Грыся, то Марылю адчувальна хістала ды рэзка паводзіла ўбок: перад сваім начным вылазам яны пасьпелі яшчэ па разу, а потым і па другім, добра прыкласьціся да зьмесьціва пяцілітровае бутлі з расчыненаю бражкаю: такую ж паўнюткую бутлю Марыля зараз сунула перад сабою, ашчадна прыціскаючы да сваіх запалых грудзей…

Вось і апошняя разорка, а там, за плотам, — падворак Андрэя Шупейкі. Менавіта сюды перліся Чаравячкі, і перліся, вядома ж, не дзеля начной пагулянкі.

Так-сяк, перадаючы адзін аднаму неабдымную бутлю ды перадзершыся цераз плот, яны замерзлі ў палахлівым трымценьні.

На падворку Шупейкі было ціха. Праўда, над парогам хаты паздрадніцку гарэла яркая лямпачка, якую Андрэй звычайна запальваў, калі клаўся спаць, і якая потым гарэла ўсю ноч, заліваючы сьвятлом амаль што ўвесь падворак. Можна было б бэцнуць зараз па ёй камянюкаю, і Грысю ў мазгі нават пальнула такая дураломная думка, але ж ён уцяміў, што на гэтым іхны напаўсвалотны вылаз хуткацечна й скончыўся б. Ён прыхінуўся яшчэ ніжэй сам, уладна прыхіліў голаў Марыські, так, што яна проста ўжо курчылася й пад гэтым уладным прыхіленьнем, і пад цяжарам бутлі з брагаю, ды паказаў супрузе сваёй, што ступаць трэба як мага бліжэй да плоту й гаспадарчых збудаваньняў. Урэшце, сунуцца на самое дварыска яны й не зьбіраліся.

А зьбіраліся яны сунуцца, і нават, на дзіва, досыць хутка, куды хацелі, таму як быў гэты хляўчук чамусьці зачынены на звычайную драўляную зашчапку, у задушны сьвінскі прыстанак — канчальную мэту іхнага, не зусім, так бы мовіць, добрасуседзкага візытанцтва.

Два ўкормленыя, угадаваныя кабанчыкі ўзбрыкнулі са сьвежае

саламянае посьцілкі насустрач нечаканым прыхадням, зьдзіўлена рохкнулі ды зачухалі лычамі аб перагародку, магчыма, у таемным спадзеве, што зараз, хоць і няўчас, ім дадуць якіх мешанцаў з пракіслымі недаедзенымі блінцамі.
— Ціха ты, Марыська… — стаяў сам ледзь жывы Грысь, хоць Марыська ягоная не выдавала ані гуку. Ён акідваў ацэньваючым п'янотным вокам то аднаго вепручка, то другога, усё ніяк не рашаючыся, на якім спыніць свой выбар. — Давай гэтага… Магамая! — урэшце тыцнуў ён пальцам у большага, як яму падалося, трохі лепш укормленага ды дагледжанага, нечакана нават успомніўшы ягоную мянушку.
— Ну, давай… — таксама мітусьліва заблукаў па вепручках Марыльчын пагляд.
Ёй таксама болей падабаўся гэны, на якога тыцнуў Грысь. Чарнабокі, ладненькі, ён раптам навеяў жанчыне ўспаміны аб басотным сваім дзяцінстве, калі пасьвіла яна падсьвінкаў на выгане, і асабліва любіла пачухаць якому кручкахвостаму гарэзьліўцу белы гладкі пузанчык ці пад шыйкаю…
— Давай, давай! Бражкі яму давай! — сыкнуў на жонку Грысь.
— Вой, зараз… — рукі Марылі раптоўна ўспацелі; бутля так і наравіла высьлізнуць зь іх на драўляны насьціл. — Ледзь не ўпусьціла…
Грысь зьнішчальна наставіў вочы на жонку:
— Я табе ўпушчу! Давай хутчэй! Пакуль ціха…
— Вой, а як ня пройме?
— А як ня пройме, дык… — але Марыля так і не пасьпела зразумець, што хавалася за гэтым страхотным „дык".
Кабанчыкі, нібы адчуўшы, што замест мешанцаў ім зараз можа перапасьці нешта нашмат смачнейшае ды больш задзёрыстае, ужо пачалі ледзь ня кідацца на загароджу, за якой муляліся двое гарапашцаў валацужна-партызанскага аблічча.
— Ну, давай! Лі ў карыта яму, к-кароста!.. — нецярпліва, хоць і лёганька чвэхнуў у сьпіну жонцы Грысь. — Яшчэ ўчуе хто… Адразу канец кіну будзе!..
— Сам стой ціха! — агрызнулася Марылька. — Я сюды што — сама перлася? — Пры гэтым, аднак, яна ўрэшце адкаркавала бутлю ды перахіліла яе цераз загарадку: — Гэтаму ліць ці якому?
— Ды гэтаму, гэтаму! Магамаю!..
— А я ведаю: Магамай гэта табе ці Мамай!..

— У Магамая бакі чорныя. І вуха! Яму й лі!
Марыля яшчэ ніжэй нахіліла рыльца пасудзіны, і ў карыта Магамая паліўся нарэшце магутны струмень з духам перабрадзілых дрожджаў ды яблыкаў. Гэты жэст, аднак, займеў досыць нечаканыя й не зусім адэкватныя бягучаму моманту наступствы. Вядома, сам Магамай порстка ўставіў лыч у карыта ды пачаў прагна хлябтаць бражку, аж зарохкаўшы адметным басам ад сьвінскага свайго задавальненьня. Затое другі кабанчык, досыць хутка адчуўшы такую дыскрымінацыю, храптануў так, што Магамай нават яшчэ шчыльней прысунуўся да свайго карыта, зусім не зьбіраючыся дзяліцца з аднакроўкам ані кропелькаю дурнап'янага зьмесьціва. Якраз у той момант, калі крыўдны хроп абдзеленага бражкаю вепручка зьбіраўся перайсьці ў зацяглы ды невыносны віскат, Грыська вырваў з Марыльчыных рук бутлю і бабохнуў амаль усю тую бражку, якая там яшчэ заставалася, у ягонае пустое карыта.
Вепручкі, задаволена прыцмокваючы ды лагодна ўзрыгваючы, захлябталі бражку ў два лычы.
Грысь аж трохі аслупянеў, так яго мілоціла гэткае ідылічнае вепручынае паеньне. Урэшце ён адарваў пагляд ад чорнага вуха Магамая, крытычна ды заклапочана акінуў ягоную ўсю сьвінячую паставу. Пасунула бровы адно на адно й Марыля:
— Ну, што!..
— А чорт яго ведае! Здаецца, не бярэ…
— Яшчэ дабаў…
Грысь перакуліў бутлю, але адтуль выцекла ў карыта Магамая толькі некалькі кропель каламутнае астатняе жыжкі.
Здаволены хмельным пітвом вепручок усярбнуў і гэтыя кроплі, зноў задраў лыч угору, відаць, патрабуючы саладжавага дадатку. Дадатку, аднак, болей не было ані макаўкі.
— Ну, давай, Магамайчык, давай! — імкнуўся паддобрыцца да жывёліны Грысь. — Ну!.. Што глядзіш? Не праняло ці што, чорт ты паганы!..
— Ня лайся так. Яшчэ ня пойдзе, — прашаптала Марыля, якая рабілася з кожнай хвіляю ўсё болей пераляканаю, бо ёй здавалася, што ў хаце даўно пачулі, як яны тут капошкаюцца, і зараз сам гаспадар Андрэй Шупейка выйдзе ды ўсмаліць ім так, што яны зарыюцца ў зямлю ня горай за таго ж паганага вепручка, якога не бярэ ні чорт, ні бражка.
— Я яму не пайду! — качнуўся раптам наперад Грысь, сам

чапляючыся за загарадку ды пагрозьліва нахіляючыся ўніз, рызыкуючы зваліцца проста ў карыта Магамая. Той, адчуўшы знаёмы бражнячы водар, які зыходзіў ад Чаравячкі, таксама памкнуўся наперад і, патрабавальна рохкнуўшы, нават ускінуў пярэднія лапы на драўляную папярэчку, дзе й пасьпяхова зашчаміў іх. Тут Чаравячка, нарэшце, заўважыў жаданае. Маленькія сьвінячыя вочкі Магамая набрынялі цяжарам, пачалі навальвацца тупым саноцьцем, рохканьне зь ягонай пашчы за кожным разам вырывалася зь нейкім прыбулькацелым прыдыхам, ён нядобра пачаў завальвацца некуды набок. Грысь, каб кабан не абрынуўся ўніз і не сапсаваў грукатам ужо немаленькай сваёй тушы ўсю іхнюю авантуру, здагадаўся зноў нахінуцца да загарадкі ды зноў дыхнуць сьвінчуку проста ў лыч. І тут здарылася неверагоднае. Круглыя дзьве дзюрачкі на магамайскім лычы, прагна ўцягнуўшы пах сьмярдзюшнага гарыва з чаравячкавага рота, напружана сьцяліся, выпрасталіся; вепручок, стоячы на задніх лапах, рэзка памкнуўся ўверх і… раптам сашчаміў свае іклы на здубянелым Грысевым твары.
— А-а! — зароў Грысь, ня могучы крыкнуць на ўсё горла й проста заходзячыся калатуном ад шоку, болю й крыўды. — Ён мяне ўкусіў! Падла! Марыля!.. Ён мяне ўкусіў! — ціха галёкаў Грысь.
На дзіва, у той жа час ён яшчэ мог больш-менш адэкватна ацэньваць абстаноўку, таму, не марудзячы, накінуў вяроўку на шыю Магамая, вышмаргнуў са сваёй завэзганае штаніны шырокую драную насоўку й, злосна мацюкаючыся, скамечыў яе камляком ды запхнуў вепручку глыбока ў пашчу. Пры гэтым ён нават не пасьпеў спужацца: а раптам падпоеная жывёліна храпнула б яго на гэты раз ужо за руку?.. Далей усё замільгацела ў тлумнай, замутнёнай калейдаскапічнасьці. Вепручок ацяжэла пачаў апускацца ўніз. Грысь, стараючыся ня надта плявацца крывёю, памалу адпускаў нацягнутую вяроўку, каб Магамай не загрукацеў на салому ўсімі сваімі рэбрамі. Марыля спачатку кінулася да дзьвярэй хлеўчука, але пачуўшы Грысева: „Загарадку!.. Загарадку адкінь, баба дурная!..“, памкнулася назад, непаслухмянымі пальцамі ўчапілася за бярвенца. Грысь пачаў асьцярожненька выводзіць за вяроўку кабанчыка, а той, не раўнуючы, бы наркаман-апушчэнец, упарта цягнуў свой лыч да твару Чаравячкі. Грысю нічога не заставалася, як раз-пораз хукаць на вепручка перапалам, пры

гэтым са спалохам адразу ж адстараняцца, каб, крый Божа, гэтая вышкрэбтаная поскудзь ня зжэрла яму твар увогуле. Калі яны выходзілі з хлеўчука, то ў гарачцы нават не заўважылі, як другі кабанчык, марудна падламіўшы пярэднія лапы, раптам зваліўся на бок ды салодка захроп, прычмокваючы ў сьне, бы абпоенае парным сырадоем дзіця… Вось і падворак.

Пад напорам набіраючага сілу вятрыска мітусьліва закачаліся ды кінуліся прэч даўжэзныя пад лямпачкаю-стоваткаю цені Чаравячкаў. Яшчэ адзін, больш прыземлены й не такі мітусьлівы, цень Магамая марудна пацёгся за імі сьледам… Грысь халадзеў ад роспачы: вепручок усё больш п'янеў. І рызыка застацца зь ім, бяздухім ды нязрушным, проста сярод гаспадарскага дварыска дабаўляла гарачага поту на яго й без таго мокры лоб.

— Давай, давай, разграбай плот!.. — зацята вымольваў у Марылі Грысь, падцягваючы вепручка да заваленага штыкетніку, які, праўда, і плотам назваць было цяжка. Марылька нечага закошпалася, тузаючы туды-сюды штыкеціны, і на свой гародчык Чаравячка ўвалок Магамая ў амаль што непрытомным стане, сам ледзь-ледзь не аддаючы Богу душу ад нечалавечае фізычнае ды нэрвовае напругі. — Загароджвай, загароджвай! Рабі, як было!.. — яшчэ пасьпеў адкамандаваць жонцы Грысь. І, губляючы апошнія сілы, не забываючы, аднак, пахукваць сівушнаю гараю ў сьвінячую пысу, якая, бы радар, строга паварочвалася на пах самагонкі, увалок-такі ў свае сенцы ўшчэнт ап'янелага Магамая.

Кабан спыніўся пасярод сенцаў, утаропіўся ў абаіх Чаравячкаў, тупым паглядам сваіх звужаных у непрасьветныя шчыліны вачэй, а потым, з рэдкім парохканьнем ды вантробным мармытаньнем, глухім булькаценьнем і перарывістым прысьвістам, неяк марудна й задаволена качнуўся спачатку ў адзін бок, затым у другі, і раптам коратка й рэзка зламаўся, усім цяжарам грымнуўся на падлогу, пасьпеўшы яшчэ задаволена рохкнуць, як астатні п'янюга, які кулем валіцца ў карчы, думаючы, што пасьпяхова дабраўся дадому…

І адразу за вокнамі перарэзала ноч маланка, страшэнна грымнула, а па ўсёй вэрандзе разьліўся магутны сьвінячы дух. Такім чынам, ледзь не асноўная частка начное Грысевае авантуры была пасьпяхова рэалізавана. Далей у пляне

няўрымсьлівага адурэлага Чаравячкі значылася спачатку забойства, а потым смаленьне вепручка ды поўная разьдзелка тушы.
* * *
— Зачыняйся, зачыняйся!.. — аж калаціла ўсяго Грыся Чаравячку. Ён хапаў ротам паветра, рукі гарэлі ад урэзанае вяроўкі, каленкі трэсьліся агіднай няспыннай трасучкаю.
— Вой, зачынілася я, зачынілася! — таксама якатала сэрца Марылі. Яна як стаяла, так і села на лаву. — І што цяпер?
— Што?..
— Ну, што цяпер зь ім рабіць будзем?
Над хатаю зноў уперыла. Марыля падскочыла з лавы, памацала кручок, на які зачыняліся знутры сенцы, нібы ад удару грому той мог сам выпадкова адкінуцца.
— А бутля дзе?
— Якая?..
— Ты што, бляха, кінула яе там ці што?.. — толькі зараз Грысь заўважыў, што зь ягонай шчакі, так неабачліва падстаўленай пад зубы Магамая, па-ранейшаму цюрчыць юха, хоць ужо й не такімі буйнымі кроплямі, як раней. — Ёду дай!.. Ну, дык дзе?
— Што — дзе? — бы дурная, перапытвала Марыля.
— Дзе бутля, я пытаю!
— А-а! — нарэшце ўцяміла жанчына, што ад яе хоча Грысь. — Дзе я табе вазьму таго ёду? Во бутля, во! — высунула з-пад лавы невядома як і калі ўбаёданы туды посуд Марыська. — Што я, дурная табе там яе пакідаць?..
— Можа й дурная… калі пытаеш… — адказаў хутчэй нейкім сваім тугатлумным думкам, чым жонцы, Грысь. Утаропіўшыся ў адну кропку на лобе нерухомага Магамая, ён тузануў зь цьвічочку стары завэзганы ручнічок, разадраў яго ўздоўж ды абы-як перахапіў ім шчаку, тым самым адразу болей пачаў нагадваць ушчэнт замудоханага пацыента зубное лякарні, чым начнога зладзюгу-сьвінакрада.
А думкі Грысевы былі аб тым, чым жа й як ён пазбавіць жыцьця Магамая.
Можна было б, канешне, клясычна закалоць яго звычайнаю швайкаю, як гэта паўсюль рабілася й робіцца. Але не зусім звычайныя абставіны, што склаліся перад вынясеньнем канчальнага выраку гэтаму сьвінчу, таксама вымагалі адметных карэктываў. Таму Грыська адразу адмёў гэтакі спосаб

марчаньня Магамая. Зноў грымнула, і ў голаў яму чамусьці адразу ўчаўплася думка, што добра было б скінуць яго з гарышча, каб бразнуўся ён усім сваім цэнтнэрам аб падлогу ды аддаў Богу сьвінячую сваю душу, не пасьпеўшы зразумець нават, што да чаго. Але ж і тут была нявыкрутка: ня з Грысевай, а тым болей не з Марыльчынай сілаю выпадала валачы гэткае цяжэрства на гарышча. І таму Чаравячка вырашыў забіць вепручка так, як яшчэ не забіваў аніхто.
Грысь, круцячы ў руках вяроўку, з насьцярогаю наблізіўся да Магамая, прысеў над ім, трохі паслухаў, а затым, зь яшчэ большаю насьцярогай, абвязаў вепручыную шыю, пракінуў два канцы вяроўчыны на розныя бакі. Марыля, здаецца, пакуль не зусім цяміла, што ён зьбіраецца рабіць:
— А што гэта ты?..
— Трымай! — толькі загадна гыркануў Грысь.
— Навошта?
— От, бабаўё дураломнае! А што я табе, калоць яго буду? Каб ён тут нам… Каб мястэчка — на ногі ўсё?..
Марыля зірнула на Грыся паглядам, нашмат страшнейшым за ранейшыя. Аднак моўчкі падалася наперад, моўчкі ўхапілася за вяроўчыну, усё гэтак жа неадрыўна гледзячы ў вочы Грыся. Той уладна тузануў за вяроўку, нібы лішні раз правяраючы яе на моц, загадна хітнуў Марылі:
— Давай!
І яны пацягнулі. Вяроўка напялася, твары Чаравячкаў заліліся суцэльным барвіньнем; пятля, што абхоплівала шыю Магамая, усё глыбей пачала ўрэзвацца ім у рукі, а таксама ў тоўстую вепручыную скуру.
— Ну!.. Ну!.. — заахвочваў і сябе, і жонку Грысь, ужо проста сіні ад натугі. — Давай!
— Не магу… — толькі прахрыпела Марыля, не выпускаючы аднак, канец вяроўкі. — А!.. — пры гэтым ускрыкнула яна, прысядаючы над Магамаем, калі недзе зблізу хаты зноў добра ляснула.
— Яшчэ… трошкі… — ня горай за яе хрыпеў Грысь.
Да гэтага часу замудоханыя, яны сабралі рэшты апошніх сілаў ды зацягнулі вяроўчыну, колькі маглі. У нейкі момант Грысю падалося, што справа вырашана: кабанчык, лежачы на баку, раптам увесь здрыгануўся, выпрастаў ды адразу падкурчыў пад сябе ўсе чатыры лапы, а з горла ягонага, перацягнутага

намёртва, вывалілася спачатку абсьліненая Грысева насоўка, потым пачулася перачаўленае булькаценьне, геркаценьне; на шчэць парсючынага падбародзьдзя паплыла з пашчы густая сьліна, а потым недзе з саміх вантробаў Магамая папёрла глыбінная хрыпата, якая вельмі нагадвала перадсьмяротную. Грысь для пэўнасьці яшчэ раз тузануў свой канец ды нарэшце адкінуў вяроўку:
— Усё, Марылька, капцы!
Марылька, якая сама ледзь не адчула напраўдзе, што такое „капцы“, раптам выказала абсалютна цьвярозую думку:
— Ты правер…
Грысь зіркануў на жонку, асьцярожна дакрануўся нагою да гладкае кумпячыны, неяк няпэўна прамармытаў:
— А што правяраць… Нажы давай.
— А як жывы?
— Ды які жывы? Ухадохалі мы яго…
Аднак уся змучаная постаць Марылі выказвала суцэльны недавер. Яна прысела над Магамаем, а потым хуценька апусьцілася на каленкі, прыклала вуха да ягонага жывата й пачала ўважліва ўслухоўвацца…
— Ну, што?.. — смыліла Грысю.
Марыля нецярпліва махнула на яго рукою, каб не перашкаджаў. Яна паслухала ў адным месцы, потым прыклала вуха трохі вышэй, а потым яшчэ вышэй. Затым адарвала голаў ад кабанячага пуза, няўцямна пацяснула плячыма:
— А чорт яго ведае.
— Ну то нясі нажы!
Марылька была памкнулася зь сенцаў, а потым спынілася:
— Ты што, нясмаленага яго?..
Грысь утаропіўся ў Марылін рот, нібы адтуль выперла такая лухта, якой яшчэ ня чуў цэлы сьвет. Аднак, пасьля хвіліннае развагі, ён зразумеў, што на гэты раз жонка мае абсалютную рацыю. На дзіва, нібы спэцыяльна чакаючы гэтага моманту, у куточку вэранды хавалася тое, што трэба: там, прыкрытая дранай анучкаю, пад шапкаю густога пылу стаяла паяльная лямпа. Грысь узяў яе ў рукі, страсянуў пыл, пашалёхаў: унутры нешта плёхалася. Зьвінціў маленькую накрыўку, панюхаў: у нос шыбанула рэзкім пахам бэнзыны.
— Запалкі давай! — загадаў ён жонцы.
Марылька крутанулася, выбегла зь сенцаў, хутка вярнулася

назад з запалкамі. Дрыжачымі рукамі працягваючы іх Грысю, спытала:
— А як хату спаліш?..
— Ты, дурыла, менш языком мянці!
— Ох, Грысю, глядзі!..
— Ды гляджу, не сьляпы ж, тваю маць!
І лямпа шуганула полымем.
Грысь лацьвей узяўся за ейную ручку, вольнай рукою ўхапіўся за лапу Магамая ды скіраваў полымя ў вепручыны бок. Але толькі гарачы язык агню лізнуў сьвінячую скуру, як Магамай дзіка рохкнуў, пераляканая Марыля, адначасова жагнаючыся й заціскаючы сабе рот, каб не закрычаць гэтак жа дзіка, падалася назад, а сам Грысь ледзь ня бразнуў паяльную лямпу на падлогу.
— Ажыў, падла! — вычавіў скрозь зубы Чаравячка, гасячы лямпу. — От, паскуда! Ну й чым яго цяпер?..
— Вой, Грысю!..
— Што Грысю? Што Грысю?.. — паўтарыў раззлавана сьледам за ёю Грысь, і невядома было, на каго ён болей злуецца: на вепрука ці на жонку.
— Неяк бы канчаў ты зь ім, га?..
— Ну й як я табе зь ім кончу? Можа, скажаш яшчэ назад, туды, дзе быў, зацягнуць? Ці за хатаю закапаць?
— Вой, ня ведаю…
— Тады схадзі сама да Андрэя, скажы, што мы ў яго кабанчыка сьпёрлі!
— Ай! — адмахнулася ад яго Марыля.
— Вось табе й „ай“! Вечна вы, бабы, з лухтой сваёй!..
На гэты раз ня вытрымала ўжо жанчына:
— То ты так?! Ты бач на яго, баба ў яго вінаватая!.. Можа, гэта я цябе падгаворвала сьвіньню гэтую сюды валакчы?! Ці, можа, я вінаватая, што ты, дундук пасівелы, яго вяроўкаю засіліць схацеў?!
Чаравячка раскрыў быў рот, каб хутка абрэзаць жонку, але якраз у гэты момант Магамай заварушыўся зноў. „Калі ён зараз ачомаецца, — маланкава пранеслася ў Грысевай чарапушцы, — дык…“ Што магло адбыцца сьледам за гэтым самым „дык“ — у ягоных мазгах дакладнага адказу не прагучала, бо вока наштурхнулася на нешта такое, што адразу зьмяніла гэты пачатак панічных развагаў. Грысь раптам убачыў тое, чым ён

заб’е Магамая ўжо напэўна.
У тым жа кутку, пад тым жа пылам, з-пад якога ён хвілю таму выдзер паяльную лямпу, ляжала перавернутая дагары лапкамі даўно згарэлая электрычная плітка. Аднак сама плітка зараз была яму без патрэбы. Яму трэба было толькі адно — электрычны шнурок. І Грысь, наступіўшы адною нагою на плітку, схапіўся за шнур ды ірвануў на сябе. Стары шнурок трымаўся ня надта. Таму ў наступны момант Грыська ўжо склаў яго надвое, паддзеў зьнізу тым самым нажом, які прынесла Марылька, пакуль ён распальваў лямпу, агаліў з двух бакоў расшкамутаныя на ніткі канцы дроту. І, пакуль жонка канчальна ўцяміла, што да чаго, ён борзьдзенька падскочыў да разэткі ды ўваткнуў туды гэтыя самыя два дроцікі. Яшчэ барджэй Грысь уваткнуў супрацьлеглыя канцы ў дзьве наздрыны магамайскага лычу, не забываючы, аднак, з асьцярогаю трымацца за ізаляцыю. Вепручок рэзка торгнуўся, нават бздануў, і ў той жа міг засьмярдзела паленым мясам пажывому.
— Ты што?! — вярэснула ціха Марыля.
— Што?!
— Кінь дрот, кажу!
— А то што?..
— Кінь! — зноў паўтарыла Марыська, але не падыходзіла да Грыся й блізка.
— Ага, зараз!
— Заб’ешся, дурніска ідыёцкае!..
— Вой, не мянці! Мо ж, не заб’юся.
— Пэўне, скажаш, што дротам гэным сьвінчо зьмярцьвіш?
— А то! — Грысь насьцярожана агледзеў кабанчыка. Той болей ня бзьдзеў і не варушыўся. — Гатовы!..
Але толькі апошняе слова зьляцела з вуснаў Чаравячкі, як Магамай пачаў хоць і ціха, аднак агідна, працягла, роспачна, проста-такі па-сьвінску адчайна павіскваць.
— Ах ты, падла! — пераможніцкі аптымізм хутка стлеў у нязьведнай цемры душы Чаравячкі. — Бач ты — жывое, сьмярдзюшэнства паскуднае!..
Тут Грысь стаў нешта тлумна прыпамінаць са сваіх ужо недасяжна далёкіх урокаў фізыкі. А менавіта прымроілася яму, што нібыта ў вадзе напруга электратоку ўзрастае, таму й маланкавы разрад у залеву такі небясьпечны…

— Вядро давай!
— Якое вядро?
— Рабое! Во, што на калодцы стаіць, з вадою!
І не пасьпела Чаравячыха, у якой да гэтага часу быў зусім задураны голаў, ухапіцца за дзюралевае вядро, як Грысь вырашыў дакладна паўтарыць сваю электразабойчую апэрацыю, але ўжо з гідраўдасканаленьнем.
— Давай, сюды паднось! — тупнуў ён нагою побач з самуськім Магамаем. Марыля паднесла. — Стаўляй усутыч! — Марыля паставіла. А паколькі два канцы дроту па-ранейшаму былі ўтыркнутыя ў разэтку, дык Грысю толькі й заставалася, што ўмакнуць канцы, побач зь якімі ён трымаўся за ізаляцыю, у ваду ды адначасна дакрануцца імі да рэбраў Магамая. Але на гэты раз ён не ўлічыў аднаго: што ягоная Марыська не пасьпее адвесьці руку ад вядзернае дужкі. Марылю ўрэзала токам так, што гаротная жанчына адразу пераламілася напалам. Твар стаў чорны, язык прыкіпеў да паднябеньня; ёй падалося, што рукі адарвала ці выкруціла за плечы.
Перапужаўся й сам Грысь: машонка сьцялася, на патыліцы валасы заварушыліся самі сабою.
— Марылечка! Ты жывая? — нейкім чужынскім голасам вычавіў ён зь сябе.
— Й-а-а… Я-а… Ты што? Ты што, вылюдак роду ты чалавечага?.. — хапалася шарахнутая токам Марыля за сэрца так, нібы хацелася яго вырваць ды выкінуць прэч.
— Марыля!.. — зноў рануў Чаравячка, і ў гэты момант у двары пачуліся нечыя прыцішаныя галасы…
* * *
Недзе за паўгадзіны да таго, як Марылю працяла навылёт электратокам, сусед Чаравячкаў, зажытны Андрэй Шупейка, нечакана прачнуўся ў сваім ложку ад занадта ўжо гучнастрэльнага ляскату грому. Ён трохі паляжаў, раз-пораз ловячы вачыма бліскавіцы за вакном ды думаючы, як моцна сьпіць перад пачаткам навальніцы ягоная, усё болей яму чужая жонка Верка. Потым Шупейку падумалася, што няблага было б выйсьці на двор. І ня толькі да ветру, а на ўсялякі выпадак праверыць сваю гаспадарку. І хоць Андрэю ня надта хацелася выпроставацца з-пад коўдры ды адрываць сваё ўпацелае цела ад гарачага жаночага боку, аднак перакат грымотаў прымусіў Шупейку ўсё ж падняцца.

Ужо на ганку яму адразу зрабілася неяк трывожна. Яшчэ не разумеючы, адкуль і што ўзялося, ён, нават забыўшы справіць сваю малую патрэбу, адразу пашыбаваў да таго самага хлеўчука, дзе кватаравалі ягоныя ўкормныя два кабанчыкі. Першае слова, якое зьляцела з вуснаў Андрэя Шупейкі, як толькі ён сюды ўвайшоў, было далёка не лагодным. Другое было такім жа.

— Ну, лярвы! — ня мог ніяк супакоіцца Андрэй. Спачатку ён увогуле падумаў, што нечая зладзейская рука мала таго, што зьвяла аднаго вепручка прэч, дык другога проста прыкончыла на месцы ды так тут і кінула. Ён са шкадобаю нахіліўся над нерухомым кабанчыкам. Сьлядоў гвалтоўнай сьмерці, аднак, нідзе не знайшоў. Тады ён прыслухаўся, прынюхаўся ды агледзеўся больш уважліва.

Кабанчык дыхаў. Але ледзь-ледзь, таму як спаў проста мёртва. І, на зьдзіўленьне, несла ад яго брагавітым духам.

Шупейка ўважліва стаў вывучаць месца вакол загароджы. Ягоныя пільныя пошукі хутка прынесьлі свой плён. Рэдкія невялікія плямы, якія вельмі нагадвалі барвовыя плямы крыві, вялі ад загарадкі да парожку і далей — уздоўж усіх хлеўчукоў-пунечак да падворку галотнага Чаравячкі…

І Шупейка, доўга не разважаючы, кінуўся ў хату да тэлефону.

— Алё, слухаю! — адказалі яму амаль адразу на тым канцы дрота.

На зьдзіўленьне Шупейкі, участковы міліцыянт Мікіта Стралкоўскі ня спаў. Хоць ужо павяртала на другую палову ночы, ён са сваім памочнікам Віктарам Малюком займаўся тым, чым і наканавана займацца ў такі позьні час нашым беззаганным службістам парадку. А менавіта — яны пілі горкую. Трэба сказаць, што гэтай самай горкай да трэцяе гадзіны раніцы яны выпілі столькі, што ўжо ставілі па чарзе селядзец вэртыкальна на хвост і пад пісталетам прымушалі яго як мага хутчэй трымацца, зьбіраліся выходзіць на вулку паліць з табэльнае зброі па пустых пляшках, а потым хацелі ехаць да вядомае местачковае шалавы Мані Сікірыцкай рабіць міліцэйскі „шрубалёт“ з Манькаю пасярэдзіне… І толькі рэзкі тэлефонны званок, які разрэзаў прастору прадымленае ўшчэнт дзяжуркі, спыніў усе іхнія высакародныя намеры.

— Ало! — зноў рабануў у слухаўку старшына Стралкоўскі. — Участковы Стралкоўскі слухае!..

— Гэта я, Андрэй Шупейка, — адказаў усхваляваны Шупейка.
— Вы прабачце, што так позна… Але, здаецца, у мяне былі злодзеі.
— Якія злодзеі? — няўцямна перапытаў Стралкоўскі, нібы пачуў скрозь слухаўку аб нечаканым візыце Папы Рымскага.
— Ня ведаю. Але скралі Магамая…
— Якога Магамая?! — яшчэ болей зьніякавеў участковы міліцыянт, зусім адурэлы ад выпітае гарэлкі.
— Прабачце, вепручка. Гэта мянушка…
— Чыя мянушка?!
— Я ж кажу, вепручка. — Андрэй, наколькі мог, стараўся не губляць раўнавагі. Па першых рэпліках Стралкоўскага ён з жалем зразумеў, што міліцыянты п'яныя ў дупель. Але й ён сам наліваў ім сёньня надвячоркам, калі яны заехалі да яго пацікавіцца, ці няма якіх-небудзь лішніх праблемаў. І во табе — праблемы зьявіліся.
— Якога вепручка?.. — усё сыпаў дурнымі пытаньнямі Стралкоўскі.
— Ды майго, майго!
— І што зь ім?
— Нехта зьвёў з хлява! Напаіўшы абодвух, як мне здаецца па паху, бражкаю.
Стралкоўскі няўцямна ўпароў вочы ў слухаўку. Памаўчаўшы, зноў паднёс яе да вуха:
— А ты што, праз слухаўку бачыш і пах можаш пачуць?
На гэты раз ужо ўзламаў бровы Шупейка. Яны там у сваёй міліцыі ўжо зусім мазгі сабе адпілі, ці што?..
— Ды кабанчыкаў маіх бражкаю напаілі, кабанчыкаў! І аднаго зьвялі.
— Куды?!
— А я ведаю! Вывелі з хлява й павялі!.. Але ёсьць сьляды.
— Сьляды?
— Так. Кроў.
Пачуўшы пра кроў, Стралкоўскі жэстам паказаў Малюку неадкладна зноў наліць. Малюк наліў. Старшына хлабяснуў поўную шклянку.
— А ты таго… не выдумляеш?
— Ды якое выдумляю?
— Ну, мала чаго. Можа, прысьніў чаго ці з бабаю… не таго…
І без таго засмучаны ўшчэнт Шупейка, пачуўшы пра бабу,

раззлаваўся не на жарт:
— Слухай, Стралкоўскі, ты прыедзеш да мяне ці не? Тут кроў, кроў, разумееш ты гэта, даўбень? Навальніца ж пачынаецца. Зараз змые к чорту мацеры ўсё!..
Стралкоўскі, відавочна пакрыўджаны на Шупейку за „доўбанага міліцыянта“, проста зароў у слухаўку:
— Нічога там не чапаць! Неадкладна выязджаем. Чакай!
— Што такое, Мікіта? — перапытаў сяржант Малюк у Стралкоўскага, убачыўшы, як у таго вочы наліваюцца проста бурачыньнем.
— А х… хрэн яго ведае! Магчыма, забойства. — Стралкоўскі спрабаваў запхнуць пісталет у кабур, аднак ён, гадзючына, ніяк не хацеў туды ўлазіць.
— Ц-ю-у!.. — сьвістануў Малюк. А потым нечакана скрушна вырачыўся на Мікіту: — Дык, значыць, да Манькі не паедзем?..
— Да якой Манькі?
— Сікірыцкай.
— Да якой Манькі?! — роў Стралкоўскі. — Зьбірайся! Да Шупейкі выязджаем. Кабана ў яго скралі.
— Дык што: і забойства, і крадзёж?
— Там разьбяромся! — рыпнуў зубамі Стралкоўскі. І, наколькі магла дазваляць яму камплекцыя, паспрабаваў даволі жвава выбегчы зь дзяжуркі да машыны, аднак урэзаўся плечуком аб вушак ды дакладна бразнуўся б на падлогу, каб ня верны памочнік Малюк, які аддана падхапіў сытага ды п’янога начальніка пад белыя ручкі.
Празь якую хвіліну матор міліцэйскага легкавіка зароў, і машына пад хвацкім кіроўствам сяржанта Малюка крывой куляю паперла ад дзяжурнае часьці да гасподы Шупейкі.
А яшчэ празь якіх хвілінаў пятнаццаць перапуджаныя Чаравячкі пачулі ў сваім двары прыцішаныя галасы. Вялікія непрыемнасьці ўжо стаялі на іхнім парозе.
Грысь хутка пазбавіўся здранцьвеньня. Яшчэ толкам не ўсьведамляючы, што ж такое рабіць. Чаравячка падхапіў Магамая, калі можна так сказаць, пад пахі й павалок у бакавушку, у якой спачывала іхняя бядовая дачка Наталка. Марыля, як заўсёды, пасунулася за ім. Галасы за вакном пачалі набліжацца, часу на развагі не заставалася. Грысь адною рукою зьдзер коўдру з Наталкі, тая падхапілася на локці:
— Бацька, маці, вы што?!

І якраз у гэты момант нехта пагрукаў у дзьверы.
Бацька ўмольна ўтаропіўся ў дачку праваламі сваіх вачэй:
— Ох, Наталка, маўчы. Маўчы й не гавары нічога. Адкінеш коўдру — пасадзяць!..
— Каго, каго пасадзяць? — а ўбачыўшы вепручка, проста самлела: — Каго вы сюды прывалаклі?
У дзьверы зноў пагрукалі. На гэты раз гучней.
— Бацьку, бацьку нашага пасадзяць, — зрабіўся адразу мокрым зморшчаны твар Марылі.
А Чаравячка прыклаў палец да вуснаў:
— Скрадзены ён, ясна? Тут… хай… пабудзе.
І Грысь пачаў уздымаць вепручковае цела зь яўным намерам пакласьці яго побач з дачкою.
Тая завішчала ўголас:
— Вы што, здурэлі? Прыбярыце яго адсюль!
— Маўчы, маўчы дачушка. Ты пацярпі…
— Я вам пацярплю! Прыбярыце, а то з хаты ўцяку!..
— Наталка, дачушачка, няма куды хаваць, — як магла, угаворвала яе Марыля. — Бацьку пашкадуй… Бо пасадзяць, дурня сівога! Хай пабудзе. Потым забяром.
— Крычаць буду! — выказала нежартоўную пагрозу Наталка.
Але тут у дзьверы ўжо загрукалі проста шалёна. І Наталка, якая ўжо шырока раскрыла рот, адразу яго прыкрыла, так і не пасьпеўшы крыкнуць. Скарыстаўшыся гэтай замінкаю, бацька ўваліў-такі ёй у ложак нерухомае сьвінячае цела, і пляхнуў зьверху на іх абаіх шырокую коўдру якраз тады, калі Наталка яшчэ нешта прамычала, аднак, пачуўшы зацятае матчына „Міліцыя!…“, спалохана зьнерухомела.
— Чаго доўга не адчыняеце, вашу маць! — злосьць так і перла са шлунак Стралкоўскага.
— Ды спалі мы, спалі, — наганяла на сябе, наколькі магла, сонны выгляд, Марылька. — Ці мала хто грукае. І пярун грукае…
— Я табе пакажу пярун! — міліцыянцкі чын скіраваў сваё пуза на пераляканую жанчыну. — Ну, дзе схавалі?
— Каго?
— Каго, начальнік? — перапытаў сьледам за жонкаю Грысь.
— Самі далжны знаць! — адрэзаў Стралкоўскі. А ягоны памочнік Малюк пацьвердзіў:
— Бо ня першы год замужам, я так палагаю?..

— Ды замужам, замужам, — пагадзілася Марылька.
— Ты адказвай па форме, калі цябе пытаюць, а не дуры галавы! — адрэзаў Малюк. — Сыгнал паступіў. — Ён рыгнуў. — Мы правяраем. — І пахіснуўся. — Дзе схавалі?
— Ды каго, каго? — абсьлюмачаны ражок хусьцінкі зноў нырнуў у Марыльчын рот.
— А то ня ведаеце, — сьледам за Малюком адрыгнулася й Стралкоўскаму. Ён паспрабаваў узьняць палец высока ўгару, але толькі й здолеў, што ўтрымаць яго на ўзроўні пуза. — Сьляды! Да вас прывялі, вашу маць!..
— Вой, ня лайцеся, вой, ня лайцеся, — зачасьціла жанчына. — Ня знаем мы нічога й ня ведаем. Якія сьляды? Куды прывялі?..
— Ну!.. — запытаў-пацьвердзіў жончыны сумненьні Грысь.
— Ты ня „нукай“, а хату паказвай! І падворак!.. — адрэзаў на гэта Стралкоўскі.
— Ды глядзіце, раз трэба, — зьмірыўся зь непазьбежнасьцю Чаравячка.
І ўчастковы з памочнікам пачалі глядзець.
А паколькія самагонныя пары яшчэ трывала ўладарылі іхнімі целамі і мазгамі, дык шмон атрымліваўся ў іх нейкі бесталковы. Міліцыянтаў адчувальна хістала. Перад вачыма ўсё плыло. Малюк „зь мясам“ абарваў некалькі шафак на кухні, пакуль правяраў іхняе зьмесьціва, не на жарт думаючы, што Чаравячкі да гэтай пары ўжо поўнасьцю разабралі вепручка ды схавалі яго па частках абы-куды. Біўся посуд, зьвінелі пустыя вёдры, ляцелі мацюганы. Трымцела Марылька, як нічога ніякага туліўся ў куточку Грысь.
— А там што? — паказаў Стралкоўскі на бакавушку й рашуча скіраваўся да яе, ледзь не перакуліўшыся праз бразнутае на падлогу вядро.
— А, там!… — раптам запабег яму наперад Грыська. — Дачка там. Сьпіць яна.
— А мы гэта зараз праверым! — рашуча адстараніў Грыся Стралкоўскі ды шырока расхрыстаў дзьверы.
І трэба было ж такому здарыцца, што дакладна ў той момант, калі міліцыянцкі бот улупіў у дзьверы, хмялюга раптоўна пачала выветрывацца са сьвінскай душы Магамая. Ён, спачатку, праўда, нягучна, зарохкаў ды зьлёгку заварушыўся пад коўдраю. Наталка хацела закрычаць, ускочыць і кінуцца прэч, куды глядзяць вочы. Але раптам, зусім недарэчы, у суцэльнай

цемры пад коўдраю перад вачыма пачало зіркацець пагрознае слова „Саўдзельніца! Саўдзельніца!…“, і яна, глыбока ўбіўшыся зубамі ў сваю руку, вырашыла пакуль маўчаць, наколькі будзе хапаць ейных дзявочых сілаў. Невыносна сьмярдзела хлявом, жывым сьвінствам, перабрадзілаю брагаю. Другою рукою Наталка моцна сьціскала Магамаю лыч, каб ён, скаціна, не завішчаў на ўсю моц. Ясная рэч, гэта яму зусім не спадабалася. І тады ён пачаў тузацца больш адчувальна. Не магла ўлежаць на адным месцы й Наталка, вымушаная тузацца ў тахт рухам працьверазелага вепручка.

Здавалася, налітыя волавам вочы Стралкоўскага назаўсёды прыкіпелі да гэтай сцэны. Побач муляўся Чаравячка. У дзьвярах стаяў Малюк, спрабуючы празь іхнія сьпіны годна ацаніць абстаноўку.

— Дык кажаш, сьпіць?… — прахрыпеў участковы.

— Ну… — як мог, цягнуў час Чаравячка. — Яна не адна.

— А хто зь ёю?!

— Жаніх прыехаў. Зяць, значыць…

— Які зяць? То ж няма ў вас ніякага зяця!…

— Ужо ёсьць. Надвячоркам прыехаў, і ўжо жаніх?

— Што, надвячоркам прыехаў і ўжо жаніх?

— Ну… Ён раней быў. А тут прыехаў… Надвячоркам.

— Ох, Чаравячка, цямніш!

Вепручок пад коўдраю нечакана часта-часта задрыгаў лапкаю. Наталка ледзь утрымала коўдру, каб тая не зьляцела прэч.

— Якое цямню? — стаў проста мёртвы Грысь. — Бачыце, як… разышліся. І ня чуюць нават… Як хочаце, то правярайце. Але ня раю.

— Чаму гэта? — вырачыўся Стралкоўскі. Ён ужо гатоў быў сам садраць коўдру ды глянуць проста ў нахабныя вочы гэтаму самаму жанішку.

— Чорны ён.

— Як… чорны?

— Ну… Як! Як нэгр.

— Які нэгр?

— Звычайны. Чорны. Альбэртам зваць.

— Ты, падла, гавары талкова! — замахнуўся нежартоўна на Грыся Малюк.

— Я й кажу. Кеніец ён. Дыплямат…

— Ілжэш, пэўна?

— Ды каб я ня ўстаў! — забажыўся Чаравячка. — Зь Менску самога. Як што ня так — адразу крычыць: „Я ў АОН буду жалавацца!.. На парушэньне маіх правоў чалавечых!…“
— У АОН?… — ледзь не ў адзін голас мармытнулі міліцыянты. Стралкоўскі, было бачна, ужо ня так рашуча намерваўся тузануць на сябе коўдру, пад якой упарта варушыліся Магамай, а сьледам за ім і Наталка.
А Малюк, памаўчаўшы, злавесна шапатнуў:
— А дзе ж ён адорву тваю падчапіў?..
— Ды гэта ня ён, а яна яго падчапіла. Як па Менску надысь гойсала. У тэхнікум не паступіла, ну, а гэтага, во, падчапіла, — зноў натхнёна збрахаў Чаравячка. Яму нават падалося, што небясьпечныя міліцыянцкія абцугі бяруцца за яго ня так хвацка… І як толькі вепручок зноў тузануўся, што твой налім у кашы, Грысь балюча штурхануў пад бок Марыльку: „Давай!“
— Ну, дзела маладое! Няхай адпачываюць!.. — адразу скеміла Марылька, чаго хоча ад яе Грысь. І ўжо сама лёганька ўзяла пад таўсматую ручку Стралкоўскага: — Ды хадземце ў прыбудовачку. Вы там яшчэ не глядзелі.
Цопкі нос участковага імгненна варухнуўся ў прадчуваньні нечага да болю знаёмага.
— У прыбудовачку?..
— Ну!.. Каб усё, значыць, абгледзелі. І супакоіліся…
— Супакойвацца нам няма як, — адразу напусьціў на сябе важнецкасьці старшына. — А прыбудовачку мы праверым.
І, хоць яму так і карцела ўсё ж упароць вока пад коўдру, каб, значыць, пераканацца ў наяўнасьці там на Наталцы ці пад ёю таго самага кенійскага дыпляматычнага нэгроіда, аднак захавальніцкі інстынкт зашкробся недзе ў ягоным чэраве, і Стралкоўскі мусіў падацца далей ад бяды. А заадно павалакчы за сабою й Малюка, які таксама нежартоўна западозрыў, што ў прыбудовачку Чаравячыха цягне іх ня проста так…
— Ну, Наталка, ну, дачушка!.. — няшчасным сьмешыкам задушыўся Грысь, як толькі бразнула клямка хаты за міліцыянтамі. — Век дзякаваць буду!
— А во вам вашае дзякаваньне! — доччына далонь аж прыкіпела да Грысевае шчакі, так уляпіла яна яму адмашную поўху, ускочыла з ложку, хутка памкнулася да дзьвярэй.
— Куды ты? — паспрабаваў спыніць яе спалоханы Грысь.
— Пусьціце! — на ўсім скаку абмінула Наталка бацьку і коркам

з-пад шампанскага выскачыла з хаты. А потым, душачыся сьлязьмі, крыўдаю, чорнаю зьнявагаю, паляцела, паляцела подбегам па начы цераз неабсяжнае жытняе поле, цераз пералесак ды балотныя чараціны, і болей Наталку пасьля таго ў мястэчку ніхто ня бачыў.
Між тым у любую хвіліну маглі вярнуцца міліцыянты. Туманістасьць у галаве Грыські ўпарта не хацела праясьняцца. Некуды тэрмінова трэба было перахоўваць Магамая. Але куды, каб яму чорт рэбры лічыў?!.. У хаце ўжо не было як, гэта ясна. Не павалачэш і на двор, зграбуць адразу. І тут Чаравячка ўспомніў.
Ён успомніў аб сваёй старой матацыклетцы. Аб той самай матацыклетцы, якую ён заводзіў у апошні раз, мо, тады, калі яшчэ вазіў Марыльку дзеўкаю на танчыкі-шманьчыкі ў местачковы клюб, і якая даўно стаяла зламанаю ў пунечцы. „Бляха, не завядзецца!..“ — смыльнула ў галаве Чаравячкі. Але разважаць не было калі.
Ён падхапіў вепручка, як ужо некалькі разоў хапаў яго за гэтую праклятую ноч, і павалок. Павалок проста нахабна й адкрыта з хаты праз двор да пунечкі, молячы Бога й Марыльку сваю, каб яна затрымала ў прыбудове міліцыянтаў, як магла падолей.
Вецер раптоўна сьціх, і першыя буйныя кроплі ўпалі на зямлю й халоднай вільгацьцю — на Грысеў твар. Яму пашчасьціла: з прыбудовы неслася гучнае гергетаньне Стралкоўскага й прыцішаны хрып Малюка, для якіх Марылька не пашкадавала апошні непрыкапаны трохлітровік.
Матацыклетка стаяла там, дзе калісьці кінуў яе Грысь: у кутку пад сенам, са спушчанымі коламі, з напалову разабраным рухавіком і завэзганай гноем люлькаю. „Не завядзецца, бляха!“ — зноў здрадніцкай пстрычкаю стрэліла думка. Надрываючыся ад кілы, Грысь увалок у каляску Магамая, так-сяк пачаў яго прыстойна ўсаджваць, нават нацягнуў моташлем, які, на дзіва, быў прышпілены да задняга сядала. Кабанчык, аднак, сядзець не хацеў. Ён, амаль што ацьверазеўшы, штосьці парохкваў ды наравіў выскачыць прэч.
— Сядзі, курва! — улімоніў кулаком яму ў лыч Грысь і ледзь сам не зароў ад болю: у кулаку нешта падазрона храснула, і каб сам Грысь у цемры мог нешта разгледзець, дык пабачыў бы, што скура на руцэ адразу счарнела. Магамай квікнуў, аднак на нейкі момант сьцішыўся. На дзіва, нешта бліснула каля

сьвінячага азадку ў люльцы. Начны зладзюган-бедачына хапянуў гэтае блішчастае. Гэта была пакрытая шматгадовым пылам пляшка зь нейкай вадкасьцю. „Самагонка!“ — вокаміг скеміў Грысь. Ані не разважаючы, ён выдзер зубамі корак і глыкнуў з бутэлькі столькі, колькі здолеў за адзін раз. У пляшцы, аднак, была не самагонка.
„Тваю маць!.. Бэнзыны насёрбаўся!“ — аж здурэў Чаравячка. Спрабуючы сплюнуць хоць трохі, ён адначасна ўрэзаў нагою па завадной лапцы, і… матацыклетка завялася, узраўла, затрашчала! Ужо ня ведаючы, што ён творыць, Чаравячка ўскочыў на сядала й вывернуў да канца газавую рукавятку.
Як толькі матацыклетка выбіла дзьверы з пунечкі й вылецела на двор, ёй насустрач кінуліся зь пісталетамі міліцыянты, відаць, пачуўшы яшчэ ў прыбудове ейнае мэталёва-скрыготнае ляскадрыньства.
— Стой! Куды?.. — ужо ня бачыў белага сьвету Стралкоўскі, якому з кожнаю хвіляю ўсё цяжэй было перамяшчаць у прасторы сваё напітае чэрава. Здавалася, ён вось-вось заваліцца сам у якую пуню на сена ці, на горшы выпадак, у салому, каб захрапсьці там на суткі ці болей…
— Як, куды? — Грысь ледзь не пераехаў хромавыя боты Малюка. — Ня бачыце — кума дахаты вязу.
У чарапку ўчастковага, а заадно й ягонага памочніка рабілася нешта страшэннае. Дакладней, там толькі драбабохала лядашчая матацыклетка, а болей… Ну, хіба яшчэ мільгацелі нейкія нэгроіды, скрадзеныя дыплёмы ці дыпляматы, местачковая поп-зорка Маня Сікірыцкая, селядцы з чакалядамі, неабсяжнае мора самагонкі, у якім плавалі жывыя індыкі ды смажаная парасяціна, ладна ўхвошчаная цыбуляю, кропам ды хрэнам… Яны спрабавалі добра ўгледзецца ў твар Грысевага кума, але бачылі толькі нейкае зарослае шчэцьцем мурло.
— Штосьці ён у цябе… да чалавека не падобны, — зрок глыбакадумна Малюк.
— Дык вочы гарэлкай заліў. Сьвіньня!.. — злосна дыхнуў бэнзынавымі парамі Чаравячка на непахісных службоўцаў. І, не чакаючы болей, пакуль яны ад гэткага дурнавенства так-сяк абмыляюцца-прадыхнуцца, урэзаў па газах.
— Стой! Стой! Страляць буду!.. Спыні мацыклетку, сволач!.. — адразу некалькі сухіх пісталетных стрэлаў ярка смыльнулі за сьпінаю матацыклетчыка.

Выбегла з прыбудовы на стрэлы Марылька й адразу звалілася, апусьцілася ў непрытомнасьці ў гразь каля хаты…
Але выперла матацыклетка з двара. І паперла, паперла яна вуліцаю, а потым ужо шашою, звозячы ў невядомае Грышку разам са скрадзеным гадаванчыкам Магамаем.
Навальніца раскашавала ва ўсю. Пярун біў нежартоўна. Грысь нічога ня бачыў, але ўпарта выкручваў газ. І толькі сьцяна вады злучала неба зь зямлёю — справа, зьлева, паўсюль. Кабанчык квічэў, тузаўся, лупіў капыточкам, куды толькі траплялася. І ўсё ж, падлюган, сядзеў, глядзеў паперад сябе ў ноч. Не раўнуючы, бы той пан міністар, якога вязуць на прыём у ангельскую амбасаду.
Раптам дакладна над матацыклеткаю вырвалася з чорнага воблака расшкуматанаю зьмяёю маланка, і сьмяротнаю немінучасьцю дакладна і трапна пацэліла ў голаў Грыся.
Але Грысь не памёр адразу.
Ён успыхнуў, бы тая паходня, запалаў рознакаляровым полымем, у якім было ўсё: і падсмаленая поўсьць, і первачына, і чалавечы тлушч, і нафтапрадукты, ды, выдыхаючы апошняе паветра з грудзей, мёртвай хваткаю ўчапіўся ў руль матацыклеткі.
І ляцела яна з прабітымі коламі па шашы скрозь навальнічную ноч, і разрываў залеву палаючы нерухомы вершнік, і ў страшэнным віскаце заходзіўся ў люльцы ні ў чым ня вінны вепручок, якому шлем зьехаў на самы лыч, назаўжды перакрываючы вольны подых…

Люты-сакавік 1999 году.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі

наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

крытыка

Томас Ман
Фрагмэнт пра Гётэ і Талстоя

Томас Ман (1875-1955) — нямецкі раманіст і крытык, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі 1929 году. З 1937 году празь нязгоду з гітлерызмам жыў у ЗША. Ягоныя творы на беларускую мову перакладаў Васіль Сёмуха.

У мастакоў, як малых, так і вялікіх, у аснове ўсіх адрозьненьняў творчасьці, само сабой зразумела, ляжыць асабістае, людзкое, канстытуцыянальнае. Гётэ і Талстой розьняцца ад абодвух сваіх хворых антыподаў, ад Шылера і Дастаеўскага, сухотніка і эпілептыка, моцнаю жывёльнаю асновай свайго іства, вітальнасьцю, якая дазволіла абодвум, нягледзячы на ўсе напяцьці жарсьцяў, што апаноўвалі іхнае жыцьцё, нягледзячы на неверагодныя ўчынкі і цяжкія перакрышы са здароўем, дасягнуць патрыярхальнага ўзросту. Хіба няма чагосьці брутальнага ў паганска-валатоўскай заўзятасьці, зь якой Гётэ часам выпруджваў сваю вітальнасьць, сваю нязломнасьць? Напрыклад, калі ўва ўзросьце 81 году ён казаў у размове з Сарэ: „Зёмэрынг памёр, пражыўшы нейкія няшчасныя 75 гадоў. Што ж за нягоднікі людзі, калі ня маюць сьмеласьці пратрываць болей! Магу толькі пахваліць майго сябра Бэнтама, гэтага надзвычай радыкальнага дурня; ён трымаецца добра, а ён жа на’т на некалькі тыдняў старэйшы за мяне“.

Пра Талстоя Горкі аднойчы сказаў надзвычай дзіўную і страшную рэч. Ён намінае на тое, што Талстой, магчыма, нягледзячы на свой моцны розум, часам спадзяваўся ці, прынамсі, думаў пра тое, што прырода зробіць для яго вынятак

і дасьць яму фізычную несьмяротнасьць. „Цэлы сьвет, цэлая Зямля глядзіць на яго, з Кітаю, Індыі, Амэрыкі цягнуцца да яго жывыя, трапяткія ніці, ягоная душа — для ўсіх і назаўсёды. Чаму б прыродзе не парушыць свайго закону, чаму б ня даць чалавеку фізычную несьмяротнасьць — чаму б не?“ Якое вар’яцтва! Але калі гэта няпраўда, калі гэты разумны стары чалавек ніколі ня быў апантаны так неверагодна саманадзейнай думкай, дык усё-ткі паказальна, што за яго пра гэта падумаў Горкі, гэта пазначае стаўленьне, якое, як падалося ўважліваму назіральніку, Талстой меў да прыроды, да жыцьця. А Гётэ? Думаеце, што старэнькі каханак фройляйн фон Левэцаў ніколі не сутыкаўся зь межамі жыцьця і чалавецтва, падобна як Напалеон, сутыкнуўшыся зь межамі ўлады, паскардзіўся, што людзі цяпер занадта моцныя скептыкі, каб прызнаць яго богам, як ягонага брата Аляксандра? Думаеце, што ён быў бы цалкам няздольны да думкі, якую Горкі прыпісвае старому Талстою: што прырода, магчыма, паўстрымаецца ад таго, каб зьнішчыць яго, свайго ўлюблёнага сына, як увесь іншы просты люд? Тым ня менш, ён раптоўна памёр у веку 83 гадоў. Прырода, так бы мовіць, мякка перахітрыла яго. Ён пакутаваў, ён утульна забіўся ў куток свайго фатэлю, каб адпачыць, задрамаць, і сышоў. Радкі, у якіх Экерман апісвае, як выглядала ягонае цела, сталі славутымі. „Цела ляжала аголенае, загорнутае ў белую прасьціну, блізка яго расставілі вялікія кавалкі лёду, каб трымаць яго як мага сьвежым. Фрыдрых (служка) раскрыў прасьціну, і я зьдзівіўся боскаму прыгаству гэтых чаланоў. Грудзі надзвычай магутныя, шырокія і пукатыя; на руках і сьцёгнах поўныя, з плаўнымі лініямі, цягліцы; ногі зграбныя і найчысьцейшае формы; і нідзе па ўсім целе ні каліва туку, ні сьледу схуднеласьці, змарнеласьці. Дасканалы чалавек ляжаў перада мною ўва ўсёй сваёй вялікай прыгажосьці, і захапленьне, якое я адчуваў, на некалькі імгненьняў прымусіла мяне забыцца, што несьмяротны дух пакінуў такую абалонку“. Тут ня трэба ўпадаць у непаразуменьне. Ніхто не сьцьвярджае, што Гётэ і Талстой былі няўклюдамі, што яны, у адрозьненьне ад хворых геніяў Шылера і Дастаеўскага, былі ў невуцкім сэнсе слова „нармальнымі“. Нават найбольш блаславёны прыродаю геній з гледзішча абываталя ніколі ня будзе натуральным, то бок, здаровым, нармальным і адпаведным правілу. У абсягу фізычнага геній заўжды мае шмат далікатнага і ўразьлівага,

схільнага да крызы і хваробы, у абсягу псыхічнага — заўжды шмат такога, чаго звычайная бальшыня цураецца, што трывожыць яе, набліжаецца да псыхапатычнага, хоць і нельга дазваляць абываталю так называць гэта... Не! Але йдзецца пра тую *пачуцьцёвую абдоранасьць*, якая належыць да асаблівае высакароднасьці антэйскага генія і якую вітае Гётэў Фаўст, зьвяртаючыся да *духу зямлі* з наступнымі словамі:
„Магутны, ўзьнёслы Дух, ты даў мне ўсё,
Чаго ў цябе прасіў. Ты нездарма,
Аблічча ў полымі сваё явіўшы,
Усю прыроду мне пад ногі кінуў
І сілу даў, каб здолеў я жыцьцё
Ня толькі подзівам халодным мераць,
Але й заглядваць у яго глыбіні,
Нібыта ў сэрца сябра дарагога...“* і г.д.

* *Пераклад Васіля Сёмухі*
Сілу адчуваць яе, цешыцца ёю. Пачуцьцёвы дар Талстоя, пераходзячы на асобы, быў, мусіць, дарам шляхотнага, надзвычай чулага зьвера, якому прырода дала ўсё, што толькі можна, — а рэфлектуючая сьвядомасьць чалавека ўзмацняла гэты дар, рабіла яго больш вытанчаным. Ягоныя вочы, малыя пранізьлівыя шэрыя вочы, пад густымі бровамі, былі вачмі сокала; яны бачылі ўсё. Яны былі здольныя і да праніклівага аналізу, глыбіня якога магла падавацца перабольшанай, што падштурхнула аднаго крытыка напісаць яму: „Вы часам у стане сказаць, што такая і такая асаблівасьць *фізычнага складу* чалавека сьведчыла, быццам ён хацеў паехаць у Індыю“. Асабліва навязьлівым, відавочна, было ягонае пачуцьцё паху. Яно моцна спрычыняецца да неверагоднай пачуцьцёвасьці ягоных твораў і ў сваёй настойлівасьці часам, здаецца, непрыемна закранае ягонае пачуцьцё пашаны да людзей. „Я надта не люблю пра гэта гаварыць, — кажа ён у сваіх успамінах, — але я дагэтуль памятаю характэрны рэзкі пах, які быў уласьцівы маёй цётцы і вынікаў, бадай, зь ейнай нядбайнасьці што да вопраткі“. І ў гэтых ягоных „прызнаньнях“, і ў ягоных позьніх дзёньніках можна знайсьці карціны прыроды, апісаньні настрою прыроды, пранізьліва шчырая пачуцьцёвасьць якіх ня мае сабе роўных у сусьветнай літаратуры. Стары распавядае, як у маленстве хадзіў з бабуляй

ірваць арэхі ў арэшнік. „Я згадваю, як горача было на сонечных прагалінах, як прыемна халадзіў цень, як мы ўдыхалі рэзкі пах арэхавага лісьця, як з усіх бакоў трашчалі арэхі на зубох дзяўчынак, што былі з намі, і як мы безупынна жавалі сьвежыя, поўныя, белыя ядры“. То бок, ужо ў пачцівым узросьце, пры вельмі аскетычным ладзе жыцьця, ён не згубіў гэтых інтэнсыўна-шчасьлівых, груба-здаровых і пачуцьцёвых успамінаў пра тое, што перажываў тады, і, пасьля старонак няўклюднага й блытанага маралізатарства, раптам ізноў робіцца мастаком.

Пачуцьцёвая зьнітаванасьць Гётэ з прыродай, ягоная прывязанасьць да зямнога, у адрозьненьне ад эманцыпатарскай свабоды Шылера, сягала так далёка, што ён сам называў сябе „беззаганным баромэтрам“. Нездарма ж кажуць, што ён уночы ў сваім пакоі адчуваў землятрус у Мэсіне, — гэтак сама, дарэчы, здольны да прадчуваньня такіх падзеяў і пачуцьцёва-нэрвовы апарат жывёлаў, — і тут мы бачым, як пачуцьцёвая ўзбуджальнасьць, зьвязаная самым беспасярэднім чынам з прыродай, перасягае межы ўласна пачуцьцёвага і адмяняецца ў звышпачуцьцёвае, прыродна-містычнае.

Калі ўзяць пачуцьцёвае ў вузейшым сэнсе слова, дык жа існавалі часы, калі Гётэ нават быў кімсьці падобным да бога садоў, і тады, напрыклад, у прысутнасьці дамаў можна было чытаць толькі тыя вэнэцыянскія эпіграмы, што накіраваныя супраць хрысьціянства і апосталаў свабоды, але іншых, гэтых *Carmina Priapea*, чытаць нельга. Гэтыя *Carmina Priapea*, спароджаныя антычнай нязмушанасьцю, якраз у той час цалкам вызначалі ягоную жыцьцёвую пазыцыю, і дзеля гэтага ён не адмаўляў свайму сэрцайку ў розных добрых рэчах, ведучы распуснае жыцьцё бязь лішніх сантымэнтаў і забабонаў. Гэты настрой, натуральна, ня быў уласьцівы Талстою, бо ягонаму іству бракавала антычнага культурнага элемэнту. Полавы юр у яго, такім чынам, меў не гуманістычна-антычную афарбоўку, а расейска-размашыстую, ды пры гэтым заўсёды зацямняўся маралізмам, і глыбокая каята, верагодна, ня толькі наступнічала, але нават ужо спадарожнічала яму. Бо ачалавечваньне для яго значыць не ўзвышэньне прыроднага, то бок культуру, але пазбаўленьне ад прыроднага. Вызваленьне ад прыроднага, ад усяго натуральнага наагул і асабліва ад таго, што было натуральным для яго, напрыклад, сям’і, нацыі,

дзяржавы, народнай царквы, усіх пачуцьцёвых і інстынктыўных жарсьцяў, каханьня, паляваньня, па сутнасьці, ад усяго цялеснага жыцьця, але асабліва ад мастацтва, самое іство якога для яго азначае пачуцьцёвасьць і цялеснае жыцьцё, — гэткага роду ачалавечваньне становіць сабой аб'ект змаганьня ягонага жыцьця. Зусім няслушна ўяўляць сабе гэтае змаганьне як раптоўна адбыты ў сталым узросьце паварот у спосабе мысьленьня, няслушна думаць, што яго пачатак супадае з пачаткам старасьці Талстоя. Француз Вог цалкам меў рацыю, калі ў адказ на навіну, што вялікі расейскі пісьменьнік цяпер „бы спараліжаваны своеасаблівай містычнай маніяй", абвесьціў, што ён даўна гэта прадбачыў, маўляў, у зародку ўсё разьвіцьцё думак Талстоя ўтрымлівалася яшчэ ў рамане „Маленства і хлапецтва", а псыхалёгія „Ганны Карэнінай" ясна паказвае кірунак ягонага далейшага разьвіцьця. Мы маем таксама сьведчаньні таварышаў Талстоя з часоў, калі ён быў афіцэрам, зь севастопальскіх часоў, — сьведчаньні, якія дазваляюць ясна ўявіць сабе лютасьць, зь якой ужо тады бушавала ўсярэдзіне яго гэтае змаганьне. Паводле аднаго з такіх апісаньняў, малады граф Талстой быў цудоўным таварышам, душою сваёй батарэі, меў іскрысты тэмпэрамэнт. Калі ён адсутнічаў, панавала прыгнечанасьць. „Пра яго нічога не было чуваць дзень, два, тры... нарэшце ён вяртаўся... і выглядаў, як блудны сын, — змрочны, змораны, у разладзе з сабой самім. Ён адводзіў мяне ў бок і пачынаў спавядацца. Ён прызнаваўся ўва ўсім, проста ўва ўсім, у сваіх пагулянках, гульні ў карты, за якой ён бавіў дні і ночы, і, ці можаце вы паверыць, ягоная каята і ягоныя пакуты былі такія глыбокія, быццам ён зьдзейсьніў жудаснае злачынства. Ягоная роспач была настолькі бязьмежнаю, што на гэта *сорамна было глядзець*... Такім ён быў чалавекам. Адным словам, ён быў незвычайны, і, праўду казаць, не зусім мне зразумелы".
Мы можам гэтаму паверыць. „Сорамная роспач", сьведкам якой даводзілася быць гэтаму маладому афіцэру, паходзіла з таго самага ўнутранага разладу, які пазьней зрабіў Талстоя адным з найвялікшых абуджальнікаў сумленьня, адным з тых, хто выклікаў наймацнейшы страх перад Богам у людзей. Але якраз глыбіня ягонае маральнае патрабавальнасьці сьведчыць пра магутнасьць ягоных поцягаў, і калі прыроднае ўсё больш а больш для ягонай хрысьціянскасьці ператваралася ў цяжкую

ношу, джала, ад якога яна шукала спакою, дык яна ніколі не дасягнула гэтага спакою, да самага канца. У сэксуальным сэнсе Талстой пратрываў гэтаксама доўга, як Гётэ, які падкеплівaў з самога сябе:

Стары, ты ўсё ня спынішся?

Увесь час дзяўчаты! — але ягонае духовае стаўленьне да жанчыны, якую ён рана навучыўся ўспрымаць як *instrumentum diaboli*, у стылі айцоў царквы, даўна склалася такім чынам, што перажываньні накшталт тых, што былі паміж старым Гётэ і Ульрыкай, былі ў стасунку да яго неймавернымі. Але пры ўсім гэтым дзіўна, а зрэшты, зважаючы на вялікасьць і магутнасьць ягоных прыроджаных здольнасьцяў, можа і натуральна тое, што ў ягоным стаўленьні да гэтых рэчаў нельга знайсьці ні сьледу ханжаства, манернасьці ці нават штучнай далікатнасьці. Наадварот: ягоным выказваньням на гэтую тэму была ўласьцівая паганская шчырасьць, велічыня якой мяжуе з цынізмам. Ён шпацыруе з Горкім і Антонам Чэхавым уздоўж мора і раптам зьвяртаецца да Чэхава з пытаньнем, якое датычыць юнацкай мінуўшчыны апошняга, выкарыстоўваючы пры гэтым біблійны выраз грубай урачыстасьці. Разгублены Антон Паўлавіч мармыча нешта, паскубваючы бародку. Стары ж, счакаўшы ягонае мармытаньне, у чатырох словах складае, гледзячы ў бок мора, надзвычай пазытыўнае прызнаньне што да сваіх собскіх паводзінаў і заканчвае яго моцным і грубым сялянскім выразам. „Сыходзячы зь ягоных суворых вуснаў, — кажа Горкі, — усе словы гэтага кшталту гучаць проста і натуральна, губляючы сваю салдацкую грубасьць“. У іншым месцы ён кажа: „Калі б Леў Мікалаевіч быў *прыродазнаўцам*, ён, безумоўна, выставіў бы найдасьціпнейшыя гіпотэзы, зрабіў бы найвялікшыя адкрыцьці“. Горкі кажа гэта ня ў зьвязку з магутным пачуцьцёвым пачаткам у істве Талстоя; але мы схіляемся да таго, каб зьвязаць гэтыя рэчы. Ён, здаецца, таксама і не ўспамінае Гётэ, прыпісваючы Талстою сукрыты прыродазнаўчы геній; але мы, з нашага боку, згадаем і яго. І наступны факт падаецца нам не зусім выпадковым: гэта зьдзеялася ў Вэнэцыі, у 1790 годзе, адначасна з тымі пачуцьцёвымі авантурамі, пра якія сьведчаць эпіграмы; Гётэ, прыглядаючыся да расколатага авечага чэрапу на гаку паміж затокай і морам, прыйшоў да той марфалягічнай высновы пра ўзьнікненьне ўсіх чэрапавых костак з костак хрыбетніка, якая

так важка спрычынілася да тлумачэньня мэтамарфозы жывёльнага арганізму. Зусім ясна, што Горкі мае на ўвеце, кажучы, што Талстой зрабіў бы геніяльныя прыродазнаўчыя адкрыцьці, калі б пачаў займацца прыродазнаўствам. Перад намі глыбіннае перажыванье блаславёнымі прыродай людзьмі арганічнага жыцьця, — перажыванье, ад якога ня так далёка да эрасу і якое спараджала біялягічныя інтуіцыі Гётэ, напрыклад, ягонае неверагодна ўпэўненае прадказаньне клетачнай тэорыі. Хіба яно, гэтае перажыванье, не выяўляецца ўжо ў юнацкім патасе Гётэвага „Ганімэду“? У гэтым „З тысячакротнай любоўнай асалодай да майго сэрца прабіваецца сьвятое пачуцьцё тваёй вечнай цепліні“, у гэтым „Наверх да тваіх грудзей, усёлюбны айцец“? Хіба яно не выяўляецца ў пантэізьме Гётэ, які ёсьць адно аб’ектывацыяй ягонага пачуцьця, „так, што ўласная адданасьць усяму“ прымушае яго адчуваць „боскасьць не як нешта вонкавае, а як усёпрасякальнае“? Ува ўсякім разе, яно, гэтае арганічнае перажыванье, гэты любоўны інтарэс, цалкам і поўніцай скіраванае на жыцьцё, на „вечную цепліню“, — тымчасам як (і што б іншае магло больш характэрна пазначыць адрознасьць двух вялікіх дзяцей прыроды!) наймагутнейшы, найбольш пакутлівы, найглыбейшы і найбольш прадукцыйны інтарэс Талстоя — гэта інтарэс да *сьмерці*. Менавіта думка пра сьмерць апаноўвае ягоныя пачуцьці і творчасьць у такой ступені, што можна сказаць: ніводны майстар сусьветнай літаратуры не адчуваў і не паказваў сьмерці так, як ён, — ніхто не адчуваў яе так жудасна пранізьліва і не паказваў так ненасытна часта. Геній Талстоя ў літаратурнай выведцы сьмерці насамрэч дапаўняе прыродазнаўчую інтуіцыю Гётэ, а перажыванье арганічнага ёсьць асноватворным момантам для абодвух. Сьмерць — вельмі пачуцьцёвая, вельмі цялесная справа, і нават цяжка сказаць, ці цікавіцца Талстой так сьмерцю таму, што так моцна і пачуцьцёва цікавіцца целам, прыродай як цялесным жыцьцём, ці — наадварот. Ува ўсякім разе, таксама і ў ягонай пільнай увазе да сьмерці ёсьць *любоў*: бо боязь сьмерці, гэтая крыніца паэзіі і рэлігійнасьці Талстоя — гэта прыродная любоўная боязь, яна ёсьць нэгатыўна-натуралістычным бокам Гётэвай узьнёсласьці ў „Ганімэдзе“. „Ты праводзіш“, кажа Гётэ-Фаўст духу зямлі, Ты праводзіш шэраг жывых
Паўзь мяне і вучыш мяне пазнаваць маіх братоў

У цішы кустоў, у паветры і вадзе… Маіх братоў: вядома, што менавіта Гётэ выказаў думку аб тым, што „чалавек — найбліжэйшы сваяк зьвяроў“, так сур’ёзна, як ніколі дагэтуль не падступалася да гэтай думкі навука; і перапоўненасьць гэтай думкай, якая станавіла сабой ягонае глыбокае, сапраўднае пераканаьне, вельмі характэрная для гэтага дзіцяці прыроды і ягонага перажываньня арганічнага. Шылераваму гуманізму, ягонаму паняцьцю чалавецкасьці, якое мела эманцыпатарскі характар, якое грунтавалася на гордай варожасьці да прыроды, ня надта даспадобы была б гэтая думка, а чалавек не натрапляе на думкі, якія яму не падабаюцца, то бок не вітаюцца ідэйна. Няма „навукі без перадумоваў“. Навуковыя адкрыцьці заўсёды ёсьць вынікам ідэйнай перадумовы; сярэднявечная прымаўка „я веру, таму што пазнаю“ заўжды будзе слушная; вера — гэта орган пазнаньня, і Гётэ ніколі не знайшоў бы ў чалавека *os intermaxillare*, калі б папярэдне ня склаў сабе, не прад-вызначыў ідэю пэўнай цэльнай карціны — паводле якой вышэйшы жывёльны сьвет фармаваўся побач з чалавекам і якой у абсягу батанікі адпавядае пашыраная ідэя аб „пра-расьліне“. Паміж фактам гэтага адкрыцьця і тым тлумачэньнем, якое Гётэ дае гэтаму ў чалавеку, ёсьць гумарыстычная супярэчнасьць. Міжсківічная костка, кажа ён, якая ў зьвяроў мае розную форму ў залежнасьці ад варункаў і патрэбы, — у чалавеку, урэшце, у найбольш высакародным стварэньні, сарамліва хаваецца „з боязі выявіць жывёльную пражэрлівасьць“. Ідэалістычнае захапленьне чалавекам магло б зрабіць закід, што досыць негуманна тады адкрываць і ўсім паказваць тое, што сарамліва хаваецца. І тым ня менш, якраз гэта і ёсьць паказальным ды вельмі значным: у Гётэ біялягічна-мэдыцынскае ў сутнасьці сваёй зьнітавана з гуманістычным інтарэсам, з інтарэсам да чалавека і ягонага хараства, а такім чынам таксама і з мастацтвам, бо мастацтва ёсьць для яго гуманістычнай дысцыплінай, а ўсе дысцыпліны і факультэты людзкога дасьледаваньня, ведаў і ўменьняў становяць для яго адценьні й варыяцыі аднаго і таго ж вялікага, настойлівага і любоўнага інтарэсу і памкненьня, інтарэсу да чалавека. Узіраньне ў чалавечае з прыродазнаўча-мэдыцынскага гледзішча ў ягоным выпадку ня мела каранёў у сямейнай традыцыі, як у Шылера і Дастаеўскага, якія абодва былі сынамі лекараў, але ніколі не пераймаліся целам чалавека. Пра Гётэ, наадварот, вядома, што

ён, пачынаючы ад часу, калі быў у Ляйпцыгу, пераймаўся мэдыцынскімі дасьледаваньнямі, у Страсбургу штодня меў стасункі з мэдыкамі і працаваў у сэкцыйнай залі, у аддзяленьні тэрапіі і ў радзільным аддзяленьні з такой сур'ёзнасьцяй, быццам ягонай будучай прафэсіяй былі ня так званыя „прыгожыя навукі", а, скажам, хірургія. Дух, зь якім ён займаўся гэтымі дасьледаваньнямі, інтарэс, зь якім ён аддаваўся ім, раскрываюцца тым фактам, што пазьней ён нават чытаў у мастацкай акадэміі лекцыі пра будову костак людзкога цела маладым мастакам. [...] Ён рана адчуў і выказаў тое, што пазнаньне мастацтва і пазнаньне прыроды ўзаемна паглыбляюць адно аднога. „Як я разглядаю прыроду, — піша ён з Рыму, — гэтак я разглядаю цяпер і мастацтва, я набываю, да чаго я так доўга імкнуўся, дасканалыя веды таксама і аб найвышэйшых творах людзей, і *мая душа адукоўваецца* таксама і з гэтага боку і бачыць вальнейшае поле". „Цяпер для мяне дойлідзтва, мастацтва скульптуры і жывапіс — як мінэралёгія, батаніка ды заалёгія", — піша ён у лісьце да Гердэра. А іншага разу: „Урэшце, у нашай мастацкай дзейнасьці мы можам спаборнічаць з прыродай толькі пасьля таго, як у пэўнай ступені навучымся ад яе спосабу, якім яна дзейнічае пры стварэньні сваіх твораў... Вобраз чалавека ня можа быць зразуметы адно праз разгляд ягонае паверхні: трэба агаліць ягонае нутро, вылучыць ягоныя часткі, заўважыць сувязі паміж імі, уведаць адрозьненьні, даведацца пра дзеяньне і процідзеяньне, запомніць сукрытае, тое, што сьпіць, фундамэнт зьявы, калі мы сапраўды хочам бачыць і насьледаваць таму прыўкраснаму непадзельнаму цэляму, што жывымі хвалямі калыхаецца перад нашымі вачыма". Гэта словы Гётэ, і хто ж будзе сумнявацца ў іхнай праўдзівасьці? Хто можа запярэчыць, што мастаку карысна таксама трохі ведаць, што там пад эпідэрмісам, каб магчыма было намаляваць таксама і тое, што нельга ўбачыць; іншымі словамі: калі ён мае да прыроды нейкае іншае дачыненьне, апроч лірычнага, калі ён, напрыклад, па сумяшчальніцтве лекар, фізіёляг, анатам і мае таксама сваё ціхмянае ўяўленьне пра жаночую бялізну? Абалонка людзкога цела складаецца ня толькі са сьлізістых ды рогавых слаёў эпідэрмісу, яна складаецца таксама і з тканіны дэрмы зь ейнымі сальнымі і потавымі залозамі, крывяноснымі судзінамі і бародаўкамі, а пад ёю, зноў жа, тлушчавая праслойка,

шматлікім тлушчавым клеткам якой увогуле заўдзячваецца чароўнасьць формы. Але тое, што ёсьць у ведах і думках, ёсьць таксама і ў словах; яно цячэ па руцэ і спраўляе сваё ўзьдзеяньне, яго няма і ўсё-ткі яно неяк ёсьць, і менавіта гэта спараджае нагляднасьць. Мастацтва, як мы казалі, ёсьць толькі адной гуманітарнай дысцыплінай сярод іншых; усе яны, філязофія, юрыспрудэнцыя, мэдыцына, тэалёгія ды нават і прыродазнаўчыя навукі й тэхналёгія, ёсьць адно мадыфікацыямі і разнавіднасьцямі адной і той жа высокай і цікавай рэчы, у стаўленьні да якой ніколі ня можа быць дастатковай разнастайнасьці і шматбаковасьці, бо гэта чалавек; а *вобраз чалавека* ёсьць увасабленьнем усяго яго, гэты вобраз, кажучы словамі Гётэ, ёсьць „*non plus ultra* ўсіх людзкіх ведаў і ўчынкаў“, „альфай і амэгай усіх вядомых нам рэчаў“.

1921
Зь нямецкай мовы пераклаў Алесь Пяткевіч паводле
Thomas Mann. Gesammelte Schrihten
© S. Fischer Verlag GmbH, Frankfurt am Main 1977.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

крытыка

Вальтэр Бэн'ямін
Расейскія дэбаты па-нямецку

Вальтэр Бэн'ямін (1892-1940) — адна з найцікавейшых постацяў эўрапейскага інтэлектуальнага жыцьця ў міжваенны пэрыяд, журналіст, філёзаф, эстэтык. Нарадзіўся і дзіцячыя гады правёў у Бэрліне. Вывучаў філязофію, нямецкую літаратуру ўва ўнівэрсытэтах Фрайбургу, Мюнхену, Бэрліну і Бэрну. Аўтар шматлікіх працаў, прысьвечаных эстэтыцы мастацкай творчасьці. Блізкі знаёмы Тэадора В.Адорна, паплечнік Бэртольта Брэхта. Разам з апошнім рataваўся ўцёкамі з фашысцкай Нямеччыны і абсеў у Данii. У выніку захопу Данii гітлерскімі войскамі быў інтэрнаваны ў канцлягер і пасьля няўдалай спробы ўцячы ў Гішпанію празь Пірэнэі зрабіў сабе сьмерць.

Буржуазія, сказаў вялікі гішпанскі філёзаф дзяржавы Даноса Картэс, — гэта вечна дыскутуючая кляса. У аснове гэтага зьняважлівага і вельмі глыбокага азначэньня ляжыць пагардлівае стаўленьне да дыскусіяў, пашыранае і сёньня. Тое, наколькі паменела ахвота да дыскутаваньня, нават ёсьць адметнай рысай паваеннага часу. Заняпад красамоўнасьці, абыякавасьць да ўсякага прыватнага меркаваньня, памяншэньне палітычнай талерантнасьці, узрастаньне веры ў аўтарытэты — галоўныя прычыны гэтай новай тэндэнцыі, плённай тэндэнцыі, тэндэнцыі, якой трэба спрыяць, але адваротны бок якой ужо можна прадбачыць. Прычым гэта будзе

не паваротам моды, калі нешта пройдзенае зноў выбіваецца на пярэдні плян, а хутчэй пераваротам у сутнасьці дыскусіі, якая зусім не мусова павінна быць той бязладнай, бязьмежнай рэчай, якою мы навучыліся пагарджаць. Але каб яна стала чымсьці іншым, трэба адкінуць аблудны прынцып, паводле якога сэнс дыскусіі нібыта палягае ў тым, што праціўнікі спрабуюць пераканаць адзін аднаго — ці нават паразумецца адзін з адным. Зь іншага боку, гэтаксама трэба адкінуць дэмагагічнасьць, тую рысу, якая — у найлепшым выпадку — уласьцівая тым прамовам у райхстагу, якія прамаўляюцца з акна і ня ў спальню. Адылі нагода даведацца, як бы маглі выглядаць карысныя дэбаты, трапляецца вельмі рэдка, і таму варта разгледзець дыскусію, якая адбылася ў Бэрліне на адным з апошніх сходаў „Задзіночаньня сяброў новай Расеі“. Дакладчык, праф. В.Брык з Масквы, загадзя абвесьціў, што хоча выступіць з палемічным зваротам. Аднак сваіх праціўнікаў — што трохі асьцюдзіла патас ягонага выступу — ён шукае ў Маскве, ня тут. Хто яны? Ну, найперш усе расейскія літаратары, імёны якіх калі-небудзь чула нямецкая публіка, пачынаючы ад І.Бабеля з Будзёнаўскай коннай арміі да Панфёрава, які назіраў узьнікненьне ў сваёй вёсцы грамады беднякоў. Ягоныя аргумэнты? Але, перш як іх паведаміць, мы ўжо цяпер мусім выступіць у іх абарону, бо настолькі гратэскавымі яны пададуцца эўрапейцу. Дык вось, варта ведаць, што Брык — вэтэран рэвалюцыі, што ён студэнтам браў удзел у падзеях 1905 году, пазьней быў сярод першых, хто стаў пад сьцяг ваяўнічага бальшавізму, што ягоная страсьць і ягонае мысьленьне аддадзеныя новаму і што ягоная праграма зусім далёкая ад таго, каб быць вызначальнай для літаратараў у Расеі. Калі кагосьці — тут ці ў яго дома — усё ж сшакуе наіўнасьць ягоных аргумэнтаў, дык няхай той згадае, што далёка ня ўсе, і перадусім не найважнейшыя мастацкія дэбаты — пачынаючы ад плятонаўскіх, якія адмаўляюць існаваньне дзяржавы паэтаў, — вяліся на мове эстэтычных паняткаў. І ўжо напэўна няможна чакаць гэтага ад змаганьня, скіраванага супраць самога існаваньня мастацтва ўвогуле. Праўда, з апошнім цьверджаньнем Брык, бадай, не зусім пагадзіўся б. Ён гэтага не казаў, а толькі патрабаваў, каб мастацтва безумоўна стала на службу прапагандзе. Але як далёкі ён пры гэтым ад знаёмых нам дэбатаў аб заканамернасьці тэндэнцыі, найлепш

паказваюць ягоныя прыклады. Во ў Панфёрава „Грамада беднякоў“ — безумоўна, харошы раман; прынамсі, паводле формы раман такі ж самы, як іншыя, людзі там адлюстроўваюцца рэалістычна; больш абачліва кажучы: адлюстроўваюцца так, як мы прызвычаіліся іх бачыць. „Але, — кажа Брык, — што нам да гэтага? Што нам да беднага селяніна, шчырага камуніста, праўда, п’яніцы? Ці што нам да багатага селяніна, эксплюататара, але які, праўда, мае добрае сэрца? Ці будзе камуністам селянін, які п’е? Ці добрае сэрца эксплюататара сапраўды добрае?“ Або — і тут іканаборчая зацятасьць ягоных развагаў робіцца шчэ больш выяўнаю — Бабель апавёў пра конную армію Будзёнага. „Але, — сказаў Будзёны, прачытаўшы гэтую кнігу, — насамрэч усё было зусім іначай. Мае людзі з тымі, якіх апісвае Бабель, ня маюць нічога супольнага“. „І які ж сэнс у тым, — працягвае Брык, — каб зынакшыць гістарычную рэчаіснасьць, якую ўсе мы зазналі, якую можна спраўдзіць, на „цікавы“ лад?“ Але калі тут Брык выступае за гістарычную праўдзівасьць, дык у іншых выпадках ён сам зласьліва нападае на тых, хто ў сваёй эпічнай творчасьці кіруецца прынцыпам аб’ектыўнасьці. Фактычную аб’ектыўнасьць і паэтычны індывідуалізм ён абвяшчае складнікамі, рознымі бакамі адной і той жа літаратурнай пазыцыі — буржуазнай. Як тлумачыцца супярэчнасьць? Проста. Тое, што робіць яго то прыхільнікам пэдантычнага рэалізму, то праціўнікам аб’ектыўнай пазыцыі, у абодвух выпадках аказваецца тым жа самым: прынцыпам першынства рэвалюцыйнага духу.

Уся дыскусія вядзецца наўкола гэтага прынцыпу. І яна была б захапляльнай нават тады, калі б у цягу яе так і не ўдалося цалкам высьветліць пункт гледжаньня Брыка, для якога рэвалюцыйны дух, бадай, перабывае ня столькі ў нечым адбытым, нават у тых дзесяцёх днёх, што ўзрушылі сьвет, колькі ў актуальным у дадзены момант лёзунгу. Вілянд Герцфэльдэ, кіраўнік выдавецтва *Malik*, рашуча выступіў за перавагу кнігі над гатовым шаблёнам, аб’ектыўнага раману над прапагандысцкім аповедам, што перасьледуе тактычныя мэты. І калі ён запатрабаваў, каб для шырокай масы чытачоў ствараліся вельмі паважныя кнігі, у якія можна ўчытвацца, героі якіх могуць дапамагчы забыцца, хто ты такі, бо толькі такія кнігі могуць узрушыць масы — „раманы ад шпіку

касьцей“, як назваў іх аднойчы Г’ю Ўолпэл у сваім бліскучым артыкуле, — дык і кіраўніку расейскага дзяржаўнага выдавецтва, відаць, давялося б пагадзіцца зь ім. Але што адказаць Брыку, калі ён спасылаецца на шмат каму вядомы „Цэмэнт“ Гладкова, як выявіць яму абсурднасьць таго, што рэжым абвяшчае сям’ю неістотнай, але ягоныя пісьменьнікі апранаюць свае гісторыі з жыцьця Савецкага Саюзу ў старыя шаты сямейнага раману? Шкада, што ён не наважыўся пайсьці далей і пакінуў больш яснае агучаньне праграмы прапагандысцкай літаратуры на іншага ўдзельніка дыскусіі. Той слушна пачаў з пытаньня пра тое, што такое сапраўднае ўзьдзеяньне, каб пасьля засьведчыць сваю поўную незадаволенасьць простым сугестыўным ці дэмагагічным узьдзеяньнем на масы і прызнаць каштоўнасьць прапагандысцкай літаратуры толькі ў якасьці дыдактычнай. „Мы гатовыя, — так ён сказаў, — прынесьці ў ахвяру індывідуальнасьць пісьменніка, прэтэнзію твораў на вечнасьць, аб’ектыўнасьць аповеду. Але ня дзеля таго, каб абмяніць іх на прымітыўную сугестыўную літаратуру, літаратуру лёзунгаў, а каб расчысьціць шлях літаратуры сапраўдных аўтарытэтаў. Мы хочам, каб людзі пад час чытаньня не атрымлівалі асалоду, а вучыліся, удасканальваліся; нам ня трэба бязглуздых рэакцый“. Пакуль добра. З розных бакоў атакавалі скрайнюю пазыцыю прамоўцы, але не ягоную „пляцформу“, як кажуць у Маскве. Амаль ніхто ў залі, магчыма, нават рэфэрэнт, ня ведаў, кім быў той чалавек, які напрыканцы ўстаў, каб страсна, грунтоўна, пераканана зьнішчыць ня толькі прамоўцу, але і ягоную „пляцформу“. Тым ня менш, Бэла Ілеш — такім было ягонае імя — досыць добра вядомы ў Нямеччыне. Мы маем пераклады некалькіх ягоных кніг. Але ж для Расеі ён больш чым проста аўтар. Доўгі час ён выконваў у аддзеле культуры ролю цэнзара, адваката дзяржавы, прадстаўніка афіцыёзнага і артадаксальнага кірунку — прынамсі, ён сам спрабаваў прэзэнтаваць стан рэчаў такім чынам. Ён узяў слова: „Хто вы такія? Тупая, мізэрная меншыня, бязмоўная групка. Хочаце нарабіць тут шуму? Вы ня памятаеце распараджэньня ЦК (Цэнтральнага Камітэту) вывучаць якраз клясыкаў — Пушкіна, Дастаеўскага, Талстоя, — на якіх вы тут нападаеце? Вы кажаце: яны ня продкі пралетарскай літаратуры. Нашыя продкі, кажаце вы, невядомыя, але з гэтай прычыны яны ня менеў вялікія.

Самы панятак расейскай літаратуры, кажаце вы, рэакцыйны. Аўтары інтэрнацыянальнага пралетарыяту — нашыя продкі? Але ад каго вучыцца нашым маладым аўтарам? Што павінны чытаць нашыя працоўныя масы, адклаўшы ў бок газэту? Як вы маніцеся падахвочваць і ўздымаць да справы, калі вы пазбаўляеце чытача магчымасьці захапляцца героем, насьледаваць герою? Вы вылучаеце свае абмежаваньні да раману. Ягоная аб'ектыўнасьць вам не даспадобы, кажаце вы. Хіба — тут прамоўца закідвае лясо сваёй аргумэнтацыі для вырашальнага кідка — аб'ектыўная рэчаіснасьць савецкай дзяржавы — гэта нешта такое, што трэба хаваць, што можа пашкодзіць прапагандзе? Хіба не аб'ектыўнае адлюстраваньне нашага жыцьця — найлепшы сродак прапаганды?"
Гэтая прамова, мастацтва дыспуту *in nuce*, магла падацца вартай увагі шмат каму з тых, хто яе чуў. І магчыма, яе завяршэньне камусьці нагадала знакаміты пачатак працэсаў над вядзьмаркамі. „Ці ты верыш, што вядзьмаркі ёсьць?" — зьвяртаецца інквізытар да злачынцы. Калі яна адказвае „так", ён працягвае: „Адкуль жа ты гэта ведаеш?" Калі адказ — „не", працяг наступны: „Тады ты блюзьнерка, бо сьвятая царква вучыць, што вядзьмаркі ёсьць". Але было б вельмі няслушна складаць сабе меркаваньне на падставе аналёгіяў, нават самых лягічных. Расейскай рэвалюцыі ўласьцівая адметнасьць, якая для Эўропы мае выняткоўы характар, а наймя: тое, што можна памысьліць, мае наступствы. Наступствы як з прычыны агромністага апарату, які ў Расеі стаіць на службе распаўсюджаньня ідэй, як у нас распаўсюджаньня шаўковых панчохаў ці цыгарэт, так і з прычыны цёмнасьці масаў, у якія рэвалюцыя ўпершыню ўкараняе ідэі. І таму яна мусіць кантраляваць тое, што можна памысьліць. Ёй даводзіцца рабіць ідэям перакрыжаваны допыт — судовы разбор ёсьць і будзе схемаю працэсу, калі словы падаюць на шалі. Праўда, мусіць яшчэ быць рука, што трымае шалі. Убачыць, што руку юстыцыі замяніла рука рэвалюцыі, было навукаю гэтага вечару.
1930
Зь нямецкай мовы пераклаў Алесь Пяткевіч паводле
W. Benjamin, Gesammelte Schriften IV, 1. Frankfurt am Main 1980.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

[image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

да Зьместу 1(6)-2000
гуманістыка

Мікола Рабчук
Канец Вялікай Паўзы
(У аснову артыкулу пакладзены выступ у Маскве на сустрэчы пісьменьнікаў СНД і Балтыі, арганізаванай часопісам „Дружба народов“ 8-10 сьнежня 1998 г.)

Мікола Рабчук — стваральнік і адказны рэдактар кіеўскага месячніка „Критика“, адзін з сузаснавальнікаў часопіса „Дух і Літера“, ключавая фігура інтэлектуальнага жыцьця Ўкраіны. У 80-х гадах стаў вядомы як паэт, празаік, перакладчык. Першым з крытыкаў паддаў сумненьню формы і зьмест „традыцыяналісцкага“ дыскурсу ва ўкраінскай літаратуры 80—90-х гадоў. Адзін з ініцыятараў утварэньня Асацыяцыі ўкраінскіх пісьменьнікаў, альтэрнатыўнай афіцыйнай Суполцы пісьменьнікаў Украіны. Ягонае іранічнае апавяданьне „Да Чаплі на раджэньне“ перакладалася на беларускую мову („Наша Ніва“, 1999). У 70-х — пэрсанаж львоўскага

андэграўнду, літаратар-дысыдэнт, які вымушаны быў працаваць у цырку. Ягоная жонка — Наталка Белацэрківец, аўтарка слыннага верша „Мы памрэм не ў Парыжы“. Сярод ягоных апошніх публікацыяў — „Украінская інтэлігенцыя ў пошуках меншага зла“ („Критика“, 1999; у скарочаным выглядзе „Наша Ніва“, 1999), *Von „Kleinrussland“ bis „Indoeuropa“: Das Stereotyp der Nation im Denken und Bewusstsein der ukrainschen Gesellschaft* у зборніку *Stereotypen und Nationen* (Кракаў, 1999), „Імпэрскі выклік, нацыяналістычны адказ: супрацьстаяньне дзьвюх міталёгій“ („Фрагмэнты“, 1998).

Нядаўна я прывёз зь Любляны немалы стос кніжак, зь якіх я прачытаў толькі адну — „Касмапалітычную мэтафару“ майго добрага сябра Алеша Дэбэляка. Праглынуў я яе найпершаю ня толькі таму, што яе аўтар — мой калега, а таксама і таму, што гэта быў не славенскі арыгінал, а славацкі (гэта значыць, значна больш даступны для нас, украінцаў) пераклад, выдадзены ў Браціславе. У сувязі з гэтым можна было б паразважаць над тым, як славакі сёньня перакладаюць славенцаў, палякі — беларусаў, а ўкраінцы — скажам, аўстрыйцаў. Але я пакіну гэты сюжэт для іншай дыскусіі, бо кнігу Дэбэляка я згадаў зь іншай прычыны. У адным з эсэ гэты даволі малады і надзвычай таленавіты славенскі пісьменьнік зь вялікай сымпатыяй і, я б сказаў, настальгіяй згадвае сваю „югаслаўскую“ маладосьць — канец 70-х — 80-я гады. Ён піша пра асабістыя кантакты з харвацкімі, сэрбскімі, македонскімі пісьменьнікамі, прадстаўнікамі пераважна альтэрнатыўнага, неафіцыйнага мастацтва, піша пра багемныя тусоўкі ў Загрэбе і Сараеве, пра паэтычныя вечары над Ахрыдзкім возерам, пра забойныя рок-гурты і кайфовыя пэрформансы, пра цудоўны (калісьці) Вукавар і ўсё яшчэ зацішныя „габсбурскія“ мястэчкі Ваяводзіны, пра калекцыю сэрбскіх, харвацкіх, македонскіх кніжак на сваіх паліцах. Алеш Дэбэляк ня тужыць па „Вялікай Югаславіі“ і, вядома, ня марыць пра нейкае яе аднаўленьне (сама думка гэта выглядала б сёньня ў Славеніі як кепскі жарт ці кашмарны сон); ён толькі канстатуе, што ў панурай сацыялістычнай камуналцы

гэтаксама былі сьветлыя дні і сьветлыя закуткі і што, скідаючы ненавісныя нам палітычныя кайданы, мы разам з тым разарвалі і зусім няшкодныя, а можа нават карысныя ніткі міжкультурных кантактаў, міжасабовых стасункаў.

Мне вельмі блізкая і зразумелая гэтая пазыцыя, хоць я, як і мой славенскі калега, зьяўляюся самым заўзятым „незалежнікам“ і самым ярым „эўропацэнтрыстам“. Але ўсё ж я вучыўся ў Маскве, наведваў файныя маскоўскія тэатры, музэі, бібліятэкі, адкрываў для сябе сучасную расейскую літаратуру (ня толькі афіцыйна дазволеную), слухаў лекцыі цудоўных прафэсараў, якім у Маскве, у адрозьненьне ад Украіны, дазвалялася вальнадумнічаць (розьніца паміж сталінскім таталітарызмам і брэжнеўскім аўтарытарызмам выяўлялася, такім чынам, для мяне як праблема ня толькі і нават ня так гістарычная, як геаграфічная). А галоўнае — у Маскве я знайшоў шмат сяброў: расейцаў, армянаў, латышоў, баўкарцаў, малдаванаў, татараў, дый украінцаў таксама. (Хто ведае, ці зьвяла б некалі мяне доля з Уладзімірам Кашкам, а пасьля і з Косьцем Маскальцом, калі б не Літінстытут. Зрэшты, са сваёй будучай жонкай я пазнаёміўся таксама ў Маскве — на адным зь літаратурна-крытычных сэмінараў.)

Але я разумею Алеша Дэбэляка і ў іншай яго выснове, якую, баюся, не адразу зразумеюць, а тым болей далёка не адразу прымуць ягоныя сэрбскія, гэтаксама як і мае расейскія, калегі: сьвет зьмяніўся, падабаецца гэта нам ці не. І „разарваныя“ сувязі, пры ўсім нашым настальгічным да іх стаўленьні, — гэта ня нейкая мана ці, скажам, крайнасьць нацыянальна-вызвольнай заўзятасьці, а аб’ектыўны і, на мой погляд, заканамерны вынік згаданых зьменаў.

Сутнасьць гэтых зьменаў даволі дакладна, па-мойму, акрэсьліў прысутны тут Яніс Пэтэрс. Для большасьці з нас „паўза“ не пачалася ў 1991 годзе, а фактычна скончылася. Гэта была сапраўды трагічная „паўза“ ў нашых зносінах з вонкавым сьветам, пэрыяд штучнай ізаляцыі ад сусьветных культурных, эканамічных і іншых працэсаў. Для Латвіі, што перажыла 50-гадовую „паўзу“, спатрэбіцца цяпер, відаць, яшчэ 50 гадоў, каб зраўняцца зь іншымі эўрапейскімі дзяржавамі. Для Ўкраіны, хутчэй за ўсё, спатрэбіцца год 300. Для Беларусі, баюся, зацяжная „паўза“ можа ператварыцца ўжо ў найбліжэйшыя дзесяцігодзьдзі ў вечнае маўчаньне.

Што ж да той „паўзы“, якая пачалася ў 1991 г. і якая мела б стаць галоўнай тэмай нашага сёньняшняга абмеркаваньня, то яна несумерная са згаданай вышэй Вялікай Паўзай прынамсі зь дзьвюх прычынаў. Па-першае, сёньняшняя „паўза“ абумоўлена галоўным чынам эканамічнымі, ну і, магчыма, да пэўнай меры яшчэ псыхалягічнымі прычынамі, але ж ніяк не ідэалягічнымі забаронамі, жалезнаю заслонаю ды магутным рэпрэсіўным апаратам. І, па-другое, сёньняшняя „паўза“ — гэта, па сутнасьці, наагул ня паўза, таму што расейскія кніжкі зусім вольна прадаюцца ўва ўсіх нашых мястох і вёсках, маскоўскія газэты ня толькі прадаюцца, а і друкуюцца ў Кіеве, расейскія тэлепраграмы рэтрансьлююцца на колькіх украінскіх каналах, расейскія тэатры гастралююць ува Ўкраіне як ніколі часта, а расейская „папса“ горда гучыць нават у логаве ўкраінскіх буржуазных нацыяналістаў у Львове — гучыць галасьней нават, чым папса англа-амэрыканская, ня кажучы ўжо пра сваю, тубыльную. Дарэчы, паслаць ліст ці затэлефанаваць куды-небудзь у Душанбэ ці Ўладзівасток з таго ж Львову можна разоў у пяць таньней, чым у суседні Жэшуў ці, скажам, Перамышль.

Падазраю, у большасьці краін т.зв. „блізкага замежжа“ сытуацыя выглядае падобна. І калі ў Маскве (і ўвогуле Расеі) рэчы выглядаюць трохі інакш, гэта значыць, украінскія кніжкі там не прадаюцца, казахскія тэатры не выступаюць і туркмэнская папса не гучыць, то прычына гэтаму ніяк не падкопы нацыяналістычных зламысьнікаў, а ўсяго толькі банальныя фінансавыя праблемы. Прасьцей кажучы — брак адпаведнага попыту на адпаведным рынку тавараў і паслуг. Расейскае грамадзтва ня хоча плаціць свае кроўныя рублі за вышэйзгаданую культурную разнастайнасьць — і гэта ягонае права. Што ж да расейскага ўраду, то ён можа й выклаў бы грошыкі на аднаўленьне чаго-небудзь такога, але, па-першае, грошыкаў, як мы ведаем, у яго нягуста, а па-другое, у яго няма ніякай пэўнасьці, што „дыялёг“ пойдзе ў патрэбным рэчышчы і прынясе хоць якія палітычныя дывідэнды ў справе яго мары — „блізказамежнай інтэграцыі“. Без кіруючай і, галоўнае, кантралюючай ролі КПСС тут наўрад ці што-небудзь выйдзе.

А таму, мяркую, ня варта жывіць празьмерных ілюзіяў што да аднаўленьня наскага „дыялёгу“ ў папярэднім аб’ёме, хай нават і ў зусім іншай якасьці. Для гэтага няма ані вонкавых, ані

ўнутраных перадумоваў. З аднаго боку, няма генэральнага спонсара ў асобе вышэйзгаданай КПСС (іншых зацікаўленых, і галоўна, плацежаздольных асобаў я пакуль што на гарызонце ня бачу). А зь іншага боку — няма больш штучна створанага на нашых землях масквацэнтрычнага сьвету, у якім расейская мова была галоўным або і наагул адзіным сродкам міжнацыянальных стасункаў, а места Масква лічылася цэнтрам сьветабудовы — з сапраўды найлепшымі (рэшта была недаступная, а значыць, нібыта і не існавала) музэямі, тэатрамі, ВНУ, выдавецтвамі, часопісамі і, вядома, літаратурнымі і ўсякімі іншымі крытыкамі. Словам, няма таго сьвету, дзе Масква была сапраўды самым галоўным аўтарытэтам, ад якога ішло „міжнароднае“ прызнаньне і які на правох манапаліста забясьпечваў пасярэдніцтва ў культурных кантактах між украінцамі і беларусамі, кіргізамі ды казахамі, і, ведама ж, украінцамі-казахамі-беларусамі ды ўсёй „прагрэсіўнай“ замежнай культурай.

Але гэты штучны сьвет зьнік, як толькі ўпала жалезная заслона і іншыя сусьветныя сталіцы адкрыліся зачараваным позіркам маладых постсавецкіх Растыньякаў. Дзясяткі ўкраінскіх пісьменьнікаў, рэжысэраў, мастакоў, кампазытараў, выканаўцаў кінуліся шукаць прызнаньня не ў Маскве і ня ў Піцеры, а недзе на прасторах Ньюёркшчыны і Каліфарнійшчыны, у Парыжах і Лёнданах, Венах і Мюнхенах, і, ведама ж, у Варшаве і Кракаве — дзе мова гэтак жа блізкая, як расейская, затое ганарары вышэйшыя і жыцьцё прыстойнейшае.

Перад ад'ездам у Маскву я спрабаваў высьветліць, што робяць мае калегі-літаратары (тыя, пра каго „гавораць“ ува Ўкраіне і каго перакладаюць за мяжой), і выявіў, што палова зь іх знаходзіцца ў блізкіх і далёкіх вандраваньнях. Аксана Забужко і Саламія Паўлычко прэзэнтуюць у Канадзе ўкладзеную імі рэспэктабэльную анталёгію сучаснай украінскай прозы ў дабрызных перакладах на ангельскую. Юры Андруховіч зьмяніў звычны для яго нямецкамоўны сьвет Вены і Зальцбургу на ангельскамоўныя ўнівэрсытэцкія мястэчкі Амэрыкі, дзе выдаўцы „раскручваюць“ пераклад ягонай аповесьці „Рэкрэацыі“. Уладзімір Дзіброва, падобна, назусім асеў у Гарвардзе (два гады таму ў *Northwestern University Press* выйшла па-ангельску вялікая кніга ягонай выбранай прозы). Юрка Іздрык падаўся ў Варшаву на прэзэнтацыю польскага перакладу

сваёй аповесьці „Воццэк“; Андрэй Куркоў чытае ў Швайцарыі лекцыі; Наталка Белацэркавец, Уладзімір Марэнец і Яўген Сьвярсьцюк выступаюць у Кракаве на сэсіі польскага PEN-клюбу ды на прэзэнтацыі спэцыяльнага нумару штомесячніка *Dekada literacka*, цалкам прысьвечанага ўкраінскай літаратуры. Аляксандар Ірванец толькі што вярнуўся зь Нямеччыны з прэм'ернай пастаноўкі ўласнай п'есы; Людміла Таран — з Прагі, зь перакладчыцкай стыпэндыі; Алег Лышэга і Тамара Гундарава — з ЗША, са стыпэндыі Фулбрайта; Марыя Зубрыцкая — зь Вены, з тамтэйшага Інстытуту гуманістыкі; пералік можна працягваць.

Безумоўна, падарожнічаюць далёка ня ўсе, дый ня ўсе гэтага прагнуць. Ёсьць цудоўныя пісьменьнікі, як, скажам, Васіль Порцяк і Канстантын Маскалец, Аляксандар Шоўна й Пятро Мядзянка, Яўген Пашкоўскі і Алесь Ульяненка, Віктар Небарак і шмат іншых, якіх „прызнаньне Захаду“ мала цікавіць, але і „прызнаньне Масквы“ іх абыходзіць яшчэ менш, чым самых нашых заўзятых „заходнікаў“.

Шчыра кажучы, я ня ведаю, які цяпер „дыялёг“ можа быць між нашымі, г. зн. былымі „савецкімі“, літаратурамі. Усе мы даволі бедныя, і таму ня вельмі цікавыя адзін аднаму. У адкрытым сьвеце мы раптам адчулі сябе тым, чым, па сутнасьці, заўсёды былі — гістарычнымі маргіналамі. Для ўкраінцаў і, я думаю, для латышоў, эстонцаў, скажам, таксама, гэта ня стала нейкім шокам, хутчэй наадварот — лепш быць маргіналам у вялікім, адкрытым сьвеце, чым у замкнёнай, адгароджанай ад усіх калючым дротам саўдэпіі. Але для многіх расейцаў, баюся, гэтае адкрыцьцё аказалася шокам. Адгэтуль, напэўна, адчайныя постімпэрскія канвульсіі расейскіх палітыкаў ды генэралаў, адгэтуль, мабыць, ня менш адчайная прага многіх расейскіх інтэлектуалаў адгарадзіцца ад сьвету, паказаць хвігу Захаду і ствараць сваю „адвечна рускую“, праваслаўна-ўсходнеславянскую-эўразійскую „самабытнасьць“ у нейкім уяўным, „бедным“, затое высокадухоўным запаведніку. У гэтым стаўленьні — да сьвету, да Захаду — расейцы падаюцца мне куды большымі „незалежнікамі“, чым усе мы тут разам узятыя. Зразумела, і беднасьць бывае рознай. Расейская культура, несумненна, даволі багатая і, выходзіць, моцная, каб існаваць у сьвеце, у прыватнасьці, і на нашых „блізказамежных“ абшарах, сама па сабе, без падтрымкі з боку ўзброеных сілаў і ваенна-

марскога флёту, бяз грошай КПСС і КДБ. Але я сумняюся, што нашыя „блізказамежныя“ культуры змогуць існаваць у Расеі без падтрымкі вышэйзгаданых культуртрэгерскіх інстытуцыяў. З уласнай волі расейскія грамадзяне ня будуць купляць нашага тавару. Бо гэта ня нейкія амэрыканцы ці немцы, якія маюць усё і якім бракуе толькі нашай арыентальнай экзотыкі — украінскай паэзіі ці, скажам, грузінскай прозы для ўнівэрсытэцкіх бібліятэк. *Дружба народов* робіць шляхетную падзьвіжніцкую справу, намагаючыся зьберагчы сваю „інтэрнацыянальную“ спэцыфіку і ня даць канчаткова памерці перакладам з моваў народаў былога СССР. Але няўмольныя законы рынку кажуць, што часопісу значна выгадней друкаваць пісьменьнікаў расейскіх (французскіх, амэрыканскіх), чым калмыцкіх ці гагаускіх. І ў мяне язык не павернецца прасіць калегаў займацца эсэндэўскай дабрачыннасьцю сабе на шкоду. Зрабіць мы можам няшмат: абмяняцца інфармацыяй, прапанаваць артыкул, параіць што-небудзь вартае для перакладу. Калі хоць што-небудзь з гэтага выйдзе — дзякуй Богу. Ня выйдзе — так таму і быць. Сьвятое месца ўсё адно ня будзе пустым. Сяргей Аверынцаў прыедзе ў Кіеў зь Вены і прачытае на ангельскай мове лекцыю ў Кіева-Магілянскай Акадэміі з нагоды прысуджэньня яму званьня доктара *honoris causa* — але ўсё адно гэта будзе ўшанаваньне не аўстрыйскага і не ангельскага, а ўсё-ткі выдатнага расейскага навукоўца, прадстаўніка вялікай расейскай культуры. Юры Андруховіч паедзе на прэзэнтацыю чарговай сваёй кніжкі не ў Маскву і не ўва Ўлан-Удэ, а куды-небудзь у Осла, але мы ўсё адно ўва Ўкраіне будзем гэтым ганарыцца. Я зноў сустрэну Алеся Разанава дзе-небудзь у Празе, а Ігара Бабкова ў Варшаве, але мы ўсё адно падрыхтуем спэцыяльны нумар *Критики*, прысьвечаны ня Чэхіі і ня Польшчы, а ўсё ж такі Беларусі. Потым мы, можа, зноў сустрэнемся ў Стакгольме з Кнутам Скуеніексам, і я скажу яму колькі латыскіх словаў, якія завучыў у Маскве ад сваіх латыскіх сяброў, а ён выгукне цэлы маналёг дабротнаю ўкраінскаю моваю, якой навучыўся таксама ў Расеі, у канцлягерох. А ў Зальцбургу мы, магчыма, яшчэ раз паспрачаемся з Валер’ем Цішковым пра міжнацыянальныя праблемы, толькі цяпер ужо не далікатна па-ангельску, а нармальна, па-расейску. Вось хіба што толькі з Галінай Старавойтавай мы больш не сустрэнемся, хоць наша апошняя

сустрэча ў Ганалулу, на прыбярэжных хвалях была даволі пікантнай і, безумоўна, вартай паўтору.
Што ж да нашай сёньняшняй імпрэзы, прафінансаванай сорасаўскім Інстытутам адкрытага грамадзтва са штаб-кватэрай у Нью-Ёрку, то прынамсі адну асьцярожна-аптымістычную выснову зь яе можна зрабіць. Калі *Дружба народов* (у двукосьсі і без двукосься) калі-небудзь такі ўваскрэсьне на нашых атручаных шматгадовымі крыўдамі і ўзаемнай перадузятасьцю абшарах, то адбудзецца гэта, відавочна, менавіта так: пры спрыяньні і пасярэдніцтве Нью-Ёрку (Вашынгтону, Брусэлю, Страсбургу), у рэальным, г. зн. „атлянтацэнтрычным“, а не „масквацэнтрычным“ сьвеце, дзе голас Эстоніі ў пытаньнях інтэграцыі і супрацоўніцтва будзе важыць ня менш, чым голас Расеі. І дзе Сэрбія, як сказаў бы Алеш Дэбэляк, будзе такім самым сябрам ЭС ды NATO, як і Славенія.

З украінскай пераклаў Сяргей Богдан
паводле аўтарскага тэксту.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
[image]
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

гуманістыка

Івайла Дычэў
Камуністычная кастрацыя ды таемныя радасьці нацыянал-фалізму

Івайла Дычэў (нар.1955) — баўгарскі думаньнік, з пачатку 90-ых стала жыве на Захадзе, дастаўшы стыпэндыю ад аднэй парыскай фундацыі. Скончыў аддзяленьне філязофіі Сафійскага ўнівэрсытэту, дзе неўзабаве і абараніў дысэртацыю. Да таго, як пакінуць краіну, выкладаў у сваёй *alma mater* курс эстэтыкі. Аўтар шматлікіх публікацый у баўгарскім і заходнеэўрапейскім друку. Сярод ягоных апошніх публікацыяў артыкул *Le marketing du national* („Маркетынг нацыянальнага“) у *Journal d'Europйanistes*, 1997, III-2. *Liberate*. Ён таксама аўтар брашуры *Future Forms the Past. The Machine of Forgetting* („Будучыня фармуе мінуўшчыну. Машына забываньня“), выпушчанай у 1999 годзе Фондам Сораса.

Кажны дзень прыносіць дэмакратычна настроеным людзям новыя расчараваньні: адбываецца невытлумачальнае, анахранічнае ды абсурднае адраджэньне нацыяналізму ў посткамуністычных краінах. Хаця слова „адраджэньне“ не перадае ўсёй існасьці зьявы, яно ўводзіць у аблуду. Насамрэч нацыяналізм ніколі не зьнікаў, ён заўсёды існаваў у якасьці

неад'емнай часткі камуністычнай сымбалічнай эканомікі, як свайго роду падвойная падстава сыстэмы, вынятак з правіла, якое неабходнае для яго выкананьня[1].
Афіцыйны дыскурс (як і дыскурс кажнае левае партыі) выводзіцца з архетыпу дараваньня, велікадушнасьці, ахвярнасьці. Забароны набываюць сваю асаблівую вастрыню ад кастрацыі якога-любя паняцьця перавагі, экспансіі, самасьцьвярджэньня і права: як для індывіда, так і для народу ў абліччы калектывізму, а таксама для інтэрнацыяналізму. Сёньня, як гаворыцца, мы прысутнічаем пры канцы абодвух апошніх — калектывізм перарадзіўся ў дзікі эгаізм, ад інтэрнацыяналізму застаўся адно атавістычны шавінізм. Тым ня менш, усё адбылося ня так ужо і неспадзявана, як меркавалі, перад намі проста паўстаў адваротны бок мэдаля. Таму што калі сапраўды існуе „падступнасьць розуму", то пасьля выпрабаваньня камунізмам яна, безумоўна, прывяла да таго ж самага ўва ўсіх гэтых недаразьвітых краінах: да вытварэньня дзьвюх сутнасных фігураў буржуазнасьці: індывіда ды нацыі. Правіла ды вынятак зь яго, як вядома, праяўляюцца ў адзін і той жа час, у адным і тым самым працэсе распазнаваньня; няслушна, што напачатку існаваў усясьвет, і адно потым хаос (бо ў гэтым выпадку ўсясьвет ня меў бы паказьніка параўнальнай вартасьці свайго парадку), але ўсё адразу: суплёт космасу ды хаосу, табу ды інцэсту, розуму ды вар'яцтва і г. д. Чалавек ня можа адмовіцца ні ад правіла, ні ад вынятку зь яго, ён адначасова зьяўляецца як этычнай, так і эратычнай істотай, ня толькі ўнівэрсальнай, але і індывідуальнай. Традыцыйны карнавал як сацыялізаваная форма вынятку ўяўляе сабой тое асаблівае спалучэньне прасторы ды часу, у якім парушаюцца паўсядзённыя нормы: ліецца кроў, спажываюцца наркотыкі, ніхто не працуе, усе аддаюцца оргіям, а грамадзкія ролі губляюць моц. У выніку разбурэньня ў экстазе парадку паўсядзённага жыцьця эратычны складнік карнавалу якраз і стаецца падмуркам гэтага парадку.

Нацыяналізм можна разглядаць у якасьці бясконцага карнавалу інтэрнацыяналізму. Ён, праўда, не валодае сваім уласным спалучэньнем прасторы ды часу, сьвятое было заступленае таемным, паўсядзённасьць ды сьвята адрозьніваліся толькі спосабам заклінаньняў. Аддавацца радасьцям расейскага,

баўгарскага ці сэрбскага шавінізму, быць расістам, рэваншыстам ці імпэрыялістам было хоць і забаронена, але ня цалкам, трэба проста было ведаць, дзе можна гэтак сябе паводзіць, вырашальным было выкананьне прынцыпу ўсталяванай паміж выяўным ды сукрытым біпалярнасьці. Адмовіць каму-небудзь у прызначэньні на пасаду, паколькі ён жыд (у Расеі, у Польшчы), можна было толькі за адным акрэсьленым пісьмовым сталом, пачынаючы з пэўнага ўзроўню ўнутры намэнклятуры; „для грамадзкасьці“ прычына заўсёды фармулявалася так: той і той знаходзіцца пад ідэалягічным уплывам з боку Захаду. Туркі (у Баўгарыі), вугорцы (у Румыніі), альбанцы (у Сэрбіі) афіцыйна мелі права на папярэдне вызначаны працэнт месцаў у адміністрацыі, мастацтвах і г. д., таксама і за кошт астатняга жыхарства; але адначасова ўсе добра ведалі, што яны ніколі не перасягнуць пэўнага парогу ў грамадзкай гіерархіі. Велікадушна нададзеная прывілея этнічнага выклікае да сябе тупую нянавісьць; кастрацыя ўзмацняе нябачны фаляс, чым бязьлітасьнейшай была кастрацыя, тым пругчэйшым рабіўся фаляс. Падобным чынам ахвярны інтэрнацыяналізм Расеі быў адваротным бокам фантазіі Масквы як „трэцяга Рыму“ („а чацьвертаму не бываць“); зь іншага боку, сама гіпэрфалічная фантазія была магчымаю дзякуючы адно свайму адваротнаму боку, апакаліптычнаму дыскурсу кастрацыі, які быў намацаны ў расейскай культуры ў другой палове XIX стагодзьдзя. Баўгарскія (расейскія, сэрбскія, румынскія...) псэўдадысыдэнты шэсьцьдзясятых гадоў былі таемнымі сьвятарамі нацыяналістычнага фалічнага культу; яны артыкулявалі эгаістычную пажаду *нашых* пры парушэньні кастрацыйнай нормы пралетарскага інтэрнацыяналізму. Нават дасягнуўшы найвышэйшых ступеняў улады, яны шчыра верылі, што зьяўляюцца бунтаўнікамі, бо яны заатакавалі марксісцка-ленінскую мадэль. Інтэлектуалы (а гэтаксама іх аўдыторыя) аддаліся гэтаму „патрыятычнаму“ настрою як пашанотнай, найчысьцейшай рысе сваёй сацыяльнай сыстэмы. Ці варта зьдзіўляцца, што ў крытычныя моманты яны перабягаюць на бок Мілошавіча?

Адначасова эгаістычны дыскурс пачаў праяўляцца ня толькі ў абсягу мастацтва, але і ў грамадзкіх ды ў палітычных дачыненьнях. Пачалі гаварыць пра інтарэсы, разьмеркаваньне

ды спажываньне; было нават дазволена пісаць вершы пра каханьне, ня робячы пры гэтым намёкаў на барацьбу супраць імпэрыялізму. Невыпадкова Чаўшэску ў сямідзясятых, а Жыўкаў у васьмідзясятых выцягнулі на сцэну нацыянальны фаляс. Камуністычны правадыр існуе (як і мастак!) у той меры, у якой ён зьдзяйсьняе парушэньні правілаў, выклікае рэвалюцыі, пралівае кроў, ажыцьцяўляе адбудову: у іншым выпадку ён стаецца простым адміністратарам, якога, як кажнага, ацэньваюць паводле яго здольнасьцяў. Якасны скачок інтэрнацыяналізму да шавінізму быў апошнім эратычным доказам моцы ўлады. Але пасьля таго, як аднойчы нацыяналістычны вынятак абвясьцілі афіцыйнай нормай, эратычная раўнавага была страчана. Можа, распад камунізму быў не ў апошнюю чаргу вынікам гэтага зрушэньня паняткавай пары дазволенага і забароненага? Ад гэтага часу патрэбна было *нешта іншае*, што заняло б месца вынятку, „ліха“, унутранай сутнасьці якога, абумоўленай пажадай, давялося б легчы ў аснову ідэнтычнасьці. Эратычнае памкненьне масаў цяпер болей не накіравана на забароненае раней зьліцьцё нацыянальнага ды фалічнага, на адзінства, моц, перамогу ды заваёву; інстытут калектыўнага фалясу спрычыніўся хутчэй да ўзьнікненьня жаданьня распаду, атамізацыі, паразы і кастрацыі.

Праваслаўе, кажучы словамі Лё Гофа[2], ня „вынайшла“ чыста, гэнага пазбаўленага эротыкі месца паміж жыцьцём і сьмерцю, дабром і злом, правілам і выняткам, якое робіць магчымым рацыяналізацыю міжчалавечых стасункаў. Усё альбо нішто, трыюмф альбо адчай — бо няма сфэры, чужой фалясу: альбо ён выдалены (ды вымраены), альбо ён навязаны (ды зьненавіджаны). Публічнасьць (як у кажным традыцыйным грамадзтве) зьяўляецца эратычным месцам: адзін дае, другі прымае. Як існавалі Савецкі Саюз і Югаславія? Вялікія (расейцы, сэрбы) давалі малым тэрыторыі, дапамогу, абарону. Той, хто атрымлівае падарункі, натуральна, абавязаны ў сваю чаргу даваць нешта ў адказ, падзякай ён уваходзіць у сымбалічны кантакт з даваньнікам. Мэтафара братэрства на самой справе зьяўляецца важнейшай, чым можа здавацца на першы погляд. Нават гандаль ператварыўся ў абмен натуральнымі прадуктамі: я дарую табе нафту, якая табе патрэбна, у адказ ты абавязаны падараваць свае памідоры; калі

б я проста прадаў табе нафту, я б мог на сваё зычэньне распараджацца грашыма, а цябе паслаць к чорту. Пры абмене дарункамі повязь ніколі ня рвецца, братэрства, паводле свайго азначэньня, трывае цягам усяго жыцьця.
Гэта быў афіцыйны дыскурс велікадушнасьці. Але ён меў сваё адлюстраваньне, у якім рэчы стаялі дагары нагамі. Кажны быў таемна перакананы ў тым, што расейцы (сэрбы ды іншыя) у сапраўднасьці *бяруць* ад сваіх сатэлітаў, што дзеецца нечуваны каляніяльны эгаізм. Потым норма ды трансгрэсія чарговага разу памяняліся месцамі (што раней ужо адбывалася пры ўсталяваньні камуністычнага дыскурсу велікадушнасьці). *Перестройка* была рэвалюцыяй сымбалічнага коду ў першую чаргу ў этымалягічным сэнсе: фаляс узьняўся, кастрацыя апусьцілася назад да забароны. Мы болей ня будзем карміць віетнамцаў, кубінцаў ды баўгараў — нерашуча засвоіла сьпярша атачэньне Гарбачова, — мы зьяўляемся вялікай дзяржавай, мы пакінем сабе тое, што маем. Мы болей ня будзем карміць узбэкаў, татараў ды грузінаў — радыкальна дадалі прыхільнікі Ельцына, — расейскі народ вялікшы за ўсе іншыя, тое, што наша, павінна заставацца нашым. У Сэрбіі ды Харватыі зрабілі наступны крок: у афіцыйным дыскурсе зьявілася ня толькі ідэя больш нічога не даваць і думаць пра сябе, але і *ўзяць* сабе тое, что належыць іншаму.
Нацызм і камунізм ня толькі надзвычайна падобныя, яны ўяўляюць сабой тую ж самую сымбалічную машыну ў двух люстэркава перагорнутых варыянтах. Камунізм прапануе народам прынесьці сябе ў ахвяру за ўсё, пасуляючы ў адказ на гэта самакастрацыю падзякі, любоўнай залежнасьці. Нацызм, наадварот, дзёрзка выяўляе сваё жаданьне браць ад усіх іншых, спасылаючыся на фалічны супраціў. Камунізм ёсьць ахвярным жэстам, нацызм — фалічным двайніком. Абодва несупынна ўсхваляюць сябе, атрымоўваючы пры гэтым сваю легітымацыю адпаведна адзін ад аднаго. Кажны зьяўляецца несьвядомым іншага, кажны марыць аб іншым як аб вынятку з самога сябе. Да таго ж, здаецца, фалічная ды супрацьфалічная сіла зьяўляецца фэномэнам пэрыфэрыі багатага, моцнага і дэмакратычнага сьвету. Чым больш празрысты цэнтар, тым больш непразрыстыя ды ірацыянальныя катастрофы на пэрыфэрыі, незалежна ад таго, камунізм гэта, нацызм, рэлігійны фундамэнталізм ці іслам. Маргіналізаваная

рацыянальнай культурай фалічная сіла акцэптуецца ня толькі другараднымі групамі (як студэнты, эмігранты ды г.д.), але і цэлымі народамі, якія гэткім апошнім засталым ім чынам выяўляюць адзіную перавагу, якая яшчэ дадзеная ім у сьвеце татальнага намнажэньня ды сувымернасьці. СМІ тымчасам ствараюць прастору гэткага выкліку, гэтага апошняга рэсурсу ідэнтычнасьці. Югаславія — якія толькі жахі, эгаізм ды абсурд там ня праўдзяцца; і ўсё ж гэны абсурд зьяўляецца тым апошнім, што ў гэтай краіне немагчыма ні купіць за нямецкія маркі, ні занесьці ў айбіэмаўскі кампутар.
Дэфалізацыя грамадзкасьці: тое, што палітыка нецікавая, ёсьць *маральным* прынцыпам. Але ці можна ажыцьцяўляць яе ў празрыстым сьвеце з адсутным цэнтрам?

[1] Тут я адштурхоўваюся ад напрацовак С.Жыжэка ды М.Рыкліна.
[2] Jacques Le Goff, *La Naissance du purgatoire*. Gallimard, Paris 1981.

Зь нямецкай мовы пераклаў Яўген Казінец паводле
Neue Literatur. Zeitschrift fьrQuerverbindungen. 4/1993.

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

да Зьместу 1(6)-2000

архіў

Ілья Куркоў
Менск 1920-га: Мережкоўскі аб Міцкевічу і славянах

Мережкоўскі і яго спадарожнікі пасяліліся ў гасцініцы „Парыж“, што знаходзілася на рагу вуліц Міцкевіча і Петрапаўлаўскай, побач з Гарадскім тэатрам (зараз тут — на перакрыжаванні пр. Скарыны і вул. Энгельса — уваход у метро насупраць скверу). Знакамітыя госці чыталі лекцыі, актыўна публікаваліся ў мясцовай прэсе, сустракаліся з першымі асобамі тагачаснай Беларусі, займаліся дабрачыннай дзейнасцю (выратавалі ад разбурэння Пушкінскую бібліятэку). У кнізе ўспамінаў Зінаіды Гіпіус менскія падзеі займаюць каля васьмі старонак. Да апошняга часу яны ўспрымаліся чытачамі больш з боку мастацтва, чым гісторыі. Таму, напэўна, што тут няма ніводнай дакладнай даты, шмат эмоцый, новым знаёмым даюцца яскравыя, але часам вельмі рэзкія характарыстыкі. Нядаўна навукоўцы-гісторыкі атрымалі магчымасць прасачыць за падзеямі 80-гадовай даўніны. Напрыканцы 1998 году ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь быў знойдзены амаль поўны камплект газеты *Минский курьер*, у які ўваходзілі невядомыя айчынным даследчыкам нумары за люты-ліпень 1920 году. Супастаўленне іх інфармацыі з тэкстам мемуараў вядомай пісьменніцы выклікае своеасаблівы „стэрэаэфект“. Вось, напрыклад, адна з вышэйпамянёных „характарыстык“ Зінаіды Гіпіус: „Среди кучи всяких людей, стремящихся в нашу

гостиницу, к Мережковскому, не из последних был редактор местной русской газеты *Минский курьер*, некто Гзовский. Московский поляк, мелкий репортер, помыкавшийся по свету. При большевиках — был в большевистской газете, возможно — шпионил полякам (мог бы, при случае, и обратно). Громадного роста, с зычным голосом, довольно определенный хам, притом захолустный (уж был ли он в Москве?). Он тотчас сообразил, как выгоден ему приезд литераторов, да еще Мережковского. Решил его использовать, принялся за нами ухаживать, печатать всякие интервью и собственные статьи о Д.С. — презабавные, как, например, одна: „Ублюдок и титан“ (Ленин и Мережковский). Мы отлично видели всё и смеялись над его грубыми ухаживаниями, которые были бесполезны: и без них мы, одичавшие, оголодавшие без „слова“, зараженные Совдепией, пошли бы на буро-желтые страницы его убогого *Курьера*. Он сейчас был ярко антибольшевистский, чего же еще нужно?“ Сёння, калі гартаеш старонкі „Курьеру“ (якія сапраўды бура-жоўтага колеру), мімаволі думаеш, што Зінаіда Гіпіус, напэўна, давала даволі дакладныя ацэнкі. Паводле некаторых звестак, гэтае выданне фінансавалася „двуйкай“ — польскай ваеннай разведкай. Але нельга не адзначыць прафесійных здольнасцяў А.І.Гзоўскага. Газета была адной з найбольш інфарматыўных у краі, выходзіла штодзённа, нярэдка нават на шасці старонках. Для Менску, які знаходзіўся недалёка ад лініі фронту (яна праходзіла прыкладна па рацэ Бярэзіне), гэта быў нядрэнны ўзровень. *Курьер* цалкам адпавядаў мэтам „трыумвірату“, крэда якога ў той час вызначалася проста — „антыбальшавізм“. Яны лічылі інтэрвенцыю адзіным сродкам, які можа выратаваць Расію ад хаосу. Але ў Менску дадзеную пазіцыю падзялялі далёка не ўсе. Тут назіраліся даволі трывалыя антыпольскія настроі. Вось што пісала Зінаіда Гіпіус: „…минское общество, глубоко провинциальное, поразило не этим, а — ненавистью к полякам! К освободителям Минска! Это было для нас столь дико, что мы не могли опомниться“; „… вторая общая лекция тоже прошла с успехом, — публичным, — ибо минское общество начинало уже коситься на нас за полонофильство“; „Лекцию Д.С. о Мицкевиче Пушкинская библиотека отказалась устраивать,— все из-за полонофобства…“; „…После лекции Д.С. о Мицкевиче (тоже совершенно полной и в присутствии представителей польской

власти), мы решили уезжать“. Дзякуючы знойдзеным матэрыялам мы маем магчымасць атрымаць поўнае ўяўленне аб абставінах, звязаных з гэтай знакамітай лекцыяй. Адбылася яна 19 лютага 1920 году ў Гарадскім тэатры (зараз будынак Купалаўскага тэатру). Дзмітрый Меражкоўскі здзівіў сучаснікаў нестандартным поглядам на навакольную рэчаіснасць. Злабадзённыя праблемы ён разглядаў не традыцыйна — як ваенныя ці палітычныя, а як метафізічныя з’явы амаль касмічнага маштабу. У *Курьере* ад 21 лютага быў змешчаны напісаны А.І.Гзоўскім артыкул-справаздача па выніках лекцыі. Ніжэй ён прыведзены ў дакладнай адпаведнасці з тэкстам арыгіналу. Другі цікавы гістарычны дакумент — інтэрв`ю па пытаннях лекцыі, якое даў Меражкоўскі рэдактару *Курьеру* (надрукавана 17 лютага).

Амаль 80 гадоў таму — у студзені-лютым 1920 году, у час польска-савецкай вайны ў Менску знайшлі часовы прытулак збеглыя з „чырвонага“ Петраграду славутыя расейскія грамадскія дзеячы і літаратары: Д.С.Меражкоўскі, яго жонка З.М.Гіпіус і іх сябар Д.У.Філосафаў. Гэтыя тры асобы доўгі час складалі вядомы „трыумвірат“, які адыгрываў значную ролю ў духоўным жыцці Расеі пачатку ХХ стагоддзя. У Менску яны ўпершыню за два гады атрымалі магчымасць свабодна заявіць аб сваёй пазіцыі і, такім чынам, зноў уплываць на грамадскую думку.
г. Менск, не пазней 16 лютага 1920 году

Беседа с Д.С.Мережковским
К лекции „Распятый народ (Мицкевич о славянах)“
Вопрос: Будет ли иметь Ваша лекция отношение к политической злобе дня — возможному миру Польши с Россией? **Ответ:** Будет. Можно бы даже озаглавить лекцию так: „Россия, Польша и Мицкевич“, или еще точнее: „Что сказал бы Мицкевич о мире Польши с большевиками?“ Отнюдь не с Россией, а именно с большевиками, потому что пока есть большевики — России нет. **В.:** Но, судя по Вашей программе, Вы будете говорить не столько о политике, сколько о метафизике Мицкевича? **О.:** Да, о метафизике. Но, ведь, политика не что иное, как метафизика в действии (*тут і далей*

словы вылучаны ў арыгінале). Я, впрочем, хорошо понимаю, как трудно это объяснить современным политическим деятелям. Они похожи на мольеровского героя, который сам не знал, что „говорит прозою“. А уж если вожди так метафизически слепы, то нечего удивляться слепоте и невежеству „масс“. Им еще труднее объяснить, что метафизика в такой же мере — основа всякой реальной политики, как основа всякой медицины — физиология. Метафизика чужда и непонятна массам, потому что кажется им „ненужною“. Но, представьте себе, что небывалая чума грозила бы поголовным истреблением всего человеческого рода и что какой-нибудь ученый открыл бы противочумную сыворотку. Неужели самые отвлеченные физиологические формулы, положенные в основу этого открытия, показались бы ненужными? С какой жадностью люди вникали бы в эти формулы, понимая, что тут дело идет о спасении их жизни. Большевизм и есть такая чума, а религиозная метафизика Мицкевича — его мессианизм — противочумная сыворотка. Вот почему отвлеченнейшие формулы его суть формулы реальной политики.

В.: Но не кажется ли Вам, что мессианизм Мицкевича — уже, в значительной мере, устаревшая политическая романтика? **О.:** Нет. Романтика — только шелуха, а зерно ее очень здраво, реально и жизненно. Идея мессианизма, в сущности, чрезвычайно проста. В переводе на язык реальной политики она заключается в том, что при современной, не только духовной, но и материальной, экономической связанности всех европейских народов, национальные проблемы разрешимы только „в мировом масштабе“ и что узкий национализм — плохая „реальная политика“. Народ, который сейчас думает только о себе и о своих национальных выгодах, обречен на бессилье, ничтожество или даже на гибель, а политический успех обеспечен только тому народу, который думает и о себе, и о других. Мессианизм и есть не что иное, как совершенно ясное сознание этой органической связи каждого отдельного народа со всем человечеством. И никогда никому сознание это не было так нужно, как сейчас Польше в ее отношении к России. **В.:** Но не полагаете ли Вы, что Польша слишком поглощена сейчас великим делом своего национального возрождения, чтобы вмешиваться в чужие дела? **О.:** „Чужие дела“! Если бы не узкий национализм, — можно сказать,

провинциализм, захолустность всей современной европейской политики, то ни Польша, ни один из народов Европы не считали бы русского большевизма „чужим делом“, ибо это — дело спасения или гибели всего культурного человечества. Сейчас уже не Польша, а Россия — „распятый народ“. Но близок час, когда и все остальные народы должны будут взойти на тот же крест. Главная сила большевиков и заключается именно в том, что у них есть тоже своего рода „мессианизм“, хотя и превратный, демонический. Они понимают, что русский большевизм, чтобы не угаснуть, должен выйти за пределы России — сделаться заразой всемирною. Интернационал — очаг этой всемирности, новый центр всемирного объединения народов, точно также, как римская церковь некогда была центром для объединения всей христианской Европы. Из всех современных политиков одни большевики захолустным политическим провинциализмом не заражены, и в этом, повторяю, их сила. Лучше, чем кто-либо, поняли бы они то, что я сейчас говорю; поняли бы, хотя, конечно, по-своему, мессианизм Мицкевича как реальную политическую силу. **В.:** Итак, что же, думаете Вы, сказал бы Мицкевич о мире Польши с советской Россией? **О.:** А вот что: мир с большевиками, убийцами России, — самоубийство Польши, ибо сегодняшние убийцы России — завтрашние убийцы Польши: кто не пощадил своего отечества, пощадит ли чужое? Спасение Польши — мир с Россией против большевиков. Для меня это так ясно, как дважды два — четыре. Но трудность моей позиции и заключается именно в ее чрезмерной ясности. Трудно, утомительно и совестно убеждать людей до истощения, что дважды два — не пять, а четыре. **В.:** Но Вы все же надеетесь, что Польша услышит это загробное предостережение Мицкевича? **О.:** Надеюсь. И не я один, а все русские люди на это надеются. Иначе мы не были бы здесь. Мы верим, что не случайно наше пребывание в Польше, также, как не случаен наш давний, еще со времен Пушкина, духовный союз с великим польским пророком — Мицкевичем; верим, что этот союз — вещее знаменье будущего братского союза обоих народов и что в борьбе с общим врагом — большевизмом — Польша и Россия вместе спасутся, а розно — погибнут. Если слова мои хоть сколько-нибудь прослужат этому великому делу, я буду счастлив.

„Минский курьер“, аўторак, 17 лютага 1920 году.
Артыкул А.І. Гзоўскага „Распятый народ“
19 февраля Д.С.Мережковский выступил в местном театре с последней своей лекцией „Распятый народ (Мицкевич о славянах)“.

Д.В.Философов сказал очень краткое, но весьма содержательное вступительное слово, характеризующее позицию знаменитого писателя в польско-русской распре. В Мицкевиче, этом вдохновенном славянском пророке, Д.С.Мережковский нашел родственную душу. Идея, вдохновляющая большевиков, столь же материалистична, как и идеи буржуазной культуры — и именно поэтому нынешняя Европа не в силах ничего высшего противопоставить большевикам. Д.С.Мережковский глубоко понял Мицкевича — этот вождь народа мог бы многое им противопоставить, ибо он понимал революцию метафизически. Революция большевиков убила свободу, а свобода только в духе, только в вере. Страстно стремясь к свободе в течение всей своей жизни, Д.С.Мережковский не мог сойтись с революционными деятелями, от которых его всегда отталкивала грубая материалистичность.
Красиво сказанное Д.В.Философовым слово, передать содержание которого в нескольких строках невозможно, было встречено публикой шумными аплодисментами.
Тепло встреченный слушателями, которые представляли собою истинный цвет минской интеллигенции, в числе которых было много польских офицеров, ксендзов и чиновников, Д.С.Мережковский начал свою лекцию словами польского патриота-мученика Лукосинского о союзе польского и русского народов.
Оба народа, действовавшие в противоположных направлениях, могут соединиться в высшей точке — в их духовной жизни, а уже реальная политика явится выводом из духовного единения. Главная ошибка нынешней реальной политики заключается в стремлении подчинить себе духовную жизнь народов. Чтобы узнать Польшу — надо узнать Мицкевича. Война и революция не создали ни одного героя, — но Польша во всемирной безличности имеет свое лицо, имеет Мицкевича. Другой пророк наших дней — Достоевский, пожалуй, яснее

Мицкевича прозревал реализм грядущих событий. Смысл социальной революции для Достоевского был демонический („Бесы“), а для Мицкевича — в борьбе демонического с божеским. Именно здесь, в христианстве пророческом „высшая точка“, в которой Польша и Россия могут соединиться. Языческая идея национализма сменила идею вселенской церкви; его идея — империализм и всемирная война, ведущаяся на истребление человечества. Это предвидел и от этого предостерегал Мицкевич.

Империализму и национализму он противопоставил идею мессианизма, видящего в муках польского народа прообраз страданий Христа. Путь в свободную отчизну — крестный путь польского народа. Итог империализма — война и гибель, итог мессианизма — конец войны и спасение человечества. Мицкевич хорошо понял будущее, и о грозящей Европе гибели и о возможном спасении говорит в своей книге о славянских литературах.

Читая значительные выписки из книги Мицкевича, Д.С.Мережковский указывает ее основную мысль: борьба двух культур — подлинной, прометеевой (интуиция) и эпиметеевой (рационализм). Интуиция, по Мицкевичу, дар славянского и французского племени. Эта борьба Прометея с Эпиметеем идет не между народами, а в самих народах. Культурным варварством заражена не одна Германия, но и вся Европа. Мицкевич предсказал, что в конечном счете славянское и англо-романское племена соединятся для борьбы с германским. В свете книги Мицкевича нынешняя мировая катастрофа есть казнь человечества за религиозный индивидуализм и религиозный национализм; его муки — муки родов, и если родится живой младенец, то человечество будет Богочеловечеством.

Далее Д.С.Мережковский подробно останавливается на сходстве идей Мицкевича с идеями русских богоискателей. Ныне уже не Польша, а Россия — распятый народ. Д.С.Мережковский останавливается далее на выводах из предпосылок Мицкевича в реальной политике.

Приведя текст мирного предложения большевиков Польше, Д.С.Мережковский задает вопрос: соблазнится ли она? Заключит ли мир со свободоубийцами она, с креста сошедшая — с распинающими на кресте русский народ? Нет, отвечает он,

— хранитель рыцарской чести, народ польский, не заключит мира с врагом бесчестным.
С Христом — свобода, рабство — с Антихристом. Это — завет Мицкевича. Пусть же он исполнится: пусть будет союз Польши с Россией за Христа против Антихриста.
Этими словами закончил Д.С.Мережковский свою интереснейшую лекцию. Его благодарили шумными аплодисментами.
Сегодня наши знаменитые гости: Д.С.Мережковский, З.Н.Гиппиус, Д.В.Философов и В.А.Злобин (сакратар Меражкоўскага — *заўвага аўт.*), оставляют Минск, направляясь через Вильно в Варшаву.
В Вильне будет Д.С.Мережковским прочитан ряд лекций, они же будут повторены в Варшаве.
Пожелаем же нашим славным изгнанникам успеха в их дальнейшей деятельности на пользу русской идеи, всего славянства и осуществления великого завета польского пророка Мицкевича о союзе России и Польши.
„Минский курьер“, субота, 21 лютага 1920 году.

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

лірыка

Оскар Любіч-Мілаш
Тры сымфоніі

Оскар Уладзіслаў дэ Любіч-Мілаш (1877-1939), выдатны паэт (4 зборнікі), драматург (містэрыя „Мігель Маньяра"), празаік (раман „Мілоснае пасьвячэньне"), філёзаф-містык. Нарадзіўся ў мястэчку Чарэя (цяпер занядбаная вёска ў Чашніцкім раёне). Жыў у Парыжы, пісаў на французскай мове, але ў вершах стала вяртаўся „да краіны дзяцінства, набытай у сьлязах". Хутка пераадолеў дэкадэнцтва й сымбалізм сваіх раньніх вершаў, але назаўсёды захаваў той выразны трагічны патас, што зьбліжае яго з По й Бадлерам. Позьняя яго паэзія прасякнутая рэлігійнымі матывамі. Пры канцы жыцьця робіць спробу крыптаграфічнай інтэрпрэтацыі „Апакаліпсы". Найчасьцей пра Оскара Мілаша пісаў бадай што ягоны нашчадак Чэслаў (у перакладзе на беларускую: Чэслаў Мілаш. Паэты і сям'я людзей // Крыніца, № 33 (7-1997).

II
Ледзь чутна пяяў пра каханьне даўномінулых памерлых;II
III IV

Верасьнёвая сымфонія
Вітаю цябе, што прыйшла да мяне на спатканьне,
У водгульлі крокаў маіх, з халоднае цемры тунэляў часу.

Вітаю цябе, о маці мая, самота.
Калі шчасьце крочыла ў ценю маім, калі біліся
Птушкі радасьці ў люстра ночы, калі краскі,
Калі страшныя краскі юнай спагады душылі маё каханьне,
А рэўнасьць схіляла голаў, каб бачыць сваё люстраваньне ў
віне,
Я згадваў цябе, самота, я згадваў цябе, пакінутая мая.
Ты карміла мяне чорным хлебам пакорнасьці, дзікім мёдам ды
малаком,
І, шчасны, я еў з тваіх рук, нібы верабей,
Бо ніколі ня меў я, карміцелька, бацькі і маці,
А шаленства ды холад бязмэтна блукалі па доме.
Ты парою зьяўлялася мне, набываючы вобраз жанчыны,
У падманным сьвятле найпякнейшага сьненьня. Твая сукенка
Была ў колер ральлі пры сяўбе; і ў маім загубленым сэрцы,
Варожым, нямым, халаднейшым ад каменя на дарозе,
Нават сёньня яшчэ абуджаецца колішняя пяшчота,
Калі бачу жанчыну ў брунатным адзеньні,
Маркотным, гатовым усё дараваць; і першая ластаўка
Над ворывам лётае, лётае ў зыркім праменьні дзяцінства.
Я ведаю, ты ня любіш месца, дзе ты цяпер,
Удалечыні ад мяне ты больш не мая самота.
Скала, прыбраная ў даўнасьць, шалёны востраў у моры -
Вось дзе жыве пяшчота; я ведаю шмат магілаў, што маюць
брамы
з іржы і красак.

Ды як жа твой дом можа быць там, дзе неба і мора
На браткавым сьпяць даляглядзе, нібыта каханкі?
Праўдзівы твой дом - ён ня там, за пагоркамі, не!
Ты выбрала сэрца маё. Бо ты тут нарадзілася.
І менавіта сюды, дзе на сьценах сваё ты пісала ў дзяцінстве імя,
А, стаўшы жанчынаю, бачыла сьмерць свайго зямнога сужэнца,
Вяртаесься ты, несучы смак солі й ветру на белых шчаках
І гэты стары, стары водар каляднае шэрані ў валасох.
Нібыта з вуглёў, калыханых наўкола труны,
З майго сэрца, дзе б'ецца таемны рытм,
Падымаецца водар, мне чуецца, поўдня дзяцінства. Я не забыў
Прыгожага саду спагады, дзе клікала Рэха мяне, о самота,
тваё другое дзіця.

Я мог бы згадаць тое месца, дзе некалі спаў
Ля ног тваіх. Вецер, напэўна, дагэтуль бяжыць па муары
Маркотнай і пекнай травы на руінах, а ў летнюю сьпёку
Няспынна ліюцца мядовыя сьпевы бухматых чмялёў.
Калі ты рассунеш сірочыя косы дрыготкай
І гордай вярбы, мне адкрыецца твар вады,
І ясны, і чысты - падобны да яснага й чыстага твару
Далёкай, якую я бачыў у ранішнім казачным сьне!
А ў аранжарэі, убранай вясёлкамі даўніх часоў,
Яшчэ захаваліся, пэўна, маленькія кактус і фіга,
Прыбылыя колісь - зь якіх цудоўных краінаў? І водар
Падвялага геліятропу шалее яшчэ ў ліхаманкавым сквары
папоўдня!
Краіна дзяцінства! Цяністая продкаў сядзіба!
Скажы, задрамалая ліпа, мілосьніца важных пчолаў,
Ці шчасная ты, як у тыя мінулыя дні? Залацістыя звонкія
краскі,
Скажэце: як некалі, цені пагоркаў ці вабіце вы на заручыны
Белай Заснулай красуні? (З пакрытае плесьняю кнігі,
Якую так добра гартаць, калі вечаровы прамень
Купаецца ў пыле гарышча, і ціша навокал -
Папрадухі-павучыхі спынілі свой калаўрот.) О сэрца!
Маркотнае сэрца! Пастух, апрануты ў грубую воўну,
Трубіць у рог, а рог зрабілі, садраўшы з дрэва кару. У садзе
Дзяцел рахмана зьбівае труну для свайго каханьня
І жаба чытае малітвы ў нямым трысьці. О маркотнае сэрца!
Крохкі атожылак хворай шыпшыны ў падножжы гары, ці некалі
Ўбачу цябе? І ці ведаеш ты, што краска твая, у якой
усьміхалася ружа,
Была сэрцам, цяжкім, набрынялым сьлязамі майго дзяцінства.
О сябра!
Джалы іншых шыпоў зранілі маё сэрца!
І крыніца з такім ціхамірным, прыгожым позіркам,
Дзе ад гучнае сьпёкі знаходзіла схоў усё тое,
Што яшчэ на зямлі засталося ад ценю і цішы!
Колькі сёньня па твары маім бруднейшай вады цячэ!
Але ўвечар зь дзіцячага ложку, дзе краскамі пахне, бачу
Звар'яцелы месяц у німбе позьняга лета. Ён паглядае
Праз суплёт вінаграднай лазы, і ў павохнай ночы
Брэша зграяй сабак Маркота, скуголіць у сьне!

Потым Восень прыходзіла з грукам сякераў, рыпеньнем
калодзежа й колаў.
Як бег
Белага зайца па першым сьнезе, кароткі дзень
Раптоўнасьцю ўражваў маркотныя нашыя сэрцы. Тады
Каханьне, якога няма ўжо, не нарадзілася шчэ.
Маці мая, самота, апавядзі мне жыцьцё маё зноў!
Вось сьцяна без крыжа, і стол, і закрытая кніга!
Калі б немагчымае, але так доўга чаканае
Раптам пагрукала ў шыбу пазяблай малінаўкай,
Хто б тут падняўся яму адмыкнуць? Кліч паляўнічага,
Што прыпазьніўся сярод зьнежывелых багнаў,
Апошні вокліч юнацтва слабее, змаўкае: адзіны ліст, ападаючы,
Жудасьцю напаўняе маўклівае сэрца лесу.
Чым жа ты ёсьць, о маркотнае сэрца? Сонным пакоем,
Дзе марнатраўны сын, паклаўшы локці на кнігу,
Слухае, як гудзе старая блакітная муха дзяцінства?
Люстрам, што згадвае? Можа, магілай, абуджанай злодзеем?
Шчасныя далі на крылах нясе вечаровы павеў, залатыя аблокі,
Гожыя караблі з грузам манны анёльскай! Ці праўда,
Што ўсе вы, усе перасталі кахаць мяне й болей ніколі,
Ніколі ня ўбачу я вас праз чароўнае шкло
Дзяцінства? Што колеры вашыя і галасы, і каханьне маё,
Што гэтае ўсё было мізарнейшым ад бліскавіцы асы
На вятрыску, ад гуку сьлязы, што спадае ў труну, -
Суцэльным падманам, біцьцём майго сэрца, пачутым у сьне?
Сам-насам із старасьці ледавіком! Толькі я
Ды імя адгалосак! А вусьцішнасьць ночы і вусьцішнасьць дня
Стаяць, замірыўшыся ў горы, як родныя сёстры,
На гэтым і тым берагох майго сну, адна аднэй робячы,
робячы нейкія знакі!
Як камень гаротны, у цёмнае возера
Кінуты пекнай і лютай дзіцячай рукою,
У сэрцы, на дне найгарчэйшай маркоты, спачыла
Між соннага мулу ўспамінаў цяжкое каханьне.

Лістападаўская сымфонія

Гэта будзе зусім як у гэтым жыцьці. Гэты самы пакой.
Так, дзіця маё, гэты самы. І колішні птах на сьвітаньні
Ў лістоце бледнай, як мёртвая; вось абуджаюцца слугі

І чуваць халодны й глухі бразгат вёдзер
Каля крыніцы. О вусьцішнае юнацтва! Пустое сэрца!
Гэта будзе зусім як у гэтым жыцьці. Пачуеш
Галасы галечы й зімы із старых прымесьцяў
Ды абрыўкі песьні шкляра,
Ды сівую бабулю, якая з-пад бруднай хусьціны
Выгукае назовы рыб, мужчыну ў блакітным
Хвартуху, што плюе на сьцёртыя працаю рукі
І крычыць немаведама што, як Анёл Суднага часу.
Гэта будзе зусім як у гэтым жыцьці. Гэты самы стол,
На ім Біблія, Гётэ, атрамант з пахам былога,
Рысы белай жанчыны, якая чытае думкі,
І партрэт, і пяро, і папера. Дзіцянё маё, дзіцянё!
Гэта будзе зусім як у гэтым жыцьці! Гэты самы сад,
Цёмны, цёмны, глыбокі, густы. А бліжэй да поўдня
Усьцешацца людзі, якія сабраліся тут,
Адзін аднаму незнаёмыя, ня ведаюць
Пра засталых, а ведаюць толькі, што трэба прыбрацца,
Як на сьвята, і йсьці ў глыб ночы,
І самотна зьнікаць без каханьня і безь ліхтара.
Гэта будзе зусім як у гэтым жыцьці. У тых самых прысадах,
Адвячоркам асеньнім, на павароце алеі,
Там, дзе сьцежка сыходзіць уніз, баязьлівая, нібы кабета,
Што зьбірае шпітальныя краскі, - паслухай, маё дзіця -
Мы сустрэнемся тут, як калісьці.
Ты забыла колішні колер сваёй сукенкі,
А я шчасьлівых імгненьняў пазнаў няшмат.
Ты будзеш убраная ў бледна-лілёвае, о найпякнейшы смутак!
І красачкі на капелюшы тваім будуць журлівыя,
Я ведаць ня буду іхных назоваў, бо знаў у жыцьці
Адной толькі кветкі імя - незабудкі, маркотнае красачкі,
Заснулае некалі ў ровах краіны Хованкі, краскі
Сірочай. Так, сэрца! Так, бездань! Бы ў гэтым жыцьці.
І сьцежка там будзе цяністая і вільготная
Ад рэха струменяў. І я табе апавяду
Пра места, якое стаіць на вадзе, бахераскага рабіна1
І флярэнцыйскія ночы. Яшчэ там будуць
Рэшткі нізкага муру, дзе дрэмле водар
Даўніх, даўніх дажджоў, і з халоднай, тлустай,
Пракажонай травы будуць падаць бясплодныя краскі

Ў нямы ручай.
[1]Ход пра апавяданьне Г. Гайнэ „Бахераскі рабін", якое цалкам не захавалася, загінуўшы пры пажары, але было ўлучана аўтарам у цыкль артыкулаў „Салён". Напісаньне твору было водгукам Гайнэ на т. зв. „дамаскую справу". Запасочаныя ў рытуальных забойствах дзеля выкарыстаньня хрысьціянскай крыві, колькі дзясяткаў дамаскіх габрэяў, улучна зь дзецьмі, былі арыштаваныя ў лютым 1840 г. Бальшыня ахвяраў загінула пад катаваньнямі.

Няскончаная сымфонія

Ты ведала мала мяне - там, пад сонцам адплаты,
Што цені людзкія яднае й ніколі - людзкія душы,
Дзе сэрцы людзкія вандруюць у сьне
Самотна празь цемру і жах, немавед да якое краіны.
Было гэта вельмі даўно - паслухай, каханка тужлівых нябёсаў, -
Далёка-далёка адсюль - добра слухай, мая зямная сястра, -
На Поўначы роднай, дзе зь белых азёрных лілеяў
Спрадвечны ўздымаецца водар, пах яблыневых садоў із забытых легендаў.
Далёка ад нашых абтокаў руінаў, ліянаў ды арфаў,
Далёка ад гор нашых шчасных.
- Там лямпа была, памятаю,
І стукат сякер ў тумане;
І я быў адзін у доме, табе незнаёмым,
У доме дзяцінства, маўклівым і цёмным,
Схаваным у парку густым, дзе птах у ружовых паўпрыцемках золкага золку
У гэтых глыбокіх пакоях із соннымі вокнамі,
Дзе нашыя продкі жылі
І куды пасьля доўгіх вандровак мой бацька
Прыехаў памерці, -
Я быў там адзін, і была, памятаю,
Пара, калі вецер ад нашай краіны
Нясе пах ваўкоў, і вішы, і мокрага лёну
Й зацягвае сьпеў на руінах ночы, як ведзьма, што крала дзяцей.
Апошні вечар прыйшоў, а зь ім хваляваньні,
І бессань, і страх. І ня мог я твайго прыгадаць імя.
Ахоўнік, пэўна, пайшоў у дом сьвятара,
Бо з зэдліка зьнікла ліхтарня.

Усе нашыя слугі старыя памерлі; іх дзеці
Ўсе эмігравалі; я быў чужаніцам
У скошаным доме
Свайго дзяцінства.
Пах гэтае цішы быў водарам збожжа,
Знойдзенага ў магіле; ты, пэўна, ведаеш тую
Іржу занядбаных мясьцінаў, сястру пахаваных,
Чый колер - як месяц над Мэмфісам, нізкая сьпелая поўня.
Я доўга бегаў па сьвеце сьледам за братам,
Не адпачываючы; я ня спаў у трывозе
Ва ўсіх харчэўнях гэтага сьвету. Цяпер я быў там,
Галава сьсівела, як брат мой - воблака. Больш не было там нікога.
Мне водгульле крокаў, трушок старой мышы прынесьлі б радасьць,
Бо той, хто тачыў маё сэрца, рабіў сваю справу бяз шуму.
Я быў, нібы лямпа ў мансардзе на досьвітку,
Нібы партрэт у альбоме брудэркі.
Бацькі ды сябры памерлі. Ты ж, сястра, была ад мяне
Далейшаю за карону сьвятла, якой спавіваецца ў студзені
Поўня, нябёсная маці сьнягоў. Ты ледзь мяне ведала,
А калі гаварыла, я ўздрыгваў, пачуўшы голас уласнага сэрца.
Ты ж спаткала мяне аднойчы, толькі аднойчы,
У дзіўным сьвятле сьвяточных лямпаў
Між красак ночы і золата пышных прыдворных, -
І я прамовіў „бывай!" адно твайму люстраваньню.
Самотнасьць чакала мяне -
Рэха цёмнае галерэі.
Дзіця там было зь ліхтарняю ды ключом
Ад могілак. Зімы вуліцаў
Пахам галечы мне дыхалі ў твар.
Здавалася мне, маладосьць ідзе за мною і плача;
Але ж пад лямпаю, з Гіпэрыёнам маім на каленях,
Сядзела старасьць - і не падняла галавы.
Добра слухай, зямная сястра мая. Гэта быў даўні блакітны
Пакой у доме майго дзяцінства.
Я там нарадзіўся.
І гэта там
Мне некалі ўпершыню ў задуменьні куцьці паказалася
Першая мая елка, мёртвае дрэва, што стала анёлам,

Якое выходзіць з глыбокага й горкага лесу,
Якое выходзіць, зьзяючы з даўніх глыбіняў,
З халоднага лесу й вандруе самотна,
Царыца сьнежных балотаў, у бледных агнёх
Каяты й асьвячэньня, у белых маўклівых і гожых палёх.
А вось залатыя вокны ў доме слухмянага хлопчыка.
Даўнія, вельмі даўнія дні! Такія пекныя й чыстыя! Гэта той самы пакой,
Але назаўсёды халодны, нямы і шэры.
Ён, здаецца, забыў назаўжды
Пра былы агонь і былога вячорнага цвыркуна.
Не было ні бацькоў, ні сяброў, ані слуг.
Была толькі старасьць, і ціша, і лямпа.
Старасьць люляла мне сэрца, нібы вар'ятка - мёртвае дзіцяня.
Цішыня больш мяне не любіла. І лямпа згасала.
Але пад цяжарам Гары цемнаты
Я чуў, як Каханьне, бы ўнутранае сьвяціла,
Ўставала над даўняй краінаю памяці, і я ляцеў
Далёка, далёка, як некалі, у падарожжа па снох.
„Прыйшоў трэці дзень". - І мяне скаланула, бо голас
Ішоў з майго сэрца. Голас майго жыцьця.
„Прыйшоў трэці дзень". - І я ўжо ня спаў, бо я ведаў: прыйшла
Гадзіна раньняй малітвы. Ды я стаміўся
І думаў пра рэчы, што мусіў убачыць ізноў; бо там
Быў вабны архіпэляг і востраў Сярэдзіны,
Засмужаны, чысты, што некалі зьнік ад мяне
З каралаваю магільняй маёй маладосьці;
Ён спаў каля ног цыклёпа з лавы. А перада мною
Ўгары была воданапорная вежа
Ў ліянах Эдэму і аксаміце старэньня
На сходах, нашараваных ступнямі месяца; справа,
На пекнай прагаліне між гаёў,
Руіны колеру сонца! І там ніводнага
Скрытага пераходу! бо ў гэтай пустэльні блукаў я
Зь нямым каханьнем пад хмараю поўначы. Ведаю,
Дзе шукаць найчарнейшых ажынаў; высокія травы,
Дзе разьбітыя стоды хаваюць свой твар,
Мне сяброўкі, а яшчаркі ведаюць з даўняй пары,
Што я зьвеставальнік міру, і ніколі пярун
Не грыміць сярод хмар майго ценю. Тут усе мяне любяць,

Бо бачылі, як пакутую. „Настаў трэці дзень,
Устань, я твая Заснулая з Мэмфісу.
Твая сьмерць - у краіне сьмерці, а жыцьцё - у краіне жыцьця.
Наймудрэйшая і заслужаная"...

Пераклаў з французскай Андрэй Хадановіч паводле
O. V. de L. Milosz. Poumes. Paris, Librairie Les Lettres, 1956.

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

лірыка

Іван Блатны
Чэскі пацыент

Голас гэтага паэта вярнуўся ў 1990-я з прадоньня выгнаньня, абмарачэньня, самоты, забыцьця. Паэта звалі **Іван Блатны**.

Нарадзіўся ён у Брне ў 1919-м, рана страціў бацькоў, у васьмігадовым веку ўжо пісаў вершы. У маладосьці — у пару гітлераўскай акупацыі й адразу па вайне — лічыўся адным з найбольш спадзеўных аўтараў свайго пакаленьня. У 1940 годзе дэбютаваў паэтычным зборнікам *Paní Jitřenka* (*„Спадарыня Дзяньніца“*), праз год выйшла другая кніжка — *Melancholické procházky* (*„Мэлянхалічныя праходкі“*); паэтыку Блатнага хвалілі за дасканалую клясычнасьць, адно што сьпеўную імпрэсіянізму ягоных вершаў той-сёй з тагачасных крытыкаў палічыў за надта ідылічную як на час пахмурнага Пратэктарату...

Першага разу Блатны апынуўся ў псыхіятрычнай больніцы пад час вайны, у студзені—лютым 1943 году. Тады, аднак, гэта была сымуляцыя. Трэ было папросту адкруціцца ад прымусовых работ, на якія высылалі немцы...

У 1945-м Блатны ўступіў у камуністычную партыю й выдаў чарговы томік сваіх вершаў — *Tento večer* (*„Гэты вечар“*). Ён радыкальна зьмяніў паэтыку — на месца колішняга

мэлядычнага александрыйскага прыйшоў свабодны верш, мэтафару заступіла маўленьне наўпрост, дамінантаю сталася сьведамае апісаньне штодзённасьці. Зрэшты, пісалася ў Блатнага й сьпеўная паэзія — у 1947-м пабачыла сьвет чацьвертая ягоная кніжка — *Hledání přítomného času* (*„Пошукі цяперашняга часу“*) — відаць там якраз схільнасьць паэтава да мэлядычных імпрэсіяў.

Кепскі час памалу рабіўся горшым — у паваеннай Чэхаславаччыне Блатны пасьпее выдаць яшчэ толькі два вельмі харошыя, як сьцьвярджаюць цяпер чэхі, зборнікі дзіцячых вершаў...

У сакавіку 1948-га, пасьля камуністычнага путчу, Блатны выяжджае ў Англію. Адтуль ён высылае ў Прагу сваё партыйнае пасьведчаньне й застаецца на эміграцыі. На Захадзе, здаецца, яго чакае жанчына — яны пазнаёміліся крыху раней, у другой палове 1946-га ў часе ягонага выезду ў Францыю. Блатны мерыцца застацца зь ёю назаўжды. Але нічога з тых намераў не выходзіць. Ён застаецца сам. І ўцякае — як пішуць ягоныя біёграфы — у псыхічную хваробу. Тры гады яго лечаць у шпіталі ў ангельскім Эсэксе. Выйшаўшы адтуль, ён патрапляе тры гады творча адрабіць пры радыях — супрацуе зь „Бі-Бі-Сі“ й „Вольнай Эўропай“. З 1954-га стан ягонага здароўя рэзка горшае — да сьмерці ў 1990-м Іван Блатны — пацыент брытанскіх псыхіятрычных больніц. Дыягназ Блатнага — паранаідальная шызафрэнія...

У больніцах яго будзе даймаць нябытнасьць жанчын, а таксама цыгарэт — ён заўзяты курэц, а цыгарэт яму выдзяляюць недаволі. Даймаць будзе й нястача словаў — ангельскіх, а тады й чэскіх — няма з кім перамовіцца па-чэску. На

паверхню памяці вымыкацца будуць словы нямецкія, французскія… Пазьней ён паэтычна засьведчыць такі стан рэчаў. Мяшаньне моваў у вершах станецца ягоным фармальным прыёмам. Аднак гэта пазьней — цягам двух дзясяткаў год Блатны нічога ня піша. Яго падахвоціць пісаць сваяк з роднага Брна — Ян Шмарда проста спытаецца пра вершы. Фрэнсыс Мічам, мэдычную сястру ў Іпсуічы, папросяць дбайна зьбіраць паэтавы рукапісы. У 1979-м у Канадзе ў легендарным для чэскае культуры выдавецтве „68 Publishers“ выйдзе чарговая кніжка Блатняга — *Stará bydliště* (*„Старыя адрасы“*). Яе сутворцам выступіць эміграцыйны чэскі паэт Антанін Броўсак — ягоным клопатам стане адбор вершаў…

Выданьне зборніка — ці мог быць большы стымул? Блатны працуе інтэнсіўна: вяртаецца ў сваіх вершах да Чэхаў, да Брна й Прагі сваёй маладосьці, але найбольш зь вялікаю шчырасьцю дае ў пісьме факты сваіх штодзённых праблем, боляў ды няшчодрых радасьцяў у псыхіятрычнай лячэльні. Гэтыя вершы — рэалістычныя аж да граніц абсурду, поліфанічныя, загушчаныя войстрым мантажом вобразаў. У 1982-м выходзіць апошні прыжыцьцёвы паэтаў зборнік *Pomocná škola Bixley* (*„Дапаможная школа Біксьлі“*). Паэтыка Блатнага эвалюцыянуе там далей: рэалізму заступае ўжо нярэдка сюррэалізма, паэзія стаецца навязьліва шматмоўнаю, прычым аўтар бавіць сябе й чытача разнастайнымі цытатамі ды парафразамі з алюзіямі. Рваны мантаж ня раз мае вынікам правакацыйныя каляжы. Іронію спалучыўшы з кпінамі, Іван Блатны выяўляў свой дэканструкцыйны настрой…

За пяць год да сьмерці, у 1985-м, яго перавялі былі ў пансіянат ля мора, да якога, зрэшты, ён

не хадзіў, — пансіянат для былых пацыентаў больніц для разумова хворых. Памёр ён ад эмфізэмы лёгкіх у Колчэстэры, летам 1990-га. Быў ужо час, каб вяртацца ў Чэхі. У траўні 1991-га прах паэтаў знайшоў прыстанак на могільніку ў Брне.

У 1990-я актуалізаваная творчасьць Івана Блатнага сталася адным з найбольшых літаратурных адкрыцьцяў у Чэхіі.

Лістапад

У чэскім клюбе ў глыбі мэтраполіі
цяпер, бо ўжо рана сутонее,
афіцыянт запальвае лямпы й прыносіць чэскія стравы.

Нарэшце дома.
Па-чэску замаўляю піва.
З эстрады гармонік, з кухні дзынканьне кубкаў.
У нядзелю будзе лялечны тэатар.

Вялікія лялькі Мацея Копэцкага тлеюць у парках.
Размоклыя люстэркі, як на Малвазінках*.
Фантан яе прычоскі, на якой балянсуе яйка места,
напаўвылупленыя птахі, з жаўтком, што цягнецца па дрэвах.

У разьлеглым парку замку дзе інтэрнаваны Гітлер
рэдкія ангельскія гаі прасейваюць цень
Празь імгу не відаць вакольнае вёскі

Рададэндраны шчэ не цьвітуць
у чорным ружовым кустоўі ёсьць яшчэ сьмерць

Некалькі нарцысаў на ўскрайку лесу які мы
лічылі мала ня дзікай прыродай
сьведчаць пра вынаходлівую тонкую працу садоўнікаў.

Калі дом ператвараецца па выбуху ў каралявы рыф

вугаль і цэмэнт стыне ў ілюмінацыі

Рыбы ніклыя чэраўцам дагары ад удару
плаваюць наўкол ружовага штандару

Вядзьмаркі на мятле
плюшчаць вочы ў гэтым зыркім сьвятле.

Міт
Ашука

Зь ляску шурпатых ружаў выбег сабака
ня ведае шчэ ўсёй сям'і
здаецца яму вялікаю як дзецям Прага

Студэнты гавораць яму па-гішпанску
разумее
ніколі аднак ня ўцяміць шахмат

Як звычайна я хаджу каралеўскаю пешкай
тым часам кветкі падаюць паміж фігур
стаўляю каралеву й слана на месцах найлепшых
для хуткага мату
які ўсё ж рэдка ўдаецца.

Шчаснасьць
З тому „Starб bydliљtм"

Наар пераадзяваецца ў жаночыя туалеты
пераведвае мідынэтак у іхных майстроўнях
усюдых на зямлі ёсьць поўдзень
усюдых на зямлі ёсьць раўнадзеньне
there is no clash of the singles with the married ones
валькірыя зьнікла ў Вальгале

Чараўніцы з „Макбэта" ідуць далінамі
прадказваюць вайну канец сьвету сьмерць
Mendelsson was arrested
вясельля ня будзе сукенку паклалі ў куфар назаўсёды

нявеста застаецца без сукенкі
румянец на твары нованароджанай німфы

* * *

Бог кепскі
робіць мне бязладзьдзе на стале
Ня маю попелкі
Зьнікла ў мяне жаданьне лічыць яго ўвесь час
за добрага
Yesterday I was coming to decisions
Today I am all the time completely undecided
I can’t overcome it
It is a hard day

На Бледзкім возеры на абтоку
стаіць бажніца
можна там выказаць тры жаданьні
я маю адно жаданьне але каб тройчы

Гэтую показку апавядала мне Сэнта Парачак
у нямецкай рэстарацыі „Heureka“
насупраць лекарскага аддзяленьня

Яе сястра Мілча была нашмат харошшая
Старая Парачкава была добраю мацерай
ведала пра нашыя шаленствы
дзіця павіннае бавіцца
Мілча аголеная пры печцы ў маім пакоі
Толькі так яна стаяла
Я чытаў ёй нямецкія пераклады сваіх вершаў
бо яна была немкаю
Немец
Я б хацеў быць немцам і ніколі не прачнуцца

The most beautiful painting is called kitsch
after a german painter who painted rosariums
he was known in Prague
Напару мы мусім маляваць падлу й вадзяныя пухліны

але час міндальных і малочных Афрадыт вернецца
as a matter of fact it is already on the bridge.

З тому „Ротоспб льkola Bixley“

Фрэд прыйдзе
Phoenix
У ёй
Дэман зьмены для зьмены

Прадмова й пераклад з чэскай Юрася Бушлякова.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

да Зьместу 1(6)-2000

лірыка

Максім Шчур
Альшанскія Могліцы

Усё жыцьцё ехаць да Прагі, каб памерці.
Падставіць твар дажджу, ня змусіўшы
раскрыцца
гатычных вежаў складзеныя парасоны
па-над магілай. Выбітныя іншаверцы
сваіх краёў, паломнікі ад месцаў пакланеньня,
ад млынаў збочыўшыя рыцары
ўсіх папярэдніх пакаленьняў
тут зьберажоны.

Як у вакенцы ўніз, у лужынным азерцы
праглядваюць нябёсы невыдумнай таямніцай
дзіцяці, што ўспрымае будучыню й заўтра
аднолькава ў сваім наіўным сэрцы
і, не стрываўшы на наступны дзень, амаль
баіцца
замест мінулага прапалага
знайсьці сьлед лапы пяціпалага
тыраназаўра.

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

да Зьместу 1(6)-2000

сьветліня

Уладзімер Ракіцкі
З хатняга альбому

Уладзімер Ракіцкі - мастак-рэстаўратар, ляўрэат прэміі „За духоўнае адраджэньне" (2000). Упершыню ў гісторыі Беларусі такая высокая ўзнагарода прысуджаная рэстаўратару. Рукамі Ўладзімера Ракіцкага былі адкрытыя, узноўленыя або рэстаўраваныя фрэскі ў Амсьціславе, Магілёве, Лошыцы, Пустынках, Бялынічах і Полацку, дзе ён адкрыў самы старажытны жывапіс Беларусі ў Спаса-Эўфрасіньнеўскай царкве.

Я нарадзіўся ў Парасьлянах, сяле, што на поўнач ад Пружаны, на пачатку сакавіка пяцьдзясят другога. Але яшчэ ляжаў сьнег, бо бацька, калі вёз санямі бабу Кацю з Шанёў у адведкі, то згубіў яе па дарозе і мусіў варочацца і шукаці яе ў полі. Казалі, што я быў надта крыклівы. Маці шла ў поле жаці, пакінуўшы малога на суседку, дык тая пад вечар: — *Манёчко, якую хоч роботу буду тобе робіці, ано не кідай больш мане з ім.* У пяцьдзясят сёмым памёр бацька, і маці з „чатырма дзецьмі на руках“ перабралася ў Шане, што з поўдня ад Пружаны, і пачалі мы будаваць сваю хату.

Маючы шэсьць год, ня вытрымаў вялікага смутку, ад таго што ўсе ідуць у школу, а самому трэба пасьці каровы. Ня вытрымаў, кінуў каровы на пожні каля млына і пабег у школу. Вучыцелька сказала: — *Ну, ніхай поседзіт, а там побачым*.

У школе ў адным пакоі былі тры класы з адной вучыцелькай. Спачатку заданьне выдавалася трэцяму класу, потым другому і нарэшце першакласьнікам. Над кожнай партай вісела газавая

лямпа з абажурам, за кожнай сядзела па тры вучні. У калідоры, там дзе стаяў бак з вадою і прывязанаю на ланцужку алюміневым кубкам, віселі малюнкі старэйшых школьнікаў, маляваныя каляровымі алавікамі. То было зьдзіўленьне, зайздрасьць і няздольнасьць да такога.
Зімою кожны школьнік шоў у лес зьбіраці сасновыя шышкі. Трэ былі цэлыя, зь зярняткамі, не паедзеныя вавёркай. Цэлы дзень па пояс у сьнезе, а пад вечар мяшок з пахучымі шышкамі прыцягваўся ў сяло.
Старэйшыя браты вучыліся ў Пружані. О, гэта так вабіла, што аднойчы, калі шла машына туды і сказалі „сядай“, то, кінуўшы сумку з кнігамі ў агарод, паехаў у Пружану і стаў вучыцца ў інтэрнаце. Тут ужо трэ было зьбіраці зярняткі ад яблык. У кабінэце па біялёгіі вісела дошка з прозьвішчамі школьнікаў і палачкамі, хто больш за каго здаў. На перапынках толькі там і таўкліся ўсе, але па вечарах у гэтым жа кабінэце сярод кактусаў і розных расьлін Мікалай Андрэевіч вучыў маляваць. Нават хадзілі на эцюды маляваць паводку Мухаўца. Ён жа выкладаў і сьпевы, але „Перапёлачку“ чамусь развучвалі ў кабінэце фізыкі. Там жа ў Пружані была ўзрошчана самая вялікая морква, каторую пасылалі аж на ВДНХ у Маскву. Невядома, якім чынам на той час здаваліся ўступныя экзамэны, але ў шэсьцьдзесят другім годзе пружанскі інтэрнат, апрануўшы ва ўсё новае, перадаў пачынаючага маляваць навучэнца менскаму інтэрнату. У менскай майстэрні гэтаксама была дошка, на якую вывешваліся лепшыя працы школьнікаў. Аднаго разу, пабачыўшы там свой маленькі малюнак, не паверыў і ціхенька зьняў яго. Але ён і ў другі раз зьявіўся на дошцы, а на трэці раз Сяргей Пятровіч, падабраўшы малюнак каля сьметніцы, закрычаў: „*Хто гэта ўвесь час зьдзірае гэты малюнак!?*“ Але ўсе маўчалі. Тады ён узяў пры ўсіх і пачапіў яго на сярэдзіну дошкі.
БДТМІ. Туды страшна было нават на парог зайсьці. Прымаліся людзі ўжо сталыя пасьля войска, выкладалі былыя партызаны... Неяк прынялі, праўда, пяціпрацэнтнікам, за малюначак, дзе бабы каровы дояць. За сьпінаю стаялі, глядзелі на гэты малюнак і казалі: „*Да, такія людзі былі на гэта месца, а каго ўзялі?*“ Праўда, сярод усяго, што там тварылася, быў адзін вучыцель Алег Уладзіміравіч, каторы са сьмехам, але доўга і ўпарта тлумачыў першапачатковы сэнс некаторых словаў, да

прыкладу: „ассортимент“, „генеалогия“.
Даўно ў вёсцы Шане, што на паўднёвы захад ад Пружаны, мне казалі:
— *Ну, што ты очы марнуеш над гэтым малёваньнем, бары лепш вілы, то хоць хлеба кавалок заробіш собе.*
— Сьмейцеса, сьмейцеса, — быў адказ, — от, купіт гэты малюнкі англійска королева, тоды побачыце.
— Хі-хі-хі, англіска королева!
Даўно ўжо няма тых, хто намаляваны на тых рысунках і хто сьмяяўся з такога маляваньня.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

хроніка

Славамір Адамовіч Турэмны дзёньнік: ад Усьпеньня да Калядаў

Славамір Адамовіч (нар. 1962) — паэт-„правакатар", стваральнік арганізацыі „Правы Рэванш". Першы палітычны вязень рэжыму Лукашэнкі. 10 месяцаў (4.04.96-7.02.97) правёў у турме за верш „Забі прэзыдэнта". У большасьці сваіх твораў Адамовіч выступае як тонкі лірык і мэтафарыст, асноўныя тэмы вершаў — каханьне, вайна, Бацькаўшчына; характар паэзіі экспрэсіўны, напорысты і адначасова прадметны, рэалістычны; проза лірычная, часта правакацыйная. У 1997 годзе на мітынгу ў абарону свабоды слова ў знак пратэсту супраць палітыкі ўладаў публічна зашыў сабе рот. Апошняя кніга Славаміра Адамовіча „Плавільшчыкі расы" выйшла ў сэрыі „Вострая брама" выдавецтва „Наша Ніва" (1999). Тут мы падаем урывак зь ягонага турэмнага дзёньніка, які мае выйсьці асобнай кнігай.
У рубрыцы „Хроніка" зьмяшчаюцца ўспаміны і дзёньнікі вязьняў сумленьня. У папярэдніх нумарах у гэтай рубрыцы выступалі Павал Севярынец, Андрэй Мельнікаў, Уладзімер Плешчанка, Эва Кантуркава, Зьміцер Гарбуноў. Да наступнага нумару рыхтуем да публікацыі згадкі Аляксея Шыдлоўскага пра ягонае

паўтарагадовае зьняволеньне.

Частка II. Віцебскі цэнтрал

14 жніўня (серада).

Позны вечар у сьледчым ізалятары г. Віцебску. Заехаў учора на белай „Волзе“ начальніка сьледчага ізалятара КДБ. Этапавалі ўчатырох. Два на заднім седале: у левага аўтамат з укарочаным ствалом, астатнія зь пісталетамі „Макарава“. Спыняліся па дарозе разы два — па малой патрэбе. Быў гарачы сонечны дзень 13 жніўня. Кожны раз, выходзячы з тачкі, я браў рукі назад. *Вертухаі* прасілі апусьціць рукі, але я не рызыкаваў, бо хто іх ведае, вертухаяў. Стрэляць у сьпіну, а потым скажуць: пры спробе ўцёкаў.

І вось — Віцебск. Аказалася, што менскія дэбэшнікі ня ведаюць, на якой вуліцы зьмешчаны будынак абласнога УКДБ. Нарэшце дарогу паказвае чалавек у вайсковай форме...

Загрузілі ў камэру 60 (шэсьць нуль). Гэта *малалетка*, з дарослых я — пяты. Сядзіць сем непаўналетніх. Сёньня зайшоў восьмы. Самаму меншаму — 14. Яшчэ тыя урвісы. Вечарам адна праблема: як схадзіць на *дальняк*. Першая ноч — на другім паверсе нараў, альбо *шконкі*. Ноччу слухаю казку пра каханьне зэка й зэчкі. Шоргат *маляваў* з камэры ў камэру праз *рэшку*. 61 — хата сухотнікаў (тубікаў), адкрытая форма. Ім даюць малако, тварог, нешта з садавіны-гародніны. „Адзін восем“, — крычыць жанчына, выклікаючы на размову свайго мужчыну. Усяго ў нашай камэры 13 чалавек. Самы старэйшы мае 36 гадоў. Восьмы малалетка, які заехаў сёньня этапам зь Менску, мае цэлы букет артыкулаў: разбой, згвалтаваньне, крадзёж ды іншае. Згадваю сваё маленства: часта брутальнае, галоднае, картовае, найсмачнейшы гасьцінец — калі бацька прынясе з работы сайку белага хлеба ды бутэльку „дзюшэсу“. Яснае было дзяцінства, прыгожае, плённае, таму і раблю я сёньня тое, што раблю.

16 жніўня, пятніца.

Ня спалі да познага — ладзілі *дарогі*. Пасылаў вестку ў пяць сем — не адказалі. Перадача ад маці. Лазьня. Канфлікт з-за картаў. Санітарна-эпідэміялягічная праверка, прадстаўнікі прэс-службы МУС. Начальнік ізалятару спытаў, ці ня я гэта зь Менску.

У Віцебскім цэнтрале (сьледчай турме) *чаляцца* дзьве тысячы

чалавек, 121 камэра.
17 жніўня, субота.
УЖ 15/із 2. 11 гадзін дня. Адзін малалетка сядзіць на *парашы* й дыміць самакруткай, другі ў тазіку мые свае лахманы. Бальшыня ўпавалачку сьпіць. Ноччу чатырнаццацігадовае хлапчанё, якому далі мяно Чосік, поўзаў па мне, як прусак, — сьцяліў дарогі ў суседнія камэры.
20 жніўня.
Заўтра — круглы стол палітычных партыяў. Але мне што з таго? Няма той партыі, якая задавальняла б маім патрэбам і падыходам. Калі толькі выйду — займуся рэарганізацыяй сваёй праварадыкальнай групы. Няхай паступова, кропля за кропляй, але Арганізацыя будзе! Арганізацыя з выразна прапісанымі правіламі гульні, дысцыплінай і матэрыяльна-фінансавым грунтам.
...Чосік сядзіць на рэшцы і дзівіцца, як маленькія чырвоныя мурашы распраўляюцца з матылём. Малому хочацца падзяліцца ўражаньнямі, але няма з кім, ніхто не адгукаецца на яго поклічы.
Сьніўся сон, што Лукашэнка іграе ролю ў нейкім спэктаклі: з указкай у руцэ і надта худы. Бачу яго, праходзячы за кулісамі.
22 жніўня, чацьвер.
Учора размаўляў з выхавальнікам Керзавым, перадаў яму некалькі нумароў „Нашай Нівы“ і „Свабоды“.
Сёньня была маці, дабілася ў судзьдзі спатканьня са мною. Нехта Голуб зь ёю гаварыў вельмі нядобра.
Мароз Юра выстаўляе пікеты дзеля маёй абароны, за што яго і б'юць ублюдкі ў цывільным. 27 ліпеня маці была на мітынгу, дзе ад яе імя выступалі (сама яна хвалявалася і не магла гаварыць) і зьбіралі грошы. Пасьля спатканьня зайшла і перадачка-*дбчка*: вінаград, яблыкі, чай і 4 пачкі цыгарэтаў зь фільтрам. Газэтаў не прапусьцілі. Турэмшчыкі чакаюць дня, калі на сэсіі Вярхоўнага Савету будзе разглядацца пытаньне пра пэнсійнае забесьпячэньне работнікаў МУС. Пытаньне ўнесена пунктам трынаццатым. Прозьвішча судзьдзі, які дазволіў маці сустрэчу са мною — Даўлюд.
Ноч. Гукі гораду. У нашых казэматах — духата і разборкі.
24-га, субота.
Позны вечар. *Баландзёры* шумяць. Перад вячэрай — прагулка. Халаднавата. У камэры вэрхал, малалеткі шчэмяць адно

аднаго. N сёньня прасіў закурыць. Ходзіць у адных трусах ды чэша муды. Днём заехаў „баскетбаліст“, рост 2 мэтры 01 см. Каб трапіць на *бальнічку*, бедалага праглынуў цьвік. Спадзяюся дні праз тры атрымаць абвінаваўчае заключэньне.

Віцебскі цэнтрал

Здаецца, нядоўгай была дарога
з 62-га ў 96-ы,
а зьведаў на ёй і д’ябла, і Бога,
і доўгія-доўгія дні посту.
Было! Пры сьвечцы чытаў Якуба,
і нешта з Луцкевіча, і з Максіма,
і п’яны прыходзіў з калгаснага клубу,
і думаў жыцьцё закрыць, як Місіма.
Было, што зь людзьмі быў шчыры празь меру,
а людзі думалі, што манюка,
і дзеля сьмеху лупілі ў цэру
альбо проста ў сэрца левым хукам.
Было! Любіў чужых і няцэлых
жанчын, што потым кідалі мяне.
Было: аддаваў і душу, і цела,
і рэдка на просьбы адказваў „не“.
Было, што піў з крыніц і балотаў,
і з кветак сьпелых вітальны сок,
з падонкамі піў і з бруднай галотай,
піў там, дзе сьветла, а больш — дзе змрок.

26 жніўня, панядзелак.

Хата пяць дзевяць — жанчыны — вярнулася з прагулкі. Чуваць, як рыпяць шконкі. Турэмныя пані залазяць у свае бярлогі, ёрзаючы нясьвежымі срачкамі па цяжкіх камэральных матрацах. Матрас, матрас, дай хоць раз, — кажуць у такіх выпадках як мужыкі, так і бабы. Некалі шэсьць нуль таксама была пад жанчынамі: у нас драўляная падлога і матрацы ў мэнструальнай крыві.

А пятай раніцы схапіў жывот. Панос. Пакутую да абеду. Камэра пайшла на двор, а я — на дальняк. Адзіная магчымасьць застацца аднаму — не пайсьці на прагулку, завіснуўшы на парашы.

Жанчыну хочацца — хоць самую апошнюю. Халаднее, ужо ня так душна ў камэры. Панядзелак — генпрыборка. Мыем

падлогу, „лебедзя“ — урыльнік. Каб зараз дадому, шчакой прыхінуцца да кары дубоў маіх, бярозаў, сасонак! Удыхнуць паветра ляснога, выйсьці па грыбы, паваліцца ў мох аксамітны, у ігліцу. І прайшлі б тады мае хваробы... Да „опера“ запісваюся шосты дзень, каб празь яго паспрабаваць адправіць лісты на волю.
Вечар. Пяць восем дала на суткі тэлевізар, а мы ёй — цывільняк (цыгарэты). Зайшоў старлей, начальнік апэратыўнай часткі. Размовы не адбылося, лісты адправіць нельга. Начальства адмоўчваецца наконт пісаных і няпісаных правілаў сваёй турмы. Самі, маўляў, кумекайце.
Генадзь Пракопавіч Керзаў — выхавальнік малалеткі. Кажа, што пры ім тут ужо сядзеў адзін палітычны. Гэта Міхал Кукабака, якога потым этапавалі некуды ў Расею.
29 жніўня, чацьвер.
Пакуль мы паласкаліся ў душы, у камэры нашай зрабілі *шмон*. Добра, што дзёньнік я ўзяў з сабой. На прагулцы перагаворваўся з Натальляй зь пяць сем. Сядзіць па 91-й. Зайшлі „СБ“ і „ЗЮ“. А вечарам яшчэ адзін шмон. Вывелі на *прадол*, тварам да сьцяны, рукі назад. Да Валіка, былога спэцназаўца, прычапіўся мент. Ледзь не пабіліся. Усе нашы транты вывернулі на *абшчак* і залілі вадой.
2 верасьня, панядзелак.
У школах сьвяточная лінейка, чысьценькія дзеткі, белыя каўнерыкі, фартушкі. Але ня ўсе яны скончаць школу, бо некага ўжо чакае камэра 60. Барані іх, божа, ад гэтай крывое сьцежкі!
Зайшла дачка, пахне яблыкамі і свабодай. Сяброўка Валя аказалася Ірынай. Зь ёю яшчэ чалавек шэсьць перапісваецца. Сядзіць за забойства мужа. Вечарам атрымалі суботнія газэты. У „СБ“ — праект прэзыдэнцкай канстытуцыі. Былы спэцназ Гуртавы нарэшце прызнаўся, што не падабаецца яму беларуская мова.
Надругательство над государственным флагом

Неизвестный злоумышленник снял государственный флаг Беларуси со здания Дерновичского сельсовета Верхнедвинского района и на его место повесил бело-красно-белое полотнище. Государственный флаг оказался сожжённым у здания сельсовета в деревне Дерновичи, а на двери строения

был оставлен лист бумаги с не шибко грамотной надписью: „Кто снимет флаг, тот будет убит до третьего колена“. Для установления личности преступника на место происшествия выехала оперативная группа специалистов УВД и КГБ из областного центра.

„СБ“, серада, 28 жніўня 1996 году.
5 верасьня, чацьвер.
Атрымаў перадачу ад мамы. Яна ў судзе і дабіваецца сустрэчы са мною. Але спатканьня не дадуць, калі справа сапраўды адпраўлена на дасьледку.
6 верасьня.
Спатканьне з маці ўчора ўсё ж адбылося. Родная распавяла мне, што на Юрася Мароза напалі, калі ён стаяў у пікеце, патрабуючы вызваліць мяне. Цяпер хлопец ляжыць у адным зь менскіх шпіталяў (страсеньне галавы).
7 верасьня, субота.
Ноччу і днём дождж, але цёпла. Малалеткі падрэзалі чырвоны стрыжань. Пішу чорным.

Канчаецца лета. Яблычны спас.
Пра Афрыку мараць птушкі.
Ах, як жа на волі прыгожа ў вас!
Ах, як жа за кратамі скрушна.
У вас там кажуць пра новы стыль
(„Прадай Радзіму“ назвалі).
А мы тут гніём, як падвальная цьвіль,
як брудная пена хвалі.
У вас там нардэпы ідуць у бой
з „усенароднаабраным“,
а мы тут штодня становімся ў строй,
штодня залізваем раны.
Мы тут прырастаем грудзьмі да нар,
мы тут заціхаем дачасу,
а ноччу смакуем чыфірны ўзвар
усёй арыштанцкай расай.
На волі ў гародчыках астры і кмен,
нясьпелы агонь каліны,
а ў нас на прадоле нахабны мент
пагардліва цыркае сьлінай.

Яму дазволена, ён „круты“,
цяпер ён сіла і права,
а нам застаецца — грудзьмі на драты,
худым абліччам у гравій.
А нам застаецца нічога і ўсё —
турэмная вош і Радзіма,
і наша нянавісьць, зь якой мы расьцём
насустрач рэжыму.
8-га, нядзеля.
Сон сьніўся, быццам сяку я сякерай нейкага адстаўнога маёра. Сон каляровы. Потым замятаю сьляды, многа крыві на адзеньні, якое я кідаю ў сьметніцу. Урэшце мая ахвяра даруе мне.
Па абедзе на дальняку сыходзіў крывёю: ці то страўнік, ці то гемарой, хай бы яго халера!
Жанчыны

Ноч. Жанчыны заслалі файную плексіглясавую асадку. *Пацаны* адпісалі дзяўчатам пра мяне.
Складана пісаць пра жанчын-арыштантак. Яшчэ цяжэй чуць іхныя галасы днём і ноччу, іх любоўныя сьпевы. Невыносна ведаць, што ў хаце пяць дзевяць шконка рыпіць пад 33-гадовай Ірынай-душагубкай. Як і ты, яна сыходзіць жаданьнем, яна прагне хоць крышку любові і пяшчоты. Зь Іркай-паліцайкай мы крыху пішамся — абменьваемся малявамі. З Наташкай зь пяць сем перагаворваемся на прагулцы праз *кабуру*. Галасок у Наташкі, што хоць памры. І шыюць ёй 91-ю. У пяць адзін сядзіць яе бацька, і кожны дзень яны перагаворваюцца-перакрыкваюцца праз рэшку-вакно. У гэты момант наша малалетка заціхае і ўслухоўваецца ў голас Наты. Я думаю, чаму гэта ня голас маёй дачкі там, на волі.
Адзінаццатага, серада.
Набліжаюцца халады. Чую пра гомельскую школу кілераў (забойства міліцыянэраў), пра бабруйскую групоўку, якая робіць наезды на маскоўскія рынкі. Ноччу Геша з шэсьць чатыры заклікаў *братву* навесьці ў турме закон: каб абшчак і дарогі не прабіваліся пэрсаналам, каб у Беларусі братвой кіравалі свае, а не маскоўскія. Крычаў праз рэшку на ўсю турму. Раніцай далі рэдкую пшонку бяз чаю. Чакаем пракурорскай праверкі, якая, што праўда, нічога ня дасьць.

Толькі свабода! Беларусь альбо сьмерць — вось наша паэзія!
22 верасьня, нядзеля.
З камэры 58 загналі тэлевізар, глядзелі фільм „Невінаваты“ — пра міліцыю.
Восень халодная (- 40). Паліцайка ня піша за любоў. Калі суд? Няўжо не асуджуся да рэфэрэндуму? Прырэзаць бы якую *суку*!..
24 верасьня 1996 году.
Рэдкая гарохавая каша. Сутычка з вывадным у санчасьці, хоць я не даваў ніякіх падставаў. Апэратыўнік Лазуркін закінуў да нас сматрашчага па корпусе Астапа, які нам *разганяў рамсы* на прадмет узаемадачыненьняў з малалеткамі.
Мэдагляд паказаў, што ў нас „востры гастрыт“. Абяцаюць паставіць на дыетпаёк. Буду піць дэ-нол, лекі ад гастрыту.
26 верасьня (чацьвер).
Ноччу малыя інтэнсыўна працавалі на дарогах. Потым злавілі ў цэляфанавы пакет мыш, пагуляліся зь ёй ды адпусьцілі. Любяць малалеткі жывое — акрамя сабе падобных.
На наступны дзень. Стаматоляг заплямбаваў мне зубік. Кажа, што нехта зь яму знаёмых цікавіцца маім лёсам. Круглая ў дантыста мордачка, маладзенькая і, здаецца, нахабная. Усё выклікаў на размову, а калі я загаварыў па-беларуску, то запатрабаваў гаварыць да яго па-расейску. Ох, і карцела ж мне засадзіць у доктарскія бельмы сталёвы маніпулятар бормашыны!
Вечарам заехаў новенькі, 201-ы артыкул. Здаровы, загарэлы, забралі проста з поля, на якім бульбу капаў разам з бацькамі. А Дзіму-баксёра *нагналі* — адпусьцілі дамоў.
П’ю дэ-нол, але ня лепшае. Цывільныя прадукты скончыліся. Няўжо, блін, засудзяць?
28 верасьня, субота.
Позна вечарам заехаў малалетка Алег Туронак. Рухавы. Бываў у Друі, што нагадала мне Галіну, ейную сакавітую чорт ведае як назваць штучку. Ноччу быў *кіпеж*: з камэры 58 пацан ламаўся з крыкам „Адпусьціце мяне дамоў!“ Урэшце закінулі яго ў *рэзінку*, дзе ён спачатку крычаў немым крыкам, а потым заціх, зьбіты. І стала так сумна-сумна...
Халодна. Баландзёрскім чаем вымываем з кашы тэхнічны тлушч, зь якога ніякага толку, бо не засвойваецца. Ад гэтага клятага тлушчу пякотка страўнік рэжа без нажа.
4 кастрычніка (пятніца).

Позны вечар. Прыгнобленасьць, злосьць, нянавісьць. Сёньня роўна 6 месяцаў з дня майго ўвязьненьня. Паўгоду за кратамі! За сваё, дзякуй богу, за Бацькаўшчыну, не за ліхое.
Пракурор запрасіў Стусу 12 гадоў. Страшна. Аддасьць лепшыя свае гады. Застаецца ў яго сын, жонка, хворая маці, якой усяго 45 гадоў, якую пакінуў бацька пяцідзесяці гадоў, пайшоўшы за маладой. Сёньня да прагулкі з Валянцінам Г. курдыкалі пра палітыку, мараль... Сэрца ў яго баліць. Жэню С. прывялі з суду са сьлязьмі на вачох. А такі быў вясёлы, пакуль была надзея. Судзяць жа яго па чатырох артыкулах за бандытызм.
6 кастрычніка (нядзеля).
Ізноў дрэнна, лёгкія болі ў жываце. Змрочна, імжыць дождж. Сёньня ноччу камар не даваў спакою. Днямі клоп пагрыз шыю. А дзявятай вечара заходзіў выхавальнік Шульцаў, патрабаваў у пятнаццацігадовага Андрэя Казлова з Талочына гаварыць „правільно“ (Андрэй гаварыў па-беларуску).
Ем часнык (альбо *чосьнік*), горкі перац, яблыкі. У камэрнай сям'і нас цяпер чатырох плюс новы — Бароха. Падумаць толькі, ягонае маці ўсяго 36! Успамінаю лета, сястрычку Сьвету, якая дапамагала мне перапраўляць на волю малявы. Тады напісаліся гэтыя радкі:

Такая ціхая і сьціплая,
на шыі крыжык залаты,
вяртаеш ты мяне, асіплага,
зноў да жыцьця і пекнаты.
Уколам, клізмаю і грэлкамі,
і чысьцінёю прасьціны,
і броваў чорненькімі стрэлкамі,
і непрысутнасьцю маны
вяртаеш ты мяне ў дні радасьці,
мяне, прыкутага за верш,
вяртаеш з зоны бруднай стаднасьці...
12 кастрычніка.
Ноччу сьніліся цікавыя сны. Першы сюжэт: мяне сустракаюць знаёмыя, бачу аксэсуары кбта, катуюць. Другі: я ў кампаніі сваіх, Вячорка побач. Усе разам на нейкім лятальным апараце мы падаем у вадаём, што і ўратоўвае нас ад сьмерці… Пасьля сну настрой прыўзьняты. І цёплае, сонечнае надвор'е.
Ноч з 12 на 13 кастрычніка. Гляджу фільм „Мярцьвяк“. Пра

амэрыканскага паэта Ўільяма Блэйка. Пасьля фільму — рок-канцэрт „Рок па вакацыях“. Камоцкая сьпявае: „Мая свабода — зь ветрам нязгода“. Камэра дрыхне.
14 кастрычніка, панядзелак.
У „хаце“ генэральная прыборка. Васямнаццацігадовы пацан Троль, як высьветлілася, ня ведае, што была такая вайна — другая сусьветная. Гэта ўразіла, дальбог. На фоне такіх тролікаў адчуваеш сябе старажытным эгіпецкім жрацом-фараонам.
Днямі заехаў да нас „дзед“ зь Віцебскай дэсантнай дывізіі — за дзедаўшчыну, вядома. Родам з Ваўкавыску. Цяпер будзе яму дзембель гады два ў дысбаце!
Зараз вось Ж.С. падсьміхаецца зь беларускай мовы Алега Туронка, падла. Растуманілі апошняга на добрую зімовую шапку.
Гадзін дзесяць раніцы. Атрымаў перадачу: сала, сушкі, масла, 2 пачкі цыгарэтаў „Бонд“, сшыткі, асадку, швэдар. На прагулку выводзіў начальнік рэжыму Захаравіч. Паабапал сьценаў прадолу — рэзэрвовая група ў масках і шлемах. Відаць, на волі неспакойна.
* * *

Ізноў кастрычнік. Час пасадкі дрэваў.
На саджанцах раса дрыжыць,
а ты,
ты ўспамінаеш падарожжа ў Крэва,
значэньня стратэгічнага масты,
любімы шлягер, інтэрнат, свабоду,
турму, сабак, іржавыя драты,
супраціўленьне мужных, слабых згоду,
неадэкватнасьць зла і дабраты;
ты ўспамінаеш, як заходзіць сонца,
як на цэнтрал навальваецца змрок,
як з вымені каровінага ў донца
струменем б’е антысухотны сок.
Ах, памяць, памяць! Файная ўласьцівасьць,
яна табе ня дасьць асатанець,
яна сілкуе годнасьць і гідлівасьць,
да усяго, што *западло* цярпець.
Ты ўспамінаеш, як цьвітуць вяргіні,

Як лес шуміць, як асядае пыл
на жыта прыдарожнае, як гіне
блакітны чмель у белай конскай грыве,
як баба ў лазьні свой шаруе тыл;
ты ўспамінаеш, як шманалі „хату“,
як ты ня стаў з рукамі на сьцяну,
як дапамог свайму блатному „брату“
жывот ускрыць, прачнуўшыся ад сну.

18 кастрычніка, пятніца.

Мэдсястра перадала два пакункі „Гексавіту“, але ня ведаю, ад каго. Дзякуй табе, добры чалавек!

Сьніўся наш мастак Алесь Пушкін. Другі сон: пясочніца, у якой поўзаем мы, дарослыя. Чорт яго ведае, што такое!

„Спэцназаўцы“ Жэнька ды Валік вывесілі камсу на прасушку. Будзе правясная. Сохне, а разам зь ёю і мы.

Позны вечар. Заўтра „ўсебеларускі народны сход“, ініцыяваны ППРБ. Малалеткі голяць Колю-пятнаццацігадовага. Ці не клапы пачалі мяне грызьці, бо ўскокваюць і не зажываюць струпы.

21 кастрычніка (панядзелак).

Змрочны дзень, сыры. Ноччу нылі зубы (верхнія справа). Прысьнілася якаясь пампушачка, песьціў яе на руках, у ейных бацькоў на кватэры. У абед прынесьлі „Определение“ Вярхоўнага Суду РБ.

„Дело направить на новое судебное рассмотение с иным составом суда“.

22 кастрычніка (аўторак).

Быў у опэра Бабарыкіна, які абяцаў адправіць ліст на матчын адрас. Перад гэтым не пасаромеўся прачытаць. Газэтаў пра падзеі выхадных дзён няма. У прагулачным дворыку мушу слухаць дзяржбрахалаўку. Верашчаць пра рэфэрэндум і ППРБ. Сярэднявечча! Горай, чым пры камуністах 70-х гадоў.

Змрочна. Дождж. Небясьпека сухотаў. Бабарыкін спрабаваў загаварыць пра Верш, але я не павёўся. Вечарам зайшлі кнігі, сярод якіх адна пад назваю „Хризантемы у тюремной стены“ са штампам Віцебскай дзіцячай бібліятэкі імя Н.К.Крупскай.

27 кастрычніка.

Сьніўся бацька малады. Мы зь ім сярод знаёмых і блізкіх, добра гаворым. У цокальных памяшканьнях дзесьці пад Будславам. Потым бацька зьнікае, дзеяньне пераносіцца ў раён Крывічоў, што пад Вялейкай. Сонечны дзень, іду са знаёмымі па вуліцы,

густа забудаванай культавымі гмахамі. Валяецца будаўнічы друз, шчэбень. Раздаём нейкі вадзяністы тварог, які цячэ па сьценках посуду. Што ж гэта? Што там дома?
31 кастрычніка (чацьвер).
Зараз Дзяды. Спадзяюся, што ўспомнілі. Калі не мужыкі, дык жанчыны абавязкова. І вып'юць за мяне. І зробяць нешта для майго вызваленьня.
3 лістапада (нядзеля).
Ноч. Дождж за кратамі. Спаць бы, ды не прыйшла чарга. У суседа на ніжніх нарах — гонкі. Гэта значыць, што хвалюецца чалавек, бо ў панядзелак павінны яму абвясьціць прысуд.
6 лістапада (серада).

Ноч. Глядзім 48-ы віцебскі тэлеканал. У камэры нас 18 ілбоў.
...І вось у правале між сном і яваю вышукваецца верш са словаў: сыр, сочыва, крышталь, прыборы срэбныя, такайскае віно, прасьціны белыя і ранічка вясны, Вялікдзень, курасьлеп, чаромха, пад'яленец духавіты і вэнджанае сала ў кубяльцы. Галоўнае — чысьціня! Чыстая раса і чыстая вада. Гэта аснова быцьця.
Па 48-м перад амністыяй пракруцілі сюжэт пра наш цэнтрал.

Тихо шифером шурша,
едет крыша не спеша.
9 лістапада (субота).
Сьнілася, што далі мне тры гады. Учора пасьля вячэры наляцелі шмоншчыкі, павыкідвалі *шлёмкі* з бульбай, якую мы пакідалі на ноч (бо што рабіць, калі палова камэры спаць ляжа толькі пад раніцу). Маё, праўда, засталося пры мне.
* * *

Каханьне бяз рэтушы, голае, галоднае,
за кратамі ў камэры альбо на прадоле,
каханьне пад прыцэлам, сырое, падкалоднае,
цяжкае, нібыта царкоўная жырандоля,
каханьне маё прышлае, імгненнае, тутэйшае,
я нацкую на плоць тваю лягавых маёй жарсьці,
я расьпішу цябе прыгожымі і дзёрзкімі вершамі,
ня дам табе спакою да самай нашай старасьці.
Пакуль я буду лёгкімі сіпець на цэнтрале,

абкураны і добраю, і дрэннаю табакай,
хадзі сабе сьмела ў памаранчавай залі,
зусім ня так, як ходзіць камандзір перад атакай.
Але як толькі выйду я, як толькі я звольнюся
з турмы, дзе забіваюць павольна і ўпэўнена,
мы паплывём з табой у белым ад полюсу да полюсу,
мы станем любіцца і слухаць Ленана,
мы будзем, як дрэвы, што мной пасаджаны
за тысячы дзён да вершаў і славы,
мы будзем добрымі індыйскімі раджамі,
будзем языкамі пякельнай лавы,
мы будзем вылівацца з кратэраў гневу,
з каналаў нянавісьці да акупанта,
мы зьнішчым яго нашым гімнічным сьпевам,
а рэшткі змыем з дапамогай гідранта.
І толькі потым, пасьля, мы зоймемся каханьнем,
мы будзем выраблять — о божа! — такія штукі,
што адшукаюць нас, магчыма, позьнім раньнем
і целы яшчэ цёплыя возьмуць на рукі.
16 лістапада.
Рабочая субота. У Віцебску сёньня мітынг у падтрымку чарговага рэфэрэндуму, арганізаваны антыбеларускімі сіламі (прарасейская „Белая Русь“, псэўдаказачкі, КПБ нейкага Чмыкіна). А ў Менску таксама мітынг, на якім патрабуюць адстаўкі ППРБ. Шарэцкі й Ганчар дамагаюцца тэлеэфіру. Напружанасьць расьце.
Сёньня пасьля трох дня атрымаў абвінаваўчае заключэньне. Ныюць зубы.
* * *

Состоялась учредительная конференция по созданию белорусской организации ветеранов КГБ Республики Беларусь. С приветственным словом к ветеранам обратился председатель КГБ Беларуси Владимир Мацкевич.
Характеризуя обстановку в республике, В.Мацкевич отметил как один из серьёзных дестабилизирующих факторов активизацию деятельности иностранных спецслужб. Вкупе с представителями оппозиции ими оказывается давление на Президента Беларуси, принимаются меры по препятствованию проводимой им политики по интеграции с Россией и другими

странами Содружества.
„СБ“, № 222, 16 лістапада 1996 г.
18 лістапада (панядзелак).
Дазволілі спаткацца з маткаю, ад якой даведаўся пра выхад маёй кніжкі вершаў „Каханьне пад акупацыяй“. Паглядзеў праз шкло на вокладку — і ўсё. Перадаць мне, аўтару, не дазволілі. Выйшаў таксама зборнік „Менская вясна-96“. Малайцы, сябры! Адвакат таксама робіць сваю справу. Усе хатнія здаровы, чакаюць майго звароту. Вертухай забраў адзін мой турэмны верш, які я спрабаваў перадаць маме.
25 лістапада — суд. Усё ж дацягнулі да рэфэрэндуму. Што ж, пабачым... На кнізе вершаў „Каханьне пад акупацыяй“ — аўтограф былога міністра ўнутраных спраў Захаранкі. Учарашняе шэсьце апазыцыі па праспэкце Скарыны адзначана сутычкамі зь міліцыяй. Сёньня ОРТ паведаміла, што старшыня Рады міністраў М. Чыгір ва ўльтыматыўнай форме падаў у адстаўку.
20 лістапада (серада).
Пятая гадзіна ночы. Учора вечарком без тлумачэньняў вытаргнулі з 117-й. На разьвітаньне братва прасіла аўтографы: хто на апошняй старонцы ўласнага прысуду прасіў расьпісацца, хто проста на белым аркушы паперы... І вось я ў камэры шэсьць чатыры (64).
Прысьніўся ўчора Вася з 117-й: нібы ён ляжыць на дарозе, каля вёскі Равячкі, распалавінены нейкім мэханізмам на дзьве часткі. Вася гэты быў прастыўшы, пот зь яго цурком ліў. А Равячка — вёска пад мястэчкам Будслаў, што ў Мядзельскім раёне. За 500 мэтраў на паўднёвы ўсход ад Равячкі, на ўзвышшы сярод поймы ракі Сэрвач знаходзіцца гарадзішча пачатку нашай эры, якое археолягі адносяць да культуры штрыхаванай керамікі. Яшчэ з гэтае Равячкі паходзяць Роўды, мая радня. Адсюль у свае сорак гадоў сялянка-каталічка Роўда Грасільда пайшла за зьбяднелага і хворага шляхціца-каталіка Станіслава Адамовіча, майго дзеда, якога я ніколі ня бачыў.
21 лістапада, ноч.
Хочацца есьці. Як бы гэта было цудоўна — сустрэць трыццаць пятую вясну на свабодзе, сярод першацьветаў, пакапацца ў гародзе!..
Геша распавядае пра адзін са способаў супраціву мусарскому гвалту — зашываньне ірта іголкаю (лепш „мэдыцынскай“ — ад

шпрыцу). Калі на судзе будуць справу клеіць гэтак жа нахабна, як і *сьлядак* Сакольчык, то прыйдзецца зашыцца. Будзе слаўны заключны акорд, рэзюмэ, так сказаць. Вярхоўны Савет запатрабаваў ад Канстытуцыйнага Суду разгледзець варыянт імпічмэнту ППРБ.

27 лістапада (серада).

Прайшоў рэфэрэндум. Лука ізноў выйграў. Учора ў дзевяць вечара вярнуўся з карцэру, дзе адбываў пяць сутак.

22.11.96 г. Раніца, паднялі нары. Дождж лупіць па жалезных казырках вокнаў. Прынесьлі хлеб і цукар. Па радыё на прадоле іграюць бээсэсэраўскі гімн.

23.11.96 г. За сьцяною сядзіць „Кампазытар“ — мой сусед па *кічы*. З *дуркі*. Суткамі рыкае. Ці прыстаўляецца, ці сапраўды дах паехаў — па-любому страшна. Кантралёр падагнаў гарачага *чыфу*. Я якраз на парашы сядзеў. П'ю цяпер, загрызаю скарынкай хлеба. І цёпла ў грудзях ня столькі ад гарачай вадкасьці, колькі ад чалавечага жэсту вертухая. Аж плакаць хочацца ў адказ на дабро. Але й саркастычнае ўбіваецца клінам у мае сантымэнты. Гэта яно хоча сказаць „добраму“ кантралёру: заходзь да мяне на штрафняк, дастань ключык, адкінь нары, пасядзім разам хоць суткі, пачыфірым. Я буду гаварыць табе камплімэнты, бо ты за пачак цыгарэт перадаў мне ад зэкаў кубак крутой заваркі. Ты герой, кантралёр!

25 лістапада ў панядзелак адбылося першае паседжаньне віцебскага аблсуду. Нявыспанага, непамытага забралі мяне з кічы а дзявятай раніцы. Узяў з сабою толькі матэрыялы „Справы“. Шманалі сярэдне — салдаты тэрміновай службы з каравульных рот. Нейкім скамячаным было першае паседжаньне. Я нават сказаў бы, што мы не пасьпелі пасядзець, мы толькі прыселі. Пракурор і судзьдзя гаварылі напаўголасу, быццам чагосьці баючыся. Майго адваката не было — завіс у Гомлі на паўтара месяца (вядзе іншую справу). Прыслаў тэлеграму, у якой просіць суд адкласьці працэс, а мяне выпусьціць пад падпіску. Адразу ж пачаліся накладкі з пратаколам. Сакратарка запісала, што і я выказаў недавер суду, хоць я такой заявы не рабіў. Здымаць на фота- і відэаапаратуру судзьдзя не дазволіў. Я чакаў, што народу будзе ў залі больш. Бачыў Алеся Пушкіна, Ю. Касіча з плякатам. Б. Хамайда і Ул. Плешчанка заявілі суду адвод, які ня быў прыняты. Наступнае паседжаньне — 2 сьнежня.

Пасьля судовага паседжаньня, якое спынілі задоўга да абеду, мяне трымалі да пяці вечара. Есьці не далі, у іх, бач, так заведзена. У прыбіральню таксама не выводзілі. Па вяртаньні ў карцэр турэмныя кантралёры выдалі халодны абед, кавалак хлеба й цыбуліну. Зрэшты, жрачку гэтую прыйшлося вырываць крыкам. А вось *палажняковай* вячэры не атрымаў. Пачаставаў бажавольнага суседа фільтровай цыгарэтай. Ужо праз хвіліну ён прасіў у мяне табакі. Пазаўчора яго супакойвалі дубінкамі і ўколамі. Нейкі час ляжаў ціха, потым пачаў сьпяваць. Таму і „Кампазытар“.

28 лістапада.

Прыйшоў з кічы, а мне паказваюць выразку з газэты „ЗЮ“. Якісьці малады выпладак шкадуе, што я ў час галадоўкі ня даў дуба. Не дачакаецеся, сучонкі!

У вячэрніх навінах белрадыё паведамілі, што ўжо сфармавана „палата прадстаўнікоў“. Ліст на свабоду выйшаў, толькі ці ў тыя рукі патрапіць?

Шуміць дождж, працуе „дарога“.

29 лістапада.

Адправіў другі ліст на адрас Сяргея Д. Увесь дзень трасца ганяла на дабл. Голад. Скончыліся запасы прадуктаў, засталася толькі чарняга — чорны хлеб.

30 лістапада.

Субота. Канчаецца любімая пара — восень, якую я так і не пабачыў. Геша пішацца з бабамі, магнітола хрыпіць пра залатую рыбку. Дзе ты, маўляў? А я тут, на верхняй шконцы, чакаю панядзелка.

1 сьнежня (нядзеля).

Прастыў. Днём рыхтаваўся да заўтрашняга працэсу.

2 сьнежня (панядзелак).

„Сьвечку запаліць“ не ўдалося. Геша даў куртку, каб я ня так лахова выглядаў у судзе. А суд той ішоў тры хвіліны. Працэс перанесьлі на 16 сьнежня, калі павінен зьявіцца адвакат Гары Паганяйла.

Вечарам далі сустрэчу з матуляй. Перамовы былі кароткімі. У мінулую суботу ў абласной філярмоніі давалі канцэрт фактычна ў маю падтрымку. Кася Камоцкая спадзяецца, што мы яшчэ пасядзім у яе на кухні за чаркай...

6 сьнежня.

6 гадзін раніцы. Зрабіў рэнтгенздымак грудной клеткі.

Прастудны крызыс мінуўся, але яшчэ кашляю. Выжыць! Трэба выжыць і перамагчы!
Нехта Гуцалюк перадаў, што пра мяне гавораць па тэлевізары. Геша чытае мне свой „верш“. У пластыкавай бутэльцы распусьціліся бярозавыя галінкі, выцягнутыя зь веніка-дзеркача. Аксамітныя такія лісточкі. А на носе — Каляды!
Пачынаецца дзень 7 сьнежня. З дынаміка гучыць „Элегія“ Маснэ. Сёньня па „хаце“ дзяжурыць надта ўжо гаваркі Аляксей-разьвядзёнец. У мяне пайшоў дзявяты месяц адседкі. Хутка жанчыны, што прынялі мужчынскае семя 4 красавіка, народзяць на плянэце цэлае пакаленьне людзей.
8 сьнежня (нядзеля).
Раніца. Слухаю гурт „Вялікае Княства“ Ўладзімера Давыдоўскага. Усе ў камэры сьпяць. Тэмпэратура нулявая. Хутка за сьмецьцем з камэры прыедзе „камаз“ — мэталічны бак у суправаджэньні двох зэкаў. Хочацца зімы, сьнегу, марозу...
Усю ноч вертухаі просяць чаю, ды яшчэ з цукрам. Камень камэры смокча з нас сокі жыцьця, забірае здароўе. Лётаюць мошкі, поўзаюць макрыцы-сараканожкі, шастаюць мышы й пацукі. Працягваецца пост (адвэнт). З радыё — „Адваротны бок месяца“ групы „Пінк Флойд“. „Аўсяны бунт“ Івана Мяло і надпіс на гэтай кнізе: „1721 г. Менск“. Хто аўтар гэтых крамзоляў? І ці не прысьніўся мне гэты год і гэты горад?
Ужо сьнежань, а, здаецца, толькі ўчора залятаў у 9-ю камэру „амэрыканкі“ чмель, і я выпускаў яго. Здаецца, толькі ўчора пісаў свой першы турэмны верш.
Да суду застаецца сем дзён. „Песьняры“ ірвуць душу Багдановічавай „Вэранікай“.
9 сьнежня.
Дзень нараджэньня Максіма Кніжніка. Я — пішу, памятаючы, што насупраць нашае шэсьць чатыры — тры камэры сухотнікаў (63, 62, 61). Заўтра ў ДЛ зьбяруцца нашы й псэўданашы, экзальтаваныя дбмы бальзакаўскага веку, мужычкі з пэйсамі і ў заношаных пінжачках...
11 сьнежня, серада.
Амаль дванаццаць гадзін праспаў. А ўчора — ты чуеш? — быў сусьветны дзень абароны правоў чалавека. Учора й сёньня залятаў начальнік опэрчасткі Гуцалюк, ад якога я даведаўся, што Алесь Аркуш піша пра мяне ў „Віцебскім кур’еры“. Падрыхтаваў да суду „Новы Запавет“ у перакладзе на

беларускую (у пераплёт уклеіў іголку зь ніткай, якой зьбіраюся зашыць сабе на судзе рот).

Сшытак № 2

Працягваю запісваць.

16 сьнежня, панядзелак.

Трэцяе пасяджэньне Віцебскага абласнога суду па крымінальнай справе № 182.

Прывезьлі, сяджу ў боксіку. Чытаю на сьцяне: „Гурко — *казёл*“. Гурко — гэта той, які мяне судзіць...

І вось заля суду. Казань кажа пракурор. Разглядаюць хадайніцтва майго падзельніка Плешчанкі, які адмаўляецца ад адваката. А яму, як і Хамайдзе, адмаўляюць у хадайніцтве. У сувязі са скаргамі Плешчанкі, Хамайды і маёй судзьдзя абяцае праверыць работу Віцебскага цэнтралу. Прыклалі да справы газэты з публікацыямі і кнігу вершаў. Пракурор не падтрымаў хадайніцтва маіх таварышаў Віктара Корзуна і Сяргея Харэўскага пра зьмену меры стрыманьня на падпіску аб нявыезьдзе. Выказаў недавер суду і адвакат Паганяйла. Суд выйшаў параіцца, што адказаць на адвод Паганяйлы. Мянты здыхаюць ад духаты. Пракурорчык і перакладчык (ці то асыстэнт, ці то асьпірант) сядзяць у залі. Ня бачу ніводнага літаратара з СП. Дзе гэтыя „народныя мудрацы“? Дзе гэты „мозг нацыі“?

Трэцяя гадзіна дня. Па абедзе. У залю зайшлі ня ўсе, хто быў да паўдня. Дык перад кім, для каго рот зашываць?

А што ж я пра маці, пра маці маўчу, якая глядзіць і глядзіць на мяне? Чаму мне так цяжка нават пра сябе сказаць ёй: „Мама, ма-ма...!“ Ці будзе ў мяне хоць калі такая жанчына, якая так глядзела б на маю дачку?

Судзьдзя чытае літаратурнае заключэньне прафэсара Алега Лойкі на гэты самы „Верш“. Пракурор Чэчка падтрымлівае хадайніцтва Хамайды пра запрашэньне ў суд спэцыялістаў-літаратуразнаўцаў.

20 сьнежня (пятніца).

Учора судовае паседжаньне пачалося а 12-й дня. Доўга чакалі перакладчыка.

Сёньня прывезьлі рана, не пасьпеў ні памыцца, ні паесьці. Ізноў чакаем перакладчыка. Знайшлі новага. Гэта Дзядова (ці Дзядкова?) Алена Сяргееўна, 1969 году нараджэньня, асьпірантка катэдры беларускай мовы Віцебскага

дзяржунівэрсытэту. Перакладчыца-аўтаматчыца. Так хутка, бедненькая, перакладае, што аж загаворваецца. Замужняя, глядзіць у мой бок. А я гляджу на чырванагрудага гіля, які скача па дрэве за вакном суду.
Судзьдзя й засядальнікі зачытваюць „выбраныя месцы“ з майго прыватнага дзёньніка, разглядаюць групавыя здымкі байцоў „Правага Рэваншу“. На адным зь іх — мужчына й жанчына. Ён — з гранатай і кулямётнай істужкай на плячах, яна — з узьнятым угору абрэзам...
Суд так і ня высьветліў:

— ці існуе ў рэальных прасторы і часе таямнічая арганізацыя „Правы Рэванш“?
— ці можа гэта дзяўчына з прыгожымі вачыма пад банданам аднойчы выстраліць з абрэзу, які трымае ў руцэ?
— ці мае ў сваіх выбуховых вантробках запал граната, якую трымае мужчына, адлюстраваны на чорна-белым фотаздымку?
Чаму ўсё ж я напісаў такі крыважэрны верш — „Убей президента“? А чаму кінарэжысэр N назваў сваю кінастужку для дзяцей страшнай назвай „Скінь маму зь цягніка“? Якраз на прагляд такога к і н а вадзілі мяне, калі я сядзеў на „малалетцы“.
Алесь Пушкін робіць замалёўкі фізіяномій удзельнікаў працэсу. Усе ўжо стаміліся ад чытаньня пратаколу па другім разе.
Бедная мама! Дрэміць, напакутавалася за гэтыя дні.
Сёньня мароз, сьвежы сьняжок, яшчэ белы, не зьляжалы.
Як паведаміў перад пачаткам судовага разьбіральніцтва Хамайда, на віцьбіча Юрася Мароза ізноў зроблены напад. Як жа насаліў антыбеларускай поскудзі гэты наскрозь хворы чалавечак!
І ўсё ж: люба жыць, калі бачыш, як ныpцуе ў роце язычок перакладчыцы, як працуе яе шматфункцыянальны артыкуляцыйны апарат!
24 сьнежня (аўторак).
Ясна, марозік, апошні дзень адвэнту — Посная Куцьця.
25 сьнежня (серада).
Вось і Каляды — турэмныя! І мне не чуваць, як „на марозе рыпяць санкі“. Надвор’е прыгожае, але мы таго ня бачым, адно слухаем па радыё зводку гідрамэтцэнтру. У Віцебску — мінус 15о. Пасьля прагулкі чытаю Ніка Хаакіна, філіпінскага

пісьменьніка. Дзесьці ў засьнежанай Альхоўцы Мядзельскага раёну, у матчынай хаце, стаіць калядны стол, пакрыты сенам. Паверх сена — чыста вымыты стары ільняны абрус, на якім ляжаць: сьвініна, вантрабянка, капуста, грыбы (салёныя і поліўка з сушаных), фасоля, бульба і — аплаткі. Адна — для мяне.

Кантралёр Сьвятлана адкрыла *кармушку* ў дзьвярох ды паўшчувала мяне за тое, што згадаў яе ў сваім лісьце на волю. Пісьмо тое перахапілі і, відаць, не без асалоды апэратыўнікі прасьлібізавалі. Сьвятлана перажывае, што могуць звольніць з працы. А ці ж бабская гэта ўвогуле справа — арыштантаў пільнаваць?! Кажу, калі, барані бог, звольняць, мы цябе не пакінем, знойдзем работу і па-за турэмнымі сьценамі. Усьміхаецца, зубы ня ўсе. Але ё-маё — палюбіў бы й шчарбатую!

Вось і канчаецца калядны дзень. Хутка праверка і адбой. Заўтра суд. Мама, пэўна, зьбіраецца на працэс. Едуць зь Менску спэцыялісты-літаратуразнаўцы — будуць аналізаваць і выносіць прысуд майму Вершу.

ТУРЭМНЫ СЛОЎНІК

А

Абіжанка — камэры для арыштантаў, якіх *апусьцілі*, альбо якія мелі кантакты з апушчанымі.

Абшчак — 1) арыштанцкая каса ўзаемадапамогі; 2) стол у камэры.

Апусьціць — згвалціць.

Апушчаны — арыштант, зь якім зьдзейсьнілі гвалтоўны полавы акт.

Аўтарытэт — 1) злачынец, якога паважаюць у сваім асяродку; 2) адзін з найбольш высокіх „рангаў“ у гіерархіі „злодзеяў у законе“.

Б

Баланда — пахлёбка, *хлябалава*, суп.

Баландзёр — арыштант, які раздае баланду.

Бальнічка — 1) больнічны від рэжыму ў турме; 2) турэмная бальніца.

Бацыла — сала альбо масла (алей).

Братва — арыштанты, зьняволеныя.

В

Вертухай — наглядчык, кантралёр.

Г

Ганец — работнік турмы альбо калёніі, які за ўзнагароду прыносіць арыштантам гарэлку, наркотыкі ды ўсё тое, на што ў зьняволеных ёсьць попыт.

Д

Дальняк — унітаз, *параша*.

Дарогі — сыстэма міжкамэрнай сувязі.

ДАчка — перадача арыштаванаму.

Дурка — псыхіятрычны шпіталь.

Духарык — неспакойны чалавек.

Духарыцца — скандаліць, мітусіцца, падымаць вэрхал.

З

Закасіць — прыкінуцца хворым на галаву, прыдуркам.

Заныкаць — надзейна схаваць.

Западло — грэшна, сорамна.

Зона — папраўча-працоўная калёнія.

І

Ізьмена — хваляваньне.

Быць на ізьмене — хвалявацца.

К

КАбура — адтуліна ў сьцяне камэры, празь якую ажыцьцяўляецца міжкамэрная сувязь.

Казёл — самая зьневажальная лаянка ў асяродзьдзі злачынцаў.

Кандзей — карцэр, *кіча*.

Кантавацца — нічога не рабіць, сноўдацца з кута ў кут.

Кармушка — вакенца ў дзьвярох камэры, празь якое падаюць *пайку*.

Карпусны — дыжурны па корпусе.

Кіпеж, кіпіш — скандал, вэрхал.

Кіпішыцца — скандаліць.

Кіча — карцэр.

КішкА — жарлівы чалавек.

Клеіць — прыпісваць чужую віну.

Ксіва — 1) дакумэнт; 2) запіска, пісьмо.

Крытая, крытка — турма.

Кум — начальнік апэратыўна-рэжымнай часткі ППК.

Кумаўскі (работнік) — даносчык, стукач у камэры ці на *зоне*.

М

Малалетка — 1) непаўналетні злачынец; 2) камэра для

малалетак.
Малява — запіска.
Маскі — рэзэрвовая група для ўзмацненьня рэжыму ўтрыманьня зьняволеных; байцы групы дзеля ўласнай бясьпекі закрываюць твары чорнымі маскамі.
Н
Нагнаць — адпусьціць на волю.
Наколка — 1) татуіроўка; 2) падман.
Начальнік — супрацоўнік органаў унутраных справаў.
Ніфелі — высушаная альбо сырая чайная гушча, якую выкарыстоўваюць па другім і трэцім разе.
П
Палажняковы — законны (палажняковая *пайка*).
Пайка — сьняданак, абед альбо вячэра паводле турэмнай нормы.
Парафініць — зьневажаць.
Параша — 1) вядро, цэбар для нечыстотаў; 2) унітаз.
Прадол — турэмны калідор.
Пацан — 1) непаўналетні злачынец; 2) кандыдат у „злодзеі ў законе“ зь ліку непаўналетніх.
Пыжыць — тое, што й *духарыцца*.
Пяро — нож.
Пятух — асуджаны, якога суседзі ў камэры вымушаюць да полавага акту („апускаюць“).
Р
Рамсы — тлумачэньне.
Рамсы разганяць — даваць тлумачэнь не, вытлумачваць праблему ў камэры (турме).
Рэзінка — камэра, сьцены якой абшытыя гумай альбо іншым ізаляцыйным матэрыялам; прызначэньне паводле функцыі — для катаваньня зэкаў.
Рэшка — закратаванае вакно з падваконьнем.
С
Сідар — валізка, заплечнік з рэчамі.
Скурвіцца — здрадзіць.
Ссучыцца — 1) здрадзіць інтарэсам групы; 2) здрадзіць усталяваным парадкам.
Стукаць — даносіць на каго-небудзь.
Стукач — даносчык.
Сука — 1) здраднік; 2) той, хто выйшаў з касты „злодзеяў у

законе“.
Сьветка — унітаз.
Сьлядак — сьледчы.
Ф
Феня — 1) жаргон злачынцаў; 2) цыгарэты зь фільтрам (на жаргоне *малалетак*).
Х
Хата — камэра.
Ходка — тэрмін, на працягу якога адбываюць пакараньне (другая, пятая ходка).
Хлябалава — пайка.
Ч
Чаліцца — адбываць пакараньне.
Чыф, чыфір — густа завараны чай, заварка.
Чыфірбак — чайнік.
Чыхуня — жанчына, якая робіць мінэт.
Ш
Шасьцярыць — прыслужваць каму-небудзь.
Шасьцёрка — арыштант, які прыслужвае аўтарытэтнаму злачынцу.
Шконка — нары.
Шлёмка — міска.
Шманаць — абшукваць.
Шмон — вобшук.
Шыць — тое, што й клеіць.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
[image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000[image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** [image] Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **18-03-2000**

да Зьместу 1(6)-2000

вожык

Андрэй Хадановіч
З чаго пачынаецца Жодзіна?

З чаго пачынаецца Жодзіна?
Дальбог, не з машыны «БелАЗ»!..
Я сёньня сьвяткую народзіны:
Як што, запрашаю і вас!

Пад месяцам, сонцам і зоркамі
Балюе з суседам сусед.
Як сьцьвердзіў паэт, нат паморкамі
Ёсьць час для сяброўскіх бясед!

Як не, адмаўляйся бяз сораму —
Шмат ежы на Белай Русі!
Пад месяцам, сонцам і зорамі
Ўсяго ўсё адно не зьясі!

Шчэ больш на зямлі — мама родная! —
Харошых ды розных кабет;
Ды не пакахае ніводная,
Хоць руш да манахаў ў Тыбэт!

Сігаеш за пекнымі паннамі,
Ды марным стаецца твой сіг.
І ўсё ж не памрэм занядбанымі,
Бо Жодзіна дбае пра ўсіх!

Сардэчнымі словамі, поўхаю,
Дубцом, бізуном, рамянём
Гадуе, кунежыць, выхоўвае.
І большай ні ўночы, ні днём

Нас песьціць ня знойдзем аматаркі.
А як адыходзім да сну,
Вачыма ласкавае мацеркі
Глядзіць у калыску й труну.

Пільнуе ды сочыць паводзіны,
То хваліць, то ставіць у кут...
З чаго пачынаецца Жодзіна?
Яно пачынаецца тут...

За мрой экзатычныя спэцыі,
За праўду ў айчынным віне,
За *Grande Canale* ў Вэнэцыі,
Які не гайдае мяне;

За госьця, што горш за татарына,
Гасьціннага сябра свайго;
За Катэдру Нашай Спадарыні,
Якая сьмяецца з Гюго;

За сьверб разумовага голаду,
Што я спаталяў задарма
Агнямі вялікага гораду,
Якому найменьня няма, —

Чым стане мне змогі, аддзячу я
Найлепшай у сьвеце зямлі —
За першыя крокі дзіцячыя,
За першыя сьлёзы, калі

Бацькамі бяз жалю, бязь літасьці
Быў гнаны ў дзіцячы садок...
Што будзе пасьля — акалічнасьці,
Галоўнае — першы радок!

Пачатак, прывабныя ўводзіны

Жую саладзенькім дражэ:
З чаго пачынаецца Жодзіна?
З разгалістай літары «ж»,

Як жонка, жыхарства, жыдоўская
Жахліва жывая журба,
Жабрацтва, журы, «Жыгулёўскае»,
«Жызэль», «Жэрміналь», жажаба,

Жаўрук, журавель з журавінаю,
Жыгучка, жаўнер, жалуды,
Жаданьне жывіцца жанчынаю,
Жычэньне жыцьця без жуды...

Славутую песьню каверкаю
Й карціны ўстаюць уваччу.
Пытаньне гаркавай цукеркаю
У роце смакую, смакчу, —

Як гронку чырвонай смуродзіны.
І тахкае сэрца ў грудзях.
З чаго пачынаецца Жодзіна?..
І ці абяцае працяг?

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000

[image]
[image] Панславізм у 1(6)-2000 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

да Зьместу 1(6)-2000

кніга

Вацлаў Чэрны Разьвіцьцё і злачынствы панславізму

Вацлаў Чэрны (1905-1987) — прадстаўнік дэмакратычнай літаратурна-крытычнай думкі Чэхаславаччыны. Вучыўся ў французскім Дыжоне, у праскім Карлавым унівэрсытэце. У 1953 г. некалькі месяцаў прасядзеў у камуністычнай турме, а ў 1985 г. стаўся адзіным літаратарам, чыё імя было выкрасьлена з ужо досыць дэмакратычнага „Лексыкону чэскай літаратуры“. З 1948 г. Чэрны быў вымушаны пісаць у стол або друкавацца пераважна ў самвыдаце і эмігранцкіх выданьнях. Ягоныя „Ўспаміны“, тры тамы якіх выйшлі ў 1977-1983 гадох на эміграцыі, сталіся бэстсэлерам неафіцыйнай чэскай культуры.Няскончаны эсэй „Разьвіцьцё і злачынствы панславізму“ ўпершыню друкаваўся ў часопісе *Stredni Evropa* ў 1993-1994 гадох. Мяркуецца, што ён пісаўся ў першай палове 50-х гадоў і першапачаткова рыхтаваўся да выданьня на французскай мове, але зь невядомых прычынаў задума рэалізаваная не была. У сьвятле сучасных расейска-беларускіх псэўдаінтэграцыйных тэндэнцыяў гэты твор набывае асаблівую для нас актуальнасьць.

Частка першая

„Амэрыка і Славія — гэта два краі глыбокай магілы, у якой астатнія састарэлыя народы раней ці пазьней бясспрэчна пахаваныя быць павінны. А таму і надалей мужна змагайцеся за свой народ і сваю мову, не зважаючы на пляткарства рабскай „Аўгсбурскай газэты“. Я сам немец душой і целам, але мне сорамна быць ім, калі я чытаю ў гісторыі сьвету пра неміласэрнае абыходжаньне германцаў з вэндамі“[1].
Нямецкі натурфілёзаф Окен
да Яна Колара зь Цюрыху ў 1844 г.
Мэлянхалічная тэа culpa[2],
або малы вадэмэкум чэскага рамантызму

Што з нас будзе праз сто год, славяне?
Прыгадаўшы славу сваіх продкаў,
наш славянскі род вясноваю паводкай
кантынэнта ўскраінаў дасягне.
ловы нашае гаворкі мілагучнай,
сярод немцаў зьневажанае спрадвечна,
загучаць чароўна і навечна
зь ненавісьнікаў ранейшых вуснаў.
Нашы веды пацякуць у сьвет ракой,
і народы па-над Эльбаю і Сэнай
апрануцца ў наш слав янскі строй,
нашы песьні засьпяваўшы дружна.
Як бы я жадаў у тое ймгненьне
са сваёй устаць магілы душнай!
Ян Колар. Дачка Славы. 1832 г.

* * *

Калі я скажу, што панславізм — гэта чэскі выраб зь нямецкага матэрыялу, мой французскі або ангельскі чытач усьміхнецца. Калі скажу, што ў ім малы і пачцівы народ шукаў сродку самазахаваньня і *une planche de salut*[3], чытач нецярпліва сьцепане плячыма й знэрвозьнее. Калі ж я дадам, што панславізм быў спробай інтэграваць славізм у *акцыдэнтальную*[4] канцэпцыю чалавека, чытач раздражнёна адкіне кнігу, абвінаваціўшы яе і ейнага аўтара ў хлусьні. І ўсё ж я тройчы кажу праўду! <…>

Калі б мы, чэхі, у канцы XVIII — пачатку XIX стагодзьдзя былі вялікім, вольным і шчасьлівым народам, мы былі б прынялі хвалу, якой Ёган Готфрыд Гердэр ахінуў славянаў. <…> Але мы былі малым народам сялянаў, падначаленым абсалютызму габсбурскай Вены, — то бок двайнымі нявольнікамі, — і нешматлікі пласт нашых адукаванцаў стаяў на самым пачатку разьвязаньня сваёй тагачаснай задачы: народ „абудзіць“, нацыянальна прасьвятліць і арганізаваць. А таму „будзіцелі“, цалкам захопленыя нямецкім рамантызмам, са зразумелай заўзятасьцю прынялі гердэрыянства як бязьмежную маральную падтрымку з рук шляхетнага прадстаўніка варожага народу. Дый як жа ж яму ня верыць, калі ты, сын чэскага селяніна, чуеш, як той разьвівае свае тэорыі пра абранасьць *Naturvųlker*[5], іх прыроджаную чысьціню, маральную моц, пра будучыню, якая належыць выключна ім? За імі — адраджэньне Эўропы, выратаваньне састарэлага сьвету, бо хто ж бліжэйшы да маці-Прыроды і ейнай прыроджанай дабрыні, як не яны? <…> Я бачу запал, зь якім яны накідваюцца на чацьверты разьдзел шаснаццатай кнігі Гердэравых *„Ideen zur Philosophie der Geschichte der Menschheit“*[6], дзе славяне ўсхваляюцца як народы сялянскія і надзвычай міралюбныя, то бок як сам праўзор натуральнай абранасьці. <…> Я бачу ўсю глыбіню ўдзячнасьці маіх землякоў Гердэру за яго высокую думку пра вялікага чэха Комэнскага, чые пэдагагічныя погляды ён хацеў бы пакласьці ў аснову свайго пляну перавыхаваньня чалавецтва. Я бачу і як яны ўслаўляюць яго за тое, што ён цешыўся чытаньнем старадаўняй Гайкавай „Кронікі чэскай“, чые міталягічныя выдумкі і прыгожыя байкі з чэскае даўніны ён прымаў, відаць, за ўвасабленьне *Naturdichtung* у апазыцыю да *Kulturpoesie*[7], і зь якіх сёе-тое ня грэбаваў паэтычна апрацаваць. <…> Напраўду, калі нямецкія хрушчы некалі й гудзелі, што змаглі абудзіць — дзякуй богу! — цэлы дрымотны народ, адбылося гэта ў 1800-1830 гадох у Чэхіі. Тады цэлая генэрацыя чэскіх будзіцеляў — другая, якая ўвадначас ёсьць першай чэскай генэрацыяй рамантычнай — дадала да гудзеньня хрушчоў свае заўзятыя Алелюя! Усім гэтым Юнгманам, Ганкам, Шафарыкам, Коларам Гердэр вярнуў нацыянальную самасьвядомасьць. Вярнуў ім болей: гордасьць. І нават яшчэ болей: надзею ў прастрацыі. <…> Бедныя сярод багатых, слабыя сярод дужых, яны адорваюць сьвет менавіта сваёй

неачасанасьцю, першаснай натуральнасьцю, арыгінальнасьцю. Яны прыходзяць ад самых *крыніцаў чалавечнасьці і маральнасьці*. Хіба ж могуць яны загінуць, стоячы бліжэй за каго да вытокаў *жыцьця*? <…> Вось так у сьвятле Гердэравай містыкі самі падставы для роспачы, самі найвялікшыя слабасьці народу стаюцца ягонымі *сіламі*: тады, на пачатку XIX стагодзьдзя, гэты чэскі народ, без палітычнае самастойнасьці дый проста моцы, з дэнацыяналізаванымі вышэйшыми станамі, без прамысловасьці і матэрыяльнага субстрату, зьведзены да сялянаў, гарадзкіх рамесьнікаў і прыгаршчы настаўніцка-выкладчыцка-ксяндзоўскіх інтэлектуалаў, трымаецца, па сутнасьці, на адной адзінай рэчы — *размаўляе* яшчэ па-чэску! Але, кажа Гердэр, народ ёсьць народам якраз дзякуючы сваёй мове: геній народу тоесны з геніем мовы; мова і толькі мова ёсьць першай і пачатковай праявай прыроды: *le langage sensible* ёсьць *le premier langage humain*[8], чысьціню якой трэба берагчы. <…> Меркаваньні Гердэра пра славянаў, вядомыя будзіцелям з 1792 г., з 1800 г. у Чэхіі стаюцца эвангельлем. Клопштак зрынуты, а на пасад усаджваюцца Гердэр і Гётэ. Гердэр усюдыісны. Да 1830 г. ён найвялікшы чэскі будзіцель. Ён удыхаецца з атмасфэры. Ён у навуцы, у філязофіі, у паэзіі, ягоныя васалы вырашаюць народныя спрэчкі. <…> Вось Павэл Ёзэф Шафарык і яго „Славянскія старажытнасьці“, асноўны твор славянскай археалёгіі, доказ пра аўтахтоннасьць славян у Эўропе і выява іх дагістарычных часоў: яго ўяўленьні пра „салодкі“ расавы нораў славянаў — ад Гердэра. Вось Чэлакоўскі, заснавальнік чэскага фальклярызму, і першы значны твор ягонага руплівага жыцьця — першы том „Славянскіх народных песень“ 1822 г. (да 1827 г. іх будзе тры): гэта ж Гердэравы *„Stimmen der Vųlker in Liedern“*[9]; ад Гердэра ён запазычыў свае зьбіральніцкія прынцыпы, разуменьне песьні як галоўнай праявы народнасьці і меркаваньне пра яе цалкам арыгінальны характар. <…> А славутыя старажытныя падробкі „Рукапісаў Кралевадворскага і Зеленагорскага“? Няма сумневу: пачаткі іх трэба шукаць у подыху Гердэра. <…> Калі ўсё ж урэшце зьявіцца слова *панславізм*? Яно ўжо зьявілася, бо ўсе вышэйзгаданыя — панславісты. Аднак першым прарокам яго і першым фармулятарам цэльнай сыстэмы быў вялікі паэт і фантастычны антыквар, прыяцель і сябра ўсіх пайменаваных, Ян Колар. Ён таксама расьце з

Гердэра, думае Гердэрам, дыхае Гердэрам. Чэрствы ад прыроды і строгага сямейнага выхаваньня, звыклы настойваць на сваім пераканаьні дзякуючы спэцыфіцы сваёй прафэсіі (ён заўзяты і цьвёрды вікары пратэстанцкай царквы і ўсё жыцьцё за сваю маленькую славацкую парафію змагаецца зь непрыязьню мадзярскага асяродзьдзя ў Пэшце: ён *пастыр* і *мяншыньнік*!), паэтычна вельмі адораны і надзвычай лёгка адношаны гіпэрбалічнай фантазіяй, вельмі вучоны, але хутчэй усебакова, чым глыбока і крытычна, гэты славак у 1817 г. прыбывае ў нямецкую Ену, і, правучыўшыся там паўтара году, вяртаецца цалкам зьмененым: наступныя трыццаць год ён будзе снаваць раскошную павучыну панславянскага міту з пачутых там думак, якімі немцы жывілі нямецкую філязофію нямецкага нацыянальнага адзінства і нянавісьці да Францыі. <…> Свабода, адзінства, містычная *Deutschtum*[10]! Дайце гэтыя тры рэаліі маладому паэту, які акурат „абудзіўся“ для ўласнага нацыянальнага самаўсьведамленьня, — і нацыянальная субстытуцыя пройдзе сама! Хіба ня ходзіць ён тут па *славянскіх могілках*? Гэты край па-над Заале быў калісьці славянскім, пра гэта гаворыць археалёгія, гісторыя, геаграфічныя назвы. Колар, летуценна блукаючы па шырокім навакольлі да самага Ваймару, знаходзіць пацьверджаньне гэтаму нават у зьнешнасьці жыхароў. <…> Гратэскная коміка і гістарычная настальгія найрамантычнейшае пачцівасьці злучаюцца дзеля зьяўленьня пачуцьцёвага „ангажэмэнту“, які ператворыць Колара ў вялікага паэта: нямецкая дзяўчына, у якую ён закахаецца, Фрыдэрыка Шміт, дачка пастыра з блізкае Лёбэды, ператворыцца ў яго ў славянку, прадачку тых зьніклых славаў[11], чый попел ён таптаў у Нямеччыне! Калі яна й не была ёй, яна заслужыла ёй быць! Хіба ёсьць нешта, чаго не адолее каханьне? Але, *il y a plus*[12], нідзе не намацаеш эсэнцыяльнага рамантызму першапачатковага славізму яўней, чым тут: гэтая немачка, якая да сваіх сарака год не магла наважыцца са сваім каханкам выправіцца ў яго чужаземны край, мела стацца ў ягонай мітычнай канцэпцыі праўзорам славянскай жанчыны, ахоўным геніем славянаў, дачкой багіні Славы, якую Бог паслаў на зямлю, каб кампэнсаваць(!) славянам усе гістарычныя крыўды, што выпалі на іх долю! Фрыдэрыка Шміт — Коларава Міна — суцішае гнеў нябёсаў і валадарыць над славянамі: ці была калі літаратурная гераіня выразьнейшым

сымбалем? Якраз такая асноўная канцэпцыя Коларавай „Дачкі Славы“, якую — вярнуўшыся зь Ены ў 1819 г. — ён выдаў у 1821 г., потым, перабудаваную, у 1824 г., і зноў, вельмі пашыраную, у 1832 г.: менавіта гэтая „Дачка Славы“ сталася першай *бібліяй панславізму*! Кніга, складзеная напачатку з пралогу ў элегічным дыстыху і трох нізак па пяцьдзясят пэтраркаўскіх санэтаў, а затым павялічаная да больш як шасьцісот санэтаў, дзякуючы мілоснай лірыцы і народнаму элегізму сваёй пачатковае вэрсіі ёсьць вялікім паэтычным творам: у такой форме яна — вандраваньне па славянскіх магілах, плач ды гнеў прыгнечаных і надзея на Божую волю. <…> Але ад выданьня да выданьня песьня мілоснай тугі слабне й банальнее, а дыдакцыя расьце: апошняя вэрсія ўжо ўяўляе сабой хіба вершаваную славянскую археалёгію, гісторыю, юстыцыю і прафэцыю. Напачатку ў „Дачцэ Славы“ мы бачым фантастычныя дагістарычныя часы славянства, ідылію міралюбнае, букалічнае расы, чые пасланцы прызнаюцца татарскаму хану, што ўмеюць толькі сьпяваць і граць на варыце13, але ніяк не ваяваць: Гердэр *dixerat*14. Потым знаходзім у ёй гісторыю славянаў, якая, уласна, ёсьць гісторыяй учыненых ім крыўдаў і гісторыяй славянскага разладу. Нарэшце — суд славянскі: Колар у двух найпазьней дастворaных сьпевах (славянская „Лета“, славянскі „Ахерон“) не вагаецца сьледам за Дантэ наведаць неба і пекла і не адмаўляе сабе ў сатысфакцыі асудзіць ворагаў славянаў на вечныя пакуты ды засяліць рай скрозь славянамі. І, нарэшце, візія славянскае будучыні і велічы: Колар бачыць яе галоўным чынам геаграфічна і лічбава: ад ускраін Сібіру да Крканошаў не заходзіць славянскае сонца! І ён зусім не зважае, што гэта ўвесь час ня „тое самае“ сонца, бо асноўная рыса ягонага славізму палягае ў цьверджаньні пра існаваньне „славянскага народу“, а чэхі, палякі, расейцы — адно галіны яго (чэскія славяне, расейскія славяне і г.д.). Ягоная „Ўсяславія“, такім чынам, атрымоўваецца ў выніку звычайнага сумаваньня. Ужо Міцкевіч папракнуў яго гэтым, бо атрымаць славянскі народ сумаваньнем значыць проста прылічыць некалькі маленькіх пунктаў да капіталу расейскага. Злагада (насамрэч думка пра еднасьць была навязьлівай ідэяй Колара таму, што яна была і восьсю рамантычнага і пасьлярамантычнага мысьленьня нямецкага!) і асьвета. Праз сто год ён бы хацеў устаць і

слухаць, як мова былых рабоў гучыць з вуснаў ворагаў. <…> Больш за дваццаць апошніх гадоў Колара (памёр ён у 1852 г.) павысьціланыя шкадаваньнямі ягоных сяброў і аблямаваныя вучнямі, што яго пакідаюць. Гэтыя гады ўсё яшчэ вялікія патрыятычным запалам і ахвярнаю працай на карысьць славянскае меншыні ў Пэшце. Яшчэ вялікія задумай ачысьціць рэпутацыю і імя славянаў. Яшчэ ўхвальныя за руплівае зьбіраньне фальклёру. І ўсё ж яны непапраўна сфальшаваныя апалягетычнай фантастыкай, якая ўчыняе зь яго нашчырараваных тамоў шэраг *morts-nŭs*[15], якія навука ўласнага народу адкінула ўмомант. Пачалося гэта спробай гарманізацыі чэскае мовы, паправай яе гукавой сыстэмы, упартай эўфанізацыяй. Працягнулася канструяваньнем нацыянальнага нораву і найдаўнейшай асьвечанасьці зь песьняў, якія ён сабраў у народзе. А скончылася перамяшчэньнем славянскай гісторыі на тысячу год назад. <…> На схіле жыцьця, у суправаджэньні жонкі Фрыдэрыкі, ён учыніць падарожжа ўсіх рамантыкаў: у Італію; потым яшчэ адно: у Швайцарыю, Жэнэву; тады зноў у Італію. У выніку зьявіліся дзьве кнігі „Дарожных нататак“ і аб’ёмны „навуковы“ том — „Стараіталія *славянская*“[16]. Так: *славянская*. Бо паўсюль, куды б ён ні прыйшоў, ён знаходзіць містычных сыноў славаў: славянамі былі лаціняне і этрускі, славянскімі былі старажытныя Італія і Швайцарыя! У той самы час іншы чэскі панславіст (Данкаўскі) у тоўстай кнізе даводзіць славянскасьць Гамэра і Анакрэонта, а яшчэ адзін (Вінаржыцкі) бачыць славянаў у кельтах. Сваёй дурасьцю гэта параўнаецца хіба зь цьверджаньнямі тагачасных нямецкіх вучоных, якія тыя самыя народы абвяшчалі за германцаў! Азірніся дзе заўгодна па Італіі: суцэльны „Геркулянум славянскі!“ Дарэчы, у гэтай сувязі на рахунак славянскіх заслугаў прылічваюцца і антычная асьвечанасьць і, вядома ж, хрысьціянскае сярэднявечча. Славянская гісторыя сапраўды пашырана на тысячагодзьдзе надзвычай „слаўнае“. Колар не пабачыў свайго твору цалкам надрукаваным (другі том выйшаў у 1853 г., ужо па ягонай сьмерці, у венскай Акадэміі навук), не зрабіўся сьведкам глыбокага маўчаньня, у якое твор занурыўся, — і воды саступіліся! Але перад сьмерцю ён меў яшчэ час прэзэнтаваць кнігу вучонай грамадзе ў Рыме: тая яго не прыняла. Што з імглы нямецкага міту нарадзілася, бясспрэчна мела ў цемры нямецкай глушы і застацца!

І ўсё ж я сьцьвярджаю, <…> што коларaўскі панславізм ёсьць спробай інтэграваць славізм у канцэпцыю культуры акцыдэнтальнай. Ён — вельмі шляхетная прапанова. З самога факту ягонай гердэраўскай асновы вынікае, што коларaўскі панславізм мог паўстаць і нарадзіцца толькі і толькі на *ўзьмежжы* славянства і Эўропы, славізму і Акцыдэнту, *і толькі зь іх узаемакантакту*. Ён складзены ня з думак і ўяўленьняў Усходу, а выключна з ідэйных *эсэнцыяў заходнеэўрапейскага* рамантызму: праз Гердэра яго можна правесьці да Русо і мысьленьня асьветніцкага. Амальгамуйце Жан-Жакаву *la bonne nature*[17] зь нямецкім рамантызмам і археалягічным мітызмам, дадайце нямецкую філязофію адзінства Быцьця і свабоды Духу ды дамяшайце крыху асіянства і Пэрсі — і вы маеце Яна Колара. Коларaўскі панславізм адпавядае імпульсам акцыдэнтальным і *толькі* ім. <…>

Згадаю яшчэ некалькі апошніх кардынальных ягоных характарыстык. Гэты коларaўскі панславізм што да будучыні поўны няясных *надзеяў*: але гэта якраз толькі надзеі, а ніяк ня пляны. Гэта не праграмы, тут няма мэтанакіраванай сыстэматычнай акцыі. *„Ьber die literarische Wechselseitigkeit“*[18] утрымлівае шэраг парадаў вельмі практычных, але бязьмежна сьціплых, а галоўнае — яна наскрозь менавіта толькі *„literarische“*. Насамрэч, такім чынам, увесь каларызм ёсьць адной адзінай вялікай гістарычнаю настальгіяй, ён цалкам зьвернуты да мінуўшчыны. А яшчэ больш, чым гістарычны, каларызм дагістарычны, археалягічны, мітычны. Абсалютна відавочна, што ён — рэакцыя на комплекс актуальнай дзяржаўніцкай непаўнавартасьці ды спроба задушыць пачуцьцё роспачы візіяй вялікай мінуўшчыны. Ён — фэномэн пачуцьцёвае кампэнсацыі. Ён цалкам літаратурны і гістарычны, а таму й *непалітычны*, і гэтая непалітычнасьць пацьвярджае літаратурнасьць і гістарызм, а ў адказ сама імі сілкуецца. <…>

далей

ЗАЎВАГІ

[1] *Вэнды* — старажытнае нямецкае абазначэньне некаторых славянскіх этнічных групаў, напр., лужыцкіх сэрбаў, паморскіх славянаў і карынцкіх славенцаў.

[2] *Mea culpa* — мая віна (лац.).

[3] *Une planche de salut* — выратавальны круг (фр.).
[4] *Акцыдэнтальны* (лац. Occidentalis) — заходні, уласьцівы краінам Захаду ў супрацьлегласьць *арыентальнаму*, усходняму.
[5] *Naturvųlker* — прыродныя, натуральныя народы (ням.).
[6] *„Ідэі да гісторыі філязофіі чалавецтва“*, асноўная праца Ё.Г.Гердэра.
[7] *Naturdichtung i Kulturpoesie* — натуральная (прыродная) творчасьць і культурная паэзія (ням.).
[8] *Le langage sensible est le premier langage humain* — мова пачуцьцяў ёсьць першай чалавечаю мовай (фр.).
[9] *„Галасы народаў у песьнях“*, кніга Ё.Г.Гердэра з 1807 г.
[10] *Deutschtum* — нямецкасьць (ням.).
[11] Найменьнік *славяне* Колар этымалягічна зьвязвае з коранем *слава*, лац. *gloria*. На гэтым будуецца ўся яго „Дачка Славы“ („Дачка Славіі“, „Gloriae filia“), насычаная слоўнымі гульнямі кшталту „…слаўма слаўна славу славаў слаўных…“.
[12] *Il y a plus* — болей за тое (фр.).
[13] *Ва́рыта* — старажытны чэскі музычны інструмэнт.
[14] *Dixerat* — сказаў (лац.).
[15] *Morts-nŭs* — мёртванароджаныя (фр.).
[16] У арыгінале — „Staroitalia *slavjanská*“, тымчасам як па-чэску трэба *slovanská*. У гэтым прыкладзе яскрава прасочваецца вульгарнасьць і прарасейскасьць Коларавага панславізму.
[17] *La bonne nature* — добрая прырода (фр.); маецца на ўвазе культ прыроды Ж.-Ж.Русо.
[18] *„Пра літаратурную ўзаемнасьць“*, адно з тэарэтычных абгрунтаваньняў панславізму Колара, напісанае па-нямецку.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
[image]
Панславізм у ARCHE 1(6)-2000
да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 18-03-2000